СУЧАСНЫ БЕЛАРУСКІ ДЭТЭКТЫЎ



Леанід Маракоў

# Запісы забітага кантрабандыста



СУЧАСНЫ

БЕЛАРУСКІ

ДЭТЭКТЫЎ



СУЧАСНЫ БЕЛАРУСКІ ДЭТЭКТЫЎ



Леанід Маракоў

# Запісы забітага кантрабандыста

АПАВЯДАННІ
АБРАЗКІ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
2008

УДК 821.161.3-3
ББК 84(4Беи)-44
М25

Серыя заснавана ў 2004 годзе

Рэдакцыйны савет:

*М. І. Чаргінец — старшыня Камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; В. С. Камянкоў — старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь; А. С. Шчурко — першы намеснік міністра унутраных спраў Рэспублікі Беларусь; У. А. Мачульскі — дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»; В. А. Праўдзін — першы намеснік старшыні СПБ*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**ISBN 978-985-02-0990-0**

© Маракоў Л. У., 2008
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2008

# СШЫТАК ЗАБІТАГА КАНТРАБАНДЫСТА

*Апавяданне*

## Ваяры невідочнага фронту

Гэта быў час, калі Сева Наўгародцаў з далёкага Лондана лашчыў слых сваёй адданай аўдыторыі згубнай для сацыялізму музыкай хардрокераў з «Grand Funk Railroad». Звыкла пасмоктваючы праз саломінку кока-колу, вядомую мірным грамадзянам Саюза хіба толькі з чутак, папулярны вядоўца музычных праграм Бі-Бі-Сі, а для хлопцаў з Лубянкі — подлы адшчапенец, здраднік радзімы і патэнцыйны кліент, частаваў жыхароў зоны-дзяржавы вяршкамі забароненай культуры.

А па другі бок жалезнай заслоны, на ўсход ад Лондана, Севавы ўдзячныя слухачы, завочныя выхаванцы і былыя землякі не спалі ў шапку. Некаторыя з іх, можа, і не самыя геніяльныя, затое дасціпныя, учынныя і даходныя не толькі грэлі душу забароненымі мелодыямі. Яны гатовыя былі, як карта ляжа-пакажа, рызыкаваць па-ўсякаму, хоць уласным здароўем,— абы змяніць сваю долю, здавалася, навекі ўжо выракаваную.

## I

Спыняць — не спыняць? Паклічуць — не паклічуць? Дваццаць метраў да збаўцы-лясочка, пятнаццаць, дзесяць... Ах, як хочацца рынуць з усёй сілы! Ах, як... Я табе рыну, баязлівец няшчасны! Я т-табе! Нават кроку ямчэйшага не зрабі! Ідзі спакойна, упэўнена, не прыспешвай хады! Што затрымцеў? Сэрца скалацілася? Злева направа пераскочыла? Шарыкі за ролікі зайшлі? Не напінайся! Нацягні лейцы! Ты ж у Султанавай куртцы. А куртка эксклюзіўная! З белай

скуры. З башлыком. Са спіны ты і ёсць Султан. Замежны студэнт. За гэтымі хлопцамі гэбісты не надта пускаюцца. Не надта...

Вось і збаўца-лясочак! Родны ты мой, любенькі... Пяць метраў да свабоды, два... Сціснуў кулакі і, апошнім намаганнем волі, скінуўшы скаванасць (а яна, хай усярэдзіне, глыбока на дне душы, усё ж была, гэта я цяпер, праз гады, казыраюся), утаймаваў у сабе жаданне пусціцца бегма, зайшоў пад сасновыя кроны спакойна. Зрабіў непаслухмянымі нагамі яшчэ колькі крокаў і схаваўся за дрэвамі. Толькі тады наважыўся — і даў волю нагам. Папёр без духу, як ад смерці ўцякаў. Так. Гэта, бадай што, не перабольшанне. Пільныя хлопцы ў цывільным: гэбэшнікі, абэхээснікі, іхныя шасцёркі — камсамольскія актывісты і звышактыўныя (такімі не робяцца, а родзяцца) народныя дружыннікі, накінуўшыся гамузам, маглі каго хочаш адправіць на той свет. Было і такое...

Я ляцеў. Але гнаў мяне не страх. Падганяла і штурхала на рызыку жаданне вырвацца з галечы. Вырвацца з нуднага, будзённага жыцця маленькага савецкага чалавека-чалавечка, будаўніка светлай будучыні... Ды ўжо ж? З цёмнага мінулага! Гнала і рымсціла: вынось ногі, браток, уцякай, ад жыткі, што апроч няволі не суліць нічагусенькі. Другога спосабу скінуць ланцугі ў цябе няма і не будзе. Не станавіцца ж з паклонам перад гідкімі органамі, каб падпісаць адну паперку і стаць віжом. Такіх па службе першымі ў людзі прасоўваюць. А не, дык не чакай падвышкі! Будзе адно таптанне на месцы. Зноў давядзецца быць як усе. Зведваць толькі дазволеныя радасці. Цешыцца, маўляў, няма вайны. Вось нейкім дзівам на васьмітамовік Артура Конан Дойла падпісаўся. І жывеш ты — у самай чытомай краіне. А галоўнае, ты будзеш чакаць — чакаць, як манны з неба, мізэрнага авансу, каб дацягнуць да зарплаты. Усё жыццё чакаць авансу! Усё! Вяршкі за цябе будуць здымаць іншыя. Іншыя будуць плаваць у «капустачцы», а за адным разам — і ў цёплых морах-акіянах. Цешыцца шчаслівым жыццём і дыхаць на поўныя грудзі. Табе ж кінуць толькі костку-надзею — чакаць!

Я не зношу чакання! Нікчэмны гэта занятак і, галоўнае, заўжды марны. Хоць і малады, а такія пакуты ўжо зведаў на ўласнай скуры. Колькі даводзілася чакаць! Чакаць і праклінаць усё на свеце. Вар'яцець ад думкі, што няма рады нешта змяніць, нешта зрушыць з месца, скараціць тое чаканне. Я не хацеў прасіць у мора пагоды і таму спяшаўся, правальваючыся ў закіданыя снегам ямкі, чапляючыся за невідомыя ў лясным змроку патырчакі, іншы раз ледзь

не падаючы, баючыся не так за сябе, як за дарагую мне ношку. Не мог я спыніцца, зламацца, здацца, каб потым, схоплены на гарачым і дзіка запалоханы, падпісацца на сексоцтва. Не меў права такога. Бо ведаў: старэйшыя ў родзе, хоць і зазналі ад гэбэшнікаў, але не папусціліся. І ў цёмных сутарэннях іх да паўсмерці збівалі энкавэдысты, і ў лагерах сібірскіх на марозе студзілі, а ў здраднікаў перавярнуць не змаглі. Не сталі продкі сексотамі. Не заплямілі роду стукацтвам. І я не маю права! А раз так, мушу бегчы па гэтай рызыкоўнай, небяспечнай дарожцы, мушу выносіць ногі. У мяне выбар: ці гуляць згодна з іх правіламі, танцаваць пад іх дудку, ці ісці супраць іх правілаў і законаў.

Я выбраў: ісці супраць. Таму і сігаў без перадыху, несучы на плечуку толькі што набытыя «Тры сямёркі». Тлумачыць маім аднагодкам, што гэта за дзіва дзіўнае, пэўна, не трэба. А для цяперашніх акселератаў скажу: так у народзе называўся манаблочны пераносны стэрэакомплекс «Sharp-777». Яго выпускала аднайменная японская карпарацыя ў пачатку – сярэдзіне 80-х гадоў мінулага ўжо стагоддзя і тысячагоддзя. Гэта была адна з найлепшых і папулярных на той час мадэляў, мара і вяршыня жаданняў многіх і многіх. Перадусім – цэкоўскіх і дырэктарскіх дзетак. І не толькі мара. Словы «мы рождены, чтоб сказку сделать былью» іхныя «вялікія бацькі», здаецца, для сябе і прыдумалі. Я ж, хоць і адчуваў у тыя хвіліны вагу «шарпа» на ўласным плячы, нават не адважваўся і думаць, каб пакінуць яго сабе: каштаваў музцэнтрык надта ўжо кругленькую суму. На плячы ў мяне, уласна кажучы, зусім не магнітола вісела, а цяжкаваты пачак маміных грошыкаў.

Цяпер вы разумееце, чаму я не мог, дый не меў права спыніцца? Або, што яшчэ горш, кінуць «шарп», прыхаваць дзе ў снезе. І тое, і другое значыла б адно: памінай як звалі! Стаў бы я – і бывай, «777-ы»! А мне – цэлы жмутак сур'ёзных непрыемнасцей. Схавай свой набытак у снег – і ўжо праз пяць хвілін не знойдзеш. А без «шарпа» – тут усё разлічана! – не скора мне ў людзі выбіцца. У нармальныя людзі. Не жабракі. А што да цаны магнітолкі, то я ні каліва не перабольшыў. Яна сапраўды была важкая і цягнула на дзве гадавыя маміны зарплаты. Не чые там, а якраз маміны! Яна ж ад самага пачатку мяне прафінансавала. Вядома ж, не адразу. Мудра я тады ўсё прыдумаў і арганізаваў, ух мудра...

Для набыцця «шарпа» патрэбны былі грошы, і немалыя. А дзе іх узяць – шмат і адразу – хлопцу з хрушчоўкі? А вось дзе! За

дарагі і прэстыжны па тым часе (а цяпер і пагатоў, як выявілася) прэзент — французскія духі «Klima» — мне пакінулі на складзе аднаго, не ўсім смяротным людзям вядомага магазінчыка без шыльды, дарагую, але звышдэфіцытную (з тых, што можна хутка прадаць) рэч — амаль не нашую, прыбалтыйскую, стацыянарную стэрэафанічную сістэму «Radiotehnika». Гэта была як бы прамежкавая аперацыя.

Само сабою, каб купіць такі круты музычны цэнтр, ды яшчэ ў крэдыт, трэба было не толькі на першы адлік капеечку зберці. Гэта я зрабіў, паўгода эканомячы на абедах! Але ж трэба прыкласці і прэзент — армянскі каньяк з маскоўскім шакаладам. Зрэшты, гэта ўжо дробязі, успамінаць якія — толькі далей заганяць сябе ў беспрасветную галечу. Гэта толькі ў шкодных для жыцця саўковых раманах можна было дасягнуць фінансавых поспехаў дробнымі ашчаджэннямі. У сапраўднасці ўсё інакш. Дык жа вернемся да жыцця. Той крэдыт я павесіў на маму: хто ж даверыць такую важкую суму маладому інжынерыку са стажам даўжынёю з заечы хвост?

Не стану стамляць чытача дэталямі маёй фінансавай аперацыі. Адно скажу, прыдбаўшы стэрэафанічны камплект, я адразу збыў яго людзям заможным. Тым, што не звыкліся марнавацца ў чэргах, сціскаючы ў мокрай ад поту жменьцы запаветны талончык, баючыся незнарок сцерці з далонькі тры няроўныя лічбінкі, напісаныя шарыкавай ручкай, а часцей — хімічным алоўкам — цяпер ужо даўно забытым. Адным словам, скінуў я дэфіцыцік з натруджаных маміных плячэй і набыў, як сказала б наша ўедлівая інстытуцкая палітэканаміца, пачатковы капітал для абароту і самастойнай работы. Далей — болей...

І цяпер во, калі знайшоў, дзе, як і чым загружацца, калі, здавалася, усё ладзіцца паводле яснага бізнес-плана — цягай з аднаго месца ў другое тыя запаветныя «шарпікі», багацей, хоць расперажыся, цяпер — спыніцца і даць сябе злавіць? Недарэчна гэта, несамавіта, не па-людску ўрэшце. Мама ж дасюль крэдыту не выплаціла. Дасюль! А я мушу апусціць рукі і ратаваць сваю скуру? Плюнуць на маміну двухгадовую працу? Не, даражэнькія, такі нумар не пройдзе! Маму я ў крыўду не дам. Яна ў мяне — адна. І я ў яе адзін-адненькі, любенькі. Так яна мяне называла, калі прыносіў са школы пяцёркі за матэматыку. А ўменне борзда і слушна купюркі лічыць хлопцу ў жыцці ой як прыдалося! Вучыце, дзеткі, матэматыку — найпатрэбнейшую з навук! Нам, мамка, трэба шанаваць адно

аднаго, трымацца разам. Толькі так мы можам вырвацца з галечы — толькі на сябе спадзявацца. Ты дапамагла ўзняцца на першую прыступку. Далей — мой клопат! А я цябе ні разу не падводзіў і не падвяду. І з магнітолай так проста не разлучуся. Не здамся! Ніколі! Фігу з макам!

Але паджылкі ў мяне, трэба сказаць, затрасліся. Бо каб спынілі ды праверылі, то ўжо далі б па шапцы. Ох, далі б! Ды што па шапцы! Лёс маглі павярнуць у іншы, не лепшы бок. За нікчэмны анекдот жыццё людзям ламалі. Гэта не выдумка, а ява вялікай Краіны Саветаў. Такое вось двухрадкоўе ўелася ў памяць: «Два сябры адзін другому расказалі анекдот — і на Ціхім акіяне свой закончылі паход». Прышылі б што і горшае, чым перапродаж. Сувязь з іншаземцамі яшчэ і ў васьмідзесятыя лічылася страшным грахом.

Цвяроза ўсё ўзважыўшы, я не стаў пазбывацца рэчдока і закопваць магнітолу ў снег, а паправіў неацэнную ношу на плячы, аддыхаўся і зноў паддаў ходу.

Снегу ў лесе было па калена, і белы холад адразу пралез у лёгкія, не для нашай зімы, італьянскія боты-факстроты. А з выгляду вунь якія фарсістыя! Серабрыстыя, з чорнаю аблямоўкаю. Толькі футра ў іх з гэтага... з пілавіння, ці што? Бр-р, чао, ціфозі! Нездарма справядлівыя ангельцы пры нагодзе не абмінаюць, каб не павыхоўваць гэтых халяўных майстроў. Зрэшты, у абутку, не разлічаным на нашы снягі-маразы, быў, як ні дзіўна, і свой плюс: у іх мерзлі ногі. А гэта змушала варушыцца — каб зусім не закалелі.

Бегчы было-такі цяжка. Але што рабіць, што чыніць? Як той казаў, час — грошы. І не толькі грошы! Час — яшчэ і жыццё! Якое ў нас усіх адно-адзінае. Геракліавы словы, што двойчы не ўвайсці ў адну рэчку, мелі для мяне вельмі канкрэтны сэнс. Мала каго з фарцоў гэбэшнікі лавілі двойчы. Ставала і аднаго разу. Першы і апошні! Можна па-іншаму: фарц, як і сапёр, мыляецца ўсяго раз.

Збіваўся дух. Я ляцеў штосілы. Але пакрысе хваляванне ўляглося, і галава запрацавала спакойна. Галоўнае — хутчэй мінуць лясок. Дзякаваць Богу, ён быў невялікі — кіламетр-паўтара.

Я мчаўся, як вецер, але і цяпер, бегучы, мусіў рабіць найневыноснейшае, як па-дзеля мяне — чакаць. Чакаць адказу: чым гэтыя ўцёкі, гэтая небяспечная авантура скончацца? А тым часам скончыўся лес. Яго разрэзала дарога. Я перайшоў на хаду, разгледзеўся. Уздыхнуў з палёгкаю: не збіўся! За дарогай пачыналіся могілкі. Вымучана ўсміхнуўся сам сабе: могілкам узрадаваўся! Можа, так яно

2. Зак. 413

калі і будзе... Жартую, нервы супакойваю. Галоўнае — дарога. Бо дарога — гэта жыццё. На яе і спадзяваўся я. А дакладней, на таго, хто мусіў мяне чакаць.

Таксіст — малайчына. Не падвёў. Не з'ехаў. А не — капцы хлапцу залётнаму. Калі б я, выскачыўшы з лесу, рынуў да аўтобуснага прыпынку, то пільныя сябры-таварышы ўмомант «замялі» б уцекача з «шарпікам». Хоць і позна, але раскусілі строгія хлопцы фокус з дзіва-куртачкай і па асфальтавай дарожцы ад інтэрната да аўтобуснага прыпынку хутчэй за мяне дапялі. Тут бы і хапнулі з японскім магам! Дзве тысячы манетак! Вунь яны, галубочкі, шэпчуцца, планы складаюць, як бы фарца хітрэннага ў нетутэйшым маскхалаце і з дарагою японскай штуковінай пад пахай за адно месца ўхапіць. Добра гэбісты разлічылі: з такою бандураю далёка не ўцячэш!

Разлічылі, ды не ўсё! Фігу вам з макам! Разумнікі! І мы не лапцем капусту сёрбаем. Як гэта Генка, мой сябра і канкурэнт у бізнесе, калі ў добрым гуморы, выпендрываецца пры развітанні: «Бай-бай, жыві — не прападай!» Ага, bу-bу, аўф відэрзээн, таварышы — ды не нашы! Да няхуткай сустрэчы!

Я закінуў скрынку на заднюю сядушку, плюхнуўся побач і, паказерыўся — што там на прыпынку? «Тра-та-та, тра-та-та, мы вязём з сабой ката!» — гэта зноў у мяне нервы разгуляліся. Кінуў шафёру:

— Паехалі! І газу не шкадуй, шаноўны!

«Позна, хлопчыкі, ачухаліся,— радаваўся я, аддаляючыся ад сваіх лаўцоў. Бачыў ззаду ў шыбе, як тыя кінуліся даганяць.— Дзе там! Адпачніце! Сёння мадам удача не ў ваш бок вочкамі міргае. Цягнічок ужо цю-цю... пайшоў. Вырвалася з гэбэшнай масткі ахвяра».

На душы палегчала, але ненадоўга. «Трэба нешта рабіць. Мо паспрабаваць змяніць тактыку. Мянты з гэбістамі зноў аблаву наладзілі. Няўжо на штодзённае паляванне перайшлі? Учора праскочыў, пашэнціла, сёння таксама — загадзя з таксі парупіўся. А заўтра? Што будзе заўтра? Ці не апынуся ў тым шэрым аўтобусіку з карычневымі фіранкамі, які таварышы ў цывільным перад паляваннем на надта шустрых хлопцаў у двор інтэрната падганяюць? Ой як не хочацца ў кабінеце з закратаванымі вокнамі адказваць на хітрамудрыя пытанні. Ой як не хочацца! А тут, глядзіш, і давядзецца зараз. Дальбог, давядзецца... Што? Ну і ляпнуў! Як лапцем па вадзе. Ціпун на язык! Ох, накаркаю, ох... Трэба, відаць, пера-

дышачку арганізаваць, тэмпы збавіць. Як гэта ў маракоў (ды ўжо ж, у іх!) кажуць: «Малы наперад!» Вось і мне трэба наперад — малым ходам. Інакш і праўда замятуць. А тады ўжо мала не падасца...

## II

На наступны дзень я здумаў-такі ў бой не ісці, тайм-аўт зрабіць. Ды фарц плануе-мудруе, а кон з ім у свае гульні гуляе! Зваліўся мне, як снег на галаву, аднапалчанін з Алтая. Тыдзень таму званіў, прасіў памагчы ўбрацца па-чалавечаму. І я, на сваю галаву, паабяцаў знайсці ягоную мару: джынсы «Lee», ды яшчэ амерыканскай маркі. І вось ён, родны, любы, дарагі, у госці зазірнуў. І дастань яму хоць з-пад зямлі, раз абяцаў, тыя самыя каўбойскія порткі — памры, але дастань, калі слова даў!

Даў дык даў! І значыць, трэба выконваць.

Рызыкуючы нарвацца на хлопцаў з невясёлымі тварамі, перарос плойму інтэрнатаў з неграмі, з арабамі, з палякамі — пуста. Няма на гэты вось час дэфіцытнага тавару, і годзе!

І раптам, мала не ў роспачы, я згледзеў у нягодніка Генкі тое, што «доктар прапісаў». Умеў гэты шустрык нейкім спосабам эксклюзіўныя рэчы даставаць. Талент у хлапца быў выбітны! Дык, не таргуючыся, давялося раскашэліцца за портачкі на топавы прайс — 190 вельмі моцных савецкіх рублікаў. Што ж! Галоўнае — слова датрымаць. Слова гонару для фарц-брата куды важчэй, чым для партыйца. Таго, што за народ заўзімаецца, а напраўду кроў з яго смокча. Слова гонару для фарца больш чым проста слова. Сказаў — значыць, на гвалт мусіш выканаць. А як жа! Дамоваў жа мы не ўкладаем і вэксаляў не падпісваем — на даверы ўсё трымаецца. На знакамітым шчырым слове. Нават удакладніў бы: на шчырым шляхетным слове. Як даўней было. Няпісаны закон. Звычаёвае права. Не кажу пра тое, што і чыста па-чалавечаму гэта прыносіць асалоду. Вунь як шчыра ўсміхаўся-развітваўся са мною ашчаслівулены аднапалчанін, як імпэтна з акна купэ ручкаю махаў!

Але, але, хоць фарцы слоў на вецер не кідалі — не расходзіліся слова і справа і ў тых, хто на іх паляваў,— у гэбэшнікаў і бандытаў. Пра першых ужо колькі слоў закінуў і, па ходзе апавядання, спадзяюся, дадам яшчэ трохі. А пра бандытаў павучальную гісторыю,

пакуль з галавы не выскачыла, раскажу. Відаць, і ўспомнілася яна невыпадкова.

Трапіў я неяк на імяніны да сяброўкі і суаўтаркі, скажам так, шырока папулярнага ў вузкіх колах кампазітара. Народзіны музыкантавай пасіі адзначаліся ў найлепшым рэстаране горада-героя. Дык і госці ж былі не з класа гегемонаў-пралетараў. Сярод запрошаных мне адразу папаў на вока ціхі сімпатычны хлапчына. Нават на фоне ўсяго гэтага бамонду ён вылучаўся звышмодным прыкідам. Не яркасцю вопраткі, а яе вытанчанасцю і строгасцю, што, як ведама, грошай каштуе. (Чулі, скажам, пра касцюмы без швоў?) І паводзіў сябе малады чалавек звышветліва і звышдалікатна. Ну проста хлапец-маладзец!

Спачатку падумалася, што ён — наш, фарц, толькі надта ўжо круты. Заляцеў на вялікіх «манях» у завоблачныя вышыні. Але нешта ў харашунчыку, відаць, было чужое, бо турбавала мяне. І пры зручным выпадку я пацікавіўся ў знаёмых, што за суб'екцік. Пра вытанчанага госця ніхто нічога толкам не сказаў, толькі даведаўся я, што запрасіла яго сама імяніnніца. Нядаўна з ім пазнаёмілася. Сама дзівілася: «А сустрэліся мы ўпершыню на вуліцы. Уяўляеце, я — і ў такім месцы знаёмлюся! Як вам падабаецца? Няёмка нават казаць. Хоць, можа, гэта сам лёс Вадзіка да мяне падаслаў, калі два хуліганы ля пад'езда прычапіліся».

Ох, гэтыя вулічныя знаёмствы! Ох, гэтыя вулічныя заступнікі! Папалася, галуба, як неразумнае дзіцятка. Вадзік прапёр не хуліганаў, а сваіх жа падстаўных сябрукоў. Камедыю, казаў бы, хлопцы разыгралі. Той адважны, як выявілася, быў не заступнікам слабага полу, а грабежнікам, бандытам, праўда, яшчэ маладым, неспрактыкаваным пачаткоўцам. Пачаткоўцам? Так, але як пачаў!

Атрымаўшы ад наводніка адрас кватэры, наладаванай апаратурай ды іншымі дарагімі рэчамі, ён дачакаўся, калі гаспадары пойдуць на работу, і зрабіў спробны званок. Не пачуўшы адказу, пазваніў яшчэ раз. На ўсякі выпадак. Зноў — цішыня. Далей ужо не стаў чакаць — выбіў нагою дзверы. (Во быў час — за фанеркамі спакойна спаць кладіся!)

Хоць на званкі ніхто не адказваў, кватэра была не бязлюднай. Нямоглая бабулька, маці перакладніка гандлёвага прадстаўніцтва, які перыядычна шастаў за мяжу, сядзела ў інвалідным крэсле і чытала. Тая кніга сталася апошняй, якую яна бачыла ў сваім жыцці.

Схапіўшы бабульку за валасы, сабраныя на макаўцы шырокім грэбенем, Вадзік прыцiснуў сівую галаву да спінкі крэсла і ткнуў растапыранымі пальцамі ў падслепаватыя вочы. Як потым расказваў братанам, пашкадаваў паўжывую каргу, таму і не прыкончыў. Пашкадаваў...

Вадзік выхоўваўся ў інтэлігентнай сям'і і ўмеў сябе добра паводзіць. От імянінніца яго адразу і не раскусіла. Раскусіла, калі ўжо было позна.

Неяк красунчык пазваніў «кампазітарцы». Пачуўшы, што тая праз дзве гадзіны ад'язджае на гастролі, узрадаваў: паспее падвезці ёй свежанькі альбом любага ёй Кліфа Рычарда. А якая ж мадам адмовіцца ад Кліфа, ды яшчэ і Рычарда? Не адмовілася і яна. Тым болей не дапусціла й думкі пра што дрэннае. Дый не ведала, што не трэба было ёй успамінаць пра гастролі. Нешта зусім іншае разумеў яе дабрадзей-харашун пад гэтым словам.

З халодным спакоем «заступнік» упакаваў і склаў ля выхаду ўсё каштоўнае, чаго было ў кватэры. А гаспадыню, супраць тае «каргі», не пашкадаваў — здзекаваўся з даверлівай нябогі, як хацеў. Навошта? А так, для ўласнай асалоды — кайф лавіў. А заадно і добрую навучку заўдаў, каб не грашыла з чужымі мужамі. Заклеіў шырокаю стужкаю скотча рот і без таго анямелай ад страху ахвяры і, сарваўшы з яе рэшткі бялізны, прывязаў, бедную, за рукі да батарэі. (Можа, Вадзік быў першы, з лёгкай рукі якога іншыя нелюдзі сталі сваіх ахвяр да абагравальнікаў прыкоўваць.) Абліў яе вадою, каб вярнуць да памяці, і стаў хвастаць па далікатным целе моцнаю папружкай з якаснай скуры ад добрай старой фірмы «Super Rifle». А ў добрай фірмы і спражка добрая — бронзавая.

Нездарма ж усмешлівы Вадзік адзяваўся з асаблівай выкшталцонасцю ды строгасцю, у сэнсе — дорага. Дорага гэта каштавала і імянінніцы — заплаціла яна жыццём.

А гадоў праз пяць збілі да смерці і самога Вадзіка — на той час ужо аўтарытэта, прызыванага Япім, вядомага ў бандыцкім — дый не толькі ў бандыцкім! — асяроддзі. А хай не лезе «беспредельщик» на бензакалонкі, у супермаркеты, адным словам — куды не трэба. Рот яму не заклейвалі. Дык на выспачцы, недзе ў забытых Богам балотах паміж Гомлем і Бранскам, лямант стаяў — нечалавечы. Зрэшты, Вадзік калі і быў чалавекам, дык толькі часткова.

На тых імянінах, дарэчы (ты глядзі, такога чалавека ледзь не забыў!), і сапраўды круты фарц сядзеў. Для яснасці хацелася б

адзначыць: фарцы бываюць розныя. Сцішаныя, такія, скажам, як Генка з вядомым дэвізам – *курачка па зярнятку*. Перастрахоўцы – сто разоў (не сем!) адмерай – адзін раз адрэж! Рызыканты, як Міколка-паравоз,– *была не была*! І урвісы, што не думаюць пра вынікі – *а пайшлі б вы ўсе*! – як Міхальчук, якога, здаецца, Сашкам звалі. Варта было хлопцу разок удала гітару дванаццаціструнную прадаць лідэру «Песняроў» Уладзіміру Мулявіну, а музыканту пару разоў адказаць на зайздрослівыя пытанні калегаўсяброў, дзе надыбаў «Хендрыкаўскі фендэрчык», як перад Сашкам умомант вырасла чарга кліентаў. І хлопца панесла! Капітал стаў расці з касмічнай хуткасцю. «Дванаццаць негрыцянят» часамі не спраўляліся дастаўляць заморскія гітары, «ударныя», іншыя «ямы», «маршалы» і «тамы», мала тады вядомыя. Аднак з такой самай хуткасцю да яго набліжаліся, з розных бакоў, бандыты і мянты. Першымі дабраліся да Сашкі служкі закону. І гэта відаць, выратавала яму на той момант жыццё. Але не выбавіла ад турмы. Два гады папраўча-працоўных лагераў – фінал не найлепшы. Улічваючы Кірылкаў досвед (пра гэта будзе ніжэй), далі пяць, з прыстаўкай «строгага рэжыму»? Праўда, адважнага Сашку і лагер не спыніў. А пратрымацца сярод зэкаў дапамагла ўпакоўка «зялёных», якую пры ператрусе ягоная жонка выкінула ў кухоннае акно. Не разгубілася ж, аднак, ад нечаканага ночнага візіту няпрошаных гасцей. Рызыка страціць грошыкі ў кустах свежапасаджанага агрэсту (Як сэрца чула!) была, але куды меншая, чым трымаць іх дома.

Спынілі ж няўрымслівага Сашку – ужо як адседзеў – бандыты, што не дасталі яго раней. І спынілі назаўсёды. Рызыка – рэч пачэсная. Але калі страчваецца развага, арыентацыя ў прасторы, няма тармазоў, а жаданні мкнуць па-за межы і няма адчування рэальнасці...

Цікава, ці сустрэў Аляксандр Міхальчук Уладзіміра Мулявіна там? І хто цяпер грае на асірацелым «Хендрыкаўскім фендэрчыку»?

## III

Я, здаецца, трохі адхіліўся ад свайго аповеду. Дык вось, хацелася б пры нагодзе зазначыць, што нашы культпаходы па тэхніку, па іншыя прывабныя нетутэйшыя рэчы рэжым залічваў да злачынстваў – рангам не ніжэй за бандыцкія, і караў няменш

строга. Хоць ніхто з нас не быў хлопцам з вялікай дарогі, але залятаў, калі лучаў ім у рукі, не слабей за ўсякага бандзюгана. А таму лёсы многіх фарцоў былі непрадказальныя і трагічныя. Асноўны кантынгент мітуслівага народу складалі студэнты інстытутаў, тэхнікумаў — і далёка не горшыя. Былі ў ліку фарцоў аспіранты, маладыя спецыялісты, адным словам — перспектыўны кантынгент, што стаяў на парозе абяцанага шчаслівага жыцця. Правалы-праколы маглі проста ўсё перакрэсліць. Адзін няўдалы культпаход, адзін-адзіны залёт — і здольны аспірант, учарашні чырвонадыпломнік, перспектыўны малады інжынер зараз жа апыналіся ў цягніку з закратаванымі вокнамі, які вёз іх задарма ў краі далёкія.

І няма тут ніякага згушчэння фарбаў, ачарнення сацыялістычнай явы. Ды Божа мой! Якое ачарненне? Ніколі, колькі жыць буду, не забуду Кірылкі, аднакласніка, яго дзіка запалоханых вачэй і безупыннага дрыжання рук. Такім ён, адседзеўшы, вярнуўся праз год. Зламалі хлопца! А да зняволення?! Быў разумнік, талент, старонку з аднаго прачытання запамінаў слова ў слова. І сябрам быў сумленным. А дзяўчаткі — дык тыя, не саромеючыся, нават у святая святых, у бібліятэцы імя Леніна, чапляліся з знаёмствамі. Пасадзілі талент на два гады за перапродаж джынсаў. Аднакашнік (не хочацца называць яго імя) упрасіў Кірылку саступіць яму модныя штонікі. І накінуў для стымулу дваццаць рублёў: ты ж, маўляў, патраціўся, у Вільню па іх ездзіў, білеты туды і назад купляў. Маці грошы выдзеліла. А бацька, даведаўшыся пра куплю, абурыўся: пераплацілі! Ён быў мянтом, і не простым — маёрам. Дык закруцілі справу як трэба — пішыце лісты. І Кірылку прышылі два гады. Вось толькі лісты яму ўжо былі непатрэбныя. Вярнуўся хворым на галаву: у лагеры зэкавая погань апусціла нашага разумніка. Не тое што старонку з лёту запомніць — двух слоў прачытаць не мог!

Ці разумелі мы тады небяспеку нашага бізнесу? Напэўна. Але брала сваё маладосць. Жыццё, хай сабе і застойнае (не для ўсіх, само сабою), клікала наперад, вабіла ў туманную далеч. І ехалі хлопчыкі ды дзяўчаткі «за туманом и за запахом тайги», як у той песні пяецца, а насамрэч — па рублі, што ў руках прыемна шалясцяць. Бо даўно ўжо рамантычныя ўсесаюзныя і камсамольскія будоўлі ператварыліся ў звычайныя, ледзь прыкрытыя ідэалагічным флёрам, шабашкі. Тыя ж, каго не захаплялі туманы ды пахі таежныя, мітусіліся-круціліся дома і фірмовую апаратуру туды-сюды цягалі. Бо даставаць яе было даволі проста. У Саюзе было

шмат танней вучыцца, чым у «прагных капіталістаў», дык негры з афрыканскіх краін, што «выбралі незалежны сацыялістычны шлях развіцця», сталі ўсё часцей паказвацца з вокнаў студэнцкіх і тэхнікумаўскіх інтэрнатаў. Яны ахвотна ішлі на кантакт. Відаць, таксама ехалі ў Саюз не толькі вучыцца, але і «капустачку секчы» і цiскаць нашых наіўных, падкіх да ўсяго заморскага дзяўчатак.

Зрэшты, за іх, гасцей чарнаскурых, гаварыць не буду. Скажу за сябе. Вось некаторыя павучаюць: не курыце, не піце, не гуляйце без меры з дзеўкамі, шануйце сваё каштоўнае здароўе. А як яго шанаваць? Як не расслабіцца пры звышактыўным працоўным жыцці? Як не зняць стрэс непамерны?

Пасля турбот-хваляванняў з «777-м», пэўна ж, трэба было расслабіцца і духам і целам. Тым больш што ўдалося выслізнуць з рук учэпістых і доўгіх, ды яшчэ з дарагою і «пад'ёмнаю» рэччу. Вось з радасці і заваліўся ў той самы шчаслівы вечарок з сябрамі ў рэстаран. Да гадзіны ночы вытанцоўвалі, потым яшчэ весяліліся за закрытымі дзвярыма. І дадому я трапіў толькі на світанні. Спаў-хроп, як пшаніцу прадаўшы, да абеду, потым ад Наталкі прачуханца атрымаў і ля інтэрната з'явіўся толькі па абедзе. А ў гэты самы абед, дакладней, у 13.25, іх, пабрацімаў маіх, калег па небяспечным бізнесе, і хапалі.

А падзеі, пакуль я песціўся ў пасцельцы, развіваліся так. Спачатку хлопцы ў цывільным, але з выразнымі фэйсамі, інтэрнат, частку кантынгенту якога складалі афрыканцы, атачылі па перыметры, тады ўзялі пад кантроль паверхі. І давай чакаць — не з мора пагоды,— а хлопчыкаў нашых, што зажадалі-адважыліся, нахабы, жыць сённяшнім днём, а не байкамі пра шчаслівае заўтра.

Выходзіць гэтак хлопчык сарамяжлівы з пакоя, а яго — хап за каршэнь! І не тузайся. «Ведаеце хлапчыну? — пытаюць у мясцовых шасцёрак.— Свой? Тады праходзь, не затрымвай людзей, важнай справаю занятых. А гэты знаёмы? Не? Відаць, не адсюль? Дык пройдземце, дыверсанцік, з намі, пройдзем, даражэнькі, па-добраму, не ўпіраймася. І што там у цябе ў сумачцы замежнай схавана? Чаго так моцна за яе ўчапіўся? А-а? Маўчым-с-с? Ясненька».

Такім ходам усю фарцу і засілілі.

Заганялі маіх згорбленых пабрацімцаў палонных у «рафік» са знаёмымі фіранкамі, празваны між намі «катафалкам», з рэчамі і па адным.

— І чым жа вы тут, у студэнцкім інтэрнаце, займаліся, дазвольце спытаць? — цікавіліся.

— Па якім такім праве да замежных грамадзян чэпіцеся? — абураліся, павышаючы голас.

— Не ведалі, што законам забаронена? А няведанне не вызваляе ад адказнасці! — задаволена ўсміхаліся.— Не вызваляе!

Вельмі, скажу вам, непрыемныя пытанні. Сам іх — хай і далей будзе літасцівым Усявышні — я не чуў. Чулі іншыя. Як тлумачыў адзін мудры чэкіст майму шустраму сябру Генку, рэч, маўляў, не ў тым, што вы на гэтым зарабляеце. Рэч у іншым. Першае: вы паказваеце дрэнны прыклад. Маўляў, не абавязкова надрывацца-ішачыць на карысць айчыны. Другое: калі чалавек не працуе, у яго з'яўляецца вольны час. У гультайстве і бяздзейнасці ён можа пачаць задумвацца, шкодныя песенькі нашэптваць: як ды што, чаму не стае нам усяго? А гэта... Такія песенькі невядома да чаго могуць давесці! Прыкладам, да такой небяспечнай высновы: працаваў, не працаваў — грошай усё роўна не сабраў. Дык наліха яна, такая работа! І трэцяе, галоўнае. Пашыраючы заходнюю электратэхніку, вопратку, музычныя кружэлкі, касеты, іншыя іхныя каштоўнасці, вы несяце ў масы чужую нам заходнюю культуру і ідэалогію. Больш таго, ствараеце ім рэкламу. А значыць, прапагандуеце капіталістычны лад жыцця — сістэму, варожую нашай, сацыялістычнай. І таму — не пабаюся гучных слоў — вы ёсць ворагамі айчыны. А з ворагамі што робяць? Так, знішчаюць!

Шмат хто пасля такой «сакрэтнай размовы» кідаў даволі небяспечную работу, не пазначаную ні ў адным савецкім даведніку. Кінуў яе і Генка. Бедачыну, трэба сказаць, ніколі лёс, апрача як у дробязях, не песціў. Успомню тут як довад яшчэ адзін сумны эпізод з няпростай Генкавай біяграфіі. Якраз гэты эпізод яго і дабіў. Ёсць жа прымаўка: знаў бы, дзе ўпадзеш, саломкі падаслаў бы. Але каб... ды калі б...

Неяк надумаў Генка двойчы тую самую капейчыну пракруціць. Двух зайцоў хапануць адным махам. Забыўся, што Бог за прагнасць можа і па руках даць. Выцыганіў у знаёмага негра вядомы ўжо нам «шарпік» і панёс пад чэкавую «Бярозку». Была такая сетка спецыялізаваных крамаў, у якіх імпартовую апаратуру, бытавую тэхніку, а таксама вопратку прыгожую за спецыяльныя грашовыя знакі — чэкі (тадышнія сертыфікаты) — прадавалі. Чэкамі тымі справядлівая савецкая дзяржава расплачвалася з сваімі вельмі каштоўнымі замежнымі спецыялістамі (сабе забіраючы, само сабой, заробленыя імі долары). Вось і прапанаваў дабрадзей

Генка «будаўніку з Індыі», як назваў сябе спешчаны заграніцамі весялун, крутую магнітолку за тысячу дзвесце пяцьдзесят тых самых чэкаў — на сотку танней, чым яна каштавала ў краме. Сам жа чэк у рублях цаніўся ўдвая даражэй. Дык і выходзіла, што «шарпец» ішоў не за «двойку» з нечым рублёў, як зазвычай, а за дзве з паловай тысячы. Вынік, што называецца, навідавоку.

Шчодрую прапанову «будаўнік» прыняў адразу ж і з радасцю, што ў прынцыпе Генку не насцярожыла. Надта ж ужо паглядны быў новы знаёмы: скураны плашч, абутак, што адбіваў сонечныя прамяні не горш за люстэрка, гальштук зноў жа не з фабрыкі «Камінтэрн», а заціскачка на ім — з такога любага для герояў Джэка Лондана жоўтага металу.

На прапанову «індыйца» адышліся яны ад людней «Бярозкі» трохі ўбок, да Генкавай «пяцёркі», каб не свяціцца перад падазронымі хлопцамі з квадратнымі нявеглымі тварамі і круглымі цікаўнымі вачыма. Пералічыў хлапец уголас чэкі, а тых — на табе! — на сотку больш.

— Ах, так! — лёгка стукнуў сябе па лобе «індыец».— Мы ж танней, чым у краме, дамовіліся. Выдатна, яшчэ і кававарку «Bosch» на халяўку прыдбаю.

Пасля прыблатнёнага «на халяўку» штосьці зварухнулася ў Генкі ў грудзях, але прыемная думка пра дадатковыя ажно дваццаць «чацвяртных» казначэйскіх білетаў прытушыла ўзніклыя было падазрэнне і неспакой.

«Індыец» яшчэ раз пералічыў купюры і, пацвердзіўшы: «І праўда, адна лішняя»,— вярнуў пачак Генадзю. На тым і развіталіся.

Не ведаў тады Генка, што пры пераліку расстаўся ён не толькі з новым сябрам, але і з сваёю дарагой валюткай, аддадзенай негрытосіку за японскі «шарпец». Хацеў адным заходам двойчы падняцца. Атрымалася, што ўраз усё страціў. Апусціўся, дакладней сказаць — апусцілі. На дзве штукі скупы пагарэў. Гаварыў жа хлопцу: «Гена, не гнявi Бога». Не паслухаў. Як любіў казаць сам Генадзь: «Атрымай, фашыст, гранату, атрымай!»

І яшчэ адну праўду задарма аддаю дарагому чытачу: быць злоўленым з таварам — не найгоршы варыянт. З валютай — куды горшы. Для доваду раскажу яшчэ адзін, лічу, варты ўвагі эпізод з неспакойнага жыцця спадароў фарцоўнікаў.

Трапіў неяк у аблаву — ужо пасля Генкавых правалаў — і Мішка Бязяеў, таксама мой стары калега па рызыкоўным бізнесе. Цяпер,

кажуць, хлопец асеў ці то ў мафіёзным Чыкага, ці то ў неспакойным Тэль-Авіве — зусім іншыя праблемы развязвае і, думаю, не будзе пярэчыць, калі чытач уведае лапік яго багатай біяграфіі. Папаўся Мішка не з таварам — не паспеў яшчэ наведаць свайго чорнага кампаньёна. Пры ім была валюта. А за няшчасныя пару купюр, знойдзеных у вашай кішэні, у тыя ліхія часы давалі тэрмін ад трох да пяці гадоў і болей. Ведаючы, якім можа быць фінал непажаданай сустрэчы, Мішка даваў дзёру, як мог, але ў колькасна няроўным забегу быў прыціснуты з абодвух бакоў да туалета. Добра, што хоць паспеў шмыгануць за дзверы і зашчапіцца на кручок, выгнуты з цвіка. Мянты пастукалі ў дзверы без ручкі (нейкі хітрун-шкуматун яе ў час скруціў), пастукалі і зразумелі: без падручных сродкаў не абысціся. Адразу паслалі ганца ўніз, да каменданта, па слясарны інструмент. Стоены за дзвярыма Мішка яшчэ цешыў сябе надзеяй, спадзяваўся на яго вялікасць выпадак: а можа, не стануць абшукваць, калі ж і стануць, дык можа, хоць у сподняе не палезуць? Але, успомніўшы сёе-тое з уражанняў хлопцаў, бывалых у падобных пераплётах, зразумеў, што гэтыя ўсё пасмеюць, і наважыўся. І паляцела любая валютка ў унітаз. На секунду Мішка глянуў на яе — нібы развітаўся, цяжка ўздыхнуў і рэзка-сярдзіта тузануў за вяровачку. Ды з такой злосцю, што тая парвалася. У жахлівым цэйтноце Мішка не разгубіўся, як можна было чакаць, а наадварот, да яго прыйшлі цвёрдасць і адвага. Забыўшы пра гідлівасць, сунуў руку ў бура-жоўтую жыжу. Ад ускалыхнутага смуроду ажно галаву на патыліцу скруціла. Таму, не гледзячы ў унітаз, гаротнік Бязяеў ухапіў свае каштоўныя паперы і перакінуў іх у суседнюю кабінку. Ужо асцярожна, нібы на той вяроўцы сам вісеў, узяўся за яе мокраю рукою і паволі пацягнуў уніз. Унітаз быў старэнькі — няйначай нейкім дзівам да развітога сацыялізму дажыў, але рабіў спраўна, і праз момант дарагія купюркі прапалі ў яго ненасытным чэраве. Толькі паспеў Мішка выцерці аб штаны памытыя пад адзіным жывым кранам рукі, як мянты ўзламалі дзверы, выхапілі яго з прыбіральні і прыставілі да сцяны.

— Рукі па швах, фарца гробаная!

Далей ясна — пачаўся асабісты дагляд (вывarочванне кішэняў, прамацванне падшэўкі іператрус самога туалета — заглядванне і ў змыўныя бачкі і за бачкі).

— Дзе долары? — абураліся неўзабаве, так нічога і не знайшоўшы.— Няўжо, падла, праглынуў?

Не маглі мянты паверыць, што чалавек здольны на такое — амерыканскія неацэнныя грошыкі ў унітазе ўтапіць.

Калі Мішку Бязяева вялі да «катафалка», ён не вытрываў і заплакаў — зламаўся. Старшы з каманды заўважыў гэта і нечакана пашкадаваў фарца:

— Не дрэйфі, не ты першы, не ты апошні.

Не разумеў ён, што плакаў дружбак Мішка не таму, што папаўся (ён, у прынцыпе, не зусім каб папаўся, заляцеў яшчэ не па поўнай праграме), а ад усведамлення, што разам з пачкам зялёных марна прапалі гады працы, працы небяспечнай для здароўя, працы без выходных і праходных, гады яго жыцця. Бяссэнсавага, як выходзіла, жыцця. Бяссэнсавай, як цяпер выходзіла, траты здароўя.

Аднак жа ці не старасць да мяне падбіраецца? На безгустоўную шматзначнасць цягне. А тым часам даўно пара ўжо вярнуцца да таго моманту, калі, адлежаўшыся пасля начной весялосці, я падышоў да знаёмага інтэрната і ўбачыў, як хлопцаў, што дазволілі сабе расслабіцца, бралі оптам. Я, вядома, паспеў ацаніць сітуацыю і на ражон — у прахадную інтэрната — не палез. Завярнуў направа, да назіральнага пункта — абшарпанай, з вечным пахам хлоркі студэнцкай сталоўкі. А з туалета, што побач, на другім паверсе, добра глядзелася поле бою — пляцоўка перад інтэрнатам ды яго парадныя дзверы, праз якія і выводзілі цяпер маіх сябрукоў па бізнесе, а за адным разам і канкурэнтаў (цяпер, відаць,— былых).

Здавалася б, радуйся: пашыраецца поле дзейнасці. Але душа не схілялася да весялосці. Было маркотна і сумна, як на магіле сябра. Нікому не зычу зведаць гэтае страшэнна прыкрае пачуццё, якое ледзяніла сэрца: нібы ты сам закапаны ў сырую зямлю.

Глядзеў я, не надта высоўваючыся на свет Божы, і неадступныя думкі свідравалі маю маладую галаву. А калі б я пад канвоем апынуўся? А калі б гэта мяне двое плячыстых хлопцаў з суровымі тварамі валаклі пад рукі ў «катафалк»? А калі б набытыя мною рэчы — не першай патрэбы — учэпістыя мянтоўскія рукі вось так нядбайна перакідвалі і пералічвалі?

За паўгадзіны строгія хлопцы ў цывільным сваю адказную справу завяршылі, і, у суправаджэнні «Волгі» з прутком-антэнай, непрыкметны аўтобусік, набіты ахвотнікамі зарабіць у абход роднай дзяржавы, рушыў у дарогу, можа, як для каго і сапраўды заломлівую — у бок раённага аддзела ўнутраных спраў.

«Трымайцеся!» — хацелася падбадзёрыць, не толькі паглядам, хлопцаў, што выправіліся ў «нязведаную даль». Але стрымаў сябе, не ляпнуў глупства. І добра.

Чыйсьці грубы голас наехаў на мяне ззаду:

— Ты з якога пакоя будзеш, красунчык? Нешта я цябе не прыпамінаю!

Я павярнуўся і зразумеў: хлусіць няма сэнсу. Перада мною стаяла, можа, і не галоўная тут, але актыўная гэбэшная пазаштатніца — камендантка інтэрната: моцна, па-мужчынску складзеная, злосная істота няпэўнага веку, з паўметровай завіўкаю на галаве. (Як такая шпакоўня на макаўцы трымалася, цяжка сказаць.)

Зіркнуўшы калючымі вочкамі і не даючы мне апомніцца, яна прадоўжыла атаку:

— Чаго маўчыш? Лыжку ў час абеду праглынуў?

У такіх жахлівых мадамаў, як я паспеў не раз пераканацца, з памяццю заўсёды ўсё ў парадку. Да таго ж яны натрэніраваныя, каб умомант тваю хітрасць павярнуць супраць цябе ж. Таму адказаў як мага прасцей, мо з лішнімі падрабязнасцямі, але, думаецца, пасвойму правільна:

— Я з другога інтэрната. Прыехаў да сябра, мы з ім у адной групе вучымся. Сказалі: «Відаць, Валерка ў сталоўцы». Ну, я і за ім. Прыходжу, а яго няма. А раз так, хацеў перакусіць. Ды нешта ежа не пайшла, хутчэй — наадварот...

Гэтае «наадварот» галаву, са шпакоўняй на макаўцы, заблытала, і камендантка прымоўкла. Пэўна што прыкідвала, чаго я ёй, круцель, такога-нітакога нагаварыў. Скарыстаўшы не надта хуткі бег нейронаў у яе неандэртальскай чаропцы, я прашмыгнуў паміж ёю і бліжэйшым да ўвахода вечна дзіравым мыцельнікам.

«Паслухайце! — амаль паводле Маякоўскага, хоць і безгалоса, сам сабе, абураўся я, спускаючыся па лесвіцы.— У прыбіральні і ў той дастаюць! Куды беднаму фарцу падзецца?»

Праз шкляныя дзверы сталоўкі — для Саюза таго часу архітэктурны пачын — бачу: «катафалк» паціху рулюе на выезд са студэнцкага гарадка. Я суцішыў крок і паназіраў. Непрыкметны аўтобусік выехаў на скрыжаванне і няспешна павярнуў налева, дзе мяне ўчора чакала выратавальнае таксі.

Яшчэ імгненне — і «катафалк» знік у бясконцай плыні аўтобусна-тралейбуснага руху. Я хуценька вышмыгнуў са сталоўкі. Радасныя і гаманлівыя студэнты, будучыя будаўнікі камунізму (як ім пра

гэта з нараджэння правілі) і капіталізму (як станецца насамрэч), абцякалі мяне двухбаковай мурашынай мітуснёю.

У гэтай шчаслівай маладой плыні можна было б і забыцца, дзеля чаго я выйшаў з дому і чаго тут апынуўся. Можна... ды — нельга! Быў і я некалі вясёлым ды бесклапотным, а іншы раз і зусім легкадумным студэнцікам, але што было, тое мінула, белым снегам замяло, і забыць іншы раз карысна. Вучоным стаў. Стрэляным вераб'ём. На мякіне не падманеш. Ой, не... Трошкі прыўзняў голаў: што там, за туалетным акном? Ага, ясна: стаіць нястомная мадам, пільнуе, чыніць службу на баявым пасту, чакае-назірае, куды я далей скірую! Не зазлаваў, а толькі ўсміхнуўся: ну і стой-мерзні, галуба, тужся, дыхай туалетным смуродам! Адрабляй хлябок. А мо і не ў ім увесь сакрэт? Можа, табе проста рабіць няма чаго, заняцца няма чым? Вось і сунеш нос куды трэба і не трэба, заадно і гэбістам памагаючы. Жывеш, пэўна што, векавухай, адна, як месяц у небе. А каму ж патрэбная не так сяброўка, як шпег. Дык, відаць, адно ў галаве і засела: сачыць-высочваць і ў час дакладаць каму належыць. Соры, прабач, аднак расчарую цябе, майнэ лібэ мутэр! Не дам зачэпкі для чарговага даклада. Пайду! Проста ў белы свет пайду. Быццам проста так і пустым, заўваж, пакідаю даверанную табе тэрыторыю. Годзе выпрабоўваць лёс! Адкладзём рызыкоўны культпаход на вечар. Не вечна ж ты будзеш ля стратэгічнага акна сляпіцца. Дый сталоўка ў васемнаццаць нуль-нуль закрываецца. Кажуць, раніца мудрэй за вечар. У мяне часам здараецца наадварот. Такая ўжо работа.

## IV

Роўна 19.50. Дакладнасць — ветлівасць каралёў.

І султанаў — таксама. Прынамсі, майго Султана. Калі я падышоў да інтэрната, ён ужо стаяў ля ўвахода, чакаў, але пазнаў мяне не адразу. І не дзіўна. На мне быў маскарадны прыкід са смачнаю назваю «вось мая дзярэўня, вось мой дом радной». Маўляў, калунхлопец, лох лохам, калгаснік, учора з вёскі заявіўся не запыліўся, не ў лапцях — ужо добра. Калі і прычэпяцца, дык, пардон, дзякуй за ўвагу, зусім іншыя хлопцы — звычайнае гарадское хуліганнё. А гутарыць з імі жыццё мяне ўжо навучыла. Папраўдзе, не жыццё, а выдатны і заслужаны трэнер па дзюдо Мікалай Іванавіч Мяцельскі, дай Бог яму здароўя.

Султан, як паляўнічы беркут, разглядаў наваколле сваімі шэра-карычневымі негрыцянскімі вочкамі. Позірк на сабе я лавіў ужо разы з тры, але ён па-ранейшаму не заўважаў мяне. Нарэшце, спатыкнуўшыся, запыніўся.

— Yes, артыст, талент! — усміхнуўся.— Няма пытанняў. Ален Дэлон, што не п'е адэкалон! Пайшлі, канспіратар.

Падышоўшы да вахцёрскай будкі, Султан сунуў пад журнал рэгістрацыі наведнікаў «Снікерс», тады яшчэ мала вядомы. Ох, і не любілі фарцы ў гэтым тоўстым сшытку адзначацца! Разок-другі распішашся за візіт і чакай дома позвачку! Вахцёр хуценька зіркнуў на бакі і толькі тады, звыкла-спрытна, апусціў квяцісты прастакутнічак у кішэньку цёмна-сіняга фрэнча з даўжэзнымі, як на вырост, рукавамі. У такіх ветэраны па-геройску маршыруюць па вуліцах у шумлівыя майскія дні. Аднак наш вахцёр, з усяго відаць, героем вайны не быў. Нешта выдавала ў ім іншага героя — героя невідочнага фронту. Зрэшты, дзе ў яго было асноўнае месца работы, пакуль што мяне не датычыла. Галоўнае — ён падачкі прымаў і, значыць, асабліва не замінаў нашай фарцоўскай справе.

Узяўшы адступнога, дробны карупцыянер адкінуў запаветны шлагбаумчык, і я накіраваўся да Султана ў госці. Ён, як, між іншым, і ўсе шчаслівуцы-негры (для савецкіх міс — вядома ж, французы), што раптоўна і дружна апынуліся ў нашай ціхай правінцыйнай сталіцы, жыў па-каралеўску, даруйце, па-султанску — у тым сэнсе, што адзін у пакоі.

Але цяпер, калі я зноў апынуўся ў атлетычнага чорнага хлапчыны, убачыў не зусім звыклую для мяне сцэну: на знаёмай канапцы ўладкаваліся, ажно чатыры, модна-паглядныя красуні. Султан бухнуўся побач з дзеўчынёхамі і паблажліва паказаў мне рукою на кут, які амаль да столі быў застаўлены кардоннымі скрынкамі:

— Прымай, dear friend, японскую тэхніку!

Хлопец быў не толькі гулякам, але і чалавекам справы: прывёз усё, што я перад яго ад'ездам заказаў.

Сякія-такія цяжкасці Султан, мне здалося, у дарозе меў. Хутчэй за ўсё і ў кішэньку патрэбнаму чалавечку ў патрэбны момант паклаў колькі зялёных паперак. Так, між іншым, нібыта на гарбату. Якія праблемы! А вось фрэнду яго, гэта значыць мне, пакуль негр па еўропах адпачываў-бадзяўся, давялося тройчы напяць жылы, каб мані назбіраць. Шмат мані. І за адным разам не засвяціцца, не пагарэць. Не паехаць па туман і ў тумане тым не прапасці. Адужаў я

ўсё гэта. Вось, калі ласка, жыў-здароў, чаго і ўсім зычу, прывезеную на мой заказ апаратурку купляю. Паэт, адным словам...

Аднак гэтым разам, нават пасля знікнення – на знак Султана – даўeuаногіх красуняў, выкладваць грошыкі я не спяшаўся. Годзе мне разлікаў загадзя! Бо заплаціць – гэта нават не палова справы, а так сабе, глупства. Галоўнае – пранесці гэтыя грошыкі валютныя, а потым – вынесці дарагія цацкі. Валачэш нібы сваё, а глядзі ты – сэрца проста заходзіцца, а нервы, як іржавыя струны, гатовы лопнуць-зазвінець. На кожным кроку тую апаратурку ў інтэрнаце адабраць могуць. А таму больш я такім макарам – не хадок. Плаціць – дык без памылак, каб уласнаю скураю расплачвацца не давялося! І я прапанаваў Султану новую схему выношвання рэчаў няпершай патрэбы.

– Папрасі свайго абібока-земляка, усё роўна цэлы дзень адно шарыкі ў кішэнях ганяе, каб памог тэхніку да таксі паднесці. Тачку я падагнаў, стаіць метраў за сто ад аўтобуснага прыпынку. Як бачыш, на бяспецы не эканоміў. Паднапружся трохі і ты. Учора ледзь жывым з інтэрната вырваўся. Больш рызыкаваць не хачу! Расплачуся, калі разам з таварам апынуся на нейтральнай тэрыторыі. Там, дзе буду пэўны, што купленае – ужо дакладна маё. І не пярэч. У маёй бяспецы і ты, калі не дурань, павінен быць зацікаўлены. Згодзен?

Султан думаў нядоўга, яшчэ раз пацвердзіўшы, што хлопец ён вуда. Пачуўшы «о'кей», я прадоўжыў:

– План такі. Я спакойненька спускаюся ўніз, іду да таксі і чакаю вас у машыне. Вы з апаратурай ідзяце не да таксі, а да аўтобуснага прыпынку. Я кранаюся з месца і кірую ся ў ваш бок. Вы, нібы не заўважаючы, што таксі занятае, галасуеце. Таксіст спыняецца, гатовы вас падабраць. Вы хуценька загружаеце ў багажнік «шарпы» і гэтак сама хуценька сядаеце ў машыну. Выйдзеце, калі я ўпэўнюся, што за намі няма хваста. Такі мой план. Ты з ім згодны?

Султан марудзіў, маўчаў. Зацікавіўся на супрацьлеглай сцяне плакатам з чамусьці маркотным Джорджам Харысанам.

Во як, выходзіць, кампаньён думае пра маю бяспеку! Мяне разбірала злосць. Што такое? Нават такой дробязі не хочаш зрабіць для сябра? Кацiся ты тады к чортавай мацеры! Ці да свайго чорнага афрыканскага дзядулі! А казаў жа, што мая бяспека для цябе такая ж важная, як і твая ўласная. Маўчыш? Вось вам і найлепшы сябра плюс кампаньён ды таварыш. Што ж, прапала кароўка,

хай прападае і вяроўка. Няма ў мяне больш ахвоты рызыкаваць сабою. Дый грашыма, фактычна, таксама не сваімі. Мама крэдыт дагэтуль яшчэ не выплаціла, і мне ён жывым дакорам: не для сябе ж брала. Не спакусіць мяне цяпер і нядрэнны – хай сабе звышвысокі! – пад'ём зялёнымі. Асабліва пасля нядаўняй гісторыі з Міколкам-паравозам.

Даючы такую хвосткую мянушку сціпламу рабаціністаму хлопцу, я ведаў, што пазычыў яе ў пісьменніка-камуніста Майкла (жартую) – Міхася Лынькова. Але вельмі ж яна адпавядала напорыстаму Калюнчыку, сябру па шныранні і праточванні. Таварышы аператыўнікі вылавілі неяк яго на адным з паверхаў незабыўнага інтэрната мединстытута. Міколка-паравоз, не раўня няўдачліваму бегунку Мішку Бязяеву, быў хлопец спартыўны, баксёр, да таго ж – раскола і адважны. Ён параскідаў мянтоў па калідоры і даў дзёру. Служкі закону спачатку разгубіліся, але ненадоўга: як-ніяк трэніраваныя былі хлопцы. Праз пару хвілін ачунялі і кінуліся наўздагон, заадно крыкам і шумам збіраючы плойму таварышаў па службе і актывістаў з паверхаў.

Міколка ведаў: калі яго зловяць, дык не толькі пасадзяць, але і ныркі пастараюцца пусціць у вольнае плаванне. Таму ляцеў без духу, як ад сабачай гайні. Пераскокваючы праз вахцёра, ён зачапіўся за будку. Яго закруціла, і, наляцеўшы на вушак дзвярэй, уцякач зламаў сабе нос ды ключыцу. Але тады Міколка-паравоз нават не заўважыў гэтага. І болю не адчуў. Адчуваў ён ці, лепш, разумеў, што цяпер галоўнае – вырвацца, уцячы. І Міколка-паравоз уцёк. Нездарма ж я даў шустраму хлопцу лыньковскую мянушку! Дарагою цаною – адлежваўся цэлы месяц! – але змог уцячы, пратараніўшы засаду. А ці змагу я выбрацца з падобнага пераплёту? Не ўпэўнены...

Султан зноў перавёў вочы на Харысана. Экс-«бітл» па-ранейшаму маўчаў.

Я не стаў браць з яго прыклад.

– Паслухай! – ужо не трымаў злосці, хоць і разумеў: інтарэсы справы вымагаюць памяркоўнасці.– Ты ж нічым не рызыкуеш. Калі спытаюць – выносіш свае ўласныя – паўтараю – уласныя рэчы. Пераязджаеш, скажам, жыць да... бацькоў свае нарачонай. (Ведаў, што балючы для Султана прыклад падабраў, але ж слова – не верабей...) Вось і ўсё. І ніякіх пытанняў. Сядзеш у тачку – і паедзеш. У выніку – і я не засвяціўся, цэлы, здаровы, на волі гуляю, і табе добра: прадаў, вышэй узняўся, павялічыў свой капітал у Citi bank.

І я, твой кампаньён, застаўся пры табе, не трэба некага шукаць. Ясна тлумачу?

За трэцім заходам Султан здаўся, і мы ўдарылі па руках.

Праз чвэрць гадзіны мой пабрацім з сябрам-земляком падыходзілі да прыпынку. За намі ўжо ўвязаліся «нашы» хлопцы. Відаць, сцямілі: гэтым разам навучаныя жыццём чорныя самі нясуць дарагую апаратуру на дом заказцу. Надумалі праверыць суб'екцікаў. Тармазнулі ля прыпынку, сталі бесклапотна пастукваць нага аб нагу — грэцца. Простыя, звычайныя хлопцы. Гаварылі абы пра што, а насамрэч — чакалі аўтобуса, каб падсесці, прасачыць, вылавіць — і адабраць, само сабою.

Як я зайздросціў, седзячы ў машыне, людзям на прыпынку! Не-не, вядома ж, не гэбэшным ганчакам, а звычайным рабачаям, інжынерам, настаўнікам, дробным клеркам, словам, народу. Як хацеў памяняцца з кім-колечы месцамі! Выскачыць з машыны і шуснуць у шэрую аднародную масу. У таксі з выгладжанымі (не без удзелу рэдзенькага сняжку) звышпразрыстымі шыбамі я быў нібы на экране. Адчуванне такое, быццам усе глядзяць на машыну і бачаць у ёй на задняй сядушцы тваю скурчаную ад хвалявання, амаль па-дзіцячаму бездапаможную фігурку.

Так, многім з нас у трывожныя хвіліны хочацца стаць маленькімі, шэранькімі, непрыкметнымі. Схавацца ў натоўпе. Схавацца, а што далей? А далей — такое самае шэрае, беспрасветнае жыццё, такія самыя шэрыя, беспрасветныя будні, дзень за днём — усё тое самае. Будаўніцтва сацыялізму і камунізму пад хітраванскім лозунгам: «Заўтра будзе лепей, чым учора». Гэта значыць, што добра вам будзе потым, заўтра, а працаваць за капейкі трэба цяпер, сёння. Несумленная гульня атрымваецца...

«Ах, табе не падабаецца? — прачнуўся ўва мне прыхільнік самакрытыкі.— Тады гуляй у тую, у якую гуляеш, і не ный!»

Так, ныць — нікчэмны занятак. Схамянуўся, сканцэнтраваўся: гэтым разам хлопчыкі без шынялёў, але зноў жа ў шэрым (тыя, дарэчы, што са мною мінулым разам у кошкі-мышкі гулялі, а цяпер выдаюць сябе за народ) — перайгралі. Не заўважылі, правароnілі, як скранулася і ціха рушыла да прыпынку таксі, што, здавалася, драмала ля ўвахода на могілкі.

Раз-два — бухнулі два «шарпы» ў багажнік, а трэці — ужо на сагрэтае месца ззаду, мне, новаму ўласніку, на калені. Кампаньёны, адзін за адным шустра і прыцэльна ўпырхнулі туды ж. Паселі — ужо

і месца было мала, «шарпік» ва ўпакоўцы во — з метр даўжынёю! — і рушылі.

Гэбэшнікі кінуліся былі да таксі. Ды позна, галубочкі, піць баржом, вагончык, як кажуць, зачыніўся! Султан-нягоднік амаль што дэманстрацыйна бразнуў дзверцамі ў іх перад носам ды яшчэ махнуў ашалелым хлопцам чорна-карычневай далонькаю — чао! Мужныя хлопчыкі разгубіліся ад такога дзёрзкага ўчынку і адразу трохі астылі. Што тут скажаш? Султан можа дазволіць сабе выступіць не па нотах: ён жа падданы калоніі былой, а не цяперашняй.

Так і выскачыў я тады сухім з вады або, калі каму больш падабаецца — жывым з полымя. Гэта радавала, але расслабляцца не дазваляла. Наперадзе быў новы, заўтрашні, дзень, новыя тыдні і месяцы, а яны абяцалі новыя ўцёкі ад бясконцай пагоні.

## V

Гэтым разам прарывацца праз цэнтральны ўваход было б звычайным самагубствам: гэбэшнікі, як напаказ, паселі вакол вахцёра.

«І чаго б гэта? — ламаў я галаву.— Раней, хітруны, хаваліся, затойваліся ў засадах і, толькі выбраўшы момант, зрываліся з ланцуга. Цяпер — пайшлі адкрыта. Чаму? — пытаўся я і сам сабе адказваў: — Відавочна, начальства з праверкаю чакаюць. Вось і здумалі паказаць, як яны на давераным аб'екце нястомна парадку пільнуюцца, не спяць, у поце чала працуюць».

Ах, жыццё ты наша вясёлае! Асцерагаешся, кожны крок разлічваеш, кожнае слова прадумваеш, кожны ўчынак вывяраеш, жывеш амаль не дыхаючы, нібы шпіён ангельскі, а не вольны чалавек неабдымнай Радзімы сваёй,— усё роўна ніякай табе гарантыі. Уяўленне аб прэзумпцыі невінаватасці ёсць толькі ў Крымінальным кодэксе. У жыцці — зусім іншы малюнак. Вось паспрабую я, скажам, цяпер падацца ў інтэрнат — дык адразу спыняць і пытаннямі бесцырымоннымі закідаюць: да каго і чаго заблукаў? Якая такая патрэба прыгнала? Хто такі і дзе вучуся ці працую? Па якім адрасе жыву і прапісаны? З кім сябрую са студэнтаў інтэрната? Ах, з дзяўчынаю? Хітра прыдумаў! І хто такая, у сэнсе, як зваць шчаслівую? Падзабыў імя? Ха-ха! Гэта і не дзіўна, бо дзяўчаты тут, у мужчынскім інтэрнаце, не жывуць. Так-так. Ды ты пэўна што зладзюга які залётны? Не? Тады шпікуль затоены-прытоены? Га? Чаго маўчыш? Адгадалі?

Можа, яшчэ і не пустым прыйшоў, а з кішэнямі, грашыма набітымі? Валютай, скажам, амерыканскай? Га? Ану пройдзем, падазроны чалавечак, з намі, паглядзім, што ў цябе пад апраткаю прыхавана!

І пройдзеш — дзе дзецца. І абшукаюць цябе, родненькага, і абмацаюць з ног да галавы, нібы праз рэнтген прапусцяць. І не дай Бог паперку знойдуць. Зялёненькую такую, непаглядную. І хоць адну-адненькую! Хоць пяцёрачку пакамечаную. Усё! Капцы! Ты — злачынец!

І ўсё ж, як прарвацца ўсярэдзіну, як праскочыць у гэтак пільна ахоўваны сёння аб'ект, праз цэнтральны ўваход якога і мыш не прашмыгне? Можа, праз акно? Не, тут таксама пралёт! Па ўсім перыметры будынка на ніжніх вокнах краты стаяць. Да вокнаў высокага другога без лесвіцы не дастанеш, а дзе ты яе, лесвіцу, знойдзеш? Вунь нават пажарную невядомы шкоднік знізу так падкараціў, што яна стала недасягальнай. Думай, хлопча, думай, абыдзі будыначак вакол. Але не проста праходжвайся, а зрабі выгляд, нібы ў цябе, разявы, нешта з акна пакоя выпала і цяпер ты ходзіш і шукаеш, круціш дурною галавой: ай-я-яй! Калі спытаюць, што згубіў, скажаш — мамін падарунак, кітайскую аўтаручку з залатым пяром.

Нядобра неяк выходзіць: зноў за мамку хаваюся...

Прайшоў, прыгнуўшыся, нібы і напраўду нешта шукаючы, да іншага канца будынка, дзе былі другія ўваходныя дзверы. Як здалі будаўнікі інтэрнат — яны і стаяць наглуха забітыя. Але справа — лесвіца на верхнія паверхі. А на лесвічных пляцоўках — вокны. Мяне і зацікавілі. Адно — на другім паверсе, справа ад стрэшкі дзвярэй.

«Гэта, бадай што, выйсце. Не, уваход»,— касавурыўся я на акно.

Студэнты пакурваюць у калідоры і, каб дым выветрываўся, акно ўвесь час трымаюць адчыненым. І галоўнае, калідор — не пакой, пусціць праз які студэнт не адважыцца, бо сам можа заплаціць. Вытураць з кута абжытага, а тады і з інстытута выставяць — за невыкананне, спрыянне, пакрыванне і г. д. Хадзі потым, выцірай нос, плач, залівайся, скардзіся каму хочаш. Так што, студэнт, скажу вам, фарцу зусім не памагаты, хутчэй наадварот. А вось лесвічны пралёт... Ды яшчэ з улікам, што калідорнае акно на першым паверсе замалявана і праз яго вас ніяк не згледзяць з фае, дзе сядзіць аблава...

Я дачакаўся, «шукаючы маміну аўтаручку», пакуль хлопцы дымам нацешацца і знікнуць з вачэй. Умомант апынуўся на шырокім выступе цоколя, ухапіўся за халоднае жалеза кратаў ніжняга акна,

дабраўся да стрэшкі пад другім. Асцярожна зазірнуў: пуста, праход вольны, разышліся хлопцы на адпачынак па сваіх ложка-месцах. Узлез на падаконне, ціха скочыў на пляцоўку — нездарма гэтым разам у красоўках ногі марозіў — і, як нічога ніякага, пайшоў калідорам свой сваім, нават ціхенька напяваў куплеты, тады папулярныя ў Саюзе, падбадзёрваючы сябе і супакойваючы нервы:

Говоря-ат, не повезе-ет,
Если черный кот дорогу перейдет,
А пока, наоборот,
Только черному коту и не везет...

Чорны, але не кот, натуральна, а Султан сустрэў мяне на парозе празмерна надушанага «давыдафым» пакоя ўзнятымі ўгору чорнымі як сажа брывамі.

— Ну ты даеш! — знячэўлена рэкнуў.— Завальвайся хутчэй! Твае «сябры» сёння па паверхах надта пільна гойсаюць... Як праз засаду прарваўся? — уцягнуў афрыканец мяне ў свае апартаменты.

— Хочаш жыць — няма чаго агіляцца, змагайся! — адказаў я з палёгкай.

— Я гэтую фразу ў другім варыянце чуў.— Султан зачыніў дзверы.— Хочаш жыць — умей круціцца. І я ўжо разам з вамі пачынаю круціцца. Небяспечная гэта рэч — жыць у Саюзе. Піць-курыць навучылі, дзяўчатак мяняць... таксама. Цяпер вось з табою, за кампанію, магу заляцець. У інтэрнат без запісу ў журнале праскочыў? Так? Гэта ж страшэннае парушэнне. Страшэннае! Хоць мне дык што? Будуць прэтэнзіі — сабраў чамаданы і махнуў на ўсе чатыры бакі. Вольны чалавек! Сёння тут — заўтра там. Не падабаецца ці яшчэ якія пытанні — змяніў абставіны, і ўсе праблемы. Глядзі, колькі вы сацыялістычных рэжымаў накляпалі... А вось для цябе гэтыя самыя праблемы так проста не развязваюцца. Праўду кажу?

— Ды няўжо ж! — Згадзіўся я з невясёлымі, але цалкам аб'ектыўнымі высновамі і, разледзеўшыся, прысеў ля акна.

Хоць непрыемна мне было слухаць Султанавы словы, ды на сэрцы пасля таго, як пстрыкнуў за мной замок, палягчэла. Але выявілася, што расслабіўся зарана.

— Дарэмна, хлопча, свой белы чуб з майго акна для чорных выстаўляеш,— не даў мне нахабнік перадыхнуць.

Як уджалены, я матлянуўся ў цэнтр пакоя і прыгнуўся.

— Не мітусіся, сядзь на канапу, астынь,— усміхнуўся Султан.— Сёння мянтоў пераапранутых — больш чым студэнтаў. У засадны

дзень нават я апаратурку не панёс бы. Нашто без прычыны рызыкаваць? У такую «пагоду» лепш адседзецца, перачакаць завіруху.

— Калі б можна было — не рызыкаваў бы. Што я, ненармальны, па-твойму, самому лезці ў лапы?

— Тады якія праблемы? — як бы зацікавіўся Султан.— Што здарылася?

— Ды так, нічога асаблівага,— адказаў я, сядаючы на канапу.— Тым не менш чакаць ніяк не магу. У Наташы ў пятніцу дзень нараджэння.

— Рызыкаваць праз жанчыну? — здзівіўся Султан.

Я перабіў негра:

— Гэта ў цябе — жанчыны, а ў мяне — Наташа. Адчуваеш розніцу, «май блэк фрэнд»?

Султан усміхнуўся і адказаў мне амаль міралюбна:

— Не нервуйся, ты павінен ведаць: розніцу я не толькі адчуваю, але і на ўласнай практыцы зведаў. Аднак ты не адказаў, чаго прыйшоў...

— Так, дробязь... Вось тут, на відным месцы над канапай, вісела сукеначка з шоўку, аздобленая бліскучымі каменьчыкамі. Помню, дзяўчат гіпнатызавала. А цяпер нешта яе не відаць. Дзе ж ён, убор адмысловы? Няўжо ты растаў ад чыіх палкіх вачэй і прэзентаваў сукеначку іх уладальніцы? Хоць не, што я — звар'яцеў? Такога не дараць... Значыць, прадаў? Невясёлая для мяне навіна, невясёлая...

Султан выпаліў з ходу, як пра нешта набалелае:

— Ты і праўду-такі ненармальны. Каму можна ў вас збагрыць, як вы кажаце, сукню, а папраўдзе, касцюм за 499 фунтаў стэрлінгаў? Ды вы свае «Жыгулі» танней на Захад прадаяце! Вісіць касцюмчык, у шафе месціцца, колькі ж можна пыліцца дарагой рэчы? — Нечакана шчыра, амаль жаласна ўздыхнуў: — Ты ж ведаеш, я сваёй нявесце яго прывозіў, а яе бацькі, як мяне ўбачылі...

Няўжо ж! Не заўжды, як на Дзяды! Было, было такое. Аднойчы нават таўстаскуры Султан шчаслівым закаханым прабегаў цэлы месяц. Была і ў яго свая «лав»,— успомніў я няўдалую Султанаву спробу ажаніцца. Успомніў, але не расчуліўся.

— З кім не бывае...

— Так, калі з кім — цябе не датычыць, а калі з самім табою? Ты ведаеш, пра што я... Яе бацькоў ледзь інфаркт не хапіў,— ці то з крыўдай, ці то з жалем у голасе прадоўжыў Султан.— Скажы

шчыра, ну хоць ты скажы: я сапраўды такі страшны, што самлець можна, як маці яе самлела?

— Ды лухта сабачая! — заспяшаўся я супакоіць кампаньёна.— Глянь у люстэрка! Торс — як у Апалона!

Праўда, голас мой злёгку падрыгваў, бо я трошкі хітрыў. Але таўстаскураму Султану, відаць, больш падабаўся скразны сэнс, чым падтэкст. Павесялеў, ажывіўся, нават заўсміхаўся. Заўсміхаўся... А ўсяго ж нейкіх пяць — дзесяць гадоў таму, начытаўшыся пра дзядзьку Тома і «Дзяцей капітана Гранта», слёзна наспачуваўшыся іх трагічным «сторыз», я ўявіць сабе не мог такога вясёленькага іх сваяка — негра, што гэтак сонечна ўсміхаўся мне ў твар, негра з казачна далёкай каланіяльнай Афрыкі з набітымі валютаю кішэнямі. Замілоўваліся дзядзькам Томам, асуджалі амерыканцаў за іх расізм, а самі, сутыкнуўшыся нос у нос з неадпаведнасцю прачытанага і ўбачанага, спачатку нават разгубіліся. Потым, калі ўжо мінула здранцвенне, ціха абурыліся, а ачухаўшыся — узненавідзелі гэтых самых, нібыта прыніжаных, абражаных і дыскрымінаваных, а насамрэч задаволеных жыццём адкормленых абібокаў, якім чамусьці дазволена вучыцца хачу — не хачу, канікулы праводзіць у Еўропе, а грошай мець — без ліку, дзеля чаго для іх створаны ўсе ўмовы. Выходзіць, калі ты сам прывёз што-колечы вартае з краін далёкіх і прадаў, то гэта не злачынства — і цягай-багацей да скону. А вось калі купіў у таго, хто прывёз, ды далей адправіў, з надбаўкай за страх, рызыку і шуканні, то гэта ўжо для Крымінальнага кодэкса зусім іншае, і высновы іншыя. А галоўная выснова такая: нам не дазволена нават тое, на што нашчадкам рабоў і дазволу пытаць не трэба! Чаму так? Не было ў нас на гэта адказу. І таму мы незалюбілі, як я ўжо казаў, «чорных» мацней, чым расісты з Амерыкі. Для большасці з нас, белых, яны былі на адзін твар, да таго ж не найпрывабнейшы. Помніцца, адзін мой знаёмы, прайграўшы на любоўным фронце і таму, страціўшы ўсякую паліткарэктнасць, абураўся: «Вочы-бельмы, вусны слінявыя, тоўстыя — колеру бардо і ад вуха да вуха, нос — на паўтвару, як раздушаны, на галаве нашлёпка з чорнага лямцу,— адно толькі рожак не стае! І на табе! Дзіўная істота ўсё часцей стала сустракацца на нашых вуліцах. Нібы чэрці з палескіх балотаў павылазілі! Жах, дый годзе!»

А гэты «жах» быў перада мною, усміхаўся...

— І я вырадкам сябе не лічу,— учапіўся за маю вымушаную пахвалу Султан.— Дзеўкі вашы, ты ж бачыў, так і вешаюцца, адбою няма.

Дарма ён пра нашых бедных дзяўчат. Я скрывіўся: маўляў, ведаю, хлопча мілы, чаго яны вешаюцца, за якую дробязь ты іх купляеш, губы раскапыльваць табе не варта,— але ўголас згадзіўся:

— Ды бачыў, бачыў, і не раз, як той казаў, галоўным быў сведкам. Але даволі пра гэта. Вернемся да таго, з чаго пачалі,— да сукенкі. Або да касцюма, як хочаш. Але для пачатку сёе-тое трэба ўдакладніць: «Жыгулі» задарма я нікуды не пастаўляю, здабываю «капусту» сумленна. І цяпер прынёс. Вось глядзі,— кінуў пяць стафунтавых купюр (заўважым, у нашых краях гэтыя ангельскія паперкі былі дэфіцытам і тады, і цяпер).— Досыць табе, містэр чароўны? Толькі адна маленькая ўмова: выносіш касцюм ты. Пара анучак — не «777-ы» шматкілаграмовы: за пояс, за пазуху засунеш — толькі і клопату. Гэта мяне, куды б ні сунуў, абшукаюць старанна — і знойдуць крамолу. А цябе чапаць не стануць.

Султан, убачыўшы грошы, якія лічыў ужо страчанымі, павесялеў, усміхнуўся шэра-жоўтымі зубамі і ненапружную ўмову прыняў.

Гэтак мы і прамаршыравалі паўз вахцёра (агента 006 — атрымвай, лысы мікрахабарнік, новую мянушку!), выйшлі з небяспечнай для майго здароўя зоны — інтэрната політэхнічнага інстытута. Мянтоў, ці, праўдзівей, «шэрых», на прахадной не заўважылі.

Я ўжо з палёгкаю ўздыхнуў, убачыў святло ў канцы тунеля, як раптам, амаль ужо на волі, нас раз'ядналі. А калі прасцей, мяне запынілі. Султан прайшоў спакойна, а госцю два плячыстыя, са строгімі тварамі таварышы — і адкуль толькі ўзяліся? — перагарадзілі дарогу.

— Тут жывеш? — здзекліва спытаўся адзін з іх, а другі адразу схапіў мяне за рукаво на выпадак, калі я паспрабую ўцякаць.

Не паспеў я нічога сказаць, адказаць на пытанне, нібы і не самае цяжкае. Не змог вось так адразу, з лёту, зноў у сітуацыю ўлучыцца. Усяго секунду назад расслабіўся, змяніў дух і не быў — фізічна не быў гатовы адказаць і на ўсякае іншае, яшчэ прасцейшае пытанне, напрыклад, як зваць хлапчыну — мяне, не каго іншага. Таварышы тармазнулі не толькі маё цела, але і свядомасць. Лёгка тармазнуць чалавечка, з маленства агаломшанага крыклівымі лозунгамі ды казачнымі тэорыямі. Куды складаней, як высветлілася, спыніць нашчадка тых, каго гандляры рабамі гадоў дзвесце назад шыфравалі як чорнае дрэва. «Дрэва» аказалася моцным.

— Тут! — больш чым упэўнена заявіў Султан і ўсім сваім атлетычным корпусам стаў паміж мною і цікаўнымі хлопцамі.— Са мною! — І, зрабіўшы прыкметную паўзу, дабіў іх, няўсмеш-

лівых: — Пляменнікам пасла Сацыялістычнай Рэспублікі Гвінея! А вы супраць таго, каб мы, белы і чорны, пад адным дахам жылі? Супраць роўнасці і братэрства ўсіх народаў?

Супраць пляменніка пасла, а тым больш роўнасці і братэрства народаў вартавыя сацыялістычнай маралі і парадку нічога не мелі. Мелі супраць мяне, аднак гэтую сваю думку-прыдумку павінны былі пакінуць сабе.

І мы пайшлі далей — міма сталовай, да выхаду са студэнцкага гарадка.

— А калі пацікавяцца і высветляць, што ты жывеш адзін? — пасмялеў я, выйшаўшы на вуліцу і ўбачыўшы жаданы аўтобус.

— Нічога страшнага. Па дакументах я жыву з двума студэнтамі з вашых. Але каб перад вачыма не мітусіліся і ў чужыя справы насоў не сунулі, аплачваю ім асобную кватэру. І хлопцам даспадобы жыць самастойна, і мне добра. А калі пачнуць глыбока капаць — дарэчы, як я нюансы вашае мовы за пяць гадоў вывучыў? — хлопцаў і ў інтэрнат вярнуць нядоўга.

— Усё ж давай я касцюмец забяру ў цябе ў аўтобусе. На ўсякі пажарны.

— Ах, як дзяржава родная сваіх жа грамадзян застрашыла! — паківаў галавою Султан.— Не ўкрадзеную, а купленую рэч чалавек баіцца ў рукі ўзяць, быццам страціць іх баіцца...

«У нас не сярэднявечная Англія і не Арабскія Эміраты мінулага стагоддзя — рук не адсякаюць. А вось галаву за парушэнне правілаў валютных аперацый могуць адцяць»,— падумаў я, але кампаньёну нічога не сказаў. Хіба жыхар вольнай Гвінеі мяне зразумее?

Так, моўчкі, і развіталіся. У аўтобусе Султан сунуў мне за пазуху шаўковы камплект, буркнуў: «Удачы!» — і на наступным прыпынку выскачыў. Не, не на наступным — я папрасіў яго праехаць яшчэ адзін — на той жа пажарны выпадак. Перастрахоўка ў нашай небяспечнай справе — адна са складнікаў поспеху, ну ды пра гэта я ўжо, здаецца, казаў.

## VI

Я ўпершыню дарыў Наташы такую дарагую рэч і, вядома ж, хваляваўся. Сэрца збівалася з рытму: а раптам, выклаўшы паўтысячы фунтаў, не дагаджу? Раптам колер не той ці фасон не такі? А калі,

што найгорш,— памер не падыдзе? Прымяркоўваў на вока, але меркаванне — не меранне. Урэшце, раптам проста не пад настрой заяўлюся?

Аднак хваляваўся я дарма. У Наташы, калі яна ўбачыла серабрыста-блакітны камплект, зроблены на недасяжным для нас туманным Альбіёне, у старой добрай Англіі (мы любілі гэтую краіну-востраў завочна, па кнігах яе пісьменнікаў), так загарэліся вялікія карыя вочы, такім невераеодным шчасцем засвяціўся яе мілы тварык, што я думаў — памру ад разрыву сэрца.

Наташа абняла мяне і — ад чаго я й зусім страціў галаву — заплакала. Яна ведала, якой цаною дастаецца такое хараство,— ведала і забараняла мне выпрабоўваць свой лёс.

Я лёгка прытуліў каханую да сябе:

— Мая бедная... маленькая...

Наташыны слёзы капалі мне на грудзі. Гарачыя, дарагія мне слёзы. Нельга, няможна прымушаць яе плакаць. Ды што я магу зрабіць, калі Найвышні не даў змогі мне выбіраць? Зрэшты, выбар быў, але які?! Рызыкаваць, ісці па вастрыі нажа і думаць, што ты рухаешся ў шуканні лепшага жыцця, або да смерці чакаць на чужым прыпынку чужога аўтобуса? Да самай смерці чакаць...

Я не хачу прачакаць жыццё! Не хачу!

Я абдымаў Наташу, цешыўся цяплом яе цела, слодыччу далікатных вуснаў. За гэта можна ўсё аддаць! Нават само жыццё!

Я быў шчаслівы. Я зразумеў галоўнае, і ні пры чым тут праклятыя грошы і бясконцыя гонкі! Я зразумеў праўду. У мяне ёсць за каго аддаць жыццё! Я зразумеў, што гатовы памерці за ўсмешку каханай! Шчасце — вось найвышэйшае прызначэнне чалавека!

За Наташынай спінай пад гадзіннікам я ўбачыў адрыўны каляндар. Машынальна зірнуў, прачытаў на ім: 1984, 8 лютага. Ну вось, учора лісток забыў адарваць... Гэтаксама машынальна адзначыў сабе: «Запомні гэты дзень. Дзень, калі ты зразумеў нешта вельмі важнае. Можа быць, найважнае для цябе».

Недзе паблізу паставілі на ўсю магутнасць родны «шарп», ці што — даляцела: «...пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Генеральны сакратар Камуністычнай партыі Савецкага Саюза Юрый Уладзіміравіч Андропаў».

«Адышоў, карміцель. Чарговы правадыр Краіны Дэфіцыту,— падумаў амаль што абыякава. Знячэўку прамільгнула: — А можа, апошні? Апошні правадыр і першы ваяр невідочнага фронту?»

І яшчэ нейкая думка прабегла ў падсвядомасці, але чамусьці не пакінула следу. Непрыемная думка, трывожная. Такое засталося адчуванне. Вельмі канкрэтнае. Таму што мне і сапраўды стала халодна. Нібы мяне схапілі раптам у смяротна-ледзяныя абдымкі. І толькі праз які час тая думка-бяглянка павярнулася-варухнулася ў амаль нерухомых мазгах: «Калі-небудзь памрэм-адыдзем і мы, зусім іншыя ваяры зусім іншага невідочнага фронту».

Тады я не думаў, што гэта здарыцца так скора.

## Усход – штука тонкая

### I

У далёкія васьмідзесятыя мінулага стагоддзя трон Галоўнага Стырнавога бязмежна ганарлівай Краіны Саветаў, тады яшчэ непадзельнай, заняў, урэшце, гэбіст, найінтэлектуальнейшы за ўсю лубянкаўскую гісторыю. І я дапяў: надышоў час адпачыць ад мясцін спазнаных. Дапяў, бо ўразумеў: хадзіць-дыхаць свежым паветрам па роднай зямельцы цяпер небяспечна. Памагатыя Галоўнага інтэлектуала могуць спорна даць па шапцы і не на жарт сапсаваць не толькі настрой, але і скурнае покрыва з фрызурай.

— А што гэта вы, добры чалавек, удзень і не на рабоце? — спытаюць.— Га?! Другая змена? Які ж вы гаварун, жартаўнік і адважны ўваднsocчасce! Дзівосненькае спалучэнне! Усё як мае быць! Ану, пройдзем! Дазвольце ж вас за ш-шкірку! Даз-з-в-о-о-льце! Будзе ў цябе, разумнік, і другая змена, і трэцяя, і чацвёртая з коптарам, і пятая праклятая! Усё будзе!

Усяго мне не трэба было, усім можна толькі задавіцца. А таму ў роспачы надумаў я пакінуць на які час прасторы маёй невялікай, але вельмі любай Бацькаўшчыны. Наважыўся палавіць рыбку ў мутнай вадзіцы Каракумскай пяскаватай невядомасці. Нечакана паўстаць перад панамі экс-басмачамі з забароненай камерцыйнай прапановай: купіць у шчырых хлопцаў, ад белага спякотнага сонца разамлелых, не раскошу, а сродак руху (як пераконвалі нас, хітруючы, класікі) — саўковы «Mersedes», «Volvo», «Ford» і тачанку разам. А менавіта: нязбыўную мару сумленнага савецкага чалавека — аўтамабіль, мабыць, і нездарма ахрышчаны татарскім словам «Жыгулі».

Адзін, вядома, у такое далёкае падарожжа не выправішся. Дык ідэяй вандроўкі на «Каракумскую выспу скарбаў» я падзяліўся са старэйшым таварышам па рабоце Валерыем Яфімкіным. Ён не толькі ўспрыняў сказанае блізка да сэрца, але і стаў актыўным арганізатарам каманды — збіральнікам, натхняльнікам і папулярызатарам.

— Колькі таго жыцця! Пад лежань-валун вада не цячэ! — размахваў агітатар метровымі рукамі і бліскаў дзюймовымі вачыма.— Ляцім, пакуль лепшыя тачкі не парасхапвалі! (Уласна, тады і прыйшло мне да галавы, што «тачка» — слова, мажа, скарочанае ад «тачанкі».)Вы ж ведаеце, Масква дзецям поўдня заўсёды зямных даброт больш падкідвала! — не сунімаўся аратар.— Іхным слязам яна верыць. А як жа інакш? Усход — штука, вядома, тонкая, як у тым фільме казалася, але і капрызлівая, дадам ад сябе.

Рана ці позна пасля такіх гучных слоў і зманлівых абяцанняў павінна была згуртавацца падпольная каманда ахвотнікаў рызыкнуць сваім здароўем і грашыма. Яна і зберлася. Аднак сам Валерка ў апошні момант занядужаў і ў тую дарожку не выправіўся. Так і не ўведалі мы, ці сапраўды галоўны агітатар прыхварэў, ці проста трохі астыў, пакуль іншых вучыў праўдзе-розуму. Ды хай яго Бог судзіць.

Урэшце група азіяцкага захопу сфармавалася з трох адважных гвардзейцаў.

Першым хацелася б назваць кіраўніка раённага хору — маларослага чалавечка з лысінкай, самааддана закаханага ў сваю занадта фігурыстую Рымачку. Гэта быў ціхі, на людзях і мухі не пакрыўдзіць, але ваяўнічы на кухні нацыяналіст з велізарным і неўтаймоўным жаданнем вырвацца з галечы. Як сапраўдны змагар за справядлівасць, а значыць, прыхільнік усяго экстрэмальнага, у тым ліку забароненай літаратуры, у прыватнасці самвыдату і антысавецкай замежнай фантастыкі, ён і мянушку меў адпаведную — Гары Гарысан. Для сваіх — Гарык.

Другім ахвотным праехацца ў край далёкі стаў «часовы» сусед кіраўніка раённага хору па лесвічнай пляцоўцы, прымак з разліку (прапіска плюс дармовы секс) недавучанай бульбашкі, аматар вясёлага, бесклапотнага жыцця і ўладальнік моцнага здароўя грузін Вахтанг — красунчык, росту трошкі большага за сярэдні, з пякельна-чорнымі шарлатанскімі вачыма. Фразу: «Ах, якая дупка!» — ён вымаўляў без аніякага акцэнту. Ён, супраць свайго славутага цёзкі, народнага спевака Кікабідзе, быў «вольным» мастаком і баламутам.

Укамплектоўваў бліскучую тройцу ваш пакорлівы слуга — таксама «хлопец з нашага двара» (як і сачок-агітатар пералічаных вышэй таварышаў, Валерка), даўней студэнт-спартсмен-камсамолец-выдатнік, потым — абаронца не сваёй Радзімы, а на той момант — ну што зробіш?! — звычайны, прыдушаны жыццём радыёінжынер, ды заадно — меламан, аматар вострых адчуванняў і прыгод — часцей на сваю галаву.

Натуральна ж, трэба ўспомніць і пра грашовыя запасы кожнага з урвісаў, шукальнікаў удачы.

Гарык узяў з сабою ўсё, назбіранае з Рымай за дзевяць гадоў дужа эканомнага (дзякуючы жонцы) сумеснага жыцця — дзве тысячы семсот пяцьдзесят рублёў.

Вахтангу на свой страх і рызыку даверлівая бульбашка дала на рукі «часова ўзятыя» ў любых дзядулі і бабулі (яе маці-адзіночка жыла ад зарплаты да зарплаты і нічым памагчы не магла) адну тысячу дзевяцьсот рублікаў — продкі збіралі іх чвэрць веку.

Я быў найбагацейшым з тройцы — дзевяць тысяч сапраўдных, моцных, як сталь, савецкіх рублікаў грэлі маё правае лёгкае (ляжалі ў патайной кішэньцы курткі): чатыры тысячы — сваіх (здаў у камісіёнку неймаверна цяжка прыдбаную шматблочную апаратуру: стэрэавідак, двайную дэку, цюнер, узмацняльнік, эквалайзер, прайгравальнік, калонкі) і пяць — аднакласнікавых, музыканта Юзіка Кульбіцкага. За апошнія тры гады ніводнага выходнага не правёў артыст у коле сям'і: усё па вяселлях, па вяселлях, па вяселлях, дзе, як вядома, спяваюць і скачуць. Дзякуючы «вясельнай» музыцы Юзік і збёр кругленькую суму.

— Трымай! — удэчыў мне пакет, але паставіў умову: — Да канца зімы возіш сябрука па халтурах задарма. Я толькі за бензін адказваю. Затое доўг можаш аддаць увесну.

— Згода,— узяў я грошы і ўсцешліва падумаў: «Да вясны — як да Месяца, а грошыкі — во яны, "Жыгулямі" пахнуць».

## II

Асноўную частку няблізкага шляху ад Мінска да Каракуміі праскочылі на малагабарытным «ТУ-134», што пазбіраў усе паветраныя ямы над Саюзам. Далей пайшлі бясконцыя пераезды аўтобусамі і аўтобусікамі. І вакол — пясок, пясок, пясок. Без прасвету,

паўсюль: у вопратцы, у чаравіках, на зубах, у вачах, у страўніку. А як дабраліся да патаемных мясцін казачнага пустэльнага каралеўства і абачліва разгарнулі атлас СССР, прыхоплены Гарыкам, кемлівым нацыяналістам, дык ледзь з розуму не выйшлі: яшчэ пара такіх рыўкоў-пераездаў — і Пржавальскага пераплюнем.

Спыніліся ў невялікім гарадку, цэнтры тутэйшага басмачова-чабанскага жыцця. Пасля нядоўгіх шуканняў пасяліліся ў двухпавярховай (адзінай тут) гасцініцы, некалі казарме саўкантынгента. Узялі «трайны люкс»: пра тэлефон і гарачую ваду — забыць, але чорна-белы круглавата-вуглаваты тэлевізар «Зорка», мутнаватыя, часоў галоўнага кукурузніка люстэркі і сюрпрызы-ручнікі, даўжынёй з локаць, былі. Пад канец высветлілася, што ў будынку мы былі адны. Можна жыць!

Падарожнікі-расейцы і нашчадкі таленавітага Тараса Шаўчэнкі, спрадвечныя нашы канкурэнты, больш любілі спыняцца, як мы пасля даведаліся, у прыватным сектары: і дах над галавою напалову таннейшы, і можна сталавацца нядорага. Аднаасобнікі ж бульбашы (і часамі занадта ганарлівыя — амаль фіны! — прыбалты) згодныя былі зведваць жыццёвую асалоду без улюбёных суседзяў, дый гатавацць прызвычаіліся самі.

От так і мы, хоць з нашае тройцы шукальнікаў прыгод адзін я быў бульбашом. Зрэшты, гэта не мела асаблівага значэння. Галоўнае — прыбылі мы з роднай, і тады ўжо самай савецкай, сястры-рэспублікі Бульбашыі.

Не паспелі ўвечары паходны настольнік разаслаць — адзначыць не надта хуткі прыезд, як у дзверы ціхенька пастукалі. На калектыўна-дазваляльнае «калі ласка!» у нумар зайшла моцна скроеная мадамс няпэўнага веку — тая, што забрала ў нас пашпарты на ўходзе ў «гатэль». Услед за ёй паказаўся вусаты, з усмешкаю на ўсе трыццаць два, задаволены сабою і светам джыгіт.

— Гэта Руслан, мой зяць,— назвала маладога чалавека мадамс.— На чэсць галоўнага героя вядомай казкі Пушкіна, між іншым, назвалі. Мы хоць і ў пустэльні жывём, але класіку чытаем.

Парупілася, варта адзначыць, цешча, яна ж — адміністратар гасцініцы Зульфія Зульфіяраўна, ці, як пазней скарацiў яе «каардынаты» бесклапотны Вахтанг — Зу-зу, не дарма. Цёпленькіх заезджых шукальнікаў караў[1] адразу па прыездзе, у першы ж лагодны вечар,

[1] Ад англ. *car* — машына, аўтамабіль.

маглі перахапіць і іншыя мясцовыя дылеры. Усход — штука тонкая, але, як пачыналі мы разумець, і спрытная.

— Хлопцы, думаю, прыехалі у такую далеч не на сонейку грэцца? — бліснула залатымі зубамі Зульфія Зульфіяраўна.— Як я разумею — машыны прыдбаць! Пахвальны ўчынак! І прашу паверыць: спыніўшыся ў нас, вы зрабілі вельмі ўдалы першы ход, чым моцна палегчылі сабе заданне. Русланчык за сімвалічную плату аб'ездзіць з вамі кожны двор, і я пераканана: што-колечы вартае вы абавязкова знойдзеце. Зяцёк зноў жа і старгавацца дапаможа: ён усіх ведае, яго ўсе ведаюць — якія праблемы? І не падмане з хлопцам ніхто. Цешча ж у гэтых краях не апошні чалавек.

Першым азваўся з адказам Вахтанг, які паспеў ужо акліматызавацца (меў жа дачыненні з амаль землякамі):

— Сэрцам адчуваю, добрая ты жанчына. І калі мае сябры не супраць — а яны, бачу, за,— дык дзякую — пакуль словам — за прапанову дапамагчы. Скажу больш: калі зацікаўленыя бакі, як кажуць у такіх выпадках, згодныя, з заўтрашняе раніцы і пачнём.

— Прыемна мець справу з разумнымі людзьмі,— зноў бліснула золатам Зульфія Зульфіяраўна.— Што ж, прабачце за турботы, не будзем вам больш назаляць. Да заўтра!

— Душэўна зычым адаспацца пасля цяжкай дарогі,— развітаўся і Руслан. Але перад тым, як зачыніць за сабою дзверы, удакладніў: — Калі ў дзевяць пад'еду, не разбуджу?

— Самы раз,— пагадзіўся за ўсіх Вахтанг.

## III

Мінуліся два дні, дакладней — двое сутак бесперапыннага гойсання па сядзібах, дварах, хлеўчуках, вуліцах, завулках. Вынік — нуль! Няма выніку! Траплялася то рыхтаванае-перарыхтаванае, цыравана-перацыраванае ламачча, то рухавік у кара кіпеў, як забыты на пліце імбрычак, то машына нават па пяску кацілася з такім грукатам, быццам танк, то яшчэ які невылечны дэфекцік нечакана выпаўзаў напаверх. Але рук мы не апускалі, не здаваліся, шукалі, мітусіліся, спадзяваліся. Надзея памірае апошняй. А калі яна яшчэ і адзіная...

Раніцай трэцяга дня Руслан, як заўсёды, заехаў па нас раней за дамоўлены час: перастрахоўваўся, каб які іншы мясцовы «аўтадылер»

не перахапіў выпадкам гасцей. Пачакаў, пакуль мы няспешна і сытна паснедаем (спадзеву паабедаць пры нашым цэйтноце не было), пасадзіў гасцей у сваю таратайку, вядомую сярод аўтамабільнага люду як «Запор-968, мадыфікаваны», і мы накіраваліся шукаць.

Гэтым разам, выехаўшы з гасцінічнага дворыка, аб'яднанага са школьным, поўным дзятвы, якая чамусьці больш поўзала, чым бегала, мы выправіліся ў чарговую пуцявіну – ужо не з тым радасным настроем, які адчувалі ў першыя дні.

Бянтэжыў і прычэп, які валок за сабою Русланаў «Запор». Навошта?

– Улавіў запытальныя позіркі,– заўважыў наш неспакой Руслан.– Думаеце, хачу вам «левую» машыну ўперці? Такую левую, якая на сваіх чатырох і кіламетра не пракоціцца? Памыляецеся і дарма мяне крыўдзіце. Прычына зусім іншая. Я на працу еду! Таму і прычэп спатрэбіўся. Сёння без прычэпа аніяк нельга. Чаму? Неўзабаве пабачыце. І не хвалюйцеся, калі ласка: адразу ж пасля працы дарагімі гасцямі займуся.

– Пасля працы? – перапытаў я, адчуваючы, што закіпаю.– А мы сюды, значыцца, адпачываць прыехалі? Каторы дзень марна матляемся! За ванек нас трымаеце? Думаеце, на ноч гледзячы кінемся машыны выбіраць? Папоцемку драпіну з палец можна прафуфукаць і зашмальцаваны салон за новы палічыць! І дзе, скажыце, нам цэлы дзень кукаваць, чакаючы перадавіка вытворчасці містэра Руслана?

– Цэлы дзень – гэта ў вас, у БССР, гарбацяцца гэтыя самыя перадавікі. Каб сагрэцца, бо ў вас халодна. А ў нас і без таго цёпла. За гадзінку дам рады.

«Слаўная работка,– астыў я адразу.– Гадзінку ў тыдзень? Гэта нават не камунізм, а... бяры вышэй! Нешта такое, на што і Маркс-Энгельс разам з дзядулем Леніным адказу не ведалі».

Яны – не ведалі, але наш рамізнік – ведаў!

Праз паўгадзіны мы пад'ехалі да Русланавай «працы» – будоўлі дванаццаціпавярховага, як апавяшчала выцвілая шыльда ля ўхода, Ашхабадскага сельскагаспадарчага навукова-даследчага інстытута.

«Багатыя, аднак, будаўнікі,– узважыў я колькасць прыватнага аўтатранспарту вакол недабудаванага першага паверха.– Машын у хлопцаў больш, чым на ўсёй нашай немаленькай, вельмі Камуністычнай вуліцы разам з трыма яе завулкамі».

У чым жа палягала аднагадзінная ў тыдзень постсацыялістычная праца, я ўцяміў не адразу.

У чацвяргі, як сёння, «масква» завозіла на аб'ект будаўнічыя матэрыялы. «Пяты ўжо год – неўзабаве юбілей!» – весела ўдакладніў Руслан. І як рабілі справаздачу, скажам, па цэгле, якой за пяць гадкоў было адгружана ці не на цэлы Акадэмгарадок (гэта я, як матэматык-самавук, падлічыў), мяркую, застанецца неразгаданай таямніцай савецкай гісторыі. Але фактычна, рабілася так: раз на тыдзень будматэрыялы спачатку разгружалі, а потым дзялілі (строга па чарзе і старшынстве) і развозілі для сямейных патрэб на сваіх машынах. Начальнік аб'екта падганяў не легкавік, а грузавічок. (На тое ён і начальнік, каб больш за ўсіх ад жыцця браць.) Посткамунізм, і толькі! А дакладней – рай! Ад кожнага і кожнаму – паводле жадання! І няма чаго тут нешта прыдумляць!

«Адпрацаваўшы» святую належную гадзіну, за якую Руслану дасталіся прэміяльныя ў выглядзе паддона цэглы, дэфіцытнага чэшскага блакітнага унітаза, скрынкі цвікоў, дзвюх бляшанак белай фарбы, чатырох пакункаў зваркавых электродаў, меха цэменту, замка да дзвярэй (усяго і не ўспомніш), наш кіроўца на гэты тыдзень афіцыйную працу скончыў. Завёзшы дадому няўлічаныя ані ў адным «дзяржплане» прэміяльныя (джыгіт яшчэ і зарплату атрымаў), ён ізноў прыступіў да левага прыробку – абслугі гасцей і кліентаў з далёкай Еўропы-Беларусі.

Гэтым разам мы кіраваліся да мясцовага эскулапа, аб візіце да якога наш памочнік-кіроўца дамовіўся напярэдадні.

## IV

Медыцыну ў Каракуміі за гады савецкай улады так і не ўдалося зрабіць дармовай, і Руслан дрыготкай рукою, амаль не гледзячы на дарогу, трымаючы руль адно левым каленам, ці не ў пятнаццаты раз то клаў у канверт трэцюю пяцёрку, то вымаў. Нарэшце, не вытрымаўшы, матлянуў галавой і, злосна плюнуўшы на «праклятага абдзіралу», працадзіў: «Ды хай ён задавіцца!»

З гэтае міжвольнай шчырасці я зразумеў, што каракумскаму эскулапу ўсё роўна, дзеля чаго ты да яго завітаў: лекавацца, пагаварыць душэўна ці яшчэ з нейкай рупнай прычыны. Галоўнае – ты прыйшоў, а не да цябе, ты і плаці.

4. Зак. 413

Такі вобраз доктара-крывасмока (грошыкі ж людзям крывёю дастаюцца) склаўся ў мяне, і, само сабою, ехаць да яго ахвоты не было.

А «крывасмок» быў чалавекам наўздзіў прыстойным і цывілізаваным: акуратна падстрыжаныя скроні і патыліца, бялюсенькі шаўковы халат, пах дарагога адэкалону, гаворка без азіяцкага прanонсу, які скажае словы. Праўда, доктар ветліва вітаў толькі нас. Пасля рабскага паклону і нясмелага падкладання на краёк стала канверта Руслан, заікаючыся, выціснуў:

— Гэ-эта мае госці з Беларусі.

Доктар заміж адказу пстрыкнуў двума пальцамі ў бок дзвярэй: «Пайшоў!»

І Руслан пайшоў.

«Ты глядзі, які аўтарытэтны таварыш,— падціснуў я губы.— Нават зяця мадам Зу-зу нулём лічыць! Нездарма Руслан усю дарогу калаціўся ад страху».

Пазней зразумеў: верх старэйшых над малодшымі на гэтых землях закладзены ў генах.

Застаўшыся з намі, суровы доктар умомант ператварыўся ў добрага Айбаліта і зглядзіў узніклую няёмкую сітуацыю:

— Не варта ўсё бачанае ў нашых краях блізка прымаць да сэрца. З абарыгенамі толькі гэтак і трэба абходзіцца. Інакш нельга — адразу на карак сядуць. Усход — штука тонкая і... жорсткая.— Доктар разгарнуў шматок паперы і прадоўжыў: — Хоць бы той Руслан. Дзеці пустэльні і ёсць дзеці пустэльні! Прысылае малодшага брата з запіскай. (Можа, менавіта па ёй доктар зараз пальчыкамі пастуквае?) Чытаю: «Вельмі паважаны...» (Акурат па ёй!) Так, гэта няважна... Во: «Пайшоў трэці дзень, як бульбашы прыехалі па машыны і пасяліліся ў нашай гасцініцы. Я, само сабою, узяўся дапамагчы, а тут, як на ліха, перад Новым годам усе распрадаліся. Вы ж ведаеце, у студзені новая партыя чакаецца... А я пра яе зусім забыўся. І вось вынік. Што рабіць? Дапамажыце...»

Доктар падняў на нас добрыя, поўныя прыязнасці вочы і спытаў:

— Зразумела, шаноўныя госці, пра што Руслан турбуецца? Тады — едзем далей. Просьбу хлопца я без увагі не пакінуў. Хоць вы, пэўна што, і спытаеце, дзеля чаго паважанаму доктару, для тутэйшага люду чалавеку амаль што святому, дапамагаць нейкім прыезджым беларусам? З якое такое прычыны? На гэтае пытанне з ходу і не адкажаш. Прапаную, сябры, прайсці ў дворык пад навес

і там, дзе не так задушліва — чуеце, ветрык пагульвае? — папіць гарбаткі, а заадно і пагаварыць.

Не ведаю, як Вахтанг і Гарык, а я пачаў прыслухоўвацца да доктаравых слоў. І праўда ж, што яму да нас, прыхадняў з іншага свету? І чаму ён сказаў не проста пра нейкіх прыезджых, а — прыезджых беларусаў? За гэтым нешта ёсць?

Мы прайшлі ў нутраны дворык, селі, падкурчыўшы пад сябе ногі, на спецыяльным узвышшы пад стрэшкай, што бараніла ад нясцерпнага сонца (у нас бы — перш-наперш ад дажджу), за шчодра застаўленым усходнімі ласункамі нізкім столікам — дастарханам. Гаспадар наліў зялёнай гарбаты. З апетытам сёрбаючы яе з кубачка тонкага, лічы празрыстага, фарфору, гасцінны «крывасмок» несупынна гаварыў, гледзячы на мяне і нібыта адказваючы акурат мне на тыя зусім невыпадковыя пытанні:

— З нейкага часу, сябры, лічу беларусаў сваімі братамі,— пачаў аповед доктар, калі мы трошкі асвойталіся за імправізаваным застоллем.— Думаю, пасля таго як раскажу, вы зразумееце чаму. Пачну здалёк. Паходжу я са старадаўнага і шаноўнага роду. І род мой нікому і ніколі не быў вінен. А на мне раптам, з незалежных ад мяне прычынаў, павіс і дагэтуль вісіць адзін даўжок. І не здзіўляйцеся — менавіта перад беларусамі. Даўно ўжо вісіць, а вярнуць яго не выходзіць: беларусы за маёй тут бытнасцю яшчэ ні разу да нашых мясцін не дабіраліся. А рэч вось у чым. Калі я паступіў у Маскоўскі 1-ы медычны інстытут, мне ўпярод было вельмі цяжка вучыцца: залічалі ж нашага брата, сярэднеазіята, само сабою, за грошы, а засвойваць курс даводзілася «сумленна» — самі разумееце, усіх не купіш! Думаў, капцы мне. Свяціла адно — вяртацца ў аул, бараноў пасвіць ды авечак стрыгчы.

Доктар памаўчаў, звесіўшы галаў, быццам страшэнна засмучаны чалавек. Потым схамянуўся, скінуў з сябе горкую безнадзейную асуджанасць, сонечна ўсміхнуўся:

— Ды знайшоўся адзін чалавек, узяў мяне на буксір, пацягнуў за сабой, і мы — паехалі. Пазней, калі я ўвайшоў у «працэс», у рытм, стаў рыхтавацца самастойна і неўпрыкмет нават захапіўся навукай.

Зноў свідруючы вострымі чорнымі вачыма акурат мяне, доктар сказануў:

— Чалавек, які ўратаваў тады сённяшняга вашага апавядальніка, быў з Беларусі, з-пад Гомеля. Ён скончыў інстытут з чырвоным

дыпломам, і пакідалі яго на кафедры вучыцца далей, у ардынатуры, але неспадзеўкі выпускнік выказаў жаданне служыць на Паўночным флоце. Бо (як ваш зямляк мне пісаў пасля з Мурманска) з дзяцінства, прачытаўшы «Дваццаць тысяч лье пад вадой» (колькі людзей гэтыя «лье» паклікалі ў дарогу!), марыў плаваць на падводнай лодцы. Ведаючы, што паводле стану здароўя ў вайсковую вучэльню не пройдзе, паступіў у медычны інстытут, спадзеючыся такім ходам праскочыць на флот. І, трэба заўважыць, ён свайго дамогся: лучыў на падводную лодку. Лучыў на сваю галаву. Яна патанула яшчэ да Маскоўскай алімпіяды. Як? Сапраўдная прычына да гэтага часу засакрэчаная.— Доктар зноў замаркоціўся, уздыхнуў: — Такая вось невясёлая гісторыя. Ды нічога не вернеш.— І яшчэ тужлівей дадаў: — Гэтак я і не адплаціў свайму беларусу дабром за дабро. Цяпер трэба сплачваць доўг беларусам наагул. Яго землякам.

Расчуліў мяне ды, пэўна што, і Вахтанга з Гарыкам доктараў аповед. Уражваў трагічны лёс безыменнага земляка. На нейкі час нават прыцьмела ўсведамленне таго, дзеля чаго я тут з кампанейцамі.

Але доктар нечакана, амаль без паўзы, вярнуў нас, кажучы сённяшняю моваю, да парадку дня:

— Цяпер успомнім мэту вашага прыезду. Хацелася б адразу ўдакладніць: не проста ад шкодлівасці не можа Руслан знайсці вам машыны. Апошнім часам з усяго Саюза кінуліся ў нашу глуш аўташукальнікі і падчысцілі тутэйшыя засекі грунтоўна. Але для беларусаў, абяцаю, нешта знойдзем. Дарэчы, пакуль не забыўся. Раю не толькі на машыны паляваць, але і да мясцовых крам і крамак прыгледзецца. Актыўная Каракумская мытня закідала іх заморскім таварчыкам пад самую столь. Калі мяне па размеркаванні загналі ў гэтую глушэчу, я гады тры запрашаў сяброў-аднакурснікаў прыехаць адпачыць, а заадно і набыць абноўкі па смешных цэнах...

Крамкамі з заморскім таварчыкам доктар зноў адвёў нас ад галоўнага. І гарбатка зялёная — добра, і зычлівая ўсмешка — добра, але пара б ужо і да справы. І калі доктар сказаў: «А зараз...» — мы замерлі ў чаканні. Выявілася — заўчасна.

— А зараз лічу патрэбным сцісла ўвесці вас у курс мясцовых звычаяў і ладу жыцця,— прадоўжыў «крывасмок» (зноў успомнілася забытае было слова).— Яны досыць дзіўныя і гэтым цікавыя. Але спачатку прапаную напоўніць кубачкі. Бачу, вам не надта даспадо-

бы зялёная гарбата? Не праблема, памяняем на чорную. Але ўсё ж хачу параіць: пастарайцеся прывучыць сябе піць і зялёную. Хоць бы чаргаваць яе з чорнай. Вынік не задоўжыцца. Праўда, самі вы гэтага, можа, адразу і не адчуеце. Першай адчуе жонка...

Пакуль мы ўсміхаліся з доктаравага, можна сказаць, чыста інтэлігенцкага, жарту, падалі чорную гарбату. Урэшце мы не надта і прагнулі яе, але ўжо, за дзень-другі, зразумелі: гарбата тут не пітво, а перадусім баўленне часу. І нават нешта большае. Як у нас не робяцца справы без «моцных напояў», тут — без гарбаты. Разумеючы тое, мы таксама — услед за гаспадаром — дружна ўзяліся за кубачкі.

— Дык пра тутэйшыя звычаі,— працягваў тым часам доктар.— Паабедзенная лагоднасць дзяцей пустэльні — не мае граніцаў,— правёў рукою, нібыта акрэсліваючы небакрай. Усміхнуўся і перайшоў на пафасна-жартаўлівы тон: — Прыняўшы дозу, без яе тут большасць як без паветра,— укалоўшыся ці накурыўшыся, галава сям'і як бы знікае, зліваецца са святым духам, вызваляючы гэтак патрэбную ў жытле шматдзетнай сям'і прастору. Вяртаецца ж зноў у свет жывых быццам з ніадкуль. От не было нікога на ганачку — і на табе! — ёсць! Усмешлівы вясёлы чалавечак з кубачкам зялёнага чыфірчыку сядае на ніколі не маляваны ганак, асалавела азірае родную бязмежную пустэленьку і ўцягвае першы глыток — асцярожны, нясмелы, маленькі-маленькі. За ім — другі, больш пэўны, больш жыватворны. «Ха-а-а...— выдыхае і растае нашчадак аднаго з так і недарэзаных камуністамі басмацкіх родаў.— Якшы-ы»[1]. І зноў глыток: «А-а-а...» І доўжыцца гэта да вечара...

— Вы проста паэт! — не стрымаўшыся, перабіў я доктара.— Як сакавіта працэс адыходу ў кайф апісалі! І праўда, райскае жыццё зладзілі для некаторых не вельмі свядомых народаў кіраўнікі роднай камуністычнай партыі і шаноўнага савецкага ўрада. А як бульбаш ці хахол, дык — да станка яго, гада, да станка! І за тры капейкі ў дзень, за тры капейкі! Як паўднёва-ўсходні таварыш-сусед, нашчадак варвара Чынгісхана, дык — на яму, родненькаму, чыфірчыку, на! Хай прахалоджваецца-адпачывае! Толькі б не чапаў той станок: загубіць жа...

На здзіўленне (і дзякаваць Богу!), доктар не пакрыўдзіўся, наадварот, падтрымаў мяне:

[1] Добра-а-а... *(узб.)*

— Цалкам з вамі згодны! Але... Але пра гэта, думаю, мы яшчэ пагамонім. Пазней...— І нарэшце-такі, зусім знячэўку, прамовіў: — Цяпер вернемся да вашага клопату. Я аддаю вам выдзеленую мне Мінздравам машыну. Не-не, не махайце рукамі! Вы не так зразумелі. Я аддаю вам не машыну, а — чаргу на яе. На жаль, не маю змогі за вас яе аплаціць, самі бачыце — будуюся, другі паверх нават не скончаны, але, як кажуць, чым багаты — памагу: тысяча-другая заўсёды знойдзецца.

...Сустрэча з «беларускім даўжнікам» у пясках Каракуміі — ці не найважнейшая частка нашай адысеі. Калі б не доктар і не яго шляхетны ўчынак, адплата доўгу заўчасна загінуламу сябру, дык што было б далей? А нічога! «Фініта ля камедыя!» Цалкам магло б здарыцца так, што вярнуліся б мы з пяскоў сыпучых наагул без караў. А хіба што — з пяском: у кішэнях, як ужо гаварылася. І на зубах. Таму доктару — доктарава! Тым больш што скончыў ён якраз, яшчэ раз падкрэслю, словамі, якіх больш за ўсё прагла душа мая, як і душы маіх сяброў-спадарожнікаў:

— Так што, калі не пярэчыце, прапаную праехацца ў аўтамагазін. Нас там ужо чакаюць.

## V

У паўтаралітровую, малочнага колеру «пяцёрку» я ўлюбіўся адразу. Грошай на дзяржцану (за парогам магазіна машына каштавала ў два разы даражэй) было досыць, і доктару раскашэльвацца не давялося. Праўда, ад куплі і далейшай прэзентацыі яркіх югаслаўскіх чахлоў я «даўжніка беларусаў» не ўтрымаў.

Адным словам, засталося здабыць машыны Гарыку і Вахтангу. Тут зноў паспрыяў доктар. Выправіў хлопцаў з пісулькай да бальнічнага заўгаса. Той, прачытаўшы ліст, пачухаў нязоленую патыліцу, але ўсё ж выкаціў з гаража дагледжаную «капеечку», колеру морскай хвалі — казачна далёкай адсюль.

Машына ўпадабалася Гарыку з ходу. Упадабалася, а грошай не ставала: на такі варыянт мастацкі кіраўнік хору, а заадно дысідэнт і заняты «антысаветчык» не разлічваў. Меркаваў купіць нешта прасцейшае, абы ехала лепш за дзедаў «Масквіч», які праз раз кудахтаў і глух — яго набылі яшчэ ў год выхаду на экраны стужкі «Пільнуйся аўтамабіля». Заўгас жа беларусам нічога не завінаваціўся, і хоць

дзеля начальніка-доктара мог істотна папусціцца з цаною, але ж не так, каб аддаваць выпешчаную красуню задарма. Потым Гарык расказваў: у той момант у яго свярбелі рукі пазваніць доктару, паспрабаваць пазычыць у «пратэжэ» забраклую суму. Але ўзважыў і намеркаваў не перагінаць кія — чалавек і так усё, што можа, для нас робіць.

Здавалася, выйсця не было. Ды нечакана на дапамогу прыйшоў Вахтанг:

— Давай, дружа, возьмем яе на дваіх, усё ж не чужыя людзі — суседзі, а дома разбярэмся, што да чаго і хто каму ды колькі вінен.

Гарык павагаўся, павагаўся: вельмі ж хацелася мець акурат асабістае аўто, але — пагадзіўся:

— Усход — штука тонкая, аднак — даражэйшая, чым доўгія языкі малолі.

Адным словам, мы не паехалі пустымі з той краіны далёкай і, як высветлілася, зусім не казачнай. Цяпер, калі мінулі гады, я разумею, што тады нам з машынамі проста пашанцавала — мы ўскочылі ў апошні вагон апошняга цягніка. Пасля нас, калі ў Каракумію хто і ездзіў па кары, дык вяртаўся зазвычай на сваіх дзвюх і з досыць тужлівай фізіяноміяй.

«Банкет з нагоды» пачаўся рана, яшчэ ўдзень. І пачаўся не ў доктара. Папрасіўшы прабачэння, што з гасцямі больш заставацца не можа, бо выклікалі ў сталіцу — як быццам нешта гаварылася пра падвышэнне,— ён перадаў нас свайму добраму сябру, дырэктару школы.

Сябра нашага сябра прапанаваў «амаль земляку» Вахтангу выбраць з самапасных бараноў найапетытнейшага, а мне — прадэгуставаць з дзесятак марак тутэйшых він. Я аддаў перавагу беламу дэсертнаму, і яго прынеслі скрынку, што вельмі здзівіла: думалася, будзем піць, як калісьці ў гасцях у Ерэване — з бочачкі.

Гатавалася ўсё ў тандыры — паўтараметровай печы, якая нагадвала ў анфас падкову — проста на нашых вачах, і вострыя слінагонныя пахі туманілі нязвыклую да іх свядомасць.

Галоўны настаўнік, вядома ж, заўважыў гэты нонсенс, і яшчэ задоўга да духавой бараніны нам прапанавалі развеяць туман бакалам маладога віна. Яго прынесла гаспадыня, якая так і не села з намі за стол.

Усход — штука тонкая, але — не жаночая.

Не прамінула і гадзіны, як шашлыкі і манты пачалі знікаць са стала бы ў фокусніка. Шчыра прызнаюся: ніколі, ні раней, ні пазней, я не еў нічога так фантастычна смачнага. Ні ў хітраванаўпалякаў, ні ў працаголікаў-скандынаваў, ні ў вечна бесклапотных баварцаў, ні ў адлучаных ад свету таежных сібірскіх паляўнічых, ні ў бандзюкаватых гаспадароў Уладзівастока, ні ў падманліва марудлівых арабаў... Віно падагравала кроў, але зусім інакш, чым тое, што прадаецца ў нашых мясцінах. Не так хмяліла, як весяліла, бадзёрыла, дадавала моцы. Хацелася жыць, жыць і жыць! Доўга і шчасліва. І каб усе былі шчаслівыя! Усе і заўсёды!

Раніцай падняліся з надзіва свежымі галовамі — во напоі і закусачка каракумская! — і, нават спехам не паснедаўшы, пачалі збірацца ў дарогу. У гасцях — добра, але ж калі-колечы і дома трэба быць.

Аднадушна пагадзіліся (як цяпер разумею, дарма), што больш спрактыкаваны кіроўца Гарык паедзе адзін і за намі, а я і Вахтанг, як свежыя выпускнікі шафёрскіх курсаў, паціху рушым наперадзе, падмяняючы адзін аднаго за рулём.

У такой паслядоўнасці нас і праводзіў галоўны школьны настаўнік.

«Дырэктар — прануза і разумнік,— адзначыў я, сядаючы ў машыну.— А дзятва, якую ён вучыць граматы,— ледзь жывая. Ад спякоты, пэўна што».

Ужо ў дарозе прыйшло да галавы яшчэ адно назіранне: «У Каракуміі, каб быць Паважаным Чалавекам, досыць вывучыцца і не глытаць наркаты штогадзінна. У нас — паўкраіны з дыпломамі, і шпрыца ніколі ў руках не трымалі, а Паважаных — адзінкі».

## VI

Неабсяжную пустэльню разрэзала роўная і вузкая, як між польскімі мястэчкамі, паласа асфальту. І на гэтай «вузкакалейцы» вёрст так праз пяцьдзесят, а можа, і праз сто расстаўлены сабачыя будкі. Зрэшты, не зусім сабачыя, хутчэй — тэлефонныя, у якіх усё роўна сядзяць сабакі, гэта значыць — даішнікі, што для многіх не тутэйшых — тое самае.

Пустэльня і ёсць пустэльня — ніводнай лішняй малекулы! — і будку відаць, нібы на далоні. І вы, як чалавек-нядурань — а не

дурань, калі машыну купілі, ды яшчэ на гэтым пры паўрабаўласніцкім ладзе зарабіць далі рады,— узіраецеся ў сціплы прыборны шчыток (Ура, Італія! Год шэсцьдзесят сёмы!) і з палёгкаю выдыхаеце: едзеце, не дазволеныя семдзесят, а ціхія пяцьдзесят пяць — цудоўненька! Далей папраўляеце рэмень бяспекі: як ён? Зашпілены? Нармалёва! Што яшчэ не так? Ручнік? Не, ручнік правяраў перад выездам — трымае. Пра што мог забыцца? От чорт,— аптэчка! Не, не чорт: каб доктар і без аптэчкі? Так не бывае. Ёсць аптэчка! Якія яшчэ могуць узнікнуць пытанні? Алкаголь? Пілі ўчора. Па тройцы дэсертнага на брата — хіба гэта піццё? У дадатак замест сняданка прынялі па літру малачка казінага — страўнікі прачысцілі. Забыць! У хлопца ў фуражцы, калі спыніць, нумар з алкаголем таксама не пройдзе. Бадай што ўсё. Рулюем, усміхаемся, не хвалюемся. «800 метраў да паста ДАІ», «400». Дзе гэта яны стольк і дарожных знакаў у пустэльні пазнаходзілі? І чаму дагэтуль па хатах не разнеслі? Дзівосы. Нязвыкла як для тутэйшай публікі.

Вылазіць таварышок, вылазіць любка. А то б не вылез! Яму ж з будкі далей відаць, чым мне з кабінкі «жыгулька».

«Да ўзбочыны, да ўзбочыны»,— паказвае паласатай палкаю дарожны начальнік, і я выконваю каманду. У мяне ж усё о'кей, якія праблемы?

— Дарагі госць нашага сонечнага краю! — агаломшыў, быццам улез мне ў грудзі і ўхапіў за сэрца дарожны дазорца і, здаецца, ілюзіяніст плюс казачнік.— Велікадушна прашу прабачыць, што перапыніў ваша такое чаканае вяртанне на бацькаўшчыну.— Выйшла рука з маіх грудзей.— Ці не жадаеце прайсці ў мае апартаменты? Будзеце прыемна здзіўлены!

Гэта ўжо чыста перабор! Якая гаворка! Якія манеры! Добра, хай сабе доктар у Маскоўскім 1-м медычным вучыўся — шэсць гадоў мазгі сушыў. Руслан — ад цешчы, вялікай паклонніцы Пушкіна і, заўважым, выпускніцы наргаса, куды простага смяротнага і з круглымі пяцёркамі ў атэстаце не возьмуць, нахапаўся. Але — дарожны мент? Дзівосы! Шахеразада, дый толькі.

Мент, чакаючы, усміхнуўся, і трэба было нешта адказваць.

— Пытанне рытарычнае. Хвілінку, прыхаплю дакументы.

— Не трэба ніякіх дакументаў! І так бачу: добры чалавек за рулём. А таварыш ваш, здаецца, з сонечных краёў родам?

Вахтанг неяк неактыўна пацвердзіў здагадку і нават вяла павітаўся, але з машыны не вылез. Жыхары поўдня чамусьці ўсе адзін

да аднаго пры жыхарах поўначы нераўнадушныя. Зрэшты, яго ніхто і не чапаў. Я рушыў да «апартаментаў». Трэба было зайсці ў будку і як мага даўжэй адцягнуць увагу даішніка. Тады ў Гарыка, які прытармазіў непадалёк, з'явіўся б шанец праскочыць без дагляду.

— Прашу! — адчыніў перада мною дзверы старшы лейтэнант.— Усход — штука тонкая і... гасцінная! Не чакалі?

Я прыціх. Ніжняя, закрытая частка будкі была абвешаная шыкоўнымі імпартнымі жаночымі касцюмамі — з тых, што называюцца «на выхад». У такіх апратках і па вечаровых Канах можна пашпацыраваць! І сапраўды — не мент, а ілюзіяніст!

— Ангельскія рэчы! Не якое там «шыла» мэйд ін Турцыя! — ажыў старлей, злавіўшы мой заблішчэлы позірк.— Выбіраем каханай жанчыне падарунак. Машына — гаспадару, суперубор — яго красуні! Усе радыя, задаволеныя і шчаслівыя! Поўны, удакладню, камплект! І аддаецца ўсё за траціну цаны, бо таварчык на рэалізацыю брат з мытнага канфіскату перадаў. (Гасцям прызнавацца можна!) А дасць Бог, пасябруем-парахуемся, дык і на карце пакажу, як пасты з нашымі хлопцамі да самага Краснаводска аб'ехаць. Бачыў у вас атлас аўтадарог! Зловяць — навучу, якія байкі для адбіўкі расказваць.

Сукенкі былі дзівосныя. Але нават за траціну цаны грошай было толькі на адну. Затое найлепшую! Цікава, дарэчы, для якой-такой тутэйшай цемнаскурай красуні кантрабандыст супердарагую Шанель валок? Цяпер усё, фініш, аніякіх дарожных купляў. Грошай ледзь-ледзь, нават на бензін.

— Трымайцеся, бульбашы! — зычыў нам бізнесмен-даішнік, калі мы зноў рушылі ў дарогу.

Доўга не мог я забыцца пра безыменнага кантрабандыста, вылаўленага братам даішніка. Хацеў хлапчына падзарабіць, нечага дасягнуць у гэтым жыцці беспрасветным, а цяпер — што? Цяпер косці на нарах пар і плач, успамінай дзянькі вясёлыя. Што зробіш — суадносіны «рызыка — прыбытак» кожны выбірае сам, згодна з сваімі здольнасцямі. Я яшчэ не ведаў, што неўзабаве гэтыя суадносіны і мне давядзецца выбіраць.

Запомніўся і старлей-даішнік, што даў мне на знак удзячнасці за куплю нечаканы прэзент — жаночыя лайкавыя пальчаткі. («У нас усё роўна не спатрэбяцца».) І слова ён датрымаў: намаляваў на атласе, як аб'ехаць сяброў дарожных. А дзе нельга, навучыў што казаць, якія байкі баяць.

Ну й браткі! Не працаўнікі пільнай сферы, а адладжаны мытна-даішны тандэмчык бізнесоўцаў: першы рабуе прыезных, другі — танна збывае нарабаванае ад'язным ды яшчэ падказвае выйсце з пескавога лабірынта.

І, варта адзначыць, апошняе было даражэй за ўсё, бо, лічы без збояў, да надыходу цемры мы знайшлі аўтапляцоўку парома «Краснаводск — Баку», на ім мы мусілі пераплыць Каспій.

Праўда, ізноў без ускладненняў не абышлося.

На пароме два жвавыя і страшэнна ўпартыя азербайджанцы-карцёжнікі з усяго народу чамусьці мяне выбралі ў напарнікі для сваіх несумленных гульняў. Ці то ім не спадабаўся «колер» маіх валасоў, выгаралы да бледна-жоўтага, ці то іх нерваваў мой твар, падсмажаны каракумскім сонцам, як і ўва ўсіх «паўночнікаў». Фініш гульні, трэба было чакаць, атрымаўся скандальны, з бойкай, і калі б у час не вынырнуў Гарык, які, на шчасце, няблага ведаў «арабскую», а значыць, мог паразумецца з імі,— дык невядомаму мінскаму радыёінжынеру і меламану ў адной асобе маглі б кранты прыйсці: карцёжнікі ўжо нажы падаставалі.

Нацыяналіст Гарык пытанне, як кажуць, закрыў, але больш ад мяне не адыходзіў. Пэўна што, адчуваў: яшчэ не ўсе свае думкі і не з усёй пяшчотаю я выказаў шулерам. Добра адчуваў.

Потым ён мне патлумачыў, як супакоіў карцёжнікаў: «Грошы ў хлопца даішнікі вытраслі, таму марна з жабраком час марнуеце. Яшчэ не позна знайсці і абуць сапраўды ўпакаванага лоха». Тады ж і прызнаўся Гарык, што прапанаваўшы гэта, ён паказаў на Вахтанга, які стаяў побач.

Я аслупянеў: чаму ён так зрабіў? Якраз Вахтанг падаў яму руку помачы, без чаго не пёр бы цяпер аматар фантастыкі ў сваёй, хай сабе і на двух купленай, тачцы. Дый абодва — паўднёвыя, скажам так, браты. Тут і праўда задумаешся: усход — штука тонкая!

Зрэшты, Гарык ведаў, што рабіў: з плячыстым Вахтангам лёс-удачу карцёжнікі выпрабоўваць не сталі.

## VII

Суша сустрэла нас танкамі, перакрытымі дарогамі, зачыненымі крамамі і бесперапыннымі праверкамі дакументаў. Нейкі рызыкоўны мясцовы афіцэр спрабаваў зваліць бакінскую ўладу, ушчэнт

карумпаваную, як ён лічыў. Ды нумар у порсткага не прайшоў. Партмафія — неўміручая!

Гадзіны тры мы прабіраліся праз кардоны, пасты і шлагбаумы, але яны надараліся ўсё радзей і радзей, пакуль зусім не зніклі.

Выявілася, мы ўжо заехалі ў Дагестан — краіну Расула Гамзатава, здаровага паветра, спакойных, але непрадказальных барадатых мужчын, невыразных жанчын і па-мурашынаму мітуслівых, супраць каракумскіх — можа, галодных? — дзяцей. Найспакайнейшы, як мне тады падалося, край. Заказвай, выбірай, плаці і пры далей. Бай-бай.

Дэрбент, Ізбербаш, Махачкала, Хасаў'юрт — усё на адным уздыху.

Прамчаўшы без прыпынкаў па найспакайнейшым краі да Стаўраполля — Чэчню з яе яшчэ нягрозным Грозным у спешцы не заўважылі,— падумалі, што досыць тых бегаў. Пара прытармазіць, заправіць машыны і здаволіць галодныя страўнікі. Прышвартаваліся ля запраўкі-забягалаўкі. Запоўнілі бакі і завіхнуліся былі выпрабаваць арганізмы падазронай прыдарожнай ежай, але не даелі. Таварышы-бандыты з вялікай дарогі, якія пазней перабудуюцца ў больш культурных, але не менш нервовых рэкеціраў, ужо наладзілі кантроль за аўтаперагоннікамі, і заставалася найлягчэйшае — здымаць «капусту».

Найлягчэйшае? Каб жа! Паспрабуй паспей за ўсімі, прасачы, не празяп якога хітразадага! Нас, от — прасалапячылі, калі трэслі разамлелых ад шчасця ленінградцаў — хлопцы адхапілі недзе чорную «дваццацьчацвёрку»!

Далей — у Паўночнай Асеціі і Кабардзіна-Балкарыі — мы, на ўсякі пажарны, амаль што не спыняліся, рулілі без перадыху. Здаліся толькі на запраўцы ў нейкай несусветнай глушэчы, аж за Мінеральнымі Водамі, дзе не было і знаку, не тое што рэкеціраў, наагул — жытла.

Смуглая, чарнавокая харашуха-запраўніца, на выгляд і з апраткі відочна старшакласніца, прапанавала-прамуркала зазірнуць на агоньчык у пакой адпачынку і, як я здагадаўся,— кахання. Пушок над яе ярка-пунсовымі ад прыроды вуснамі, якія, здаецца, яшчэ не ведалі памады, ад хвалявання злёгку пакрыўся потам. І з якое гэта прычыны дзеўчына ў краях гарных мужыкоў-казакоў галодная ходзіць ды наважылася на прыдарожны флірт — як кажуць, досыць небяспечны? Хіба я адзін, такі герой, па дарозе хуткасці перамыкаю? Наўрад.

— Паспрабаваў бы перш! — падвысіла голас недарослая красуня, калі зразумела, што госць не зазірне на агоньчык.

Але я задушыў у сабе небяспечнае жаданне, не рызыкнуў здароўем. І, бог ведае, чым яшчэ.

Такія прапановы — перадыхнуць і расслабіцца, гучалі з вуснаў дарожных каралеў і Краснадарскага краю, і Растоўскай вобласці, і па ўсім поўдні Украіны, аж да самай яе слаўнай сталіцы.

## VIII

За Кіевам наваліўся несусветны туман. У такое мроіва я лучыў упершыню. Дарогі за два крокі не відаць.

Упарты грузін спрабаваў ехаць кіламетраў дзесяць у гадзіну, пакуль ледзь не пацалаваўся з шыкоўным дубам, у тры абдоймы. Спыніліся перачакаць. Так бы, напэўна, і адпачывалі невядома колькі часу, калі б раптам, нібы на самалёце, паўз нас не пранёсся нейкі вар'ят. Заведзены гэтым выбрыкам дзівака, Вахтанг, не раздумваючы, ірвануў за ім.

— Гулу смаленую, мяне за так не возьмеш! — лямантаваў пачапаеўску.

Мёртвай кусай Вахтанг учапіўся за бампер машыны невядомага адважнага, якая ляцела наперадзе. Так да Казельцаў на халяўку і дабраліся.

На ўказальніку «Нежын» наш вядоўца збочыў направа і прытармазіў.

Спыніўся і Вахтанг. Дастаў з бардачка прынагодную — даішную — пляшачку і занёс яе відушчаму павадыру. Высветлілася, што не ён быў відушчы, а ягоныя адтуманкі са ставатнымі японскімі галагенкамі.

Развіталіся пераразвонам сігналаў.

Недзе пад Чарнігавам Гарык, які ўвесь час старанна і моўчкі трымаўся ззаду, раптам рынуў наперад.

— Пайду цяпер я паравозам, стаміўся на хвасце ў салаг сядзець! Дый вы тут ужо не згубіцеся...— крыкнуў ён у прыспушчанае правае аконца іхнай з Вахтангам «сямейнай» машыны.— Заўтра ў Рымы дзень нараджэння! Абяцаў абавязкова быць! І буду!

Так і пайшоў верны муж наперад, толькі мы яго і бачылі. Спачатку, гледзячы наўслед, здзекаваліся нязлосна: ну адрывайся,

адрывайся, спяшайся да сваёй пульхненькай імянінніцы. Сказана ж даўно і слушна: едзеш цішэй — будзеш далей. Жартавалі-пасміхаліся і не заўважылі, як сапраўды моцна асталіся. Ці то Гарык занадта высільваў «капейку», спяшаўся на імяніны да каханай жоначкі, ці то мы часцей, чым трэ было, спыняліся, мяняліся месцамі ды застылыя костачкі разварушвалі.

Ужо сам-друг мы мчалі далей ды падымаліся па мерыдыяне зямной кулі ўсё вышэй і вышэй, а значыць, апыналіся бліжэй і бліжэй да роднай зямелькі.

Такім манерам выгналі без сну, ад самага Баку, дваццаць восемь гадзін. Я прапанаваў не выпрабоўваць больш лёсу і перадыхнуць. Але Вахтанг — ён якраз сядзеў за рулём — заўпарціўся:

— Дацягнем!

І мы ледзь не дацягнулі... да могілак!

Сон зламаў яго арганізм, і кацо вымкнуўся, праўда, руль трымаў моцна. І я не адразу ўгледзеў небяспеку. Неўпрыкмет мы бралі лявей і лявей. Хоць Вахтанг усё яшчэ ўчэпіста сціскаў, ні на што не рэагуючы, абаранак. А тым часам на нас насоўвалася шэрая смерць, павольна і ўпэўнена, у выглядзе роднага «МАЗа» з пяцісекцыйным прычэпам-вагонам. Можа, зямляк кіраваўся якраз на будоўлю таго самага сельгасінстытута? Я ледзь паспеў ірвануць руль на сябе. І мы прашмыгнулі адаграмадзіны на адлегласці выцягнутай рукі. Кіроўца яшчэ доўга ціснуў, аглушаючы нас, на сігнал.

Вахтанг прахапіўся і, добра не цямячы, што здарылася, учапіўся за руль. Я аддаў упартаму грузіну кіраванне, але заўважыў:

— Як толькі дагонім Гарыка, перасаджваешся да яго. Там свае небяспечныя эксперыменты на вынослівасць і паказвай!

Праехаўшы пару кіламетраў, грузін усё ж скеміў, што лепш не гуляць з лёсам у рызыкоўныя гульні, і здаўся:

— Тармажу, крыху пакімарым. І праўда — вочы зліпаюцца.

— Так, адпачні, а я пакірую. Да мяжы ўжо рукой падаць,— памяркоўна прапанаваў зменніку.

— Э, не! — Вахтанг нечакана зноў заўпарціўся.— Пакуль не вымчу кіламетражу, як дамовіліся, руля не аддам!

Што было чыніць? Пярэчыць марна. Дый стаміўся я спрачацца з наравістым грузінам.

— Спадабалася мераць наземныя прасторы? Давай, давай.

## IX

Прачнуўся я, калі пад'язджалі да Беларусі. Вахтанг, задаволены тым, што ажыў першы і паспеў пару дзесяткаў кіламетраў пагаспадарыць адзін, прысвістваючы, вырульваў на запраўку.

— Ачуняў, бос? У час! Давай грошыкі, пайду каня падкармлю, а то зусім хлопец прагаладаўся: чырвоная лямпачка з паўгадзіны гарыць.

Вярнуўся Вахтанг не ў настроі:

— Запраўніца песні пяе: «Бензіну няма. Толькі НЗ для даішнікаў. Чакайце да раніцы». Але ж да раніцы адубеем. Адчуваю, сваім фэйсам ёй не спадабаўся. Можа, ты схадзі? З бландзінамі, наколькі прыкмеціў, хахлушкі больш ветлівыя, самі да іх ліпнуць.

— Ліпнуць брудныя рукі і яшчэ сякое-такое месца, калі салодкім абжэрціся, а дзеўчынёха спалохалася,— перавёў я гаворку ў іншае рэчышча, мала спадзеючыся на сваё меркаванне.— Зірні на сябе ў люстэрка: двухсутачная чорная шчэць, вочы галодныя — бандыт, адназначна! Але не марнуйся, дыхай глыбей. Можа, мне пасвеціць удача. Паспрабую ўгаварыць хоць на пару дзесяткаў літраў, іх нам якраз і не стае.

Дасведчаныя вучаць: калі нельга дасягнуць мэты ні за так, ні за грошы, а вельмі трэба, яе дасягаюць за ўсякую цану. За ўсякую!

У гэтым разе абышлося без эксклюзіву, але ахвяраваць падараванымі каракумскім бізнесменам-даішнікам лайкавымі пальчаткамі давялося. Супраць вырабаў з лайкі ані ў воднай жанчыны няма аргументаў.

Заправіліся і рушылі. Як бывала казаў Астап Ібрагімавіч, паседжанне працягваецца!

Праз паўгадзіны паказалася і мяжа! Нарэшце! Аднак дзіўна: нешта няма нашых хлопцаў-даішнікаў. Спяць, пэўна што. Святы занятак для беларуса. Гэтак ён апошнія два стагоддзі і праспаў.

І ўсё ж як вольна дыхаецца на роднай зямельцы! Вось мы і дома! Амаль што дома — калі хто дакладнасць занадта любіць. Цяпер мяне цяжка спыніць.

Я сеў за руль, і мы пагналі!

Здавалася, не за пяць гадзін, а за пяць хвілін прамчалі трыста кіламетраў. Заставалася зусім дробязь. Зусім...

## X

Я ведаў, галоўнае, не расслабляцца на апошнім адрэзку дарогі. Прытым не з чутак ведаў, меў і сякі-такі досвед. Але калі мінулі знак «Мінск — 17 км», розум мой вымкнуўся, задрамаў. У сне я ішоў па канаце над безданню і раптам хіснуўся. Абняты жахам, закрычаў:

— Стаяць!

І прытармазіў! На галалёдзіцы! І як?! Педалька — да канца! Машыну панесла юзам, закруціла, і вось яна — бездань, тая, што снілася! І мы ныраем...

— Не-е! — закрычаў.

Я спалохаўся, але змагацца не пакінуў. Рэзка вывернуў руль направа, у бок адваротны кручэнню, вырваў кіраванне з рук конустыхіі і выруліў за метр ад абрыву,— не даў сну стацца яваю, а нам — абрынуцца ў скрозьдонную будаўнічую яму.

Яшчэ доўга я нешта крычаў на мангола-татарскай, ускідваючы ўгору кулакі, трос, нібы эпілептык, галавою — здавалася, да скону яна так і будзе ў мяне матляцца туды-сюды, туды-сюды. Нервы не вытрывалі, і я не валодаў сабою...

Але тое, што ўбачыў далей,— спаралізавала.

Нейкае чалавекападобнае — інакш не назавеш — стварэнне скінула з рамантаванай дарогі знакі «паведамляльны ўказальнік пераходу на другую праезную паласу» ды іншыя, спадарожныя ім. І на поўнай хуткасці (не толькі мы спяшаліся трапіць дадому, пакуль не поўнач) — чатыры машыны ўрэзаліся адна ў адну.

Фурнікі паспелі ўжо перагарадзіць дарогу з раскіданымі па ёй знявечанымі целамі і пакарабачанымі аўтамабілямі, загучалі аварыйныя сігналы. Не першы раз пераконваюся, якія малайцы дальнабойцы! Калі б не яны, целаў было б куды больш — з кожнай хвілінай больш.

Тады я і ўбачыў чалавека без галавы. Замест яе на шэрым асфальце ў чорна-барвовай лужыне плавалі раструшчаныя косці і траслося жэле мазгоў.

Успомніўся той пяцісекцыйны «МАЗ», які прагрымеў дакладна за некалькі сантыметраў ад нас. Тады Найвышні злітаваўся, пашкадаваў, зараз — таксама. Наступны раз чарга на выратаванне можа быць не нашай.

Нешта змусіла зноў глянуць на безгаловага. Гэта ў прыродзе чалавечай: жахлівае не толькі адштурхоўвае, але і прыцягвае. І я зноў

павёў вачыма. Божухна! Боты з медзянымі каўбойскімі шпорамі! Гэта ж хвалёны штатаўскі абутак Гарыка! «Другіх такіх «кірзачоў» па ўсёй краіне няма!» — любіў фарсануць ён пры нагодзе. Не хацелася верыць. Свядомасць адмаўлялася ўспрымаць убачанае. Божачкі! Навошта ён адарваўся і панёсся наперад? «Да Рымачкі на дзень нараджэння спазняюся». От і паспеў...

Вахтанг раптам залапатаў па-свойму. Пэўна што, таксама пазнаў Гарыкаў абутак. І закрычаў. Ягоны голас разлягаўся ўсё мацней і мацней, і неўзабаве я нічога, апрача гэтага голасу, не чуў. Нішто не магло заглушыць яго.

А потым Вахтанг заціх, укленчыў каля славутых ботаў, пачаў маліцца — зноў жа па-свойму, незразумела. Так і прастаяў да прыезду «хуткай» і даішнікаў.

Вахтанг застаўся пільнаваць на месцы аварыі, а я павалокся ў Мінск — паведаміць родным. Акурат павалокся — доўга поўз на трэцяй, забыўшыся на чацвёртую і не чуючы за спінай абураных сігналаў тых, хто ўсё адно спяшаўся. І гэта злавала. І з злосцю думалася: дарога бярэ занадта дарагую плату за тое, што яе нехта некалі праклаў для хуткасці перамяшчэння. Цяпер яна вымагае грошай? Так, вядома. Але здаўна і нястомна бярэ і куды больш дарагую плату — чалавечыя жыцці.

## XI

Апрача любові і нянавісці ёсць яшчэ адно пачуццё, якое змушае траціць галаву. Яно прыходзіць, калі мы вяртаемся па доўгім расстанні дадому.

Я заехаў у двор, спыніўся, заглушыў матор. Усё, прыехаў! Канец. Фініш... Расслабіўся... Нечакана сціснула ў грудзях. Запала кудысьці дыханне.

Ледзь вылез з машыны. Моцна, як мог, удыхнуў і выдыхнуў — адпусціла! Закарцела зірнуць на неба. Вялізная чорная птушка лунала над горадам. Ястраб? Няўжо арол?! Вось ён праляцеў над маім домам, узняўся ўвысь і растаў у нябёсах. Як Гарык, мой сябра, цяпер ужо вечны. А можа, гэта ён і быў?

## Першы клас

Дваццаць тры плюс два — заданне для першакласніка. Толькі тут яно так проста не развязваецца. Бо гаворка ідзе пра рэчы розных шэрагаў і рознага парадку: дваццаць тры гадзіны да пачатку рэгістрацыі рэйса Стакгольм — Масква і дзве шведскія кроны, патутэйшаму — дробязь — у кішэні.

Чаму з гэткім запасам часу, спытаецеся вы, з'явіўся я ў аэрапорт? Не-не, я не з тых бесклапотных бадзяг, рамантыкаў ці летуценнікаў, якія любяць назіраць за «ІЛамі» ды «боінгамі», што знікаюць у нябёсах, і ўяўляюць у іх сябе, даражэнькіх. Не аматар я і бяздумна туляцца ў натоўпе няўрымслівага прылётна-адлётнага люду. Урэшце, не такі я багаты і не такі бедны, каб дазволіць сабе траціць жыццё на марнае церце часу. Прычына, праз якую лучыў я ў аэрапорт мала не за суткі да рэйса, каб пакінуць найсацыялістычнейшую (як у нас мяркуюць) ці найкапіталістычнейшую (як лічу я) краіну Захаду — Швецыю, больш трывіяльная і простая. Помніце, выходзіў пры камуністах кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»? Здаралася, бальшавікі кідалі ў народ і карысныя лозунгі. Дык веды, калі сёння прадоўжыць іх думку,— гэта інфармацыя, а інфармацыя каштуе грошай. Каб зарабіць грошай, трэба, само сабою, добра-такі выкласціся, напнуць сваё неацэннае здароўе, здабываючы тую самую неацэнную інфармацыю. Вось я яго і напінаю каторы ўжо год. Таму і ў Швецыі апынуўся, дзе гэтак модная цяпер хатняя электроніка куды таннейшая, чым у нашай «буче, боевой, кипучей». А дома някепская дэльта выходзіць. Так-так. Прычына ж майго доўгага сядзення, лепш — доўгага цярпення ў аэрапорце сапраўды банальная, нават, бадай, і занадта.

Ды пра ўсё па парадку.

Выбегаўшы за апошні дзень па «шопах» і распродажах належны кіламетраж і вяртаючыся ў гатэль па непараўнальным, у агнях і ілюмінацыях Стакгольме (ён ужо паспеў ахінуцца цёплым снежным вечарам), я знячэўку сам сабе абурыўся: а колькі таго жыцця?! Пашпацырую і я, быццам нічым не абцяжаны турыст, па гэткай ночнай казцы! Развітаюся з ёю, незабыўнай! Калі яшчэ ў чароўныя мясціны гуллівы лёс закіне?

І пашпацыраваў. Забрыў на вядомую вуліцу. І спытаў сам у сябе, прывароржанага ўбачаным: а які, калі на тое, клопат, старэча? Ту-

рыст ты сёння ці не турыст?! Чым ты горшы за іншых, падобных да цябе чалавечкаў? Хоць бы і за таго шведа, тваімі продкамі некалі бітага? От і зазірні ў гэты маленькі бардэльчык! Патрымайся за дамачку заморскую! Бачыш, як шматабяцальна вірлавокія лэдзі за шклом свае яркія вусны аблізваюць. А як завабліва тое-сёе ў сябе пагладжваюць. У-ух! Зазірні, Ваня (гэта я так сябе, калі хвалююся, называю), на развітанне, зазірні, дарагі.

І я зазірнуў і зведаў каханне платнае. З чым яго, сякое-такое, ядуць і колькі за гадзіну лічаць. Вы не паверыце, але надта ж палкаю і нястомнаю сяброўкай паказала сябе, можна сказаць, зямлячка — шыкоўная, у добрым целе хахлушка, якіх тут, наўздзіў, хоць гаць гаці.

І вынік — у гатэлі апынуўся глыбокай ноччу, калі, як спяваў Высоцкі, «автобусы уже не ходють», і знясілены, быццам я на нейкі час падмяніў Атланта, які купал неба трымае...

У сем нуль пяць настырны і разумны электронны будзільнік учэпістых і мэтных японцаў з «Seiko» разбудзіў мяне толькі за трэцім разам. Сонная галава цяміла цяжка, і я зусім забыўся пра розніцу ў часе. Апамятаўся, апёкшыся кавай, што закіпела ў micro wave: спрасонку пазначыў у таймеры не той час. Адразу ж выклікаў таксі, папярэдзіўшы: у мяне з сабою рэчаў — цэлая гара. Адказалі, каб не хваляваўся. No problem, маўляў, чакайце, дарагі таварыш, за вамі прыедуць... Жартаўнікі...

Аднак не выратаваў, хоць і паказаў характар, нашчадак недабітага шведа. Ён гнаў свой micro bus (усё ў іх мікра) як учадзелы, але... гэта быў не ягоны вечар — папраўдзе, ранак. Не даехаўшы да аэрапорта з квартал, «мерседэсік» зачмыхаў: швед, спяшаючыся, забыўся заскочыць па дарозе заправіцца.

Карацей, самалёт я праваронІў. Правёў яго прытуманеным слязою паглядам. А ў дадатак і апошнія грошыкі спаліў: велікадушна адмовіўся ўзяць у кіроўцы рэшту — не мог не аддзячыць чалавеку. Стараючыся паспець да рэйса, ён рызыкаваў і сабою, і машынаю: раз ледзь у кювет не нырнулі, а калі зноў занесла, дык толькі нейкім цудам слуп не параўнялі. Ды і рэчы дапамог у залу чакання занесці.

Наагул, заставалася адно: закампасціраваць адкрыты — дзякуй Богу! — білет на наступны рэйс і чакаць. Чакаць амаль што суткі.

Праседзеў у пакутлівай бяздзейнасці паўтары гадзіны. Здаліся яны вечнасцю. «А як адбарабаніць тэрмін у пятнаццаць разоў

большы?!» — бедаваў, ёўзгаючыся ў крэсле. Але чалавек — усё ж цярплівае стварэнне. І не пазбытае да таго ж цягі да спазнання. Апоўдні я ўжо больш-менш уяўляў сабе жыццё і правілы паводзін, а ў існасці — выжыванне — у аэрапорце з прыгожай назваю Arlanda.

Горш за ўсё, што на парасстаўляных у холах і залах незлічоных крэслах і канапах няможна спаць, а мяне нястрымна хіліла. Ледзь заплюшчыш вочы — і невядома адкуль з'яўляецца ўзброены да зубоў рэйнджар (гэтак я ахрысціў тутэйшых палісменаў за іх асабліва ваяўнічы прыкід: пісталет, электрашокер, дубінка, кайданкі, яшчэ нейкія бірулькі ды бразготкі для тых, хто захоча паспрачацца й павыскаляцца). З'яўляецца — і прапаноўвае асалавеламу містэру пасажыру прайсці ў пакой адпачынку. А пакой гэты — папраўдзе, катушок з мяккім лежаком — каштуе грошай. І не дзве кроны. Пахадзіць жа па залах, выйсці падыхаць свежым паветрам, абглядзець тутэйшыя славутыя мясціны, туды-сюды тусануцца і тамсям патаўчыся, а значыць, прабавіць час, а разам скінуць з сябе гнятлівыя апранахі сну — гэткай жаданай мажлівасці няма: вы не абібок-турыст з мыльніцаю ад «Fuji» ці «Kodak» на грудзях, а чаўнок. («Трагік» Т. Драйзер, жартаўнік О'Генры, «нямецкі таварыш» Э. М. Рэмарк, К. Чапек, які «за словам у кішэнь усё ж палезе», «жахіст» Ф. Кафка, аўтар ціхіх дэтэктываў з камісарам Мегрэ «ў галоўнай ролі», які ні на хвіліну не расстаецца з люлькай, Ж. Сіменон, Конан Дойл і іншыя назвалі б вас мякчэй, больш інтэлігентна і загадкава,— камівояжор, што, уласна, нічога не змяніла б.) Так, чаўнок. І таму вымушаны адольваць моры, акіяны або паветраную прастору звычайна з грузам. Вось і гэтым разам панакупляў рознай буржуйскай электронікі, якая на бацькаўшчыне каштуе шалёныя грошы, а тут... Тут просты рабачай з адной-дзвюх зарплат здольны заваліць апаратураю радыёаддзел усякага саўковага універмага. І зараз гэтыя тры хайфайныя відэамагнітафоны «JVC», найноўшы дваццаціпяцідзюймовы «блэк-трынітрон», крутая шматблокавая стойка «Technics», парачка прафесійных сінтэзатараў «Yamaha», скрынка з аўдыёкасетамі «BASF» і «ТДК», а таксама важкая — сем на восем — сумка якаснага (без кепікаў) сэканд-хэнду вісяць у вас каменем на шыі, прывязаўшы да клятага пластыкавага крэсла.

Такую колькасць тэхнікі павесіць на аднаго чалавека ды на бязмерна ўедлівай савецкай мытні — значыць, абдзерці яго як ліпку. І таму частку грузу на час праходжання кардону трэба падзяліцца

з багатымі людзьмі. Чаму, пытаеце, з багатымі? Ды таму, што яны ляцяць пустымі і запісаць на сябе нейчы «лішні» відзік-шмыдзік звычайна згаджаюцца: новаспечаныя ротшыльды яшчэ не забыліся, як самі жываты надрывалі, у людзі выбіваючыся...

Колькі, дарэчы, націкала? Дванаццаць пяцьдзесят? Гм-м. Тут мяне і пахаваюць.

Але здавацца — лёс перайначыць, перавярнуць яго, беднага, дагары нагамі. Прыдумаў маленькі самападман. Дзеля ўяўнага прыспешвання часу разбіў гадзіну на дзве палавінкі. Адна мінула, другая — гадзіны як і не было! Проста імчыць час! І зноў першая палова гадзіны мінула. І другая... І зноў першая. Але ўжо не гэтак хутка. Нічога! Як там казаў хахол у вядомым фільме: «Тэчэ помалэньку»? Ён пра ваду гаварыў, але час — таксама цячэ. Памаленьку, але цячэ. Галоўнае — трымацца, не расслабляцца, не ныць! Колькі там нацякло? Палова на трэцюю? Да рэйса яшчэ амаль дваццаць гадзін? Жах!

Але жах быў не толькі ў гэтым. Пачаліся эксцэсы-прыгоды.

У цёмна-шэрых апратках, што нагадвалі нешта сярэдняе паміж халатам і купленым навырост плашчом, і з аднолькава цяжэннымі — на паўгрудзіны — бліскучымі крыжамі ў залу зайшла гоп-кампанія з чатырох братоў-блізнятаў. Адрозніць іх можна было хіба што паводле колькасці блакітных ці ружовых палосаў на галаве.

Заўважыўшы мяне ў атачэнні сумак і скрынак, яны заміж прывітання праспявалі: «Ой-ля-ля!» — і, разгледзеўшыся, ці няма дзе рэйнджараў, падышлі бліжэй. Датумкаўшы, з якіх такіх краёў прыбыў дарагі госць, асмялелі.

Адзін з крыжакоў, сіневалосы, з фрызураю, якая нагадвала дыск-фрэзу, на трaціну ўтопленую ў галаву,— хто бачыў, разумее, пра што ідзецца — паставіў брудны чаравік на скрынку аднаго з сінтэзатараў.

«І дзе ён свой абутак у ідэальнай шведскай чысціні ўмудрыўся так страшэнна запэцкаць? — здзівіўся я.— Гэта ж як трэба было пастарацца! Хоць што й казаць? Свіння ўсюды гразь знойдзе. Нават у Швецыі».

Сіневалосы тыцнуў чорным ад татуіровак пальцам — вось ад каго наша маладое пакаленне засвойвае свае манеры — у скрынку з «трынітронам» і, скрывіўшы вусны — відаць, намагаўся надаць твару застрашлівы выраз,— нешта прагугнявіў.

Шведская — не тая мова, якой я марыў з маленства авалодаць, нават не ведаю, як на ёй да дзесяці лічыць, а таму выкрыкнутую з хамаватай усмешкаю тыраду зразумець не змог і прамаўчаў. Гэта дало сіневалосаму падставу пайсці далей у сэнсе нахабства. Нахабнай нагою ён падцягнуў «Ямаху» бліжэй да сябе і да сваіх сяброўтаварышаў — я паспеў ужо ахрысціць іх «патужнікамі».

Некаторыя жартаўнікі, аматары гуляць з агнём, кажуць: «За баксы я і Бацькаўшчыну прадам!» Я не прыхільнік гэтакіх смелых заяў, але ў скрынках з сінтэзатарамі ўпакаваў і па пары дыскаў (для сябе і звышмеламана-суседа) незраўнаных «Led Zeppelin», «Nazareth», «King Krimson», «10 cc» і «Queen». Бацькаўшчыну турбаваць не буду, а вось за старых рокераў паваяваць заўжды гатоў!

Скінуў я са скрынкі брудны чаравік будучага заўсёдніка дармовых харчэўняў за кратамі і на ўсякі выпадак адступіў — а раптам сіневалосы красунчык калі ў секцыю боксу, скажам, заглядваў? Аднак спартоўцам забытае дзіця капіталізму, відаць, ніколі не было, бо такому майму кроку здзівілася і быццам разгубілася, нават спужалася. Не знайшліся чым мяне астудзіць-напалохаць і яго віхрастыя дружбакі.

Не стану цяпер гадаць, які б атрымаўся фінал міжнароднай, але зусім не таварыскай сустрэчы па вулічных адзінаборствах, калі б нечакана не вярнуліся ў залу строгія рэйнджары. Сіневалосы, выявілася, быў наўздзіў кемлівым і зрэагаваў імгненна. Зрабіўшы выгляд, што мы з ім сябры, сто гадоў знаёмыя і гэтак далей, ён махнуў рукой, маўляў — мне пара, стары, удачы!

Паліцэйскія правялі чацвёрку да выхаду з запытальнымі позіркамі, але не зачапілі: няхай дзятва гарэзіць, абы нікому не назаляла. Капіталізм, што ні кажы, і значыць — свабода самавыяўлення.

«Няхай бы так і паўз мяне пратупалі, не заўважылі»,— шаптаў я малітву, і, здаецца, уверсе яе пачулі. Перамовіўшыся некалькімі словамі, рэйнджары пакіравалі да выхаду: відаць, усё ж непакоіліся наконт гарэзаў хлопчыкаў, не пэўныя былі, што тыя і на вуліцы будуць добра сябе паводзіць.

Не сядзелася і мне. Устаў, каб разрухаць здранцвелыя костачкі.

«Раз-два, раз-два!» — успомніў даўныя армейскія ранішнія прабежкі. Пераступіў з нагі на нагу, пераступіў і... скеміў, чаму гэтак прытанцоўваю.

Пакрытыя тоўстым слоем эмалі белыя дзверы з двума нулямі і перакуленым над імі залацістым трохкутнікам ззялі метраў за дваццаць. Але як вядома, у «дабле» дзверы за сабою не толькі

джэнтльмены зачыняюць. І што я змагу заспець, калі вярнуся, здаволіўшы натуральнае жаданне? Так... нічога.

Выйсця не было, а пакуты — абвастраліся, і я важыўся пакінуць на волю лёсу электронныя прычындалы, якія ў мяне цяпер во дзе сядзелі. Ужо сказаў быў сабе: «Усё, начхаць, пайшоў! Колькі можна трываць!» — і ўстаў... Але ў гэты момант тутэйшая старэча-прыбірачка, адзетая па-моладзеваму ў камбінезон колеру хакі — сама галантнасць — заўважыла мае прытопы і добра ацаніла сітуацыю. Злезла са свайго аўтападмятальніка і, падышоўшы бліжэй, шапянула (з англійскай мовай у Швецыі нават пенсіянеркі на ты):

— The Mister, no problems. Unless you object, I care for your things[1].

Перакладаць гэтакі тэкст не спатрэбілася, і я шмыгануў за жаданыя дзверы.

Праз гады, пабыўшы ў многіх аэрапортах свету, я наведаў безліч розных «даблаў», але такога, які ўбачыў у шведскім «Arlanda», не сустракаў: бялюткія, з пахам ранкавага бору падлога, столь і сцены; шарэнга аўтаматаў з квяцістымі аконцамі для продажу сродкаў сексуальнай абароны, цыгарэт, жуек, паўсюднага «Марса», не ведаю чаго яшчэ; мякчэйшая за шоўк папера і ў колькасці, дастатковай, каб абгарнуць Зямлю па экватары; некалькі гатункаў вадкага мыла для рук, аўтаматычныя паветраныя сушылкі; бляск святла, як пры здыманні кіна. І, галоўнае, здавалася, немажлівае: ніводнага наведніка, акрамя вас! Ніводнага!

У фінале азнаямлення з... апартаментамі — іншага азначэння гэтага месца цяжка падабраць! — мяне дабіў адзін з унітазаў. Ён стаяў, як Людовік XIV, пасярод пакоя-спачывальні, без адзінае ручкі, рычажка, а тым болей — шнурка ці вяровачкі. Хітрых кнопак таксама не назіралася. Разумны унітаз спрацоўваў паводле патрэбы...

Ці варта ўспамінаць пра падобныя ўстановы ў нашых тагачасных аэра- і, асабліва, чыгуначных вакзалах з іх невыносным вечным смуродам, з выдрапанымі на сценах напісамі з лексікону адважных вояў Чынгісхана і не менш пахабным насценным жывапісам.

У зале чакання засвяціўся, запрацаваў сам сабою і прымусіў ачуцца ад роздуму — нават крыху спалохаў, умураваны ў сцяну

---

[1] Містэр, няма праблем. Калі вы не супраць, я паназіраю за вашымі рэчамі *(англ.)*.

тэлевізар. Акрэслілася аблічча вядучага з застаўкаю «CNN» у правым ніжнім кутку. Выстрэльваючы словамі з хуткасцю кулямёта, дыктар расказваў і паказваў, хто, як і дзе ў свеце рыхтуецца да Калядаў. Дабраўся нават да папуасаў, якія, як з песні вядома, з'елі Кука — насамрэч і не спрабавалі. Але нядоўга абарыгены аднаго з астравоў Новай Гвінеі высоўвалі доўгія языкі, палохалі рэдкімі зубамі-ікламі і дэманстравалі дармовы стрыптыз. Падышоў у зялёнай спяцоўцы, але пры белай кашулі і салатавым гальштуку, рыжы-рыжы-васпаваты і тэлік вымкнуў.

— The ladies and gentlemens, beg your pardon for troubling you. Is connected the new system. Is connected the new system of television — satellite. Soon meeting long for in expectation of does not come[1].

«Во гад! А я рот разявіў. І зноў жа — на зразумелай мове патлумачыў,— адкінуўся назад да спінкі крэсла.— Няйначай, ангельская для шведаў — як родная».

Паглядзеў на гадзіннік: палова на шостую. З такое нагоды ўспомніўся вядомы анекдот, але настрой ад гэтага не палепшыўся. Наперадзе — пятнаццаць гадзін адпачынку-пакут на проклятым капіталістычным крэсле, а сілаў ужо няма!

Аднак набеглая думка ўзняла настрой, дала надзею: мінула ж траціна тэрміну. Дый жывы-здаровы, і рэчы пры мне. Большага жадаць — Богу грашыць і на капрызы лёсу нарывацца. Ад дабра толькі занадта рызыкоўныя і неўтаймоўныя яшчэ большага дабра шукаюць.

У развагах пра дабро і зло — а з грунту, гэта тое самае, розніца толькі ў тым, з якога боку паглядзець — праседзеў да цемнаты.

Каля васьмі трыццаці — дванаццаць трыццаць да пачатку рэгістрацыі — у кавярні насупраць, адкуль даплывалі смачныя пахі і выклікалі выдзяленне сліны, па-садысцку туманілі галаву, змяніліся бармен з афіцыянтам. Бязлітасная капіталістычная сістэма эксплуатацыі працоўнага люду яўна ўлічвала і адпачынак. Але гэта ўлічвала *іхная* сістэма і для *іхнага* народа. Праўду Астап казаў: «Мы госці на гэтым свяце жыцця».

Калі апошнім глытком ліманаду, яшчэ гатэльнага, я тужліва зафіксаваў на цыферблаце ўсяго толькі дзевяць гадзін вечара, актыў-

[1] Пані і панове, прашу прабачэння за турботы. Прылучаецца новая сістэма тэлебачання — спадарожнікавая. Неўзабаве ўсім пачаканцам у зале сумаваць не давядзецца *(англ.)*.

на пачалі прыбываць транзітнікі. За лічаныя хвіліны яны запаланілі ўсё, што можна запаланіць, і ўрэшце зала-хол нагадвала ўжо фае савецкіх кінатэатраў у часы шэсця па Саюзе раз'юшанага «Фантамаса». Службы аэрапорта такога бурнага наплыву гасцей не вытрымалі і захлынуліся. Узніклі абураныя чэргі каля рэгістрацыйных стоек. А паасобныя рэйсы нават давялося пераносіць, што для распешчаных, зусім нам не таварышаў-капіталістаў — надзвычайная сітуацыя.

Карацей, скандынавы не падрыхтаваліся да перадкаляднага турысцкага ажыятажу.

Падрыхтаванымі да яго былі амерыканцы. Дзіўны, скажу вам, народ! Бальшавікі плацілі сваім рабам — рабочым ды інжынерам у 100 — сто! — разоў менш, чым янкі сваім — таксама быццам бязлітасна эксплуатаваным працоўным. І ў гэткім звышняроўным змаганні капіталісты перамаглі: усё ў іх лепш, якасней, ды яшчэ ў тыя ж 100, калі не ў 1000 разоў усяго гэтага якаснага больш. Адныя загадкі, неразгаданыя таямніцы...

Калі ж мы будзем дзяліць нашыя грошыкі, гаспада бальшавікі, тыя трыльёны, што вы ўкралі ў нашых дзядоў, бацькоў і ў нас?

Зноў задаю пытанне без адказу, адхіляюся...

Дык вось, акурат у шведскім аэрапорце я даведаўся, якія нестандартныя гома сапіенсы жывуць за акіянам. Можа, таму хлопцы і вырваліся наперад планеты ўсёй? Тады амерыканцы яшчэ не развалілі свайго, вартага спарынг-партнёра, які не дазваляў ім расслабіцца. Гэта крыху пазней прыблудныя псы, вылезшы з пяскоў, пачнуць цішком кусаць янкі, што адарваліся ад цывілізацыі...

Недалёка ад майго крэсла пакут заакіянскія турысты правялі кароткі, але дзейны сход, на якім выбралі старшых. Начапілі тым на рукавы павязкі з пярэстых шалікаў — яны ў той час толькі ўваходзілі ў моду — і ўчынілі з сваіх жа пасажыраў дадатковы мытна-памежны калідор. Шведы спачатку вяла пасупраціўляліся досыць арыгінальнай самадзейнасці, але пад ціскам свабодалюбных і ўпартых амерыканцаў неўзабаве здаліся.

Праўду кажучы, гэта было маё другое знаёмства з пасланцамі далёкай, амаль што казачнай для мяне краіны, а больш дакладна — іншай планеты, гасцямі з будучыні. Першы раз з бесклапотнымі малойцамі я сутыкнуўся ў алімпійскім 1980-м, калі яны з'явіліся ў нас у інстытуце. Дарэчы, колькі там часу? Дзесяць дваццаць пяць? Паўсутак прабегла? Ужо весялей! Бач, як ва ўспамінах час ляціць!

5. Зак. 413

Дык вось, па ўзаемаабмене да нас у інстытут прыбыла група з васьмі амерыканскіх студэнтаў – пяць хлопцаў і тры дзяўчыны. Усе як на падбор, гуліверы – інакш пра іх і не скажаш: кожны вышэй за савецкага брата-студэнта на галаву.

Такую юную дэлегацыю нашы, вядома, умацавалі б парачкаю старэйшых таварышаў без пагонаў, але са званнямі. А янкі, пазбытыя ўсякага жалю, адправілі сваіх дзяцей туды, дзе Макар цялят не пасвіў – і адных.

Тады мы нават не ведалі, што ўсмешка ў амерыканцаў сядзіць у генах. І так моцна, як у п'янага рускага маханне кулакамі. Дык вось, гэтай вечна бестурботнай васьмёрцы нашы жартаўнікі прапанавалі згуляць у баскетбол – любы амерыканскаму народу. Гэтую справу ўзначаліў артыст-рэктар – ну выкапаны Мюлер – Бранявы, сутыкнуўшыся з гэткім тыпам, можна было заікам стаць. А ўжыццявіў яе загаднік кафедры фізічнага выхавання, не па вазе спрытны – паўтара цэнтнера! – празываны Жапацінскім; так студэнты перайначылі прозвішча вядомага чэмпіёна-штангіста, вядома ж, звязанага з галоўным фізруком не сваяцтвам, а толькі саліднай вагой.

– А во якраз і навікі-першакурснікі таўкуцца ля колца! – заспявалі Мюлер і Жапацінскі дуэтам.– Захоп мяча пад шчытом адпрацоўваюць.

Навікамі ля колца была зборная інстытута па баскетболе, якая нядаўна стала чэмпіёнам сталіцы. Перад прыездам гасцей яе на ўсякі выпадак узмацнілі яшчэ і парай-тройкай найлепшых гульцоў з іншых клубаў. Два апошнія тыдні хлопцы дзень і ноч старанна займаліся, дзеля чаго іх вызвалілі ад заняткаў, узмоцнена кармілі ў адным з рэстаранаў для замежных турыстаў.

Дарма кармілі! Праляцелі і рэктар, і загаднік кафедры! Выйшла так, што пажартавалі яны з сябе!

Няўрымслівыя – усё ўсміхаюцца ды ўсміхаюцца! – амерыканцы пачалі гульню асцярожна: дзяўчаты селі на лаўку запасных, а пяцёрка хлопцаў выйшла ў асноўным складзе.

А што адбылося пасля? Гэта трэба было бачыць!

Амерыканцы далі не гульню, не,– цыркавы паказ! Сам-адзін – абводзіў трох, чатырох. А мяч часам знікаў з вачэй, быццам зачараваны. Тыя, зусім не навікі, якія «выпадкова таўкліся ля колца», потым вярталіся на сваю палову поля і, паўтарыўшы праход, то кідалі, то... проста клалі мяч у карзіну. «Вандроўныя» цыркачы-жанглёры забівалі зборнай-чэмпіёну і з цэнтра пляцоўкі, і з-пад ног, і стоячы

спінаю да шчыта, і бокам, і па-валейбольнаму, калі няўлоўным дотыкам мянялі кірунак лёту мяча, і з адскокам ад падлогі, і галавою (жартавалі-ўсміхаліся), і яшчэ бог ведае як і чым.

Здавалася, вочы ў гледачоў вось-вось павыскокваюць з вачніц, а ў раты заляцяць усе мухі свету. Калі на фінішы першага тайма паспешліва наладжанае пад амерыканцаў электроннае табло высвеціла 46:8, госці выпусцілі на замену траіх дзяўчатак з коскамі а-ля рашан. (Вось у каго капіталісты моды крадуць!) Выхад даўганогіх акселератак не прынёс чэмпіёнам горада палёгкі. Адрыў, хоць ужо і не так хутка, але няўмольна рос.

Усе, вядома, былі агаломшаныя і прыгнечаныя. Загадзя спланаваная і, здавалася, добра падрыхтаваная акцыя-спектакль пад кодавай назваю «Савецкі спорт – найлепшы ў свеце!» правалілася. Рэктар ужо не сумняваўся, што зляціць са свайго цёплага месца. Гульня, а хутчэй змаганне з праклятымі буржуямі была начыста прайграная. Ды яшчэ горш: змагання, самога праз сябе, з боку нашай каманды наагул не выйшла. Бо лічы не трапляў у рукі зборнае мяч. А да сёмага ж поту займаліся і карміліся! Да якога ж поту набівалі руку гэтыя загадкавыя амерыканцы?

Пасля фінальнага свістка заакіянскія госці далі гаспадарам па баваўнянай майцы з голубам міру, па часопісе з рыфмаванай назваю «USA TODAY», надрукаваным на паперы, якая адбівала сонечныя зайчыкі, і па значку з двума сцяжкамі – сваім і савецкім, чым крыху супакоілі перакормленых валідолам інстытуцкіх кіраўнікоў: цяпер гульню там, наверсе, можна будзе падаць як сяброўскую студэнцкую сустрэчу, вынік якой не такі ўжо й важны.

А што ж там нашы цяперашнія, шведскія амерыканцы?

Апошнімі, зачыніўшы за сабою часова арганізаваны памежнамытны канал, зніклі іх старшыя з павязкамі.

Сам сабе зацеміў: поўнач – мінула. Засталося ўсяго дзесяць гадзін. Але чаму гэта на душы каты скрабуцца?

Нездарма скрабуцца!

Два рэйнджары ўхапілі пад рукі турка – ён сядзеў ад мяне праз пяць крэслаў і шмат разоў быў папярэджаны яшчэ ўдзень – ды пацягнулі ў бок закутка-лежака. Хлопец залятаў, як мінімум, на пару сот крон, а хацеў жа, небарака, зэканоміць. Праўда, у Швецыі – капіталізм, амаль што поўная свабода і заўсёды ёсць варыянты. Калі, скажам, кліент катэгарычна ўпрэцца і не пажадае разлічыцца за атрыманыя даволі шыкоўныя, і цаною адпаведныя,

паслугі, маршрут яго руху зменіцца і скончыцца таксама ложкам, толькі ўжо без анатамічнага матраца, бялюсенькай, з пахам язміну прасціны, гарачага Gold Nescafe з піроржным Frech strawberries[1] ды іншых атрыбутаў буржуйскай цывілізацыі — дагэтуль усё не памерлай. Карацей, патрапіць вусаты хлопец у каталажку, а адтуль — і да бацькаўшчыны рукой падаць.

Адным словам, знік з далягляду таварыш па змушаным няспанні, і мінула ахвота пакімарыць які час і ў мяне. Успомнілася даўнавата ўжо забытае, суцяшальнае: слабак ты, турак недабіты, далёка табе да нашага, катаванага бальшавікамі ў трэцім пакаленні, паўночнага брата!

Дзве дзесяць. Выходзіць, ногі адымаюцца не толькі ад бясконцага бегу па неабсяжных стэпах Алтая. І цягне не абавязкова на сон, але і на ўспаміны! Трэба было б устаць, прайсціся, можа, акрыяюць, гаротныя. Божа, калі ж усё гэта скончыцца! Зноў паліцаі! І чаго яны апаўночы расхадзіліся? Сон сабе, а заадно і іншым перабіваюць, ці што? З прабежкай-патупваннем давядзецца пачакаць. Чамусьці зноў амерыканская васьмёрка ўспомнілася. І раптам такое нечаканае пытанне у звязку з гэтым прарэзалася: тыя амерыканскія студэнты засыльнымі казачкамі былі ці ў капіталістаў ля кожнага пад'езда асы баскетбольныя таўкуцца?

03.33. «Тридцать три богатыря... Пушкин написал не зря!» Чуў ад каго ці рыфма а-ля рашан сама ў галаву палезла? Няйначай першая адзнака ціхай шызафрэніі. Чыгунок, само сабою, ужо не варыць. Паспаць бы хоць з гадзінку. Але не будзем даваць волі ўсялякім шкодным думкам: адлік пайшоў на хвіліны...

«А што гэта злева ў шкляной сцяне знаёмае мільганула?» — злавіў на тле неправіднай цемры адлюстровак чалавечка, сціснутага камячком у цэнтры тузіна крэслаў, звінчаных у радок. Прыгледзеўся: ды гэта ж я! Святы Божа, святы крэпкі, я не варт сухой свірэпкі! Да свабоды — шэсць гадзін дваццаць сем хвілін, а мяне ўжо вунь як скруціла! Праклятыя шведы давялі! (З роднай антыдэмакратычнай дзяржавай звязаў такі далёкі ад яе панятак, як свабода.)

З неймавернай цяжкасцю дадзюбаў да чатырох сарака пяці. Паліцэйскіх не відаць. Крыху пасплю. Колькі можна з арганізма здзекавацца?! Калі рэйнджары пабудзяць — атрымаю толькі першае папярэджанне. Першае — не апошняе...

---

[1] Свежыя трускаўкі *(англ.)*.

Я засынаў, але, відаць, Бог не забыў пакутніка, і ў падсвядомасці нешта спрацавала.

«А багаж, Ваня? Га? Хто будзе рэчы пільнаваць?! Прачніся! Ты ж сюды не адпачываць прыехаў! Дома на канапцы адляжышся. Ці засумаваў па заводскай сталоўцы і кампоце сямікапеечным з пахам анучы?! Падымайся, гультай, уставай!»

Спрабаваў супакоіць свайго пільнага двайніка: «Ціха, ціха! Не сварыся! Не сплю я, не сплю».

Поўная шызафрэнія!

Роўна ў шэсць, быццам закамандавалі, аэрапорт пакрысе заварушыўся. (Ноччу самалёты капіталістаў, зазвычай, не ўзлятаюць — шануюць хлопцы сваё дарагое здароўе.)

«Госпадзе, няўжо пакуты канчаюцца?» — ажыў і я. Час ізноў пабег весялей. Папіць бы чаго ды перакусіць крыху! Марыць — не шкодна. «Даў бы хто паперку, звярнуў бы цыгарэтку, ды табачкі няма». Не, пра хлеб-соль і тытунёк лепш не ўспамінаць. А спіну самлелую разрухаць не пашкодзіла б.

Спахапіўся ў час! Зноў паліцаі некага павялі. За што арыштавалі няшчаснага? І чаго бармен гэтак абураецца? І... па-ангельску? А-а, вунь яно што, бомж-аўтастопнік свіснуў у кавярні булачку... І госць здалёку, па-шведску ні гу-гу. Як жа гэты рызыкант планаваў на самалётах аўтастопіць? Ты глядзі, хлопцу рукі заламалі... Але ж які моднік: у карычневай скуранцы, нестарых джынсах «Wrangler», чысценькіх — не тое што ў сіневалосага мутанта — красоўках «Adidas»! Бомж, называецца! Адарваліся буржуі ад свету зямнога, адарваліся...

Без пяці сем. Да пачатку рэгістрацыі гадзіны паўтары. Сцяў зубы. Сяджу каменем. Амаль што суткі. Як доўжыцца нерухомая кара, найпакутлівейшая для мяне. Усё, досыць, панове! Устаю, трэба прадыхацца, прачысціць лёгкія, неяк пацiху ачуньваць. Латва, што побач нікога. Падумалі б — з'ехаў з глузду хлопец: ускочыў без дай прычыны і давай хухукаць, як паравоз. Не зразумець вам, містэры, што такое амаль дваццаць гадзін да аднаго месца быць прыкутым.

З кавярні выйшла прыгожая маладая бландзінка, гуллівымі вочкамі бліснула ў мой бок.

Я прыпыніў занятак «ёгаю»: чаго яна?

— Апаратуру валачэш? — знячэвіла найчысцейшым «рашан».— Няслаба загрузіўся!

— Як сказаць...— ад нечаканасці не знаходзілася слоў. Паспрабуй не разгубіся тут! Тая самая ахвочая да сексу — проста ненасытная — хахлушка і то спачатку шведкаю выстаўлялася.

— Так і кажы: пад завязку атаварыўся, цяпер сяджу ды пыхкаю без капейкі!

— Кожнаму сваё,— насцярожыўся. Наконт «без капейкі» гэта яна, пагадзіся, правільна адгадала. Але і надта ж кемлівая. Можа, не выпадкова падышла? Можа, яе нейкая свалата падаслала, каб загружанага на поўную сілу хлопца прамацаць і «абуць»?

— Не пужайся! Мне ад цябе нічога не трэба! — быццам прачытала мае думкі бландзінка.— Хочаш, колаю або сапраўднай кавай-экспрэса пачастую? Не люблю ў самоце час бавіць. Бацька за дзве гадзіны да пасадкі прывёз мяне ў гэтыя джунглі. Пазней не выпадала — заняты. А відзікі свае пакінь дзе стаяць — ніхто іх не возьме. Гэта табе не Расея. Засёк, як за булачку хлопцу рукі ледзь не адарвалі? Яны сквапных да чужога дабра мігам адлоўліваюць. І тваё барахло сто гадоў нікому не спатрэбіцца! Не верыш? Гэта з непрывычкі. Мінецца. Ладна, Фама («Добра, хоць не Ваня!» — пасміхнуўся і я), давай дапамагу паднесці да століка твой неацэнны скарб. Цябе няйнакш без іх танкам з месца не зрушыш. Хоць тэлевізар з «ямахамі» на месцы пакінь: іх жа ну ніяк не спруць.

Ах, як жывіць фірмовая гарачая кава! Паўжыцця за кубачак! (Асабліва калі ўжо і пра заводскі кампот не марыў.) Цяпер я пратрымаюся! Будзьце пэўны! І надараюцца ж такія людзі — анічога ім ад вас не трэба. Нічога! Сядзі і слухай, як мінулым вераснем іхная кампанія «на бульбе» начамі ля вогнішча розныя смелыя песні спявала, а днём на полі адаспацца спрабавала. І шанцуе ж некаторым: бацька ў капіталістычнай краіне працуе...

Пахваліўся і я (тым, што, думаецца, не выпадкова тут прыйшло ў галаву), як аднойчы, гадкоў не помню ўжо колькі, сватала мяне ў Маскве цётка за дачку шведскага пасла. Меў бы і я цяпер больш спакойны занятак. Пашкадаваў:

— Тады б ды цяперашні розум!

— І што змянілася б? — прымружыла незнаёмка вочы з хітрынкаю.

— Грэў бы костачкі ў адным з безмерных крэслаў тутэйшай савецкай амбасады, а не муляў бы аднаго месца на пластмасавым табурэце Made in Sweden. І ўжо ж, само сабою, не цягаў бы скрынкі

з другога канца Еўропы. Дый спаў бы, як усе нармальныя людзі, гадзін па восем, не меней!

— А ты хочаш быць як усе? — азадачыла бландзінка. Дастала цыгарэту.

— У кожным разе, не горш! — даў ёй прыкурыць.

— Не горш — мала! — яна злёгку зацягнулася.— Трэба імкнуцца да лепшага! Ты, бачу, стараешся, шчыруеш, але шлях, абраны табою,— доўгі. Ёсць іншыя, карацейшыя. І адзін з іх, як я зразумела, ты некалі не скарыстаў. Цяпер шкадуеш... Зрэшты, ты мяне не вельмі слухай. Змагайся, рызыкуй, калі не знайшоў іншага шляху да дабрабыту. Дарэчы, як табе новая знаёмая? Хто? Ды я, цемната! Нішто сабе, кажаш, дзяўчына? Сімпатычная? А хочаш пацалавацьсімпатычную? Не ўмееш цалавацца? Ну даеш! Цікавы ты хлопец, цікавы. Але буду закругляцца: на мой рэйс пасадку абвясцілі. А ты, гляджу, ангельскую ведаеш... у абсягах школьнай праграмы,— укусіла пад канец, як некалі і сваццця-цётка.

Бландзінка паклікала афіцыянта, разлічылася. Паглядзела ў люстэрачка пудраніцы, асвяжыла румяны і паднялася.

— Бадай што ўсё. Се ля ві.— Пайшла да выхаду. Ля дзвярэй азірнулася: — Ледзь не забылася. Заказала табе мой улюбёны малінавы Lipton і крэкер, так што прынясуць — не адмаўляйся, аплачана. Нешта яшчэ не так? Ах, во! Ты ж назваў сябе, а я — не! Папраўлю памылку. My name is Віка. З гэтага года — студэнтка Маскоўскага універсітэта. Заадно дачка пасла СССР у каралеўстве Швецыя. Наша сям'я тут нядаўна. Вясною з... з адной лацінаамерыканскай краіны прыехалі. І апошняе: раю навучыцца цалавацца. Раптам Бог пашле табе трэцюю спробу.

Праводзіў дачку пасла паглядам: вось табе і першакурсніца! Грымучая сумесь наіўнай савецкай дзяўчыны з прашытай капіталістычнай тыгрыцаю. Адказаў ёй у думках: «Трэцяя спроба выбіцца ў людзі ў мяне, галуба, адбылася значна раней — калі на патроенай армейскай прабежцы, на чэсць дня Кастрычніка, у нармальных для алтайскай зімы мінус сорак ледзь ногі не адкінуў. Арганізм тады вытрываў, і я нават прыбег першы, за што і павінен быў у звязку з вялікім святам атрымаць неардынарны прыз — дзесяцідзённы водпуск дадому. І хоць прыбег першы, ды з неацэннай узнагародаю ўсё ж праляцеў: не пусціў п'яніца-ротны салдата на пабыўку. Зрэшты, тое было даўно. Дык жа і цяпер таксама даў маху: такую дзяўчыну правароніў! Але што тут казаць.

Каб ведаў, дзе спатыкнешся, саломкі падаслаў бы. Відаць, лёсам мне наканавана да скону веку скрынкі цягаць. Дачка пасла паставіла слушную кропку: се ля ві. Гарбатага магіла выпрастуе. І нічога тут не паробіш. Нічога...»

А што ў гарбатага з часам? О-о! Дык гэта ж і на мой рэйс пасадку абвясцілі! Разява і салапяка ўваднач ас! Мы ж адным самалётам ляцім! Ён жа ўсяго адзін і ёсць. Не дарма ж суткі тут паруся! Наперад! Яшчэ не ўсё ў гэтым жыцці страчана! Памылку з пацалункам можна і на борце лайнера выправіць.

Пакінуўшы бармену апошнія дзве кроны на чай, кінуўся да стойкі рэгістрацыі. Я быў апошні, хто яе яшчэ не прайшоў.

Прачынаўся на хаду: таварчык жа пыліцца без нагляду, трэба ж забраць рэчы. Схапіў кімсьці кінуты багажны вазок — хоць тут падфарціла — і папёр яго да кавярні.

Бой на дзве мае кроны не забыўся — дапамог пагрузіцца. З радасці аддаў яму і нечапаны крэкер.

Здаўшы ненавісныя скрынкі ў багаж, я нарэшце вызваліўся ад грузу, які скоўваў мае рукі і ногі дваццаць тры гадзіны.

Праўда, здарыўся невялікі казус. Стандартны для маіх падарожжаў перагруз у сорак «кэгэ» я аплаціў загадзя, але крыху не разлічыў: лішняй вагі было на тры кілаграмы болей. Аднак пранесла: шведка, некуды спяшаючыся, слушна зразумела маё пацепванне плячыма: скончылася капустачка, скончылася...— і махнула:

— Pass[1].

Накіраваўся ў свой першы клас. Менавіта так, не агаварыўся: у першы! Тут вам не Швецыя! Тут — іншая планета! Тут і я іншы! Тут у мяне ўжо ёсць сваё «я».

Хто не зразумеў, тлумачу папулярна.

Білеты купляў за рублі, а розніца ў іх паміж класамі first (першы) і business (дый нават народнымі — tourist або economy), калі яе, вядома, праз відэакасеты пралічыць, не вельмі б'е па кішэні. Калі ж вымяраць дэльту чыста ў рублях, дык рэч зусім іншая выходзіць. Таму, хто зажадаў нялішніх зручнасцей, давядзецца на месячную зарплату (а то й на дзве!) дадаткова раскашэліцца. Яму first class абернецца дарагою асалодаю. Пацець трэба, хлопчыкі, дзеяць, рызыкаваць, а не чакаць літасці (заплаты) ад прыроды (дзяржавы).

[1] Праходзьце *(англ.)*.

Настаў час і сваю ратаўніцу кавай пачаставаць: нашы, драўляныя, у мяне заўсёды ў запасе ёсць.

Але дзе ж паслова дачка? Чаму не гучыць калючае: «Надумаў не ўпускаць другой спробы?»

— Пані і панове, калі ласка, прышпіліцеся. Узлятаем.

Не сцярпеў, спытаў шэптам у сцюардэсы:

— Даруйце, вы не бачылі, выпадкам, маладой прыгожай бландзінкі ў чорна-сінім скураным плашчы?

— Выпадкам бачыла... у турыст-класе. А раменьчык усё ж нарэшце.

«Ну і выкрунтасы! — глядзеў ачмурэла бортправадніцы ўслед.— Вось табе й паслова дачка! У турыст-класе».

Не, бадай, не кіну я пакуль што лёты-пералёты, паматляюся яшчэ крыху па белым свеце. І наша хата прычакае свята! Хоць і начуем часцяком у аэрапортах, затое — як пасля ляцім!

— Шампанскае, каньяк, віскі, джын, марціні. Для пасажыраў першага класа — задарма.

«Задарма мы ўжо праходзілі. Задарма толькі сыр у пастцы, за ўсё астатняе даводзіцца пеклаваць»,— прыўзняў я празрысты пластыкавы кубачак і павярнуўся да сцюардэсы:

— Армянскага, калі ласка.

## Трэцяе купэ

Спачатку ў купэ паказаўся бот, складзены ў гармонік. Ён наступіў на мае навюсенькія лакавыя туфлі-вастраносікі, неабачліва пакінутыя ля ўвахода. Яны жаласліва рыпнулі. За ім — лынуў атрутны пах перагару. І, нарэшце, на парозе з'явіўся той, ад каго ішоў перагар,— інспектар саўковай мытнай службы ўзору 199... года. Квадратны, наліты крывёю, аблеплены буйнымі воспінамі фэйс. Воспіны зніклі пад стрыжкаю з дзіўнай назваю «паўбокс» — адзінай для ўсіх грамадзян монадзяржавы. А паўбокс у яго быў рыжы.

— Чаго зекры вылупіла?! — не інакш прывітаўся ён з нашай суседкаю на свой манер. Бабуля «божы дзьмухавец», відаць, упершыню выехала за ваколіцу роднай вёскі.

Старая знямела. Яна была — сама дабрыня. Па першым часе страшэнна хвалявалася, безупынна жагналася і шаптала: «Божа,

уратуй і захавай, не дай у крыўду рабу сваю безабаронную». Троху асвойтаўшыся ў нязвыклых для яе абставінах, завінулася частаваць нас вясковай смакатою: пальцам пханай каўбасою, варанымі яйкамі з ярка-аранжавымі жаўткамі, самаробным — ажно, здаецца, раставаў у роце — сырам. Мы — я і маладая пара насупраць — за некалькі гадзін язды да мяжы, трупацячы сыр, ледзь языкоў не паглыталі. А бабуля ўсё прыгаворвала: «Ешце, дзеткі, ешце!» — і шчодра адкройвала ад белага, загорнутага ў марлю, тоўстага круга новыя і новыя кавалкі.

Цяпер бабуля спалохана глядзела на ўладальніка складзенага ў гармонік бота.

— Маўчыш?! — паказаўся і другі бот.— Ану ўстань!

У бабулі задрыжэлі рукі і барада. Яе важкае цела ледзь уціснулася між столікам і купэйнай перагародкаю. Ёй не проста было паварушыцца, не тое што ўстаць! Але яна паспрабавала. Зазвінелі шклянкі з чаем, прыпраўленым замiж цукру яе смачным, пальчыкі абліжаш, малінавым сочывам.

— Я, я...— пачала яна заікацца. Хацела нешта сказаць, але не мела сілы вымавіць і слова.

— Вылазь, старая кантрабандыстка! — раз'юшваўся, задаволены, што нагнаў на бабулю і на ўсіх нас страху, Прапаршчык. (Так я ахрысціў яго за падоўжна размешчаныя на пагонах зорачкі, хоць і ведаў, што ў мытнікаў яны значаць крыху іншае.) Бездапаможная разгубленасць жанчыны яго развесяліла.— А вы чаго раты паразяўлялі?! — не забыўся ён і на маладых.

Тыя дружна падхапіліся.

— Нам выйсці? — палахліва спыталася кірпатая шэравокая дзеўчынёха, нервова цярэбячы акуратна заплеценую касу колеру спелага каштану, што звісала на грудзі паверх светла-зялёнай, у белую палоску кофтачкі. Малады муж мякка ўзяў яе руку, быццам падтрымаў: «Не бойся, я — побач!»

— Дайшло нарэшце! — таптаўся па маіх, цяпер ужо зусім — на жаль! — сапсутых туфлях рыжы Прапаршчык.

У правым не вытрымаў, разышоўся па шве заднік. Наймаднейшыя вастраносікі — паэтаву мару! — можна было выкідаць. Можна, ды нельга: у абцасе левага я схаваў неапрыходаваную валюту.

У тыя далёкія часы, калі адбываліся падзеі, пра якія расказваю, клас «новых рускіх» толькі нараджаўся і людзі, што пераязджалі мяжу з валізамі грошай, на кожным кроку не трапляліся. (Апошнім

часам яны зноў прапалі.) Мытныя дэкларацыі, цяпер абавязковыя, звычайна не раздаваліся і адпаведна не запаўняліся. Але няўлічаную валюту вывозіць з краіны не дазвалялі і тады. Вось і хавалі за падшэўку, у бялізну, у іншыя патаемныя месцейкі незадэклараваныя грошыкі тыя, хто хацеў набыць не толькі двухкасетавы «Панасонік» і пару мадняцкіх джынсаў «Montana», але і такі-сякі не зусім дабіты «мерседэсік».

Не ведаю, што ўва мне спрацавала ў той лёсавы момант — пачуццё самазахавання ці інтуіцыя, сам не чакаў, што здольны на такое, але мяне панесла.

— Таварыш старшы лейтэнант! — пачаў з камплімента, бо павысіў рыжага ў званні. Ніводзін рыжы на маёй памяці ні разу не заставаўся абыякавым да цёплых слоў пра сябе.— Я, вядома, прашу прабачэння, але вы стаіце на маіх туфлях, на тым, выбачайце, што ад іх засталося. А выходзіць у шкарпэтках у калідор, самі разумееце...

Рыжы ленавата зірнуў сабе пад ногі, саступіў з туфляў і... (тут маё сэрца, шчыра скажу, пайшло было ў разгон) зафутболіў іх ботам у праход.

«Малайчына, дабрадзей мой дурненькі!» — адразу ж адлягло ў мяне на душы.

— Выходзьце! — чамусьці афіцыйна, на вы, звярнуўся да мяне мытнік, хоць я быў напалову маладзейшы за яго. «І што далей, цікава?» — захваляваўся зноў, але рыжы не даў апамятацца — паказаў пальцам на дзверы: — Там абуецеся! Вызваліце купэ для праверкі!

Пакуль я дапамагаў бабулі вылезці з-за століка, маладыя адышліся да тамбура — далей ад ляманту пільнага Прапаршчыка. Выбраліся нарэшце ў праход і мы з бабуляю.

«І чаго гэта ён прыляпіўся акурат да нашага, трэцяга, купэ? Чым яно, няшчаснае, правінавацілася? — набягалі адно за адным пытанні.— Астатнія ж ніхто нават не адчыняў».

За дзвярыма тым часам чуўся натужны сопат: рыжы ўзяўся за шмон. Нешта там грукнула. Няйначай штосьці звалілася з верхняй паліцы. Але ж туды толькі я свае сумкі закідваў?! Ды ліха з імі! Няхай! Галоўнае — разумнік у пагонах сваёй уласнай нагой найкаштоўнейшую рэч з зоныператрусу выкінуў. Каб ведаў, што шпурляе, быў бы больш далікатны з маімі туфлямі. Так што — шчыра ўдзячны.

А на старую, каб хто спытаўся, за што ўз'еўся? Бабуленцыя — пашукаць такую! Прызналася, што першы раз дзевяціпавярховы дом праз акно нашага купэ ўбачыла. Перад яздой перахвалявалася, усю ноч вачэй не заплюшчыла і толькі раніцай, калі пляменнік вёз яе на станцыю, змаглася — усе сто семдзесят вёрст праспала на задняй сядушцы.

Валюты заміж дазволеных колькіх соцень рублёў памяняла ўсяго на шэсцьдзесят пяць — болей не назбірала.

І вось цяпер рыжы хамуйла сваім крыкам давёў бабулю: яна цяжка дыхала, трымалася за сэрца.

І маладую пару ўшчэнт запалохаў: абое як прыліплі да тамбура.

Зноў у купэ нешта загрукатала. І што ён там шукае? Можа, ноччу наркотыкі прысніў і цяпер спрабуе іх знайсці, палічыўшы сон прарочым?

Нечакана рыжы адчыніў дзверы. Плюнуў на калідорны дыванок, ізноў дыхнуў перагарам:

— Дай прайсці!

Адапхнуў мяне да акна і ступіў да наступнага купэ. Не азіраючыся, праз зубы, некуды ў падлогу выціснуў з сябе:

— Інтэлігенцыя драная! Нават пойла з сабою не ўзялі! Пустадомкі!

«Вось табе й на! — не змог я стрымаць здзіўлення.— Дзеля гарэлкі такі гвалт узняў! Дарага ж абходзіцца дзяржаве твая смага! Правароніў незаконны вываз капустачкі! А табе ж, ашчадненькаму, яе стала б надоўга! І вагоны вам, рыжым, на шкуматанне няйначай па адным на рыла даюць. Хто пасля гэтага пустадомак?!»

Я прапусціў бабулю ў купэ. Не сталі доўга чакаць і маладыя.

— І чаго ён гэтак раскрычаўся? — ажыў нарэшце бязвусы муж і зноў узяў за руку сваю кірпаносую шэравочку.

— Мо чалавек не з той нагі ўстаў? Бывае такое. Усё і пакацілася не ў той бок,— заступілася бабуля за мытніка.— Не трэба на людзей злосці таіць.

— Затойваць злосць — не трэба, а вучыць нахабнікаў ветласці — трэба! — гарачыўся я.— У якім лесе рос? На якой стайні выхоўвалі?

Бабуля супакойвала нас: яна больш перажывала за іншых, чым за сябе.

Паціхеньку-памаленьку мы адходзілі ад перажытае калатнечы. Я падаў думку праветрыць купэ. Неўзабаве пасвяжэла не толькі ў паветры, але і на душы. Маладая жонка нашага спадарожніка зноў заўсміхалася. Бабуля, як і раней, узялася частаваць нас прысмакамі. Спакайней забілася сэрца і ў мяне.

Так, без новых трывог і турбот, даехалі да Берліна. На рыжага проста забыліся. Суцяшала, што свайго ён так і не дамогся. Тыя, што мелі ў запасе спіртное, сваё кроўнае аддаваць не збіраліся і не спалохаліся яго дзікага ляманту. Іншыя ж, накшталт нас... Зрэшты, пра іншых пакуль што памаўчым.

Цягнік ішоў са сваёй крэйсерскай хуткасцю і, супакаяльна пастукваючы коламі — та-та-та, та-та-та,— імчаў нас усё далей на Захад.

Бабуля ехала на бацькаўшчыну «бітлоў», у Ліверпуль, да роднага брата. Не бачылася з ім з часоў Другой сусветнай вайны. Усё ўздыхала:

— Ці пазнае Пецечка мяне, старую?

Маладая пара накіроўвалася да сяброў на поўдзень Францыі — у цёплым моры пакупацца.

— Прыедзем — і адразу на пляж, у ваду! — рабіла планы даўгакосае дзяўчо.

— Не,— пярэчыў ёй муж,— спачатку клункаў пазбудземся.

Я ехаў да ліпавай радні ў звышвольны Амстэрдам на выведы: казалі, там, на лета гледзячы, у некаторых шопах апаратуру за капейкі скідваюць.

Толькі пры расстанні бабуля прызналася, што таўшчыні ёй дадаваў абкручаны вакол жывата шалік з зашытымі ў яго залатымі чырвонцамі.

Незвычайнай была і каса ў маладой кірпулькі-жонкі — са шнурочкамі каменьчыкаў-алмазікаў. І дарма яна яе церабіла. Трапіўся б хто кемлівейшы за чырванамордага — здагадаўся б, што пальчыкамі яе нервачкі водзяць.

Не стрымаўся, пахваліўся сваім сховам-абцасам і я.

Усе дружна рассмяяліся.

## Самы Ніжні Тагіл

### I

Ёсць такі горад на Урале, Ніжні Тагіл называецца. Ціхі, трэба сказаць, гарадок, спакойны. Асабліва ўдзень. Але пра гэта — пазней.

Цёмна-шэрае, з адценнем хакі зімовае неба Ніжняга Тагіла апоўдні звычайна падфарбоўвалася аранжава-блакітным едкім дымам, што поўз, як з цюбікаў, з комінаў шматлікіх заводаў. І тады гэты пейзаж нагадваў карціну, адзін позірк на якую выклікаў невясёлую думку-здагадку: на небе нас чакае не толькі рай — знайшлося і там для пекла месцейка. Заводы ўсе былі пільна патрэбныя краіне і, вядома ж, строга сакрэтныя, такі, як, скажам, танкавы. Спецыялізацыі іншых не ведаю, а хлусіць, ледзь ступіўшы на парог, не хочацца.

Аднойчы ў Ніжні Тагіл зазірнулі два шукальнікі прыгод, больш дакладна — удачы. Маладыя авантурысты з НДІ электронікі марылі не толькі свет паглядзець, але і сябе, малайцоў, паказаць.

Прыехалі шукальнікі цягніком. Сціпла гэтак прыехалі, без шуму. Ды, калі папраўдзе, шумець ім і не выпадала: у гасцях — не дома, пакрыўдзяць — матулі не пажалішся.

Дык вось, гэтыя самыя шукальнікі-здабычнікі выйшлі на прывакзальную плошчу. А тут, ні адсюль ні адтуль, таксі да іх падрульвае, і кіроўца, вясёлы такі, проста сам Швейк-салдацік бравы, задаволены сабою і жыццём сваім нябедным, усміхаецца і кажа:

— Сядайце, паночкі даражэнькія, камандзіровачныя ці бізнесоўцы, нават не ведаю, як да вашага брата цяпер звяртацца. Калі ласка, загадвайце, куды вас даставіць. У нас тут такі расклад: налева пойдзеш — у інтэрнат патрапіш, у заводскі, гэта калі вы камандзіровачныя, направа — у гасцініцу сярэдняй рукі, дзе селяцца чаўнакі; проста паедзем — гэта ўжо са мною, у сэнсе, тады і я спатрэблюся,— у люкс-гатэль прыбудзем. Што, паночкі даражэнькія, выбіраем?

«Клоун і вершаплёт, цікавы суб'ект, карацей»,— зрабіў я сабе закладачку. І чаму гэта таксіст з усёй гурбы пасажыраў акурат нас выбраў?

— Нішто сабе ў вас гарадок, незвычайны,— разглядаючыся на бакі, загадкава зазначыў мой сябрук Жэня Бяндзераў. І, звяртаючы-

ся ўжо да мяне, запытаўся: — Ну што, стары, не будзем эканоміць на здароўі?

— Не будзем,— падтрымаў я аматара камфорту і павярнуўся да кіроўцы: — Давай, дарагі, паказвай свае палаты белакаменныя.

Таксіст-артыст, нібы пад каманду, расхінуў набіты залатымі, яшчэ эсэсэсэраўскімі зубамі рот і, заззяўшы, як лямпачка Ільіча, па-ранейшаму задаволены сабой, выдыхнуў:

— Ваня паноў камерсантаў умомант дамчыць. Усё будзе, як заўсёды... у сэнсе о'кей! — хуценька дадаў ён, міргаючы вочкамі.

«Цікава,— не пераставаў я здзіўляцца.— Выскаляецца ўвесь час, як блазан, а наконт нас з ходу дапяў».

Люкс-гатэль паўстаў у выглядзе шэрага панельнага будынка, на якім паміж першым і другім паверхамі прарэджанымі літарамі гарэла-свяцілася шыльда. Калісьці, напэўна, на ёй можна было прачытаць назву ўстановы, але цяпер нястача паловы літар рабіла гэта немажлівым. Затое люкс-нумары з двума студэнцкімі жалезнымі ложкамі, піянерскай фанернай тумбачкай, халодным душам, радыё, але без тэлефона і тэлевізара былі ў наяўнасці.

Пасялілі нас надзіва хутка, па-еўрапейску, як быццам чакалі даўно. Звярнула на сябе ўвагу і тое, што ў найлепшым, як запэўніваў нас чарговы, ужо гасцінічны, клоун, люкс-гатэлі горада не заўважалася іншых, апрача нас, прыезджых. Не было і мясцовых, начнага лёту, «мятлушак». «Зрэшты, яшчэ не час»,— прыйшлі мы да высновы, зірнуўшы на дапатопны (калі меркаваць з дызайну цыферблата) гадзіннік, што вісеў у фае.

Неўзабаве мы асвойталіся ў нумары, а яшчэ хвілін праз сорак я крычаў на Жэньку, які зачыніўся ў туалеце-душы:

— Ты там заснуў, ці што? Хлопцу з дарогі таксама апаласнуцца не шкодзіць, вагонны бруд змыць.

Пасля ледзянога душу мы нібыта наноў нарадзіліся, і я дазволіў сабе заікнуцца наконт дзяўчатак.

— Спачатку падмацуемся,— запярэчыў Жэнька. У яго былі свае правілы на гэта.— Здароўе найперш. Запомні, донжуан: арганізму патрэбныя вітаміны, тады — грошы і толькі потым — крэслы (жыццёвыя выгоды, значыць) ці дзяўчаты — гэта ўжо на выбар.

«Табе, можа, і гэткая паслядоўнасць даспадобы,— не пагадзіўся я,— а хлопцу дзяўчаты перш-наперш. І наагул, якія табе вітаміны без адпаведных капіталаў? Дый на жыццёвыя выгоды без іх не разгонішся».

Жэнька выставіў на стол усе прыпасы, што засталіся пасля трохдзённага падарожжа: бляшанку шпротаў (мэйд ін «амаль за мяжою», гэта значыць у Прыбалтыцы), дзве размякчэлыя «труфеліны», чвэртку сітнага і два пазначаныя пролежнямі яблыкі. Яблычкі, заўважу, былі не звычайныя, а залатыя, бо куплялі мы іх у цягніковага спекулянта, а заадно і пашыральніка друку — ён яшчэ і бульварнымі газеткамі гандляваў. Хацеў я сказаць пару ласкавых слоў хціўцу, але сябра мяне апярэдзіў: «Ты лепш бы не дзвесце працэнтаў накідваў, а, скажам, пятнаццаць,— даў Жэнька дармовую навучку пачаткоўцу дробнага бізнесу,— тады б не швэндаўся па вагонах цэлыя дні з адным вядзерцам. У інстытут табе трэба паступаць. Там розныя разумныя законы вывучаюць, скажам, аб пераходзе колькасці ў якасць».

Ацаніўшы спажыўную вартасць памянёных прадуктаў, мы зразумелі, што да раніцы на такім мізэры не пратрымаемся, і здумалі наведаць мясцовы люкс-рэстаран. Там, глядзіш, і дзяўчаткі — лепш позна, чым ніколі — надарацца.

Дзеля іх мы і надзелі ўсё найлепшае з узятага з сабою на «гульбу па Дунаі» (Жэнькава прыдумка). А ўзялі мы з сабой, паслухаўшы парады аднаго тутэйшага жыхара, які выступіў у ролі кансультанта, шмат чаго. І гэтаму «шмат чаму» многія пазайздросцілі б нават і сёння. Больш правільна будзе сказаць — асабліва сёння.

На Жэньку былі чорныя скураныя, ці, як ён з гонарам удакладняў, лайкавыя, штаны ад «Karden», бліскучая італьянская цёмнавішнёвая байка, замшавы шэры жакет і гішпанскія чаравікі колеру дзіцячай нечаканасці (тым годам надзвычай моднага).

Я адзеўся сціплей: шакаладны касцюм ангельскай фірмы «BHS», светлая кашуля ў буйную клетку, чаравікі мала каму вядомай тады (во цёмныя былі!) «Salamander».

Тандэмчык выйшаў някепскі: бландзін з брунетам у апратках на ўсякі густ. Скажам так, хлопцы да бою гатовы! Але ў свядомасці чамусьці круцілася не надта вясёлая рыфмачка: надзелі што мелі і ўсё ж праляцелі. Такі вось вершык прыклеіўся. Думаеце, падказка зверху? На жаль, нічагуткі мы не ведалі.

Спусціліся ў рэстаран красунчыкі (вось і не вазьму ў двукоссе!) недзе а палове на восьмую, але незаняты столік быў толькі адзін, дый той у куточку («Адсюль цяжкавата будзе дзяўчатак выглядаць»,— зацеміў я адразу) і з шыльдачкай «Заказаны». Запыніў-

шыся ў цэнтры залы, мы яшчэ раз разгледзеліся, хітнулі па-крутому галовамі: ніводнага прасвету. Няма дык няма, і Жэня прапанаваў:

— Што ж, атаварымся на кухні і — у нумар. Перакусім — і баюбай. Ляжам раней. На досвітку ўставаць: выведка боем. Магазінаў тут, здаецца, няшмат, але таварчык, мяркую, будзе ў тэму. Сам ведаеш, як яно вядзецца: таго, што ў іх на складах гніе, у нас днём з агнём не знойдзеш. А тутэйшых дзяўчатак яшчэ паспееш шампанскім пачаставаць. Дый ці п'юць тутэйшыя Абрау-Дзюрсо? На тваe панскія звычкі тут, як мне думаецца, пажадана забыцца. Сітуацыя ў гэтым Кітаі нейкая... Не ведаю нават, як сказаць... нервовая, ці што. Чуе маё сэрца, што яшчэ не вечар.

І адгадаў. Па дарозе на кухню нас запыніў нейкі бойкі хлопец і, усміхаючыся (ну зусім не Ніжні Тагіл, а — ура стаматолагам! — Галівуд), спытаў:

— Панове, а што ж вы за свой столік не сядаеце?

— За свой столік? — адначасна вырвалася ў нас абодвух.

— А-а, так-так,— працягваў ужо адзін Жэнька.— Дзяжурная з паверха вам пазваніла, напэўна?

— Само сабою, Вольга Васільеўна нам усё перадала. Так і сказала: «Новенькім хлопцам запэўніце столік, і каб ніхто не замінаў, у куточку дзе».

(«Выходзь на новенькага»,— пранеслася ў мяне ў галаве — недарэмна, напэўна.)

— Цікавая ініцыятыва з боку дзяжурнай з паверха, спрактыкаваная, аднак, дзяжурная,— шапнуў Жэнька мне ў вуха,— прагадлівая.

Бойкі хлопец прыбраў са століка шыльдачку, і мы селі на запэўненыя месцы.

Афіцыянтцы нас даручылі маладой, сімпатычнай, і Жэнька, убачыўшы яе, адрэагаваў з ходу:

— Як запасны варыянт — нішто сабе, пойдзе.

«Запасны варыянт» быў дзяўчынай шустрай і кемлівай — яна відочна прэтэндавала на тое, каб перайсці ў асноўны. Падаўшы чарговую страву, Люда-Людачка запынялася ля нашага століка, выслухоўвала Жэнькавы досціпы наконт мясцовых жартаўнікоў-таксістаў («Тыя яшчэ ворлікі»,— пагаджалася яна), абшарпаных люкс-нумароў («Так, не Парыж»,— уздыхала) і іншых тутэйшых адметнасцей. Неўзабаве Жэнька з «найпрыгажэйшай на Урале» (во пайшоў кампліменты шпурляць, а казаў жа: галоўнае — вітаміны) быў ужо на ты і, як пасля высветлілася, пастараўся не марна.

За гадзіну мы расквіталіся са «Сталічнай» салатай, якасці — натуральнай у такіх установах, з курыным заліўным, падобным да квашаніны з ножак пярэстаркі-свінні (у дзяцінстве я аднойчы такім аб'еўся) і разбавілі ўсё гэта «Белым буслам», які, надзіва, прынеслі неадкаркаваным.

Неўзабаве наведвальнікі (і мы, на жаль, разам з імі) пачалі п'янець, але, апрача ўсё больш частага мату, нас нішто асабліва не занепакоіла. І дарма.

«Бусел» затуманіў вочы, і мы забыліся «прабіць» публіку. А тым часам набліжаўся момант, які я не забуду ніколі, хоць бы таму, што ён адразу паставіў пад сумнеў эпітэт «ціхі» ў дачыненні да нашага бытнішча.

Група музыкаў (таксама эстэтаў: усё «не гони лошадей» ды «не гони-и») пайшла перадыхнуць, і амаль што адразу сярод запанавалай цішыні пачуўся дзікі лямант:

— Сёння я вам зладжу, блядзі, вечар! Сёння вы ў мяне пакуляецеся! Я — Міна-ай! Забыліся? Устаць, сукі!

Жэнька папярхнуўся фрагментам таго, што ў меню значылася як гуляш, і, кхэкаючы, схапіў шклянку з ліманадам — запіць.

Крык узвіўся ў мяне за спінаю і нагадаў, што там, ззаду, знаходзіцца сцэна: можа, пачаўся які авангардысцкі спектакль? Але інтуіцыя падказала: не, дружа, гэта не спектакль, гэта — жыццё. Жыццё, якое пачынаецца ў «ціхім» ніжнім горадзе разам з надыходам ночы. Цёмнае такое жыццё, змрочнае. Тайга, адным словам.

— Ай-я-яй! Ахранеў народ! Міная забыліся?! А Мінай сёння рэзаць будзе ахранелых! Ох, будзе! — І маларослы, моцна збіты неандэрталец гадоў трыццаці, са шмат разоў парэзаным тварам, што спалучаў ленінскі лоб і мангольскія вочкі («Відавочны шызафрэнік,— мільганула ў мяне ў галаве,— прытым закончаны»), усхапіўся з крэсла і ўскочыў на стол. Прымружыў і без таго амаль нявідныя вочкі, і яны нібы зніклі. Сабачая морда абярнулася ў пацучыную і, не адкрыўшы, а скрывіўшы рот, адпрацаваным фальцэтам завішчэла:

— Сука буду — не забуду!

Схапіўшы бутэльку шампанскага, недарэзаны з размаху агрэў суседа па галаве.

— Я — Мінай! — неслася наўслед стрыжанаму пад нуль хлопцу, які потырч кульнуўся з крэсла.— Ты ўсёк, вырадак, на каго зекры лупіш? Усіх прырэжу! — не мог ніяк супакоіцца недарэзаны,

накручваючы сябе ўсё больш і больш. Спружыністы быў, трэба сказаць, жвавы.

Па шчацэ хлопца, які зваліўся з крэсла, цякла кроў, і, патаргаўшыся крыху на падлозе, ён заціх. «Страціў прытомнасць,— заначыў я.— Калі зараз жа не дапамагчы, можа й загнуцца».

Аднак выгляд крыві толькі ўзбадзёрыў Міная.

— А ты, падла, чаго вылупіўся? — гыркнуў ён на мужчыну-бугая за суседнім столікам.— З'еш і ты, вырадак! — і ўсадзіў мужыку ў грудзі нож, які невядома адкуль з'явіўся ў ягонай руцэ.— На! Атрымай! Атрымай! — вішчэў Мінай, раз-пораз вырываючы нож і наносячы новыя ўдары.— Хто яшчэ пяра захацеў? — павярнуўся да залы.

Зараз, успамінаючы той момант, разумею, што Мінай быў сапраўдным бандытам, даперабудовачным, не раўня цяперашнім: за проста так мог зарэзаць.

Кроў з нажа пырснула на дзяўчатак за суседнім столікам, і, адолеўшы гіпноз, яны нарэшце закрычалі (праўда, як нам падалося, не на поўную сілу).

Мінай быў хлопец спрытны, але ўхіліцца ад бутэлькі, што ляцела ў яго ззаду, не змог: ён яе не бачыў. Бутэлька была запушчана кімсьці дасведчаным у кіданні. Пацэліла дакладна ў патыліцу і не як-кольвек наўскос, а самым донцам. Мінай паваліўся на суседні, злева ад нашага, стол, за якім вішчэлі дзяўчаткі, і, перакаціўшыся, распластаўся ля нашых ног.

«Выдаткі вытворчасці»,— падсумаваў я сам сабе.

Але Мінай не быў бы Мінаем, калі б вось гэтак проста ўзяў ды сканаў. Нож, што застаўся ў ягонай руцэ, заварушыўся, і, ачуняўшы, неандэрталец ускочыў і кінуўся міма нас у тую частку рэстарана, адкуль прыляцела бутэлька. Відаць, ведаў, хто мог на гэта адважыцца. І праўда, хто?

Замітусілася-забегала і астатняя высокая публіка. Услед за Мінаем рынуліся два-тры яго хаўруснікі, гэткія ж мангалаватыя апалонікі (не такі ўжо і рэдкі гібрыд, выходзіць). З другога канца залы за імі спяшаліся чалавек пяць асоб «каўказскай» нацыянальнасці. У руках у іх былі ланцугі.

— Пазнаю, пазнаю-ю наш рэстаранчык,— спакойна выстаўляла на стол сімпатычная Люда заказаную Жэнем рыбу.— Класны спектакль убачыце. Зрэшты,— дадала яна,— ён ідзе тут штодня.

Рэстаран быў вялікі, а столікаў не так і шмат — месца для гладыятарскіх забавак ставала. Не мінула і хвіліны, як па зале з

крыкамі насіліся ўсе, апрача нас і гасцей за суседнім — справа ад нашага — столікам, чатырох дзяўчатак і зграбнага хлопца ў «адзідасе», пад якім ля пояса адгадвалася нешта больш сур'ёзнае, чым усе гэтыя нажы, ланцугі ды кастэты. Па-за калатнёй заставаўся толькі наш астравок. І нешта падказвала: лепш не выпрабоўваць лёсу, сядзець ціха, не варушыцца. Жэня ад такіх сюрпрызаў знямеў і скамянеў, як правадыр пралетарыяту на адной з плошчаў велізарнай, даўней, а цяпер зніклай, краіны.

— Слухай, мы што, у непрабівальным полі сядзім? Ці сапраўды забраняваныя? — ачуўшыся ад наслання, спытаў я ў сябра.— І што б усё гэта, як ты думаеш, значыла?

Нічога ён не думаў. Дый ці можна думаць пра што ў сітуацыі, калі стукат сэрца ў галаве адбіваецца?

— Вас на дэсерт пакінулі,— пачуў я з-за спіны ціхі голас Людачкі, і да мяне дайшло: «Нас ашчаджаюць, як тых выбраных на забой бараноў, адкормліваюць...»

«Між сабой разбірайцеся, а лохаў маіх не чапайце»,— думаю, нешта такое сказаў той, у «адзідасе», тутэйшым адмарозкам. Здаецца, і «пушка» тут была толькі ў яго, астатнія так, шушамець, хіба што парэзаць могуць. Праўда, рэжуць тут, дык рэжуць. Кроў фантанам пырскае. Але субардынацыя, скажу вам, узорная. І гэта добра. Значыць, галоўнае — пад аховаю «адзідасніка» ўцячы ад адмарозкаў, а пасля і ад самога абаронцы, таксама, пэўна што, аматара і калекцыянера розных купюраў. «Асабліва чужых»,— давязваў я ланцужок, страляючы вачыма па зале.

А на авансцэне-арэне валтузілася чалавек шэсцьдзесят. Дзяўчаткі, быццам пад каманду, выстраіліся ўздоўж сцен і вокнаў. Некаторыя паспелі закурыць. Шустрыя! З дзесятак гладыятараў ужо ляжалі на падлозе, калі «адзідаснік», высунуўшыся ў акно, даў адмашку мянтам, якія стаялі на вуліцы, і тыя нарэшце непарадак заўважылі.

У залу забегла брыгада (тузіны тры братоў-блізнюкоў) і рукамі, нагамі, дубінкамі амаль імгненна паклала на бетонную падлогу ўсіх, каторыя заставаліся на нагах, наведвальнікаў. Угледзеўшы, як двое мянтоў валакуць за ногі Міная, ужо без адзнакаў жыцця, я зразумеў, што неўзабаве ў гэтай зале застануцца толькі пачэсныя госці: мы і каманда «адзідасніка». Нам, можа, улічваючы маральныя выдаткі, дазволяць не разлічвацца за вячэру, але заплаціць за ўратаваныя жыцці давядзецца. Больш дакладна, аддаць усё: не той выпадак, каб капейкі лічыць. Жэня, убачыўшы, што сталы, нажы і

людзі па зале больш не лётаюць, крыху супакоіўся (ён сядзеў да «адзідасніка» спінаю) і падсунуў да сябе талерку з рыбай.

— Фільм жахаў,— сказаў ён не сваім голасам.— Карпентэр з Хічкокам адпачываюць. Га-а?

Для мяне жыццё было даражэй, чым смажаны карп, і я, махнуўшы Людачцы, хуценька пашыбаваў да яе ў бок кухні. Трэба было нешта рабіць, нешта дзеяць.

«Адзідаснік», відаць, заўважыў мае торганні, прыўзняўся. Але прасачыўшы, куды я пайшоў, не кінуўся наўздагон, зноў апусціўся на крэсла. Мусіць, успомніў, што Жэня застаўся ў закладніках. Так я і ведаў: пры мянтах засвечвацца, паказваць свой інтарэс да нас ён не стане. Да таго ж у яго былі іншыя турботы. Мяркую, фразу «вы бачылі забітага апошнім», звернутую да сябе, ён не хацеў бы пачуць нават ад сяброў. Пасадзіць не пасадзяць, але грошай за паслугі папросяць.

— Людачка, толькі адно пытанне,— стаяў я каля ўвахода ў буфет.— Як нам адсюль выбрацца, у сэнсе жывымі выйсці?

— Ніяк,— спакойна адказала Люда (у гэтую хвіліну яна мне падалася не вельмі сімпатычнай і нават не такой ужо і маладой).— Ад Зуба яшчэ ніхто не ўцякаў. Прынамсі, тут, у нашым рэстаране. Да таго ж ён абвясціў вас сваёй уласнасцю. «Каб на новенькіх ніхто вачанятак не вылупляў і зяпу не разяўляў»,— сказаў усім гадзіны дзве таму. (Ага, вось як яно было!) Таму ад вас, як ад агню, усе і шарахаюцца. Лепш піку атрымаць, чым з Зубам звязацца. І я, чаго добрага, магу дагаварыцца.

Трэ было нешта рабіць. Увесь трыццацігадовы жыццёвы досвед падказваў, што безвыходных сітуацый не бывае. І, ужо нічым не рызыкуючы, я прапанаваў, як сказала б Людачка, на дэсерт:

— Ты бачыла калі долары? Шмат долараў. Скажам, сто.

Добры быў час: за сотку адкупляліся!

Слова «долары», такое ж рэдкае ў тутэйшым ужытку, як і самі абазначаныя ім грашовыя знакі, напалохала яе, але яно ж і памагло адолець страх, надало Людзе адвагі:

— Выйсці можна толькі праз кухню, але там жалезныя дзверы і яны замкнёныя. Ключ у дырэктара, а яго вечарам (цяпер ведаеце чаму!) ніколі не бывае.

— Добра, а ў кабінеце дырэктара дзверы браняваныя?

— Не,— адказала Люда, скеміўшы, што я маю на ўвазе,— дзверы як дзверы.

— Тады — берымося!

Мой план палягаў у тым, каб прабрацца спачатку ў кабінет дырэктара, пашныпарыць там наконт «залатога ключыка» і пасля ўжо далей выпрабоўваць лёс.

Першая частка аперацыі прайшла на выдатна. Трэба сказаць, што і надалей Люда чынна трымала наш бок: ужыццяўляла лучнасць паміж мною і Жэнькам, адцягвала Зубаву ўвагу, а пад канец заявіла, што пра сябе парупіцца сама (і, як пазней мы даведаліся, парупілася), чым зняла з нас маральныя вярыгі.

Карацей кажучы, мы здабылі волю.

Вырваўшыся на двор, пранесліся паўз Дом быту, хімчыстку, магазін «Хлебны» (як я паспяваў назвы чытаць?). Ламанулі за стэнды, з якіх нас віталі ўдарнікі камуністычнай працы, і апынуліся на бубне, а папраўдзе — на закладзенай з уральскім размахам будаўнічай пляцоўцы. Штохвіліны рызыкуючы грымнуцца ў яму ці напароцца на ражон з іржавай арматуры, мы не прыпынялі чэмпіёнскага забегу. І Бог злітаваўся над «спартоўцамі»: дыстанцыю адолелі без асаблівых страт для здароўя, ды ў дадатак натрапілі на «КамАЗ», гружаны дошкамі.

Лёгкія разрываліся ад даўно забытай нагрузкі, у вачах праплывалі белыя шары, і, не змаўляючыся, мы спыніліся. Трэ было перадыхнуць і заадно ўзважыць, як там справы з пагоняй і ці не нас чакае «КамАЗ» з дошкамі, з каторых, як вядома, труны збіваюцца.

— Добра беглі,— спрабаваў жартаваць Жэня, ды я толькі зубамі скрыгатнуў: мы маглі гэтаксама добра ляжаць.

Не марнуючы часу, падняў з зямлі абрэзак арматуры і, асмялеўшы, зазірнуў у кабіну — нікога. Абгледзеў з падножкі грузавіка мясцовыя адметнасці, прыслухаўся: быццам ціха... І ў гэты момант адбылося аб'яўленне Антыхрыста народу: з цемры перада мною ўзнік не зусім цвярозы гаспадар аўто і разам — раскрадальнік будаўнічых матэрыялаў.

— Гэй, мужык,— крыкнуў я работніку ў нейкім сэнсе інтэлектуальнай працы.— Калі мы зараз паедзем, і паедзем вельмі хутка, ты атрымаеш вось гэта,— тыцнуў яму пад нос правую руку, адзін з пальцаў якой аздабляў залаты пярсцёнак работы аднаго маленькага габрэя, вялікага знаўцы даўганогіх «гёрлз» вясёлых паводзін,— і табе нейкі час не трэба будзе красці гэтыя няшчасныя дошчачкі.

— А ад каго шыецеся? — з неймаверным, проста-такі наркатычным спакоем спытаў мужычок. Біты, відаць, быў хлапчына, не працячок, няйначай з крымінальным мінулым.

— Ды магазінчык з такімі вось бразготкамі грукнулі.

— А-а, ну тады святая справа,— вывеў былы гоп-стопнік.

Мы ўскочылі ў кабіну.

Я апошні раз азірнуўся на будоўлю веку, што ўратавала нас, і не без трывогі адзначыў, як яе крэсляць уздоўж і ўпоперак агоньчыкі-ліхтарыкі: «Не супакоіліся хлопцы, шукаюць. І сапраўды, цяпер для рызыкоўных малайцоў гэта справа чэсці. А то, глядзіш, адны ўцякуць — іншым захочацца. Гэтак і на бабах застанешся».

Для нас жа расклад быў іншы: мы атрымалі з паўгадзіны форы. І вадзіла наш быў малайцом: «Едзем да мяне»,— кінуў на маё маўклівае пытанне.

«Шукайце, шукайце»,— наказваў я «ліхтарыкам» ужо больш спакойна, калі «КамАЗ» па-дакарску рвануў з месца...

Камазнік жыў у прыватным доме на ўскраіне горада. Дом, паводле азначэння яго гаспадара, быў прыблатнёны — з тэлефонам, і мы не ўтрывалі, пазванілі забытаму да часу мясцоваму кампаньёну. У прынцыпе, якому там кампаньёну — проста апынуліся неяк разам у схільным да легкадумства горадзе Сочы, дзе ён і панаплёў нам пра скарбы, асабліва мэблевыя, што ледзь не задарма бяры ў тутэйшых супершопах з падвешанымі да столі ліпучкамі для знішчэння мух і іншага паскудства. Меркавалі абысціся без яго, але зараз розніцу давядзецца дзяліць на траіх (халява, на жаль, не прайшла). Зрэшты, усіх грошай не забярэш, а з жыццём, рызыкуючы, як сёння, развітацца можна ўмомант. Карацей, пазванілі.

Заспаны кампаньён доўга не мог даўмецца, «каму там не спіцца», але як толькі сцяміў, што да чаго, прачнуўся імгненна. «Дысцыплінаваны і лёгкі на ногі,— падумалі мы.— Гэта добра». І слушна падумалі.

Прадыктаваўшы трэцяму-не-лішняму адрас гоп-стопніка на пенсіі і расказаўшы ў двух словах пра нашы надзвычайныя прыгоды, мы пачулі голас надзеі: «Буду хвілін праз трыццаць — сорак. На белай «сямёрцы». Пастарайцеся нікуды не выходзіць».

«А кампаньён у курсе мясцовых звычаяў,— ласкава прайшліся мы па новым дружбаку.— І чаго ж ён, гад, у Сочах пра іх сціпла прамаўчаў?»

Камазнік, пачуўшы сапраўдную версію нашых уцёкаў, пярсцёнка не ўзяў («Хай у мяне пакуль што дзесяць пальцаў на руках застанецца»), а толькі папрасіў на пляшку і паставіў умову, каб чакалі мы «свайго хаўрусніка» на дварэ, і на тым — тыцнуў ён брудным

пальцам у акно,— супраціўным ад яго дома баку. «Вы сёння тут, заўтра там, а мне яшчэ пажыць хочацца. Так што вось вам Бог, а вось парог».

Мы палічылі ягоныя довады пераканаўчымі і, узаемна задаволеныя, развіталіся.

Хвіліны здаваліся гадзінамі, але калі мінула іх дваццаць восем (па секундах лічылі), убачылі белую «сямёрку», пра якую гаварыў наш кампаньён. Пытання «сядаць — не сядаць» у нашай сітуацыі не ўзнікала, і мы ўскочылі ў машыну.

Ехалі наструнена. Жэнька сядзеў скасабочыўшыся, грудзямі ўперад, тварам да задняга шкла: ці то пагоню адсочваў, ці то маршрут на ўсялякі выпадак запамінаў.

Але хваляваліся мы дарма.

Кватэра новага сябра «Клуба ахвотных і знаходлівых» была напакаваная, як кажуць, пад завязку. Нас з Жэнькам гэта дужа ўзрадавала: хто б там што ні казаў, але чым багацейшы чалавек, тым болей шанцаў, што ён вас не абрабуе.

Выдзеліўшы асобны пакой, нас запрасілі (пасля ванны, вядома) «павячэраць чым Бог паслаў». «Ты глядзі, нават у гэтым ціхім горадзе Ільфа і Пятрова ведаюць»,— шапянуў мне Жэнька, калі з бурчэннем у жыватах (яго рыба і мая катлета па-кіеўску засталіся Людачцы заміж прэзента, як, зрэшты, і родная сотачка) мы ішлі на кухню.

Расказаны Мікалаю (няўрымслівы жартаўнік Жэнька крыху пазней спрасціў «царскае» імя нью-кампаньёна да нянаскай карацелькі — Мік) увесь баявік «Прыгоды двух сціплых чаўнакоў у не вельмі сціплым Ніжнім Тагіле», на наша абуранае здзіўленне, асаблівых пачуццяў і суперажыванняў у гаспадара дома не выклікаў. Сумленна выслухаўшы ўсе жахі да канца, ён толькі сонна спытаўся:

— І што, зусім-зусім не стралялі? Та-ак, старэюць хлопцы, старэюць... От у наш час...

Толькі пад раніцу, стомленыя бурнымі падзеямі і напалеонаўскімі планамі, мы паваліліся на аграмаднае румынскае крэсла-ложак, якое нам выдзеліў гаспадар. Жэнькаў мозг, нават засынаючы, спрабаваў аналізаваць ход і вынікі перамоў:

— Прафесіянал — сам узяў меру, а нас напаіў добра. Цікава, ці шмат лішняга нагаварылі? Але, нямала на грудзі прынялі. Ды як

не напіцца пасля такога працоўнага дня? Га-а? Нанава ж, можна сказаць, нарадзіліся.

«І ў кашулі, забыўся ён, ці што»,— дадала мая затуманеная свядомасць.

— Праўду, бацька, кажаш,— было апошнім, што выціснуў я з сябе — і вымкнуўся.

Прачнуліся пад абед (калі меркаваць паводле пахаў, што плылі з кухні), памыліся, пагаліліся і, адчуўшы сябе больш упэўнена, рушылі на пяшчотныя для вушэй гукі, якія выдае мяса, калі смажыцца-сквірчыць на патэльні.

— Вы ўжо даруйце гасцям нязваным, што гэтак доўга ўчора мучылі вас гутарыстыкай,— узяў Жэня на сябе ініцыятыву ў наладжванні кантакту з жонкай таварыша ў бізнесе.— Хоць Саша,— валіў ён усё на мяне,— любіць пабалакаць. І пазабаўляцца трохі. Прыкладам, нядаўна ў незнаёмым горадзе пайшоў у рэстаран шыкоўны і нават жывы адтуль вярнуўся. І ўсё б добра, ды толькі дагэтуль не зразумеў, што вярнуўся зусім выпадкова... Не слухае старэйшых. А пад стол жа пешкі хадзіў, калі некаторыя...

— Ды годзе табе,— абарваў я дэмагога.— Ты лепш успомні разумніка з графскімі замашкамі, аматара люкс-гатэляў.

— Усё нармальна,— падвяла вынікі балбатні гаспадыня,— ідзіце есці. Мікола скора пад'едзе.

І праўда, праз колькі хвілін у кватэры празвінеў званок, і наш новы кампаньён з парога, усміхаючыся, рэкнуў:

— Сёння ваша чарга наліваць! Усё куды лепей, чым я думаў! Ну ды пра гэта пазней, спачатку перакусім,— скончыў ён, распранаючыся.

— Не, не, не! — захваляваліся мы з Жэнем, займаючы месцы па адзін бок барыкады.— Нам без інфармацыі ежа ў горла не палезе. Ты ўжо не муч, не будзь катам.

— Капрызныя гэтыя камерсанты, усё ім не так. Але тут я згодны, сапраўды. Напярод — справа, гэта значыць крэслы ці самалёты, а рэшта (тут, не змоўчу, ішоў намёк на маіх бедных дзяўчатак) — потым. Добра, будзем лічыць, перакапалі. Дык вось, дазвольце зачытаць увесь спіс.— І Мік пачаў пералічаць: — На каменны кар'ер — два чалавекі... Не разумеюць прыезджыя панове гайдаеўскіх жартаў,— паглядзеўшы на нас, канстатаваў ірад.— Хоць вы ж учора ГПА на залаты значок здавалі.— Але, злавіўшы

строгі позірк жонкі (вясёленькі партнёр трапіўся, зрэшты, як і ўсе ў ціхім горадзе ўдзень), узяўся за справу: — Першае — дванаццаць крэслаў з...

— Мікола, кінь! Людзі за трыдзевяць зямель не жарцікі твае слухаць прыехалі! — прыкрыкнула на нашага лютара жонка.

— Ды я не жартую. Дванаццаць крэслаў са сталовым гарнітурам. Вытворчасць — Югаславія. Ужо і праўда чалавеку слова сказаць нельга...

— Дык і кажы гэтае слова,— зноў падтрымала нас новая хаўрусніца,— а не трэль абы-што.

— Ну добра, добра, не наязджай,— спрабаваў адбіцца Мік.

— Чытай, чытай,— хорам перайшлі мы ў атаку.

— Другое — дваццаць дзіцячых пакояў. Made in USA... Спальні, вытворчасць — Румынія...

Спіс быў такі доўгі (меў усё ж, гад, права дражніць дзікіх гусей), што, разявіўшы раты і слухаючы чарговае «мэйд ін...» — мы неўзабаве перасталі лічыць — за колькі ходак зможам вывезці скарбы Тутанхамона — заляжалы ў тутэйшых магазінах дэфіцыт.

— Кландайк, а не Ніжні Тагіл,— падвёў Жэня вынік агучвання ўсяго спіса.

— Далей,— не супакойваўся наш новы партнёр.— У чыгуначны кантэйнер (фуру — забыць: на дарогах аблавы з нашых хлопцаў стаяць) улазіць...

Усё гэта, трошкі звыкшыся з дзівосамі, мы слухалі больш спакойна.

Урэшце, пасля зацятай спрэчкі паміж мною і Жэнем, першую ходку намеркавалі зрабіць спробнай, па многіх пазіцыях адразу не біць. Узяць для пачатку толькі «дзіцячыя пакойчыкі», а там відаць будзе.

— Тады — да справы,— праявіў Мік задаткі кіраўніка, і мы пачалі збірацца ў дарогу.

Гадзіны праз паўтары белая «сямёрка» пад'ехала да склада часоў Пятра Вялікага. Калі я ўбачыў аграмадную аблезлую гаспадарчую будыніну і побач з ёю — старадаўні двухпавярховы асабняк з забітымі вокнамі, чамусьці адразу ж падумаў: «Акурат тут нас і пахаваюць. Разрэжуць на кавалкі і раскідаюць па розных кутках "Вішнёвага саду"» (нягледзячы на рэстаўрацыйна-шкодніцкія работы, склад нагадваў панскую сядзібу, сканфіскаваную і прыстасаваную да інтарэсаў працоўнага народа ў навальнічныя гады).

Але дарэмна так думаў. З'явілася тоўстая загадніца склада і заміж роспалаці прапанавала нам гарбату, пернікі і іншыя ўральскія ласункі. Спрабавала паднагрэць лохаў, спекульнуць на іх яшчэ і самацветамі. Але даходны Жэнька адказаў строга: «Самі з вусамі і выхад на каменьчыкі просты ведаем» (ох і маніў!). Гаспадыня за «пралёт», на наша здзіўленне і радасць, не пакрыўдзілася і, не марнуючы часу, узялася за справу.

— Хлопчыкі і праўда ўсе «дзіцячыя» забяруць? — перапытала з недаверам у Міка.— Та-ак, за дзень двухмесячны план выканаю. І куды толькі можна спхнуць два дзесяткі дзіцячых па вар'яцкай цане? Бываюць жа ненармальныя!

«Цікава,— падумаў я,— амерыканскія дзіцячыя пакоі за... так, колькі ж гэта ў нармальных грашах? Ага, за сто трыццаць сімвалічных, сказаў бы, долараў нікому ў Ніжнім Тагіле не патрэбныя. Паўстае пытанне: і куды бандыты глядзяць? Золата пад нагамі валяецца, а яны па старой завядзёнцы спрабуюць залезці ў чужыя кішэні».

Гружэнне ладна заняло часу: Мік сачыў, каб рабочыя насілі ўпакоўкі асцярожна (а значыць — паціху) і складвалі іх роўненька — адну да адной (золата, а не кампаньён!). Гадзіны праз чатыры ладаванне «драўніны», як казалі нецярплівыя грузчыкі, скончылася, і, не чакаючы канца змены, не звяртаючы ўвагі на вокрыкі мажной загадніцы, хлопцы пайшлі ўзяць пару-тройку «пузыроў». Тут, само сабою, Мік быў вінаваты, торкнуў, чорт, хлопцам дваццацьпятку. Тыя ажно працверазелі. «Па дзве белай на рыла?!» — перапытвалі ўтарапела. «Та-а-ак, можа здарыцца, што сёння "напрасно старушка ждет сына домой",— гледзячы на грузчыкаў, падумаў я.— Літр без закусі — гэта сур'ёзна... Хоць на Урале свае ўяўленні аб рэкордах...»

Але ўзніклі праблемы і ў нас.

Калі пагрузілі дзіцячыя гарнітуры, выявілася, што ў кантэйнеры засталося вольнае месца. Разважыўшы згодна з сітуацыяй, Мік агучыў дзіўную для сферы бізнесу прапанову:

— На тыя грошы, што належаць мне, возьмем яшчэ адну дэфіцытную па ўсім Саюзе пазіцыю — індыйскія ручнікі — і заткнём дзіркі. Нельга скрынку няпоўнай адпраўляць. Гарнітурчыкі сюдытуды пакоўзаюцца, і пад канец падарожжа замест іх атрымаем высакаякасныя дровы... Наконт грошай — думаю так: адным заездам вы сытыя не будзеце, прыедзеце яшчэ, тады і разбяромся.

Такая шляхетнасць у той вясёлы час была рэдкасцю (цяпер ні пра што такое наагул гаварыць не даводзіцца), і адмаўляцца ад прапановы было б нечуваным глупствам.

Пакінуўшы Жэню ахоўваць тавар, мы з Мікам праехалі да бліжэйшага прызаводскага магазінчыка. Зайшоўшы праз кабінет загадніцы адразу на склад, забралі ўвесь наяўны лазне-пральны асартымент і ў дадатак, на ўсякі пажарны, прыхапілі яшчэ тузін кітайскіх падушак.

Вярнуўшыся да галоўнай пляцоўкі загружвання, мы заспелі Жэню ў стане лёгкага афекту. Выявілася, замест запланаванай паловы гадзіны нас не было цэлых дзве. Як жа, аднак, у працы час ляціць! Бедны Жэнька ледзь не памёр ад розных благіх думак. Дый напарніца, здаецца, спрабавала свайго шанцу не ўпусціць. Цікава, адбіў зямляк атаку ці ўсё-ткі спазнаў асалоду мімалётнага флірту?

У той далёкі час кантэйнеры, што каталіся па краіне, бандытамі не адсочваліся, і да грузавой чыгуначнай станцыі мы даехалі без прыгод.

Нейкі час быў затрачаны на афармленне розных паперак і даванне лёгкіх прэзентаў прадстаўнікам «ніжэйшага бюракратычнага звяна». Неўзабаве, я сказаў бы, нарэшце-такі, мы вызваліліся ад грузу, што вісеў на нашых карках ужо больш за дванаццаць гадзін.

Рукі былі развязаныя, але чамусьці адразу захацелася адчуць іх звязанымі, і я ўспомніў пра дзяўчатак. На здзіўленне, рыбак Жэнька падтрымаў маю ініцыятыву. Аднак беспрэцэдэнтная ў сваёй нахабнасці прапанова новага кампаньёна: «Я ведаю адзін класны рэстаранчык...» — нас адразу астудзіла. Гэта як напалены метал у ваду апусціць (пра што, дарэчы, яшчэ будзе).

— Не-не, час дадому збірацца. Стаміліся вандраваць,— амаль што хорам адгукнуліся мы.

«От малайчына,— падумаў я пра Міка,— ведаў, як уратаваць хлопцаў ад рэпартажу з пятлёй на шыі».

Да адпраўлення рэйса Свярдлоўск — Масква заставалася пяць хвілін. Жэнька глядзеў у ілюмінатар (як больш пацярпеламу — ён так лічыў — гэтае месца дасталося менавіта яму) і паважна (ужо трошкі расслабіўся, змей) гаварыў:

— Цікавае ўсё-ткі ў нас жыццё, Санёк. Многія жывуць сабе — хлеб жуюць дый добра. А мы не проста жывём, а радуемся, што жывём, дакладней — што жывымі засталіся. Э-э, а што гэта

ты аціх, быццам нябожчык? — злёгку штурхануў мяне.— Сэрцам чую — чарговую авантуру плануеш. Ты, гэта, канчай жыццём маім адзіным распараджацца. Мысляр-камікадзэ...

Але я думаў пра іншае: «Ці даляціць да месца прызначэння наш стары, сто разоў заслужаны паветраны лайнер? І наагул, каму гэта прыйшло ў галаву даваць самалётам назву не самых якасных цыгарэт?»

## II

— Лена? — крыкнуў я, як толькі на другім канцы паднялі трубку.

— Я слухаю.

— «На Заходнім фронце без перамен»,— пачаў з пароля.— Гэта Саша. Ведаю, што Мік зараз наўрад ці дома, але ўсё роўна званю. Добрымі навінамі заўсёды прыемна падзяліцца. Наш груз дайшоў цэлы і непашкоджаны. І ўжо зрэалізаваны. Уяўляеш, мэблю грузілі аптавіку адразу ў машыну. У яго аж вочы разбегліся ад халявы несусветнай. Гэтак ён сказаў, калі ягоная фура была запоўнена. Наагул, усё о'кей. Мікаву дзель, як дамовіліся, адклалі, так што хай не хвалюецца. Лен, ты мяне слухаеш?

— Так...

— А чаму голас у гаспадыні журботны? Можа, галубка чаго недачула? Усё добра, кажу! — ужо крычаў я ў трубку.

— Не,— адказалі на тым канцы дроту,— не ўсё добра.

— Што значыць — не ўсё?

— Міколы няма,— аглушыла мяне Лена.

Я не адразу ўсвядоміў сэнс гэтых слоў, але адчуў: здарылася нешта кепскае, жахлівае, непапраўнае.

— Лена, ты супакойся, калі ласка, а то я не зразумеў. Мікалай кудысьці з'ехаў?

— Але, з'ехаў. Туды, адкуль не вяртаюцца. Забілі Міколу. У пад'ездзе чакалі... Без Зуба не абышлося...

І на тым канцы дроту паклалі трубку.

Нейкі час я сядзеў як ачумелы. Перазваньваць Лене не адважыўся і, ратуючыся ад жаху, што апанаваў мяне, аўтаматычна набраў Жэньку.

— Прыходзь, ёсць пытанні,— абарваў ягонае «а-а» і ўдакладніў: — Сур'ёзныя.

Жэнька, пэўна што, здорава гнаў сваю «Ніву», бо прымчаў хвілін праз пятнаццаць.

— Чаго торгаешся? — замест «дабрыдзень» пачаў ён з парога.— Мянты выклікалі? Не? Званілі? Добра! Не крадзі!

— Супакойся, канчай блазнаваць. Я тэлефанаваў Лене. Павіншаваць хацеў, а там... Бяда. Мікалая забілі. Яна кажа — Зуб, «адзідаснік» арганізаваў.

Усмешка сышла з Жэнькавых вуснаў.

— Та-а-ак,— сказаў ён, сядаючы на тумбачку трумо ў вітальні.— Ты, гэта, Саша, не пажартаваў? — спрабаваў адсунуць ад сябе страшную навіну.— Та-а-ак...— паўтарыў і замоўк.

— Тут, пакуль ты стырно па горадзе круціў, я сёе-тое прыдумаў. Далучышся — добра. Не — сам спраўлюся. А надумаў і зразумеў я вось што: мне цяпер не заснуць спакойна, пакуль спакойна спіць Зуб. Папраўдзе, я толькі тады і засну, калі ён на вечны спачын адыдзе. Карацей кажучы, грошы ёсць, здароўе — таксама, так што нечаканы доўг, мяркую, мы аддаць здолеем. Я слушна кажу — «мы»?

Жэнька паглядзеў на мяне і, нервуючыся, кінуў:

— Ты лічыш, што я хачу на ўсё жыццё даўжніком застацца? Забілі як праз цябе, так і праз мяне! Не ўжо, выбачай, жыць з каменем на шыі...

— Добра, добра, я ведаў, дружа, што ты не падвядзеш. Шчыра кажучы, шанец аднаму грукнуць Зуба, мяркую, у мяне быў, а вось шанцаў застацца пад тое жывым, адчуваю, не было.

— Ну, артыст, без сябра хацеў змыцца,— пачаў прыходзіць да памяці Жэнька.— Ляцім хоць калі? Ці ў цябе, як заўсёды, свае адметныя задумкі ёсць?

— Ніякіх лётанняў! Прозвішчы свяціць не будзем. Паедзем сціпла — цягніком, і маім улюбёным плацкартам. Выйдзем, дакладней, увойдзем, як той казаў, у народ. Калі правадніца мае ў вагоне дзесяць пасажыраў — гэта адно, а калі да паўсотні і пяцёра зайцоў — іншае. Паспрабуй запомніць кожнага.

Праз некалькі гадзін мы выйшлі з дому і пазванілі Лене з галоўпаштамта: лішні раз кватэрны тэлефон засвечваць не варта было.

У далёкім Ніжнім Тагіле трубку не падымалі. Не паднялі яе і за пятнаццаць хвілін да адпраўлення цягніка, калі я званіў з вакзальнага перагаворнага пункта.

Двое шукальнікаў прыгод, а лепш сказаць — гуза на сваю галаву, як і даўней, удзень зышлі на станцыі цікавага, як яны цяпер

гаварылі, горада. У цягніку іх моцна прымарыла, і зараз абодвум трэба было нямала намагацца, каб заставацца пільнымі, адсочваць сітуацыю.

Сігаючы разам з масамі да аўтобуса (таксі тут, як ужо ведаем, толькі надта бойкіх дэбютантаў-самагубцаў возіць), яны ўбачылі воддаль знаёмага жартаўніка. Той чынна махаў рукамі і нешта гаварыў-тлумачыў чарговаму кліенту-смяротніку наконт люкса і ўсяго астатняга.

Відаць, ён пераканаў новага госця горада, бо той махнуў рукой і сеў у машыну, што павінна была павезці яго ў апошнюю дарожку, гэта значыць, у госці да Зуба.

Кемны (гэтак Жэнька цяпер называў таксіста-залатазубіка) завёў «катафалк», міргнуў фарамі, і двое новых знаёмых паехалі — у адной машыне, але ў супрацiўных жыццёвых кірунках.

— Ты пабач,— прыпыніўшыся, павярнуўся да мяне Жэнька,— а жартаўнік — за адным разам яшчэ і сігнальнік. Святлом знакі падае. Мінулым разам праваронілі.

— Наводца,— пагадзіўся я.— А ты думаў, у госці да «адзідасніка» мы проста так лучылі? Не-е, дружа, выпадковасці і недарэчнасці могуць быць толькі ў сумленных людзей, а ў Зуба ўсё паводле плана. Адпрацавана. Далёка, адчуваю, спартсмен пойдзе. Мянты — ягоныя. Сарокі-таксісты — ягоныя. Рэстаран-маліна — ягоны. Зброя ёсць. Поўны камплект для хроснага бацькі-пачаткоўца. Але тут я на месцы Зуба памятаў бы і іншае: хросных час ад часу адстрэльваюць...

На плошчы перад аўтавакзалам стаялі пяць «Ікарусаў», здавалася, апошні раз мытых гадоў дзесяць таму — якраз перад адпраўленнем з Венгрыі ў «Саюз непарушны рэспублік свабодных». Мы падыходзілі да аўтобусаў, і пара было ўзважыць, у які сядаць. Жэня падумаў не выпрабоўваць лёсу і спытаў у касіркі, «як даехаць да Алтайскай». Пенсійнага веку, але яшчэ напарфумленая жанчына ўбачыла, пэўна што, у Жэньку нешта ад свайго крэўнага сына і дарогу «да сястры» растлумачыла вельмі даходліва. Ехаць па мясцовых мерках было зусім нядоўга — хвілін дваццаць.

Неўзабаве мы знайшлі свой аўтобус, але дружна прамінулі яго і запыніліся ля суседняга. Пачынаў дзеяць сціплы план пад «шпіёнскай» назваю — антыперахват. «Увага і яшчэ раз увага»,— казалі мы перад ад'ездам. Асцярожнасць плюс розум і мінімалізацыя рызыкі — зарука поспеху. Зрэшты, хто не рызыкуе, той есць гуляш

у заводскай сталоўцы за трыццаць сем капеек і мае не меншы шанец атруціцца, чым мы — патрапіць у лапы да Зубавых памагатых.

Калі ў перапоўнены аўтобус сеў кіроўца, мы зразумелі: пара! І ўскочылі ў пярэднія дзверы, калі тыя ўжо зачыняліся. Азірнуўшыся, я пабачыў, што ніхто не спрабаваў зрабіць таго самага. «Нічога,— сказаў я сабе,— перастрахавацца ніколі не зашкодзіць, асабліва зараз. Ці тыя, што мусілі нас сустрэць, ужо селі?» Пачаў вышукваць ваўчыныя позіркі. Разгледзеўся: не, здаецца, такіх няма.

Ехаць давялося стоячы. Нядоўгія дваццаць хвілін расцягнуліся на добрыя пяцьдзесят. Але скончыліся і яны. Трохметровым скокам нам удалося пакінуць агульнадаступны сродак перамяшчэння і не трапіць у лужыну, сярод якой ён спыніўся. Зрэшты, неўзабаве мы пераканаліся, што лужына разлілася на ўсю Алтайскую вуліцу.

— Нічога,— падбадзёрваў мяне напарнік,— затое сабакі следу не возьмуць.

Прызямліўшыся збольшага ўдала (у гразь амаль што не запэцкаліся), мы абгледзелі навакольныя дамы: ледзь не ўсе «панелькі» былі новыя і аднолькавыя (Як мы ў першы прыезд гэтага не заўважылі? Забіць мала!), як той казаў,— «С легким паром!». Скрозь дамы-блізняты, ды яшчэ інкогніта — без нумароў.

— І добра, што дамы не распісаны,— культурны, значыць, народ жыве,— бадзёра зазначыў Жэнька. І абгрунтаваў: — Добра, кажу, што лічбачак не відаць, язык на тое і дадзены, каб да Кіева давесці.

Але тут разумнік занадта разгаварыўся. Абарыгены, якія разам з намі вываліліся з аўтобуса, умомант рассыпаліся, а новыя чамусьці вылазіць не спяшаліся. Ну, ды неяк разбяромся...

Разбірацца давялося гадзіны з дзве. Нарэшце мы пазванілі ў дзверы кватэры, гаспадыня якой ужо тры дні не адказвала на званкі з розных пунктаў адной шостай часткі нашай планеты. Не адказала яна і цяпер. Што ж, працуем далей згодна з планам. Едзем да найшустрэйшай і, можа быць, пакуль што адзінай у горадзе ўладальніцы вельмі дэфіцытнай купюры з партрэтам дзядзькі Франкліна. Балазе адрасок у нас быў.

Пра свой візіт мы, само сабою, Людачку не папярэдзілі: раптам красуня захоча пашукаць шчасця на другім беразе. І таму, адчыніўшы дзверы, наша выратавальніца вачам сваім не паверыла. «Гэта ж трэба, бегункі, выходзіць, зусім ашалелі,— думала, напэўна,

яе светлая галовачка,— без запрашэння на пагібель вярнуліся. Рызыкоўныя хлопчыкі...»

— Прывітанне самаму дарагому і любаму ў гэтым дзівосным горадзе мараў чалавеку! — грымнуў Жэнька. Малайцом, аднак жа, паказаў сябе.

— А-а, хлопчыкі! Жывыя! Я так і знала, што вы тады ўцяклі ад пацаноў, надта ж ужо Зуб шалеў, калі вярнуўся. Як заведзены гойсаў па зале. Перажываў страшэнна. Глядзець было жаласна. Давялося яго пашкадаваць, адвесці ад думак горкіх і небяспечных. А што было рабіць? Ён жа мог разборкі ўчыніць. Пачаць высвятляць, як вы з рэстаранчыка зніклі. Вось і адцягнула Зубаву ўвагу, улагодзіла родненькага. Так што за вамі цяпер даўжок.

— Даўгі мы заўсёды вярнуць рады, ды высвятляць іх памеры на лесвічнай пляцоўцы не хацелася б,— перапыніў харашуху-афіцыянтачку нахабны Жэнька.

— Ой, і праўда, праходзьце, распранайцеся,— ачомалася нарэшце Люда.— Зараз гарбату пастаўлю. Ці ў вас каве аддаюць перавагу? І гэты негрыцянскі напой у калекцыі ёсць.

— Паслухай,— зноў наструніў гаспадыню адважны Жэнька,— чай-каву пасля будзем піць. І не толькі чай. Цяпер жа хацелася б іншым заняцца — сёе-тое табе расказаць. Расказаць пра нашыя планы. І галоўнае, каб ты ўсё запомніла, не памылілася пасля, бо мы з гэтай хвіліны пераходзім у стан мінёраў на аб'екце.

Пра планы Людзе расказалі падрабязна і дакладна. Каб усё правільна зразумела і не паднесла сюрпрызу. План адважнай дзяўчыне спадабаўся, асабліва апошняя яго частка — разліковая: Людачка магла стаць уладальніцай дзесяці «франклінаў», а гэта ўжо нешта, нават для чалавека з свабоднага свету, а ў тутэйшым балоце на такія грошы можна было і кватэрку прыкупіць...

Гадзіны праз паўтары з кабінета дырэктара люкс-рэстарана мы спакойненька назіралі, як мянты-чарнасоценцы, не набліжаючыся да параднага ўваходу прыкурвалі адну цыгарэту ад другой. Заўважылі, што рукі ў хлопцаў свярбяць, і свярбяць даўно. Яны ўсё часцей пазіралі на вокны рэстарана і на свайго галоўнага. А той — на Зуба.

Пачуліся стрэлы. Галоўны мент імгненна павярнуўся да «адзідасніка», але Зуб паказваць зубы не спяшаўся. Малайчына, хлопча, усё як мае быць! Адмыслова мянтоў выдрэсіраваў. Талент! Дураў, а не Зуб!

7. Зак. 413

Але тут быў пададзены божы — для мянтоў! — знак, і «брыгада хуткай дапамогі» рынулася ратаваць тых, што патаналі ў крыві. Як і мінулым разам, усё было скончана хвілін за дзесяць — пятнаццаць. Удзельнікаў халяўнага банкету пагрузілі ў знаёмы закратаваны аўтобус-турму. Падумалася: «У іх, пэўна што, і свае рэкардсмены ёсць. Цікава, які рэкорд наведвання-катання ў каталажцы з кратамі?»

Люда, як і дамовіліся, пастукала тры-два-тры разы, потым зноў. Жэнька да дзвярэй пайшоў, але адчыняць не стаў, аўтаматам спытаў:

— Хто?

— Я гэта, Люда, не бойцеся.

Кампаньён прыняў выгляд самца на распеве і, адчыніўшы фанерку-заслонку, ганарыста прамовіў:

— Прашу!

«Фраер!» — канстатаваў я ў думках.

«Дело было к вечеру», але працяг вершыка складваўся іншы — прынамсі, гэтак мы зразумелі словы завербаванай намі, чужой сярод сваіх Людачкі. Уляцеўшы ў кабінет, яна спехам выклала:

— Дзень на дзень не выпадае, але сёння, здаецца, ён наш. Зуб падчапіў тут аднаго з заезджых. Ванька-таксіст, Зубаў пабрацімчык, яго прывёз. Спекуля ўжо апрацавалі і вось-вось павязуць да Зуба на фазэнду. Распытаюць пры свечках: што ды як, дзе і колькі. Я неяк раз была пры такой гутарцы. Больш не хачу. А цяпер на развітанне скажу галоўнае: Зуб, калі вязе каго да сябе, бярэ толькі двух гарылаў, так што, гэта хоць і невялікі, але шанец, другога ў бліжэйшы час не прадбачыцца. Карацей, думайце самі,— ужо не гаварыла, а спявала афіцыянтачка-хаўрусніца,— міркуйце самі... (Якое сапрана прападае!)

— Што меркаваць? Кон усё за нас размеркаваў, карацей — па конях! — Жэнька відавочна браў ініцыятыву на сябе.

Яшчэ італьянская, «ад сваёй мамы», Людмілінага бацькі «капейка» па-паляўнічаму ўчэпіста ўзяла след новай «васьмёркі» «адзідасніка». Пагоня на адлегласці доўжылася не больш за паўгадзіны, прайшла наўздзіў спакойна і скончылася паблізу непрыкметнага дамка з мансардамі. Плячыстыя хлопцы праводзілі госця ў дом, ні разу не азірнуўшыся. Дый навошта? Яны былі вельмі далёкія ад рэальнасці: меркавалі, колькі каму перападзе пасля боса.

Карцела зазірнуць на агоньчык і нам, але пасля невялікай перапалкі калегіяльна-мужна пастанавілі заставацца на месцы. Для нас яшчэ не надышоў той самы вечар.

А ў скляпку-спартзальчыку дамка з мансардамі ішла чарговая серыя фільма жахаў — «месца сустрэчы вызначылася акурат апоўдні» (сцэнарый яго ўявіць няцяжка).

Зуб глядзеў на прывязанага да батарэі няўдачлівага аматара падарожжаў і ціха, але ўцямна, натхнёна (не дарма — як пасля высветлілася — тры курсы Шчукінскага адолеў) гаварыў:

— Ох і малайчына ж ты, спякульчык наш ненаглядны, любы, залаты, цудоўненькі! Разумненькі ты наш і багаценькі Бураціна! І што ж цябе, чубка такога кучаравага, занесла ў нашы мясціны таежныя? Няўжо гэтак капустачкі захацелася? І навошта галоўка разумная падштурхнула на дарожку слізкую? Ну што ж, паможам пакутнічку, пазбудзем цябе хваробы грашовай, астудзім галоўку гарачую. Сідар, апусці, зрабі ласку, нашага друга ў вадзічку. Акуратненька мачні, без гвалту. Як ты ўмееш...

Сідор-памідор (гэта я па фэйсе ягоным праязджаюся) адчапіў бедачыну ад батарэі, за чупрыну павалок асвяжыцца да бочкі з вадой, што стаяла непадалёк. Пасля трэцяга нырца госць датумкаў, што ў гэтым скляпку, зусім не вінным, квіткоў на жыццё не выдаюць і абарыгены могуць дажартавацца з ім да самага што ні ёсць скону. Хлопец вымеркаваў: час ратаваць цела, а не грошы, але сівая брудная карга ўжо прыкмеціла яго на тым, не гэтым беразе.

Праз гадзіну Зуб высветліў не толькі код ячэйкі ў камеры захоўвання, дзе ляжала сумачка з пасагам, але і той факт, што пульс у гастралёра больш не прамацваецца. «Шкада»,— хацеў быў сказаць з дабраты сваёй душэўнай, але, сутыкнуўшыся з позіркам звар'яцелых ад перадсмяротнага ціку вачэй, прамаўчаў.

Нервы ў Жэнькі, як выявілася, былі слабейшыя за мае, і неўтаймоўнай Людачцы ўсё часцей даводзілася забаўляць сябра-праведніка апошнімі мясцовымі ньюсамі.

Я ўжо і сам быў досыць узвінчаны, калі нарэшце запаветная рулетачка-брамка расчынілася і бравая група амаральнага ўздзеяння, гучна выказваючыся на чынгісханскай, пайшла да машыны.

Завялася «васьмёрачка», бы той гадзіннічак, што зараз цікаў пад яе бензабакам. Люда тонка заўважыла і нашу звярнула ўвагу на тое, што ў тутэйшых краях, згодна з зімовай звычкай, новыя машыны і ўлетку трохі праграюць. Шамацела на месцы з хвіліну і гэтая. На такі якраз час Жэнька, дэбютант-падрыўнік, і навёў у пякельнай машыне будзільнічак.

Успомніліся словы ўмельца-піратэхніка: «За гэтую штучку спрачацца аб цане не варта. Яна канкрэтна праблемы развязвае...» Выбух атрымаўся такой моцы і аглушыў і асляпіў нас так, што ў першае імгненне здалося, быццам падарвалася акурат наша бедная «капеечка». І толькі пабачыўшы, як цела «адзідасніка» разам з прыліплымі да яго заднімі дзверцамі ляціць-вяртаецца да брамкі (Во лёс! А толькі што героем быў!), у нас адкрылася другое дыханне.

Паволі, ледзь шоргаючы шынамі, шэрая «капеечка» пачыкільгала ў бок чыгуначнага вакзала. Да адпраўлення цягніка Ніжні Тагіл — Масква заставалася больш як дзве гадзіны, і спяшацца не было куды.

— Саша? — пачуў я жаночы голас у трубцы і, пазнаўшы яго, падскочыў ад радасці:

— Лена, гэта ты, прапаўшая грамата?

— Я, хто ж яшчэ. Але ты не хвалюйся і не сварыся. Зараз усё растлумачу. Толькі не крычы, дай слова сказаць. Пасля таго як ты зноў патэлефанаваў, я зусім змучылася. Увесь час успамінала тую ноч. Вы сядзелі, спрачаліся, жартавалі. Як Мікола быў рады, што вы аб'явіліся! Якія планы грандыёзныя складаў! Тая ноч бясконца пракручвалася перад вачыма. І я паціху вар'яцела. Баялася, што дзеці адны застануцца. Калі зрабілася зусім няўсцерп, сабрала Тамарку, Уладзіка і паехала да мамы. Там мы прабылі два тыдні. Мама ёсць мама. Хадзіла за мною, супакойвала, настаўляла. І роспач паступова прайшла. А сёння раніцаю мы вярнуліся дадому. Заходзім, і амаль адразу ж — званок. Падбягаю, бяру трубку. Уся калачуся, Міколу ўспомніла. Ледзь выціснула з сябе «алё». Чую голас: «Гэта следчы Дангулаў. Мы падумалі, што трэба яшчэ раз сустрэцца з вамі. Тры дні таму невядомыя падарвалі машыну вельмі паважанага ў горадзе чалавека. Можа, тыя ж бандыты, якія забілі вашага мужа». Ты ўяўляеш, Саша? Паважанага чалавека! Га-а? Як табе? Цікава толькі, хто ж гэтую гніду кончыў? Помнік такім бандытам ставіць трэба! Саша, ты хоць чуеш мяне?

— Так-так,— супакоіў я Лену,— чую: помнік бандытам.

А сам сабе падумаў: «Вось прыбярэш з дарогі такую погань, і адразу ўвекавечыць цябе гатовы. Давядзецца, відаць, усё ж мяняць прафесію».

## Касіў Ясь

1994 год. Глыбокая восень. Пражэктары слізгаюць па бетонных скалах недабудаванага аэрапорта «Мінск-2». Злева ад забытай людзьмі і Богам пабудовы стаілася аграмадная «жоўтая чарапаха» — ангар-склад, пераабсталяваны пад залу чакання, сектары прылёту і адлёту, міліцыю, мытню, білетныя касы, багажню, бар, туалеты і іншае. За чарапахаю — лётнае поле. На ім танцуем мы, «эміратнікі». Чакаем, дрыжым, сінеем. Пранізлівы холад, шалёны вецер, слепяць камякі снегу. Не Мінск, а поўнач Аляскі (а што, і там бывалі!). Чакаем.

Нарэшце з завірухі-туману выплывае бела-серабрысты — абледзянелы,— бы здань, «Ікарус». Ускокваем, спатыкаемся, падаем, смяёмся. Пад'язджаем да роднага «ТУ-134». Узбягаем-рассаджваемся з хуткасцю гуку. Радуемся першай супакойлівай ластаўцы: «Пасажыры, прышпіліце рамяні, калі ласка». Цяплее.

Разганяемся. Узлятаем. Мы — у небе! Цяпер ім нас не дастаць! Ура! Свабода! Нал-лівай!

— Э, дзелавыя, у каго мая «капуста»? — успырхваюць з некалькіх месцаў неспакойныя галасы.

— Тэпайце сюды, хлопчыкі,— самавіта азываецца з хваста самалёта Юрык Сачкін, празываны Банкірам.— І кілішачак дзядзьку не забудзьце наліць,— распачынае, пасміхаючыся, пачак цыгарэт «Davidoff».

*

— Касіў Ясь канюшыну! Касіў Ясь канюшыну! — не спяваў — гарлаў я праз гадзіну пасля ўзлёту.

— Ка-асіў Ясь канюшыну, паглядаў на дзяўчыну! — перабіваў мой віскат, падскокваючы каля ілюмінатара, Сяргей Ласавец. Быццам сапраўдны дырыжор, махаў-памагаў сабе рукамі. У немалой ступені ён ім і быў. План, куды і па што крутануцца, а пад тое не застацца дурнем і не быць падвешаным за ногі ў выніку нерэнтабельнага выкарыстання чужых фінансаў, спеў і выспеў у яго светлай галаве.

Мытня! Атас! Мы прайшлі мытню! Прарваліся! Прадзерліся! Прабіліся! Налівай!

— А дзяўчына жыта жала...— узняў Сяргей аэрафлотаўскую шкляначку з «Абсалютам».— А дзяўчына жыта жала! А-а дзяўчына жыта жала...— чокнуўся са мною,— ды на Яся паглядала!

Сяргей рызыкаваў меней, але пры абломе застаўся б без галавы і ён. Мяне ж пры залёце жыўцом падсмажылі б. Ён вёз пяцьдзесят шэсць, а я — дзевяноста дзве тысячы тых самых, зялёных (як-ніяк за траіх трымаў адказ).

Мытня! Мытня! Мытня!

Грошыкі! Грошыкі! Грошыкі!

Дзе? Дзе? Дзе?

Няма-а-а!!!

*

— Здымі абутак,— ці то загадаў, ці то параіў мне шчанюк з парай зорачак на пагонах.— Цяпер — шкарпэткі. Не бянтэжся, ты ж не дзеўка-цнатліўка. А можа, паразумнееш і сам раскажаш, куды бабкі схаваў? Тады хоць і не паляціш разам з усімі, затое пры сваіх застанешся.

«"Пры сваіх" — гэта не да нас,— сам сабе пасміхнуўся я.— «Пры сваіх» мы ўжо праходзілі, даволі ў жабрацтве сліны наглыталіся».

Шчанюку адказаў:

— Вы нібыта панібрацкія янкі: усё ты і ты. У чым прызнавацца, калі няма ў чым?

Гаварыў даверліва і спакойна. А ў душы ўсё спявала: на пакет з прадуктамі, што стаяў перад «тэлевізарам», хлопец не звярнуў ніякай — нуль! — увагі. Не ўсёк, тупіца! А ў ім і была ўся соль. Праверылі, да прыкладу, твае сумкі-чамаданчыкі, махнулі: «Праходзь!» Ты і пайшоў. Толькі пакецік з хатняю каўбаскаю падхапіў і пайшоў. А рэчы — хэ-э! — няхай глядзяць-шнырацъ. Работа такая — у чужых рэчах корпацца. Трасі чаўнака-зажору. Вось і гэты ўбачыў з паўгадзіны таму, што ў маёй пары сумак чыста, і датумкаў: «Пры сабе, відаць, разумнік трымае баксікі». Замітусіўся: «Пройдзем». І — дарэмна бурбалкі пусціў. Яму б, стратэгу зоркаму, пачакаць, пакуль я запаветны пакецік у рукі вазьму і ўжо з ім патэпаю. А так, даруйце-выбачайце — пралёт. Пакет у зону дагляду не трапіў: яго Сяргей, які стаяў на падстрахоўцы, нагою да сябе падсунуў. Адрэпетыравана!

— Дальбог, дарма, час марнуеце,— адагнаў я набеглае было хваляванне (а калі Сяргей не падсунуў?).— Раптам у гэты самы момант сапраўдныя кантрабандысты праз вашы парадзелыя кардоны прабіраюцца?

— Ты чуў? — павярнуўся малады мытнік да такога ж, як сам, сабрата-навабранца.— Парады дае, жыць вучыць, здзекуецца. Абарзеў! Відаць, да практолагаў нераўнадушны, хоча, каб да яго ў адно месца залезлі.

«Хоць і надта нахабныя, але зяленіва поўнае,— спакайней затахкала маё сэрца.— Ці ж у гэтае месца можна запхнуць амаль што сотню саўзэндз[1]? Парвецца месца, па швах разыдзецца, ні ў адной бальніцы не выратуюць».

— Да дактароў, і праўда, неабыякавы, век бы іх не бачыць,— цягнуў час.— А стараецеся вы, паўтараю, дарма! Як на споведзі, кажу: пры сабе толькі пяцьсот дазволеных для правозу без дэкларацыі даляраў, нават менш — сёе-тое ўжо ў бары пакінуў.

— Спявай песеньку, чаўнок, спявай, усё роўна не пабачыш рай,— не суніmaліся ўчэпістыя хлопцы.— Не хочаш прызнавацца — воля твая. Выклічам хлопца ў белым халаце. Сам на медагляд напрасіўся.

«Далібог, над усякую меру спраўныя,— засмуціўся за іх, не за сябе.— Падобных наязджальнікаў яшчэ не сустракаў. Што ж, хлопцы, з вамі далей будзе? Гэтак можна і да старасці не дажыць. Высмыкнеце, ачысціце якога нервовага, каму губляць няма чаго, ён вас і прышые — грошы ж не абы-якія круцяцца. Сустрэне вас ля пад'езда калі... Зрэшты, гэта не мая гісторыя... А што ж у нас? Напалохалі мытнікі хлопца — добра, такая ўжо ў іх работа, але ж час і адпускаць. Дурню зразумела: пасажыр не торгаецца, спакойны, а таму наўрад ці бабкі пры сабе заціснуў».

— Так, хлопчыкі, зніклі! — уваліўся нарэшце ў «катоўню» Ігар. («Фу-у!» — здрадліва вырвалася ў мяне.) — З гэтым хітруганам я сам разбяруся.

— Мы тут, Ігар Мікалаевіч, яго амаль раскруцілі. Можа...

— Не можа. І круціць будзеце дзяўчатам галовы або сабе вусы, як вырастуць, а кантрабандыстаў выяўляюць. І давайце-давайце, ідзіце да стоек. Шэфу толькі што зверху тэлефанавалі: рэйс ані ў якім разе не затрымваць. Гэтым самалётам сын старшыні Саўміна

[1] Ад англ. *thousands* — тысячы.

ў вясельнае падарожжа ляціць. Папярэдзілі: каб ніякіх эксцэсаў! А тут я сам разбяруся.

Учэпістыя хлопчыкі панура адышліся, і Ігар падышоў да мяне. Самы раз было выпусціць пару:

— Малайчына! Дзе цябе носіць? Я ледзь на смаркачах не пагарэў! А каб салагі накінуліся на пакет з ежаю?

— Не крычы, тут як-ніяк я начальнік. З пакетам усё нармальна: Сяргей яго падхапіў — не разгубіўся. Сам бачыў. А спазніўся праз мымру сваю. У яе сёння дзень нараджэння, вось дуня і надумала ўразіць гасцей небывалаю — пад нейкую галівудскую зорку — фрызураю. Раніцай пабегла ў цырульню. Сказала — на гадзінку-паўтары, а з'явілася праз тры. Забіць мала. Пасля мчаў сто шэсцьдзесят, ледзь машыну і сябе не размалаціў — ты ж папярэдзіў, колькі гэтай ходкаю грошай бярэш. Жах! Я і Вадзіму званіў, каб падстрахаваў цябе, калі не паспею даехаць. Дык ён узяў і захварэў. Ну, думаю, хана! Але ўсё, дзякуй Богу, абышлося. Хоць не зусім. На двух у шэрых плашчах, быццам прыкутых да стоек, звярнуў увагу? Нашы хлопцы, гэбэшныя. З той рэвалюцыі ніяк не супакояцца. Шнырацць, вышукваюць, хто ад лапаў дзяржавы пару капейчын спрабуе ўтаіць. І няма ім, няўрымслівым, спакою. Дарэчы, работа ў іх такая — сабачая... Пяройдзем да нашых, чалавечых пытанняў. Ты зараз для канспірацыі паспрабуй хоць фэйс крыху скрывіць. Уяві, прыкладам, нібыта табе па галаве дубінкаю мянтоўскай урэзалі. Тады, калі гэтыя ў твой бок кінуць вокам, падумаюць, што мы цябе ўжо вычысцілі, і наноў душыць не палезуць. Пакажы твар. Во, як мае быць! Проста артыст! Але не мітусіся без прычыны, усё будзе нармальна. Ідзі з Богам!

Двое на мяне нават не зірнулі: былі занятыя іншымі кліентамі, дакладней — кліенткай. Адна наша, з новых, нафарбавалася пад ляльку Барбі, прыбралася, як валютная прастытутка ў начны рэстаран, і ганарліва падплыла да стойкі. Яўна разлічвала сваёй абаяльнасцю непрабіўных «двухзорачнікаў» укласці. А ўклалі яе. Дурніца схавала ў касметычцы пяцёрку тысяч «лішніх грошай» і ў спешцы забылася — пакінула яе ў сумцы з адзеннем. А тую, вядома ж, прасвятлілі і засеклі вузельчык патаемны.

Зрынаты мытнік, атрымаўшы адступнога, хутчэй за ўсё адпусціў бы ляльку, але ж во няўдача: хлопцы ў плашчах умяшаліся! Сына знатнага таварыша падстрахоўвалі, а тут даўся шанец вызначыцца. Цяпер усё пойдзе па поўнай праграме: спачатку будзе зададзена

«вясёлае» пытанне: «Дык, значыць, дэкларацыйку запоўнілі, упісалі ўсё, што належыць». Потым пойдзе паўторны, ужо татальны шмон, за ім – складанне пратакола, канфіскацыя, а далей – як карта ляжа. Можа так легчы, што і да закратаванага неба дойдзе. Артыкул жа сур'ёзны: незаконны вываз замежнай валюты ў асабліва буйных памерах. Для нас – на жаль! – іншых артыкулаў няма. Мы ж ворагі дзяржавы! Адначасна і найлепшыя сябры масаў. Паспрабуй купі танней! Але ж цана гэтаму «танней» часам бывае над меру высокай...

Шкада, да болю ў сэрцы шкада было Барбі, але пры мытным даглядзе ёсць няпісаны закон, правіла, умова: кожны – сам за сябе. Жыццё так завязала-абавязала. Былі выпадкі, сёй-той расслабляўся, спрабаваў падаць руку тапельцу, вырваць сябра з ваўчынай пашчы. У выніку зазнаваў поўнае фіяска: «залятаў» сам і нярэдка яшчэ каго пад разборку ўцягваў. А вы ведаеце, што такое трапіць пад разборку? Гэта – быццам у цябе адрэзалі частку цела, скажам – нагу. Нават, бадай, горш. Бо жывуць і без ног, а вось пасля разборак хтокольвек гэты свет пакідае.

Помню, як білася галавою аб падлогу, галасіла і стагнала такая самая, як і гэтая злоўленая Барбі, размаляваная прыгожая дзеўчынёха. Як трагічна падобныя некаторыя лёсы! З эканоміі не «купіла» дэкларацыі на права вывазу валюты і, у дадатак, спяшаючыся, лішнія купюркі схавала так, што нават салагі знайшлі іх за некалькі хвілін. А грошай амерыканскіх было нямала: хацела зарабіць не толькі на хлеб з маслам, але і гардэробчык абнавіць. Вось і абнавіла. Апошняе страціла. Абчысцілі галубачку да ніткі...

А Барбі «плашчы» падхапілі і, нібы тэрарыстку, павалаклі «за кулісы».

Як яна залівалася слязьмі, вырывалася, маліла, прасіла! Знаёмая тут сцэна, нярэдкая. Але мытня, як і Масква, слязам не верыць. Я ведаў, што дома ў Барбі засталіся маці-пенсіянерка і двое хлопчыкаў, ведаў, што ў кожны прыезд дзецям даваліся падарункі, і разумеў: гэтым разам не дачакацца ім стракатых пакетаў з цацкамі. Можа быць, не прыедзе і мамка, доўга не прыедзе. Але што я мог зрабіць? «Заляцелай» красуні ўжо нічым не паможаш. Шакалы ўчапіліся ў яе моцна. Дзеля чарговай зорачкі яны і роднага брата на часткі разарвуць. А мяне дома таксама чакаюць двое малых...

Задушыўшы ў сабе небяспечны тут жаль, я накіраваўся ў залу чакання, у якой толькі й было, што некалькі радоў былых

8. Зак. 413

кінатэатраўскіх крэслаў. Мой ды Сяргееў пакеты з ежаю аб'ядналіся ў адзін, ён ляжаў цяпер між намі. Выклічуць на пераправерку Сяргея – ён возьме толькі сваю сумку. А пакет чый? Пакет – не яго. Паклічуць паўторна мяне, прыхаплю толькі свой баульчык: пакет – не мой. Нават прайшоўшы мытню, расслабляцца не спяшайцеся: вас могуць высмыкнуць з залы чакання. Нярэдка гэта робяць прадстаўнікі іншай службы, пры ўспамінанні пра якую і найадважнейшаму мытніку хочацца кульнуць чарку. Яны ўсё могуць, але не ўсё ведаюць, а тыя, што ведаюць,– маўчаць. За тое, каб знаўцы «не ведалі», даводзіцца залучаць іх апетыты-веды ў сабекошт тавару.

«Інфармацыя – гэта грошы»,– думаюць некаторыя.

«Інфармацыя – гэта болей чым грошы»,– сцвярджаюць знаўцы.

«Інфармацыя – гэта ўсё!» – кажуць багатыя.

«Інфармацыя – гэта жыццё!» – кажу я.

«Інфармацыя – гэта добрае жыццё!» – ведаюць абраныя.

*

– Ці ты Ясь, ці ты не...– матляў галавою сп'янелы Сяргей.

– Ці ты Ясь, ці ты не-е,– абагнала і пераспявала яго Ліля,– спадабаўся ты мне!

На час «гастроляў» Ліля рабілася Сяргеевай жонкаю. Збліжаліся яны адразу пасля ўзлёту; развітваліся – за хвіліну да пасадкі на роднай зямлі.

А дома ў Лілі быў муж – заводскі інжынер-рабачай, які цягнуў на худых пракураных плячах усё КБ, але не выцягваў і траціны рэальнага сямейнага пражытнага мінімуму. Ён жыў звычайным шэрым даперабудоўным савецкім жыццём і шчыра верыў: менавіта яго стараннямі ў сям'і ўсе адзетыя, абутыя, не галодныя, а ў выходныя пуцуюць апельсіны і бананы. Ліля з ім не спрачалася, ніколі нічога не тлумачыла і нават па-свойму кахала. Але ў дарозе адрывалася ад нудных будняў, дазваляла сабе развеяцца. Не супраць быў адпачыць ад жонкі-выхавальніцы («Ох, і заляціш ты калі з поўнай канфіскацыяй!») і Сяргей. Вось такая «сямейная пара», даволі тыповая для «эміратнікаў».

Дзіўна, як абое яны мяняліся, калі вярталіся ў Мінск і сходзілі з трапа самалёта. Уражанне было такое, што гэтыя двое не толь-

кі не ведаюць адно аднаго, але і псіхалагічна несумяшчальныя. Сяргей — вечна расхлістаны, гаманлівы; Ліля — сама акуратнасць, строгасць, спакой. Флірт фліртам, а сем'ямі «эміратнікі» даражылі.

*

Пабудзіла нас сцюардэса, як заўсёды, загадзя. «Непрабудных», назюзюканых — шмат, а яны з сяброўкаю — удзвюх; пакуль усіх раскатурхаюць...

Усё ж голас у яе быў нязвыкла рэзкі, але спрасонку я не надаў гэтаму значэння. Пазней, у гатэлі, пачуў: селі мы толькі з трэцяга заходу. Я не здзівіўся. «ТУ», адбыўшы два тэрміны, вядома ж, стаміўся цягаць нас па белым свеце і, здаецца, надумаў паставіць крыж на сваіх пякельных пакутах. Двойчы, заходзячы на пасадку, ён не выпускаў шасі. Але за трэцім разам стары злітаваўся, пашкадаваў бедалагаў-чаўнакоў. І нават досыць мякка, нібы просячы прабачэння, прызямліўся.

«Сабрацца!» — загадаў я сабе, як, відаць, і ўсе, спускаючыся па трапе. Нас чакала новая небяспека — арабы. Гэтыя хлопцы амаль непрадказальныя. Хоць мытня ў Дубаі нулявая (максімум, што забяруць, дык гэта лішнюю гарэлку), затое ў іншых дачыненнях... Прагледзеўшы пашпарт, возьмуць і заедуць ні з пушчы ні з поля проста пад дых: «No!» No — і ўсё! Накаўт! Тлумач, давodзь, крычы, скардзіся, млей — «No!» І кожны з нас, аддаючы дакументы, высільваўся на ўсмешку, на ўпэўненасць: «Усё о'кей, ніякіх "No!"».

Аднак «No!» прагучала і гэтым разам. На адрас Лёвы.

О Божа, ці ёсць Ты на свеце?! Я вытрымаў бы такі ўдар, Сяргей — таксама, Ліля не здалася б, ды і іншыя, відаць. Толькі не Лёва. Ён быў сумленным хлопцам, чаўнаком-аратым, але — бесталковым, нікуды не вартым рахункаводам і ўжо даўно заблытаўся ў сваёй бухгалтэрыі: што выгадна вазіць, а з чым «пападалава», дзе плюсы, а дзе мінусы. Ён лётаў, закупляўся, працаваў, а хмары згушчаліся. І чым болей Лёва лётаў, чым болей накупляў, тым болей дадавалася блытаніны з грашыма і таварам, тым часцей ён мусіў рызыкаваць, «біць па-банку», набываць новы, не правераны на прадавальнасць тавар (а разам абавязкова трэба ўпісацца ў адпускную цану, меншую за магазінную ў паўтара-два разы), тым

глыбей залазіў у пазыковую яму. І цяпер яму сказалі: «No!» Ціха, забойча, непахісна. Як дубінкаю па нырках.

Аднак гэтым разам удалося яго ўратаваць. Я забраў у Лёвы грошы і спіс з заказамі. Мы абняліся, развіталіся, і ён пацёгся ў бар глушыць горкую і чакаць зваротнага рэйса. Сяргей даў яму пакет з «белай», замаскаванай пад мінералку: у Арабскіх Эміратах сухі закон.

Лёве не пашанцавала толькі з уездам. Некаторым жа...

Быў у мяне сябар — Віктар. Куды пазней за падзеі, якія тут апісваюцца, калі ўжо практычна не было сэнсу купляць тавар у Эміратах і большасць перакінулася на іншыя краіны-кантыненты, ён працягваў лятаць у Дубаі па сімвалічныя дзвесце «зялёных» ды яшчэ і транзітам праз Маскву. Чаўночны бізнес у Эміратах для большасці быў не першым, чым яны заняліся ў перабудовачныя часы. Віктар жа спахапіўся позна і звольніўся з інстытута толькі на пачатку дзевяностых. А тут яшчэ і ажаніўся. Неўзабаве нарадзілася дачка, і пайшло-паехала: ложачак, возічак, памперсы, зусім не таннае фінскае дзіцячае харчаванне, садавіна, сокі. Патрэба ў грашах расла з гнятлівай хуткасцю. І Віктар працягваў цягаць мяхі туды-сюды амаль задарма. Некалі захапляўся культурызмам, і цягаць груз было не так ужо цяжка. Нават форму быццам падтрымваў. Але сэрца...

З чарговай паездкі Віктар вяртаўся, цягнучы на сабе пяць аграмадных баулаў.

Да свайго дома Віктар падходзіў уночы. Стаялі лютаўскія маразы, а яго праймаў пот. Раптам адчуў боль у грудзях. «Нічога,— супакоіў сябе,— дайсці да ліфта, а ад яго — два крокі». Але ліфт не рабіў, і два крокі абярнуліся ў сто пяцьдзесят чатыры. На сто пяцьдзесят пятым, перад самымі дзвярыма, Віктар упаў. Разляцеліся ў розныя бакі баулы. У адным разышлася маланка, і з выпнутай упакоўкі памперсаў усміхнулася вясёлая маленькая бландзіначка. Зусім як Віктарава дачушка.

Калі б ён змог дацягнуцца да званка! Калі б Люда, выглядаючы яго з акна, не адлучылася пераспавіць (скончыліся няшчасныя памперсы) дачушку... Ды рвецца заўсёды там, дзе тонка. Так і абарвалася Віктарава жыццё.

Ён быў не першы з «эміратнікаў», хто ахвяраваў сабою, каб у сям'і быў хоць нейкі дастатак. Не дачакаюцца хлопчыкі з бабуляю і ўспомненай вышэй Барбі — мамы і дачкі. За два месяцы да вызвалення з лагера яна загіне на будоўлі нікому не патрэбнага электразавода. Прыдушыць красуню трохметровая пліта перакрыцця.

Усё гэта адбудзецца значна пазней, а цяпер...

Цяпер мы праходзілі дубайскую мытню. Як звычайна, пацярпелі аматары зэканоміць на «гаручым» (у Эміратах, нагадаю, яно прадаецца толькі ў спецмагазінах для белых і коштам ад дзесяці ўмоўных адзінак) і ўзяць у «паход» сваё. А наагул усё прайшло спакойна.

Выходзілі з аэрапорта, нібыта з вайны вярнуліся. Нарэшце засталіся ззаду праверкі,ператрусы, гулкі грукат сэрцаў у грудзях. Наперадзе — свабода. Свет рабоў, іхных гаспадароў і наш свет — тых, хто між імі.

Ішоў пераломны 1996-ы. Канец лістапада.

Мы выйшлі на плошчу перад аэрапортам «Дубаі» ў 12.34 па мясцовым часе (дарэчы, ён супадае з нашым). Зіхоткі, у праменнях сонца, паралелепіпед вакзала, тоўстае шакаладнае шкло вокнаў, увішная здаравяцкая абслуга з нястомным кваканнем: «What? What? What?»[1] — усё гэта крыху падымала настрой.

Было не горача: плюс дваццаць дзевяць.

Ад часу сустрэчы ў «жоўтай чарапасе» з двума салдатамі невідочнага фронту і сябрам з «групы падтрымкі» мінула каля дванаццаці гадзін. Больш дакладна, два гады і дванаццаць гадзін лёту-жыцця над безданню. Нашага жыцця.

— Касіў Ясь канюшыну! — ажывала ў таксі за маёй спінаю Ліля.— Ка-асіў Ясь канюшыну...

— Паглядаў на дзяўчыну! — стараўся дагнаць яе Сяргей. Заадно ён крывіў твар, спрабуючы быць падобным да эмірацкага мытніка, які знайшоў у яго замест дзвюх бутэлек гарэлкі — восем.

— А дзяўчына жыта жала...— перайшлі раней часу на новы куплет, абганяючы «маладых» і мелодыю, мы з Банкірам.— А-а дзяўчына жыта жала ды на Яся паглядала!

Мы абганялі мелодыю, ды абагналі жыццё, дакладней — пралящелі яго.

У бакавым акне таўстазадай «Хонды», якая везла нас у гатэль, я ўбачыў у разгоне родны «ТУ-134». Вось ён узляцеў і знік у небе.

— See you soon! — успамінаў я свабодную мову.— Don't be nervous any more[2].

[1] Што? Што? Што? *(англ.)*

[2] Да сустрэчы! Ты толькі болей не нервуйся *(англ.)*.

## Інтуіцыя

Як патлумачыць прачуванне бяды? Мабыць, ёсць толькі адно з'ясненне: інтуіцыя,— маладаследаваная і ці не надпрыродная сіла, якая выяўляецца ў здольнасці чалавека рабіць выракі, часам, лепшыя за лагічныя і ўсебакова абгрунтаваныя, і значыць — вешчаваць будучыню.

Чалавек генетычна створаны на аптымізацыю сітуацыі. І калі мозг не атрымаў досыць інфармацыі, не можа разабрацца, што да чаго (здавалася б, няма прычыны, а сэрца ные), не можа рабіць нейкіх высноў, дык як апошняя інстанцыя абароны чалавека — у бой уступае яе вялікасць Інтуіцыя.

От і зараз. Мы толькі пад'язджалі да мяжы, а Юрка ужо трывожна застагнаў:

— Пячонкай адчуваю: на гэтай мытні не праскочым. Давай адразу на наступную. Мо там...

— Позна, Юрка, піць баржом,— перапыніў я стогны напарніка.— Да шлагбаума пад'язджаем. Калі зараз пад носам у пагранцоў развернемся, хлопцы, чаго добрага, і наўздагон кінуцца. Цяпер толькі наперад — за аднаго бітага двух нябітых даюць! Ды не газуй ты так, на мытні шуму не любяць...

Бедны Юрка! Першы раз з-за мяжы вяртаецца, і адразу не пустым.

«А як жа ў мяне ўсё пачыналася?» — паспрабаваў я напружыць памяць...

— Пашпарты, панове! — перабіў мае думкі польскі памежнік. Як заўсёды, ухмылка на ягоных вуснах спалучалася з нянавісцю ў вачах.

«І што ім яшчэ трэба? Памагаеш людзям жыць, памагаеш (гэтаму дай, таму заплаці, з тым разлічыся, хоць нічога не вінен), а ў адказ — адна няўдзячнасць».

Юрка ад хвалявання забыўся, што пашпарты мы засунулі пад ягоны казырок ад сонца, кінуўся мацаць сябе па грудзях і бакавых кішэнях. Бачачы, што сітуацыя выходзіць з-пад кантролю, правай рукою я дастаў дакументы, а леваю даволі моцна штурхануў Юрку ў бок. Ён пакутліва скрывіўся, але калаціцца перастаў.

Падаўшы пашпарты памежніку, я зразумеў: той заўважыў Юркавы дрыжыкі, і паспрабаваў супакоіць паляка:

— На жаль, мне чамусьці не найлепшыя кіроўцы трапляюцца. Мінулым разам адзін разумнік ледзь машыну не разбіў, а гэты,— кіўнуў на Юрку,— наагул нейкі безгаловы папаўся.

Паляк зразумеў, што ў машыне едзе бос з шафёрам, і страціў да нас цікавасць. Шафёра, асабліва навіка, ён яшчэ мог «апусціць» даляраў на дзесяць — дваццаць, а з босам такі нумар не пройдзе. У таго (гэта значыць у мяне) усё распісана: што, дзе, куды, каму, калі і тым болей — чаму, навошта і колькі.

Юрка нарэшце злавіў першую перадачу, і мы рушылі да месца агляду.

Адразу падскочыў пан «нумар два» і з ходу ўрэзаў Юрку, які не паспеў яшчэ ачомацца, перастаць «прадаваць дрыжыкі»:

— О, дружа, самаход твой, здаецца, новы. На дагляд, дружа, на дагляд!

— Што яму трэба? — чамусьці павярнуўся Юрка да мяне. Бедалага не разумеў ужо ні рускай, ні беларускай мовы.

— Цыц! — станіўся я ад торганняў свайго неспрактыкаванага кіроўцы.— Ні гуку! — Павярнуўся да пана паляка і дадаў: — Няма праблем. Адну хвілінку.— Адчыніўшы дзверцы, выйшаў з машыны.— Усё ў парадку,— падбадзёрваў заадно і сябе.— Вось тэхпашпарт, а вось і мае паперы.

Узяўшы дакументы, памежнік памахаў імі, нібы пастрашыў мяне пальцам:

— Ад вашых дакументаў залежыць, колькі гадзін, а мо і сутак вы тут пратырчыце (па-беларуску, як, мабыць, вы ўжо заўважылі, палякі яшчэ сяк-так гавораць).

«Не пратырчым»,— спакойна падумаў я, маючы на ўвазе, што нездарма ж клаў у пашпарт навюткую дзесятку.

Як і трэ было чакаць, хвілін праз пятнаццаць чынны і прынцыповы шукальнік крадзеных машын аддаў дакументы, і мы рушылі на мытню.

Я ўсё ніяк не мог супакоіць спалоханага Юрку і ўздумаў паўплываць на яго больш жорстка:

— Калі ты зараз жа не перастанеш калаціцца і пагранцы пачнуць капаць машыну, я цябе прыб'ю! Твае дурныя дрыжыкі зробяць нас жабракамі. Да цябе дайшло? Не? Нашы дзеці будуць галадаць. Твой Сяргейка будзе га-ла-даць! Зразумеў? І таго вялізнага «Лега», што ты яму купіў, нават не пабачыць. Забяруць Сяргейкаў канструктар. За даўгі забяруць.

Датумкаўшы ўрэшце: сын не дачакаецца таго, пра што марыў увесь першы цяжкі школьны год — як сказала праз тэлефон жонка: «Не спіць і ўночы — чакае гэтага чортавага "Лега"»,— Юрык нарэшце ўзяў сябе ў рукі і ўжо амаль спакойна сказаў:

— Санёк, даруй. Нервы. Разумею: падстаўляю, але зрабіць з сабою нічога не магу. Страх спаралізаваў...

— Добра, добра, галоўнае — супакойся, не торгайся. Тут і без цябе клопатаў будзе.

Польскі мытнік нюхам пачуў здабычу і пакіраваўся да нас. Ішоў паволі — трымаў паўзу.

«Прашыты,— адразу зразумеў я.— Такі крыві пап'е, о-го-го колькі пап'е. Пачне: «Дзе пан рахункі (чэкі, значыць) схаваў?», а скончыць: "Ну, гэтага вывозіць няможна"».

Дзеля перастрахоўкі я дадаў да пакладзенай у пашпарт дзесяткі яшчэ адну і выйшаў насустрач паляку.

— Естэм бізнесмен,— ляпнуў далонню сябе па грудзях,— усё ведаю. Няма праблем. («Так ужо і няма»,— мільганула ў свядомасці, але я хуценька прагнаў гэтую шкодную іронію.) Вось, калі ласка, дакумент.

— Давай, давай, паглядзім, ці добрыя ў цябе паперы.

Мытнік (як Юрка пасля палічыў: пан «нумар тры») узяў пашпарт і, крыху адступіўшы ад мяне, звяртаючыся да свайго калегі, дадаў:

— Адважны, сам сустракае. Бачыш?

Пан «нумар тры» разгарнуў на секунду пашпарт, усміхнуўся, закрыў яго і благаславіў:

— Так, добрыя дакументы, едзь да сваіх.

Ужо сядаючы ў машыну, я пачуў ад Юркі:

— Глядзі ты, без баксаў адпусціў. Не разумею...

— Дурань, ты проста ад страху нічога не бачыш,— даваў я Юрку, ужо досыць спакойна, дармовую навучку.— Баксы яны хаваюць хутчэй, чым карцёжнік карты...

Нашы сустракалі нас па-нашаму:

— Ну, што там у цябе, расказвай, не саромся, тут усе свае.

— Ды так...— пачаў я няпэўна,— дробязь розная.

— Дробязі я люблю,— сказаў наш.— Дробязь да дробязі — ужо, глядзіш, нешта ёсць. Як кажуць, курачка па зярнятку.

«Гэты выцягне больш за паляка,— адразу ўшупіў я.— Педант. Такі хоча не толькі грошай, але і нервы паказытаць. Садзюга, адным словам».

Я падняў заднія дзверцы мікрааўтобуса, і мытнік з ходу ўгледзеў маю падставу (яшчэ я сказаў бы — падказку):

— А, кветачка,— паказаў ён маімі дакументамі (чаму і тыя і гэтыя любяць махаць маім пашпартам?) на метровую пальму.— Гэта, братка, перавозіць няможна. Пойдзеш у дванаццаты кабінет. Будзеш з нашымі дзяўчатамі разбірацца. А з імі, скажу табе, ох як цяжка знайсці агульную мову.

— Зямляк, не губі. «Кветачку» цешча-змяюжына заказала, заб'е ж.

Відаць, мае словы трапілі на спрыяльную глебу, бо наш нарэшце «ўбачыў» мяне і сказаў:

— Не ведаю, не ведаю...

— Браток! — зразумеў я, што пара браць быка за рогі.— За такую кветку нічога не шкада.— І, панізіўшы голас, дадаў: — Хоць дваццаткі.

— О, ты ведаеш,— таксама ціха падхапіў наш,— у школу я пайшоў адразу ў другі клас і таму з лічбамі меней за трыццаць, на жаль, не знаёмы.

«Няўжо так і праскочу на халяву?!» — не верыў я, развітаўшыся з чарговымі дзесяткамі і сядаючы ў машыну.

Дзе там. Вядома ж, не! Вось ён, шылахвост, бяжыць, родненькі.

— Паслухай, зямляк, дык я ж бакавых дзверцаў не адчыняў. Забыўся, спяшаючыся. А ты вельмі рады і не нагадаў. Непарадак, зямляк, непарадак.

«Так, педант. Педант і садыст. Мог жа адразу ўсё праверыць».

— Ну, што тут у нас? — ужо з напускной строгасцю спытаўся мытнік.— А-а,— убачыў маю другую падставу,— піўцо. Баварскае, іхнае, добрае, значыць. Цэлая скрынка? Ці не многа на дваіх?

— Няма праблем,— згадзіўся я адразу.— З земляком можна і падзяліцца...

— Добра,— падхапіў педант.— Хлеба акрайчык і той папалам.

— Не губі,— зноў запусціў я дурня,— дарагі ж напойчык.

Сам сабе падумаў: «Боўдзіла ты прагавітае! Уся гэтая скрынка табе і прызначана. Я піва яшчэ з першых рэйсаў у рот не бяру. Па мне што баварскае, што жыгулёўскае — адна вада. Маю нервовую галаву півам не падманеш».

Хвілін праз пяць да машыны падышоў салдацік і хуценька паклаў у прынесены з сабою чорны пакет шэсць бутэлек «іхнага».

— Вазьмі і сабе,— паглядзеў я на відавочна недакормленага першагодка і аддаў яму кавалак «Маскоўскай сыравэнджанай».

Другі раз прайшоўшы мытню, я сеў у машыну і зноў пачуў стогны беднага Юркі:

— Не, больш я з табою не яздок. Ну яго ў балота! Лепей зноў на родны завод. Я толькі збоку глядзеў — і то ледзь не памёр.

— Не бойся! Пакуль што праблем няма. Змена, вядома, паршывая, аднак...— я прыкусіў язык, заўважыўшы, што Юркавы вочы робяцца круглымі. За спінай пачуў:

— Зямляк, дык я ж забыўся спытаць, што ты ўсё-ткі вязеш з той далёкай Галандыі?

«Во, нарэшце, а то ўжо сапраўды рот разявіў, паддаўся спадзяванням, што на некалькіх дзесятках праскочу. Адразу яму дзвесце бухнуць ці з ста пачаць?» — хутка ўзважваў. Уголас сказаў:

— Друг, як зямляк земляку (гаварыў смела: крыху ж падмазаў, падаслаў, як той казаў, саломкі), скажу сумленна: машына адным смеццем забіта. Ёсць толькі дзве новыя штучкі, дзве такія невялічкія скрыначкі,— падняў я (так, каб бачыў толькі ён) рог падабранай на адной з вуліц Кёльна амаль што новай пуховай коўдры.

— О, дык гэта ж тэлікі. І вялікія нейкія...

— Ага, вялікія, але не фірмовыя, не «Sony» там або «Panasonic». Так, «плазматроны». Кітай, адным словам...

— А-а,— прамармытаў мытнік.

— Сто,— паспрабаваў я спыніць яго аканне.

— Ну-у,— перайшоў ён на другую танальнасць.

— За кожны,— давялося мне ўдакладніць.

— Як усё-ткі шанцуе некаторым,— адразу ж загарэўся зямляк.— Уяві, што было б, каб табе трапіўся не я, зямляк твой родны, а які юда.

«Ты ён і ёсць»,— падумаў сам сабе, а ўголас схамелеоніў:

— Сустрэць свайго заўсёды прыемна.

Прайшоўшы трэці раз мытню і чарговы раз, не помню ўжо які, сеўшы ў машыну, я зноў пачуў стогны:

— Магіла! Усё! З дому болей ні кроку. Прыеду — і адразу ж на завод! Адразу ж!

— Заткніся, абрыд! Паміраць будзеш потым! Паехалі! Бачыш, пагранец махае. Нябось таксама піва хоча.

Неўзабаве разам з півам давялося расстацца і з апошняй дзесяткаю.

Наагул гэта каштавала пяцёрку, але купюркі такой не знайшлося і стаўку давялося падвысіць. З таго часу, між іншага, стаўка такой

і засталася, і мала хто ведае, кім яна была неспадзеўкі падвоена. І дзякуй Богу, бо калі б сябры-таварышы даведаліся пра гэткае нахабства, дык далі б чосу свайму калегу, што так неўтамавана шыкуе.

Урэшце машына вырвалася з «зоны распранання», і Юрка, крыху ачомаўшыся ад «кашмараў», паціхеньку пачаў паказваць сваё майстэрства кіроўцы-аса (дзеля чаго, уласна, я і ўзяў яго: пасля мытні маглі аб'явіцца яшчэ адны «правяральнікі» — з вялікай дарогі). На блізкім святле ён трымаў належную сотку і нешта насвістваў. Адыходзіў нарэшце ад дрыжыкаў.

— Паслухай, Юрка,— настала чарга ўжо мне захваляваецца,— здаецца, ты не хочаш давезці мяне цэлым да змяюгі-цешчы.

Юрык упершыню за ўсю дарогу ўсміхнуўся:

— Якая ж твая Вольга Уладзіміраўна змяюга? Дабрэйшага чалавека на ўсім белым свеце няма!

Юрык смяяўся. Ён не ведаў, што кашмар яшчэ не скончыўся, што мытня яшчэ не дала поўнага «згода». Наперадзе была прымытная ДАІ, але я не хацеў яго нерваваць.

Ён дасмяяўся амаль да слёз, але ўсё ж угледзеў паласатае жазло даішніка, які вынырнуў немаведама адкуль (так Юрыку падалося).

— Што вязём? — пачулася нармальнае для гэтых мясцін пытанне.

— Піва,— адказаў я, выходзячы з машыны. Чым бліжэй робіцца кантакт-гутарка, тым большая імавернасць, што ён добра скончыцца.

— Піва — гэта добра,— праканстатаваў даішнік, гледзячы на задні нумар машыны.— О, землякі! Што ж, піва дык піва.

Ужо глыбокай ноччу даішнік з-пад мытні адкаркоўваў апошнюю бутэльку «іхнага». «У ночнай змене ёсць свае перавагі,— разважаў, пахмяляючыся,— удзень так не расслабішся».

У гэты самы час на адным з прамежкаў трасы Брэст — Масква катамаранам, быццам склееныя, імчалі дзве машыны. Нягледзячы на падступную серабрыстасць дарогі ад першага свежага снегу, мікрааўтобус трымаў свае максімальныя сто шэсцьдзесят, але сіняя «дзевятка» нібы прыліпла да яго злева і схіляцца не хацела. Здавалася, што вар'яты, якія сышліся ў гэтай смяротнай гонцы, няйначай паспрачаліся, хто хутчэй лучыць на неба. У імгненне вока яны прамільгнулі паўз бензакалонку, і яе гаспадыня, што выйшла

падыхаць свежым паветрам, спачатку зацiхла, потым войкнула і перахрысцілася:

— Госпадзе, ад недасну ўжо лятучыя аўтобусы мрояцца.

А за многія кіламетры ад тае бензакалонкі, у двухпакаёвай хрушчоўцы, у маленькім, яшчэ з дзіцячага садка, ложку не спаў другакласнік Сяргейка. Хлопчыку чамусьці здавалася, што пакуль ён не спіць, змагаецца са сном, казачны «Lego» набліжаецца да яго. І Сяргейка трымаўся як мог. «Не спаць, не спаць, не спаць»,— зноў і зноў падказвала і гэтым дапамагала адольваць сон яго недзіцячая інтуіцыя. І ён усё цёр і цёр пальчыкамі амаль што зліплыя вочы. Маці сэрцам адчувала, што дзіця не спіць, але падысці, супакоіць яго не наважвалася: яна баялася, што і ўпоцемку Сяргейка ўбачыць яе заплаканы твар.

Пакарабачаныя левыя дзверцы мікрааўтобуса падказалі дзяжурнаму па КПП, які стаяў у бронекамізэльцы на ўездзе ў сталіцу, што з гэтай машынай не ўсё ў парадку. Махнуўшы люмінесцэнтным жазлом, ён адначасна ўзяўся за аўтамат. Кіроўца мікрааўтобуса прытармазіў і, калі даішнік рушыў да іх, паглядзеў на пасажыра, што побач.

— Усё нармальна, Юрка. Адпачні. Што мог, ты зрабіў, цяпер — мая чарга,— супакоіў кіроўцу ягоны таварыш.

Лейтэнант збочыў да машыны, потым прыпыніўся: па рацыі перадавалі паведамленне, і ён падумаў, што гэтым, з мікрааўтобуса, чуць неабавязкова: «Сінія «Жыгулі» ВАЗ-2109 дзяржнумар... не даязджаючы... кіламетраў да пасёлка... на мосце... з хуткасцю, якая значна перавышала... вылецелі на паласу сустрэчнага руху, урэзаліся ў металічную абгароду, прабілі яе і ўпалі ў рэчку...»

Лейтэнант зразумеў, пра якую сінюю «дзявятку» ідзе гаворка, і, адклаўшы рацыю, падышоў да машыны:

— Куды едзем, мужыкі?

— Дадому, камандзір, толькі дадому,— адказаў яму той, што сядзеў за рулём.— Павандравалі, і годзе. Добрага, як той казаў, пакрысе.

— Вы не зусім добра мяне зразумелі,— удакладніў даішнік.— Я хацеў спытаць, у які раён едзеце? Машына, бачу, мінская.

— На Чыгуначную,— сказаў кіроўца чыстую праўду.

— А-а, ясна,— кіўнуў лейтэнант.— Толькі вось выгляд у вас нейкі, ведаеце...

— Ведаем, таварыш лейтэнант, ведаем,— мякка перапыніў даішніка пасажыр,— як-ніяк трэція суткі ў дарозе.

— Ды бачу, вы быццам п'яныя — хоць «трубачку» даставай. Добра, едзьце. Ды глядзіце, ля дому не разбіцеся, удвая крыўдна будзе,— і лейтэнант махнуў люмінесцэнтнаю палкаю.

Пачакаўшы, пакуль мікрааўтобус ад'едзе, ён зноў узяўся за рацыю:

— Чатырыста дваццаты?

— На прыёме.

— Сто шосты. А ты зараз дзе?

— Там, дзе і быў, а што?

Сто шосты крыху памарудзіў з адказам, але, успомніўшы пра вымову і рапарт на звальненне, які быў напісаны з гэтай прычыны, сказаў:

— Хвілін праз пяць паўз цябе праедзе мікрааўтобус «Міцубісі», дык ты яго не чапай, няхай хлопцы едуць сабе спакойна.

— А што за хлопцы такія, што чапаць няможна?

— Добрыя, чатырыста дваццаты, добрыя. Дарэчы, адчуваю, ты ад машыны адыходзіўся.

— Тармазнуў тут аднаго. А што?

— Цікавую навіну празяпіў.

— Гэта якую?

— Ды так... Здаецца, пра банду Баксёра ты больш не пачуеш.

— Баксёра, праз якога цябе... Чаму ты так думаеш?

— Інтуіцыя, дружа, інтуіцыя.

## Фарц

Фарцоўнік. Скарочана — фарц. Слова кагадзе вядомае. Але нешчаслівае: мільганула ў гісторыі і знікла. Мільганула нядаўна, а знікла даўно. Як і тыя, каго так называлі.

Фарцоўнік Саша паміраў ад нуды і няўсцешнасці. Паміраў ад жадання памерці. І тапіў тое жаданне ў алкаголі. Гэтыя пятнаццаць гадоў свабоды сталіся для яго заломлівымі. Ён не змог прыстасавацца да хуткіх гульняў «новых рускіх». Ён любіў класіку. Казаў: «курачка па зернетку». Злётаў у «дрэнную» капіталістычную Швецыю (адно трапіць туды — было ўчынкам), абмяняў сумку з гарэлкай, шампанскім і ікрою на два-тры відзікі, дзесятак вокменаў і

стэрэафанічны «Саньё», вярнуўся, прадаў усё ў паўтара раза танней, чым у камісіёнцы,— і зноў купляй «запрашэнне» і ляці ў чарговую капіталістычную.

Цяпер — іншы час. «Новыя» імкнуцца прадаць удвая даражэй, чым купілі. Прадаць і зрабіць усё, каб не даставіць тавару, не разлічыцца, знікнуць, змыцца, забыцца пра доўг. Ёсць і нармальныя «новыя». Але і яны, калі ты раптам на дзень-два, няхай і не сваёй віной, спазніўся з дастаўкай тавару, разбяруцца з табою, як мае быць. Наладзяць такое практыкаванне нервовай сістэме, пасля якога аднавіць яе будзе вельмі-вельмі складана.

Забег сябра, уладальнік некалі адной з найбагацейшых у СССР калекцыі — колькі тысяч — фірмовых вінілавых кружэлак, кожная з якіх каштавала тады палову зарплаты пралетарыя. У тую старую добрую пару яму ўдавалася слухаць пінкфлойдаўскую «Сцяну», калі гэты, пазней суперславуты, двайнік яшчэ не паступіў у продаж нават у той краіне, дзе ён друкаваўся. Гандляры слухалі кагадзе музыку і трымалі ў руках альбомы «Цэпелінаў», «Паплаў», «Сабатаў», «Фанкаў», «Слэйдаў», «Назарэтаў» і іншых «Хіпаў» ці «Світаў» раней за самых англічан.

Саша паглядзеў на сябра, як у люстэрку ўбачыў сябе — і адвёў вочы ўбок. Не хацелася жыць. Хацелася выць. Выць на неба, на несправядлівы нейтралітэт Найвышняга. Цяпер і ўявіць нельга, што раней, дзе была кватэра гэтай асобы, ля пад'езда суткамі дзяжурылі таксісты. У рэстаране, куды ён заходзіў паесці, афіцыянт ведаў: калі раптам — ну раптам! — ён застанецца без работы, дык пасля таго, як Асоба паабедае, дык за бліжэйшыя месяц-два з голаду ўжо не памрэ. І хадзіла Асоба з вялізнымі сумамі. Грошай не хавала і нікога не баялася.

Цяпер Асобы не было.Ператварылася ў анучу. Цяпер сябра баяўся ўсяго. Дрыжаў. Прасіў. Маліў. Але найбольш баяўся яго, Сашы. Баяўся, што ён адмовіць, не дасць гэтых няшчасных дваццаці даляраў, якіх, калі жыць эканомна, яму стане, каб забыцца дні на тры. Ён не ведаў і не бачыў (або не хацеў ведаць і бачыць), што ягоны сябра даўно ўжо такі самы, як і ён, і для яго гэтая сума таксама — ой, якая немалая.

Праўда, Саша стараўся не западаць духам. Штодня бегаў, прымаў душ, чытаў вясёлую перабудоўчую перыёдыку, сачыў за навінкамі. Новы альбом Макартні нядаўна запісаў. Радаваўся, што Вейкман аб'явіўся па доўгім маўчанні. Што Дылан па-ранейшаму

не здаецца. Што не спяць Бенсан са Сцюардам, і Плант з Блэкмарам. Боўі ў кіно вярнуўся... «Змагаецца старая гвардыя,— уздыхнуў Саша, гледзячы на сябе ў люстэрка,— не раўня нам, зацыкленым, зацюканым саветыкусам». Акуратна насіў купленыя некалі эксклюзіўныя рэчы. «На іх цяпер не заробіш, нават калі памрэш ад перанапругі,— інфармаваў жонку, калі прасіў заводзіць пральную машыну ў эканомным рэжыме.— Балазе тады купляў усё фірмовае. Фірма і праз гады як мае быць».

«Дзе ж знайсці для Стаса гэтыя праклятыя дваццаць даляраў? — спрабаваў Саша нешта прыдумаць.— Пэўна ж, ён не паверыць, што ў мяне іх няма, і адразу я ператваруся для яго з сябра ў найзакляцейшага ворага».

Думай, адстаўны фарц, думай!

Сёння панядзелак, на рынку выходны, і сусед дома. Адпачывае. Былы слесар! Ён дрыжаў кагадзе ад хвалявання, калі для яго запісваліся ў гэтай кватэры «Боні М», «Атаван» або «Чылі», што даводзілі да сексуальнага ўзбуджэння, Дона Саммер, якая ажно стагнала ад перапоўненасці пачуцця, «Супермакс», што нізамі падрываў акустыку і лёгкія, або антымаскоўскі бандытыністы «Чынгісхан». Цяпер — даўно мае гэтых «максаў» і «ханаў». Стасавых «ханаў». Стас, кожны раз за мізар закладаючы «да заўтра» «бітлоў», што сталі класікамі ў студэнцкія гады, або джагераўскі «языкасты», але строга выверaны «Стоўнз», атручаную наркотай першую рокавую гітару свету Хендрыкса або тую ж Джоплін, што разарвалася ў напружанні звязак і жыцця, паступова спусціў сваю славутую калекцыю. Потым за мізар паляцела унікальная, нават па цяперашнім часе, аўдыёапаратура: эквалайзер з аналізатарам спектра і карэктарам акустыкі пакоя японскай фірмы «Сан Суй», тады яшчэ моцнай, двухблочны узмацняльнік, цаною некалькі іншамарак, славутага амерыканца «Марка Левінсона», прафесійная акустыка ад англійскіх джэнтльменаў Баўэра і Вілкінсона, дэка «без пытанняў» ад легендарнай «Накамічы», аналагавы прайгравальнік вышэйшай групы складанасці ад учэпістых немцаў з «Дзюала». Пасля тэхнікі дайшла чарга апошніх запасаў: відэакасет з лазернымі копіямі і відэадыскаў. Пазней з малатка пайшла жончына калекцыя французскай парфумы, сукенкі ад Како Шанэль і іншых непатапляльных.

Цяпер у Стаса для слесара, а дакладней — для гаспадара сеткі камерцыйных кіёскаў, што стаялі каля ўвахода на цэнтральны рынак сталіцы, нічога не было, і ён прыйшоў да Сашы. Грошы Саша

павінен сябру знайсці, інакш стане ворагам. Сусед ці знаёмы, што не пазычыў, гэта проста той, хто не даў — «сволач», «скупяндзя». А сябра, які не дапамог,— гэта «здраднік», «кроўны вораг», «юда».

Саша не хацеў быць Стасавым кроўным ворагам, не хацеў быць «юдам».

Успомніў! Жывы яшчэ апошні з магіканаў, любы радыёпрымальнік, адзін з першых лічбавых «Sony». Некалі найвышэйшая мадэль у каталогу. З яе каталог пачынаўся. Нават цяпер, праз паўтара дзесятка гадоў, яе ніхто не перавысіў. З'явіліся меншыя габарытамі і вагою, але не лепшыя паводле якасці.

Усе гэтыя гады прымальнік прастаяў у спальні і стаў паўнапраўным сям'янінам. Спачатку — сведкам шчаслівых імгненняў зачацця, потым — жарлівых сцэнаў рэўнасці, цяпер — няспаных начэй таго, хто паставіў на карту ўсё і прайграў, дакладней, не стаў гуляць. Любы прымальнік шанавалі, накрывалі махровай сурвэткаю, шкадавалі. Ставілі толькі перад сном: што там, на «Свабодзе», пра найсвабоднейшую гавораць? Таму і захаваўся ён у ідэальным стане.

Цікава, ці возьме Віцька, неўтаймоўны бізнесовец і пястун лёсу, апарат, які каштаваў семсот даляраў, за «Стасавы» дзесяць?

Сябру сказаў:

— Добра, пачакай. Сам разумееш, зараз трымаць грошы дома — тое самае, што бандытаў на гарбату запрашаць.

Увайшоўшы ў спальню, Саша ўбачыў родны «Sony». За гэтыя гады ён стаў яму другім бацькам, першым настаўнікам, малодшым братам. І зараз ён мусіў свайго брата прадаць. Саша паглядзеў на прымальнік, падумаў, супакоіў сябе: ён выкупіць, ён абавязкова яго верне. За ўсякую цану!

Пяшчотна працёр «Соньку», блок сілкавання ад яе, дастаў з ніжняй паліцы шафы тоўстыя, з добрую кніжку, правілы эксплуатацыі, прыкладзены да іх даведнік частот вядучых радыёстанцый свету, паклаў усё гэта ў дыпламат і выправіўся да суседа. Ішоў, як на плаху. У трыццаціградусную сонную ліпеньскую спякоту цела працінаў холад, ад якога ён некалі ледзь не задубеў у Сібіры.

Дзверы адчыніла Святлана, бізнесоўцава жонка, былая прыбіральшчыца ЖЭСа, а цяпер заўзятая наведвальніца буцікаў, масажных кабінетаў і іншых панадных мясцін для здаровых і заможных.

— Светка, твой дома? — паспрабаваў Саша спытаць суседку пасвойску, але збянтэжыўся. Наплыў французскі туман, і ў былога караля відэаапаратуры язык прысох да паднябення. Прагучала не

пытанне, а просьба. Апошні флакон духоў скончыўся ў жонкі год таму. «А Францыя застаецца Францыяй,— падумаў Саша,— гіпноз, а не пах. Не здаецца старая гвардыя. Не здаецца».

— Як усе збрыдлі,— незадаволеным голасам загадніцы каўбаснага аддзела часоў брывастага калекцыянера цацак Леаніда Ільіча, сустрэла яго суседка.— У выходныя адпачыць не даюць. Віктор (зрабіла націск на другім складзе) заняты! — Суседка мелася зачыніць дзверы.

— Свет, хто там? — пачуў ён голас слесара-бізнесоўца.— Сашка? Пусці пацана. Хай цягне, што прывалок.

— Праходзь ужо,— кінула Света, нехаця адчыняючы дзверы.— Мёртвага ўгаворыш. Тапкі здымі. Віктор у спальні.

«Бедны мой «Сонечка»,— падумаў Саша, уваходзячы ў бялюткую спачывальню.— Не спытаўшыся, вырваў цябе з наседжанага месцейка. Тут цябе, здаецца, ні разу і не пагамоняць з браточкам».

У спальні Саша ўбачыў, як па голым целе Віцькі-бізнесоўца праходжвалася масажыстка, высокая, у празрыстым халаце, без ніжняй бялізны, з сакавітым целам бландзінка. Віцька, пакрактаўшы ад кайфу, кінуў адрывіста:

— Выклад-вай свае забаўкі. Можа, што й спатрэбіцца.

Сашка падышоў да суседа і падаў яму «Sony».

— Гадзіннік, ці што? — хмыкнуў, гадаючы, Віцёк.

— Не, прыёмнік,— адказаў Саша, пачынаючы злаваць на гэтую цёмную, задаволеную жыццём істоту.— От напісана: «All band Receiver»,— усехвалевы, значыць. Але гадзіннік і таймер у ім таксама ёсць.

— Колькі? — адрэагаваў хваткі ўладальнік шапікаў.

Імгненне падумаўшы, Саша назваў цану, крыху большую за суперхаляўную, па якой сусед пераважна і купляў усё:

— Семдзесят...

— Ну ты даеш! — не даслухаўшы, абарваў Віцька.— Дурня шукай у іншым месцы. Трыццаць — і амбец!

— «Sony», арыгінальны, японскі, не які там малайзійскі філіял,— тлумачыў Саша.— Такіх цяпер раз-два і...

— Так,— зноў перапыніў яго Віцька.— Цяпер — не тады! Пяцьдзесят. Апошняе слова. Паўсотні! І рублямі. Усё! Гандаль скончаны,— спаліў сусед апошні масток, які лучыў Сашу з тым іншым, актыўна-застойным жыццём.— Светка, нясі капусту! Санёк мяне зноў абуў.

Атрымаўшы грошы і аддаўшы суседу за пяцьдзесят рублёў прымальнік, цаною ў семсот даляраў, Саша пажадаў яму далейшага квітнення і пайшоў.

Ужо падыходзячы да сваёй кватэры, падумаў: «Толькі б Стас не зрабіў глупства і не ўкраў чаго, пакуль мяне не было, з дарагога посуду, да продажу якога я пакуль не дакаціўся. Іра знікнення яе талісмана, апошняй адзнакі таго, амаль забытага жыцця не вытрывае».

Але хваляванні яго былі дарэмныя. Нават у цяперашнім бядотным стане Стас чужы посуд красці ніколі б не стаў. Прапіць сваё — так. Але чужое... Ён жа былы фарц, а не злодзей! Так, Стас не крадзе — і гіне.

Аддаўшы сябру ўпакоўку рублёў (два чырвонцы «іхнымі»), Саша правёў яго і, вярнуўшыся, прысеў на ўсё яшчэ шыкоўную, але месцамі ўжо пацёртую скураную канапу, што раскінулася на паўзалы. Уздыхнуў.

— Старая,— звярнуўся да канапы,— што будзем рабіць? Можа, годзе лайдакаваць, каціцца ў прорву галечы ды апатыі? Здаецца, настаў час падумаць, як далёка я зайшоў, не жадаючы прымаць новых правілаў гульні.

Саша думаў. Меркаваў. Куды скіраваць намаганні, веды, досвед? Ды й з чаго пачаць? Кінуцца ў бойку самому ці пайсці ў найміты? Не, лёкаем ён ніколі не быў! Але і ад боек стаміўся. Можа, таму цяпер і не ў абойме. Так, ён стаміўся. Пятнаццаць гадоў змагання за годнае жыццё... Стаміўся...

Саша расслабіўся, забыўся, заснуў.

Сніўся сон.

Індыя. Яны ўзляцелі. Выбар тавару, яго закуп, загруз і апошні прыпынак перад фінальным скокам у нашпігаваным кандыцыянерамі бамбейскім аэрапорце — усё мінулася. Яму за сорак, а вымушаны завіхацца з маладымі хлопцамі. Але хлопцы працавітыя, дружныя, вясёлыя, чымсьці родныя. Ён зышоўся з імі, ажыў, пачаў усміхацца. Упершыню за апошнія гады адчуў сябе чалавекам, дзейным чалавекам, які працуе, змагаецца, жыве.

Нарэшце!

Іх дванаццаць. Дванаццаць чаўнакоў, гатовых верай і праўдай, або й без іх, прарвацца, прабіцца, праскочыць, даставіць, зарабіць, карміць сям'ю, жыць і зноў прарывацца.

Ён стаў адным з іх. Людзей па-за дзяржаваю і законам, па-за абаронаю і гісторыяй. Нямытых, трохжыльных, рызыкоўных, змушаных бадзяг-падарожных, камікадзэ, шукальнікаў удачы.

Гэтым разам удача іх абмінула, абышла, пакінула, здрадзіла ім.

Адразу пасля ўзлёту заклініла рухавік, потым — другі. Ён успомніў словы аднаго з пілотаў, сказаныя камусьці з экіпажа перад узлётам: «Хлопцы, давайце адкладзём свой тавар на наступны рэйс. Мы ж не чаўнакі, нас час не падганяе. Шэсць тон перагрузу».

Так, перагруз.

Ён узяў болей за норму, болей, чым мог панесці. Ён хацеў дагнаць гады. Гады прастою, нечынення, роспачы. Ён не адужаў. Не змог. Не вытрымаў. Зламаўся.

Самалёт зламаўся. Падаў. Гінуў.

Сашка выдыхнуў, расслабіўся, заплюшчыў вочы.

«Усё. Фініш. Стаміўся. Стаміўся змагацца з жыццём. Стаміўся назаўсёды».

Грымнуў выбух.

Гарэў самалёт, гарэў дом, на які самалёт упаў, гарэў яго лёс.

Ён не ведаў, што сон будзе прарочым. Абудзіўшыся, паабяцаў жонцы: «А «Соню» я абавязкова выкуплю, вось пабачыш».

Але яна не ўбачыла. Яна спала. Учора было яго пахаванне, і яна вельмі стамілася.

## БОНУС

### А далей – дробязі...

100 марак. Сто. Роўна столькі у канцы васьмідзесятых — на пачатку дзевяностых трэба было адшкадаваць за «гасцявое запрашэнне» ў Германію (тады з гонарам дадавалася: Заходнюю), спакойна браць білет на цягнік-мару Масква — Берлін і махаць краіне ручкаю: «Да няхуткай сустрэчы, дарагая!»

— Мы пойдзем іншай дарогаю! — па-ленінску настаўляў мяне старэйшы таварыш, які паспеў раней пабамжавацца ў капіталюг ненасытных.— Удвая таннейшаю! Галоўнае — дабрацца да Згаржэлец (гэта крыху на поўнач ад трохкутніка — стыку межаў Польшчы, Чэхіі і Германіі), а далей — дробязі...

Дробязі, як выявілася, зусім не дробязі, і было іх гэтулькі, што нават і цяпер, праз шмат гадоў, калі ўспамінаю пра той Згаржэлецкі трохкутнік, сэрца з рытму збіваецца.

Знаёмага паляка, «спецыяліста бязвізавага перасячэння межаў», таварыш не заспеў — паехаў пан у мясціны, як у нас кажуць, не вельмі аддаленыя, а ягоны нядурань-сусед і сябрук у эмігранцкім бізнесе таксу падвоіў:

— Цяжкія надышлі часы, небяспечныя, хапаць паліцаі кінуліся нашага брата. Дзвесце «дойчаў», не меней, каштуе цяпер, каб патрапіць на той, Богам не забыты бок,— заспакоіў нас нягоднік — як зарэзаў.

Ужо вечарэла, а там, глядзі, і ноч насунецца. Паўздыхалі мы, паўздыхалі, дый згадзіліся на гэтую ідыёцкую авантуру. (Заплацілі столькі сама, колькі каштуе віза, а ідзём без яе, роднай.)

Мяжа — рака. Брудная, але што зробіш. Перасек, пераплыў яе — і ты там, за Кардонам. Але-але, з вялікай літары. З малой — гэта калі б гаворка ішла пра Паляндыю. Самі разумееце: «курица — не птица, Польша — не заграница».

Плыўма, як Чапаеў, мы ў рэчку не кінуліся — лепш караскацца, нібыта малпы, па ржавай арматуры чыгуначнага моста, ці то недабудаванага, ці то паўразбуранага.

Як ні дзіўна, выйшла.

Ціха, амаль не дыхаючы, пратупалі і палову Гёрліца (той жа Згаржэлец, але з нямецкага боку). Не ўбачылі нас паліцаі і на мясцовым — увесь у свастыках — вакзальчыку, размаляваным маладымі спадкаемцамі Адольфавай справы. І рушылі бойкія хлопцы ў цэнтр Еўропы без штампікаў-візаў у пашпартах, хоць за іх, быццам бы, і заплацілі.

Зэканомілі.

І яшчэ наперадзе мяне чакала сітуацыя, калі на ўсходзе Галандыі, у ціхім буржуйскім Арнхеме (самы закаранелы бомж-гультай тут фруктозай напічканы шчыльней, чым наш хвалёны, вельмі адукаваны, бязмежна эрудзіраваны суперінжынер), я застануся адзін з двума купленымі напярэдадні аўтамабілямі (таварыш заляціць у турму за вулічны гандаль цыгарэтамі), з грашыма, якіх ледзь хапала на запраўку аднаго.

І яшчэ, чакала мяне наперадзе сітуацыя: брэсцкі мытнік вылезе з будкі падзівіцца на клоуна, што адзін спрабуе прасунуць цераз мяжу дзве тачкі. І злітуецца. За сімвалічную плату (блок «Мальбара» — апошняе, што засталося з таварышавых рэчаў, свае

два дазволеныя для правозу я памяняў у старшыні абмежаванага саўкантынгенту на салярачку) ён скажа запаветную фразу:

— Едзь, артыст, толькі не цяпер, дачакайся раніцы: начамі пацаны на дарогах пільнуюць, крыўдна будзе заляцець на фінішы.

Але не стаў я чакаць ранку. Пагнаў уночы «Форд», а на світанні вярнуўся па «Опель».

І таварыш, які прыехаў з Германіі праз два месяцы, пасвяжэлы, нібыта з санаторыя, але з пустымі кішэнямі і неўязным штампам у пашпарце, забіраючы ў мяне ключы ад «Опеля», скажа:

— Шкада, не было мяне. Я б за паўблока граніцу праскочыў. Ну, такой бяды, наступным разам будзем разумнейшыя. Дарэчы, пакуль у каталажцы сядзеў, пэўныя людзі каштоўнай інфармацыяй падзяліліся: цяпер выгадней машыны купляць на Блізкім Усходзе, у Арабскіх Эміратах. Тут галоўнае — каб пры перагоне на тэрыторыі Ірана не падстрэлілі, а далей — дробязі...

## Дзевяць сутак і дзевяць гадоў

Ад'ехаліся ад Омска кіламетраў дваццаць, асфальт пайшоў упярамешку са снегам і лёдам, і Азік — так звалі прысібіранага азербайджанца, што сядзеў за рулём,— раптам прарэзліва, быццам яму ў шыю ўпілася змяя, заенчыў: «Ва-ай!» — і рэзка затармазіў. Машыну панесла юзам, але пярэдні прывод не падвёў, утрымаў яе на дарозе. Спынілася «васьмёрка» за нейкі крок ад абрыву. Заікаючыся, хлопец прызнаўся:

— Вад-дзіцель я, с-сам б-бачыш, ніякі, нават н-не ведаю, як у тваім «зубіле» задняя перадача робіць. Нагадзіўся на непасільную для мяне работу дзеля жонкі. Тыдзень таму зноў узняла гвалт і заявіла, што болей трываць у кватэры дармаеда не будзе. Чалавек я просты, але сітуацыю разумею, згодны і гатовы на ўсё. Можаш змясіць мяне хоць да паўсмерці, калі табе ад гэтага стане лепш, толькі адпусці: адсюль я дадому яшчэ на сваіх дваіх дабяруся.

Такі-от вясёлы сюрпрыз паднеслі мне на пачатку дарогі ў дзве з паловай тысячы кіламетраў. І што было рабіць? Выкінуць ашуканца з салона і застацца аднаму? А калі машына, бітма набітая апаратурай, сапсуецца? Хто застанецца яе пільнаваць і хто пойдзе шукаць падмогі? І праўда, што рабіць? Ды нічога! Пакінуць гада ў машыне, хоць вартаўніком, хоць...

— Глушы матор, пагамонім,— загадаў я небараку-кіроўцу.— У мяне таксама ёсць жонка і дзеці. Але з табою мой кампаньён Жэнька Бяндзераў наперад разлічыўся, і твае ў бліжэйшы час ад голаду не зачэзнуць. А мае — зачэзнуць! Учора ў іх скончыліся і прыпасы, і грошы, і цяпер я ўжо не ўяўляю, у каго жонка будзе пазычаць. У суседзяў брала, бацькі самі маюць патрэбу ў дапамозе. Адным словам, пра «адпусці» — забудзься. І ўбі сабе ў галаву: не рыпайся і не думай адысціся ад машыны хоць на крок. Будзеш грузчыкам, штурманам, не ведаю кім, але — паможаш дабрацца. Цяпер — вылазь, памяняемся месцамі. І кінь калаціцца! Вазьмі з бардачка атлас дарог, разваж далейшы маршрут. Не такі ты ўжо тупы, калі чаўнака абуў у лапці. І не глядзі гэтак на мяне — я не дзеўка.

Азік узяў атлас асцярожна, як нейкую атруту. Я жахнуўся: «Можа, ён яшчэ і непісьменны? Во ўлез дык улез! Як мае быць. Што ж, не першыня. Будзем біцца да канца».

І я пачаў біцца, дакладней — біць. Я хвастаў яго па рабым няголеным твары, тыцкаў носам у карту, крычаў:

— Ты ў мяне ўмомант грамацеем станеш, мігам прачнешся і пачнеш памагаць!

Толькі кроў, што лынула ў яго з носа, крыху астудзіла мяне. Я даў яму губку для праціранння шкла. Ён прыклаў яе да твару. Не прасіўся, маўчаў — відаць, падумаў, што лепей не выпрабоўваць лёсу. Дапяў, што я не жартую і ў зрыве магу забіць.

Так пачынаўся першы дзень майго «падарожжа» з Омска ў Мінск. Наперадзе было яшчэ дзевяць. Дзевяць сутак татальнага галалёду пры мінус трыццаць восем за бортам з бандытамі або часам (калі адпачывалі бандыты, але не я) мянтамі на хвасце.

Дзевяць сутак, што забралі дзевяць гадоў жыцця.

Нармальная для чаўнака статыстыка.

## Уладзівасток – Найдалёкшы Усход, або Другая спроба

Ці ведае паважанае спадарства горад, у якім, калі звярнуцца да тутэйшай мадам-с і з усмешкай-намёкам, гулліва ўскінуўшы ўгору бровы, пацікавіцца: «І колькі?» — вам не зададуць сустрэчнага пытання: «Чаво?» — не кінуцца ўдакладняць, ці доўга вы мяркуеце карыстацца гэткай незвычайнай паслугаю, і ўжо пагатоў не

плюнуць у твар і не ўрэжуць па нахабнай мордзе? Вам бясконца млява пасміхнуцца і па-змоўніцку ледзь чутна агучаць лічбу. Нават дзве: за гадзіну і за ноч. Лічбы будуць сціплыя, не напалохаюць: скажам, трыццаць і пяцьдзесят тых самых умоўных адзінак. Але галоўным і найдзіўнейшым стане тое, што абслужаць вас як мага лепш. Як мага! Вы не пачуеце: «Так — не хачу!» або «О-о, хітрун, за гэта — асобная плата!». З вамі будуць з задавальненнем. Выціснуць з вас усе сокі — нават тыя, пра якія вы і не здагадваліся.

Пасля такога якаснага абслугоўвання вам застанецца толькі вохкаць і войкаць: дзе гэта раней, на якой такой забытай Найвышнім планеце мучыліся, у якім каменным веку абарачаліся? Як жа далёка да гэтай планеты вашым жонцы і палюбоўніцы! Вы нарэшце зразумееце, што ж так прыгнятала вас. Але галоўнае — вы даведаецеся, што такое Уладзівасток. Самы бандыцкі горад былога Савецкага Саюза. Дзяржава ў дзяржаве. Бандыцкая дзяржава. Бо як на найвышэйшым роўні вас абслужаць мясцовыя гейшы (а гэта, так ці інакш, лічы што ўсё тутэйшыя women), гэтаксама па найвышэйшым роўні вас вычысцяць мясцовыя грывастыя хлопцы.

З аэрапорта пасля марнай спробы паляцець мы вырваліся толькі цудам. Да чыгуначнага вакзала дабраліся на грузавічку «Хлеб». З закупленай у мясцовым ГУМе дэфіцытнай японскай электронікай пад'ехалі з тылу. І дзяжурныя бандыты, «ахова», як яны сябе называлі, нас заўважылі не адразу і тое-сёе паспелі.

— Удвух проці васьмі. Не найгоршая мера,— прашаптаў мне Жэнька Бяндзераў, калі пералічыў каўказцаў, што перакрылі нам падыход да чыгуначнай платформы.

Я пагадзіўся:

— Першая спроба прарвацца не ўдалася. Але купім не купім, а патаргавацца можна,— паўторым. Каб вырвацца з лапаў гаспадароў Уладзівастока, пупок давядзецца напружыць.

— Прабівацца да вагонаў прапаную перабежкамі, як нядаўна ў Ніжнім Тагіле,— успомніў Жэнька нашы апошнія гастролі.

«Ага, перабежкамі»,— кіўнуў я, не перастаючы сачыць за рухам маленькіх вузкалобых чарнявых урвісаў. І не карлікі, і не нармальныя піпл. Сімбіёз пацука і сабакі. Носяцца па платформе, як ашалелыя, шукаюць. Нас, вядома. Тут, на жаль, мы ў адной вязцы, дакладней — у адным жыццёвым чыне. У адным, але ў розных ролях. Яны — паляўнічыя, мы — здабыча. Мы ўсё жыццё

для кагосьці здабыча: справа — міліцыянты, злева — гэбэшнікі, наперадзе — мытнікі і падатковая паліцыя, ззаду — бандыты. Хоць не: зараз і бандыты спераду!

Як я стаміўся! Узяць бы дый перастраляць зграю ненажэрную. Пісталет жа купілі. Аднак перастраляць — значыць пайсці па-банку, значыць — здалі нервы, значыць — пляваць на сям'ю, значыць — не вярнуцца дахаты, ніколі не ўбачыць сына, Наташу...

— Ну што — другая спроба? — зрынуў мяне ў рэальнасць Жэнька Бяндзераў.— Скачам?

І мы скочылі на чыгуначныя рэйкі, пабеглі, панесліся, паляцелі.

Чорная зграя паперла за намі. Але цяжка ім будзе нас дастаць. Яны ж хочуць толькі грошай, а мы цяпер марым пра большае — выжыць! Апаратурка ж японская ў паштовым вагоне паехала...

## Мост

Мост лучыў гандлёвы цэнтр горада, рассечаны аўтабанам напалам. Абедзве паловы амаль цэлыя суткі кішэлі купцамі, прадаўцамі, грузчыкамі, разявакамі-турыстамі. На мосце ж вока фіксавала хіба што адзінокія фігуркі. Мост заставаўся незапатрабаваным. Загадка.

«Зачараваны,— мільганула думка.— І як азіяты стыкаюцца міжсобку, гэтак упарта ігнаруючы дугападобнага стальнога харашуна?»

На мост я ступіў з трывогаю. Даўжэзны, ён вісеў не толькі над шасціпалосай шашою, але і сягаў кончарамі ў глыб вялізманага рынку.

Трывога ўзмацнілася, калі я адлічыў першую сотню крокаў і спінаю адчуў: я тут не адзін. І за што мяне Бог узнагародзіў гэтым незразумелым прыцягненнем? Варта падысці ў магазіне да прылаўка, як ля яго ўмомант выцягваецца чарга, а нехта імкнецца і адапхнуць, наперад праціснуцца. Пра тэатральныя касы наагул няма слоў: здаецца, здолеў бы стварыць ажыятаж і распрадаць білеты на відавочную шэрасць.

Мой нечаканы спадарожнік не спрабаваў абганяць, але я ўсё ж прыспешыў крок: чуццё падказвала — лепш адарвацца. Адарваўся. Аднак недзе на сярэдзіне моста незнаёмы зноў задыхаў у спіну.

— Ну і спякота! — нібы прытрымаў словам.— Шкодны ў нас, аднак, занятачак. Як думаеце?

Трэба сказаць, інтуіцыя рэдка падманвала мяне. Зараз жа яна проста выбухнула: «Уцякай! Хутчэй! І не ўздумай тузацца. Сілы няроўныя. Ён, вядома ж, не адзін, увесь мост у іх пад кантролем. Але бяжы не адразу, а як зыдзеш з моста. Ляці без духу. Апынешся ля дарогі — адразу хапай таксі».

«Я ўсё разумею, не хвалюйся,— запэўніў інтуіцыю.— Так і зраблю». Супакоіў і прыліпалу:

— Праклятыя Эміраты! Ад спёкі мазгі размяклі — бабкі ў нумары забыўся. Трэба вяртацца. За дурной галавой і нагам неспакой.

Надзеў маску чаўнака-дэбютанта: разяўлены рот, здзіўлена вырачаныя вочы (маўляў, лох лохам — усё о'кей, не мітусіся, я твой, ужо цёпленькі).

Ён быў кідала, хоць і малады, але, з усяго відаць, спрактыкаваны, біты воўк, і на маё адцягванне ўвагі, само сабою, не папаўся, не адчапіўся. Наадварот, усё з большай любасцю аблашчваў позіркам сумку-партманет, якая вісела ў мяне на поясе.

Усміхнуўся:

— Я, дарэчы, таксама ў «Карлтане» жыву.

«Значыць, з самага пачатку вялі: не прачытаў жа ён праз кашулю на бірцы ад ключоў назву гатэля».

— Ого! Здаецца, кашалёк! Бачыш?! От падфарціла! Паглядзім, што там? Паглядзім...— ён нагнуўся, падхапіў рупліва згублены кімсьці з яго памагатых светла-карычневы партманет.— Во гэта штука! — падкінуў яго.— Ну-ну... Цяжкі кашэль...— Раскрыў.— Слухай, а бабак колькі! Халява, брат! Толькі цур, дзелім па-чэснаму, напалам...

— Мне чужога не трэба, пакінь сабе,— асмялеў я, калі адчуў пад нагамі прыступкі, якія паказвалі, што адна з рынкавых вуліц блізка. Але не пабег. Унізе нас, вядома ж, чакалі і з моста маглі проста не выпусціць.— І яшчэ,— працягваў, задарма навучаючы бандыцкі маладняк і крыху саромеючыся свайго нервовага шматслоўя,— што ты не чаўнок, адчуваецца адразу. Першае: мы ніколі ні да кога не чэпімся — няма часу: за тры дні ў дзесятцы пунктаў трэба атаварыцца. Другое: на работу сваю ніколі не скардзімся: навошта языком малоць дарма? Не хочаш — кідай: святое месца пустым не бывае і замена заўсёды знойдзецца. (Сам сабе зазначыў, што наконт замены крыху перагнуў палку, бо незаменныя ўсё ж ёсць,

9. Зак. 413

але гэта ўжо іншая гісторыя.) І апошняе — твой фокус з партманетам, у якім, зразумела, спачатку знойдзецца парачка «франклінаў», а пасля банда падляціць і ўмомант давядзе, што партманет іхны і грошай там было разы ў тры болей,— гэты фокус я ведаў, калі ты яшчэ пад стол пехатою хадзіў. А цяпер — бывай! — скончыў маналог, ступаючы з моста на зямлю.— І бегчы за мною, былым стаерам, не трэба: марна час патраціце...

Як толькі мінуў кампаньёнаў майго праваднікa (яны маячылі менавіта там, дзе і трэба было чакаць), я кінуўся бегчы. Можа, тыя і памчалі б наўздагон, але іх запыніў вокліч:

— Стойце, лох усё роўна пусты: капусту ў гатэлі забыў. Чакаем наступнага.

«Чаму гэта ён такі клапатлівы?» — з трывогай падумалася ў той момант, але толькі падумалася.

Прабегшы на ўсякі пажарны паўквартала, я спешна выкінуў угору руку. Не паспеў аддыхацца, як ужо сядзеў у светла-карычневай, з вядомымі ва ўсім свеце чорна-белымі шашачкамі машыне. І ўсё б добра, калі б не голас ззаду:

— Смірненька сядзі, не торгайся: дзверы заблакаваныя, а пушка проста на тваю левую нырку глядзіць... Не чакаў? А як ты думаў. Пад асабліва шустрых — такіх, як ты,— мы машыну на выхадзе трымаем. Так, разумнік, праляцеў ты, моцна праляцеў. Не захацеў наш кашалёк браць — цяпер мы возьмем твой... Шэры! — гэта ўжо было адрасавана кіроўцу.— Паварочвай да моста па мальцоў — і на базу.

«Добры горад Шаржа,— думаў я, спаралізаваны новым паваротам падзей,— але лепей атаварвацца ў Дубаях».

— Бывае, конь на чатырох нагах і тое спатыкаецца,— паспрабаваў выйсці з трансу, а заадно і адцягнуць увагу бандыта, намацваючы ў кішэні балончык з на-адта ж эфектыўнай вадкасцю (на сабе праверыў, купляючы ў знаёмага гэбэшніка: той доўга не мог вярнуць мяне да жыцця — сам, відаць, не ведаў, што за таварчык прадае).— Яшчэ не вечар, панове, яшчэ не вечар,— рэзка, з разваротам прыўзняўся, асвяжаючы адэкалончыкам хлопца з пушкаю.

Кіроўца рвануўся тармазіць, каб вызваліць рукі і памагчы дружбаку. Не атрымалася: таго па інерцыі кінула ўперад, і ён хапануў порцыю газу з запасам. Абмяк адразу... Машына ўжо спынілася, але Шэры, замест таго каб мужна палезці ў бойку, выскачыў і сігануў прэч. І ключы, дурань, у замку пакінуў. Але каштоўным падарункам я не пакарыстаўся: азіяты скрадальнікаў вылоўліваюць — не па-

спееш свіснуць, а караюць так, што пасля не будзе чым свістаць. Я таксама пабег, як мага далей ад моста. Гэтак і засталіся пры сваіх.

Цікавы, як вам думаецца, масток, га? І мне так здаецца.

## Аблава

— Санёк, кажуць, аблавы на ўсіх мытнях. Хлопцы прапаноўваюць адседзецца дзень-другі ў гатэлі, дый апаратура на дзяржскладзе лепш захаваецца. Прымаўка «Хто не рызыкуе — не п'е шампанскага» — цяпер не праходзіць. Не тыя часы.— Серж зрабіў глыбокую зацяжку, выдыхнуў, крыху супакоіўся і далей не стаў напружваць. Глядзеў на сябра, чакаў, што той скажа.

«А калі яны былі тыя? — нервова падумаў Санька.— Ды ніколі! Прабач, але сядзець і ціха вар'яцець ад немачы і невядомасці — не для мяне. Збаўце!»

— Серж,— Санька ўсё ж спрабаваў гаварыць спакойна і ўпэўнена,— трэба ехаць, рухацца, уцякаць. Аблава — толькі пачатак. Далей кола пачне сціскацца. Дабяруцца рана ці позна і да склада, хай і дзяржаўнага. Трэба забіраць апаратуру і перці на які далёкі пераход. Наперадзе паслаць легкавушку (каб яшчэ і на халяўнікаў з ДАІ не нарвацца), а за ёй — нашу фуру. Рацыі, зразумела, прыхопім. Трэба ўцякаць, Серж! Павер яшчэ раз маёй інтуіцыі, яна ж пакуль не падводзіла.

— Можа, і глупства раблю, але іншага варыянта не знаходжу. Тут хоць інтуіцыя.

Калі іхная фура, набітая апаратурай так, што і палец не ўсунуць, уехала на аднакалейку Геранёнскага мытна-памежнага пераходу і заняла амаль усю яго тэрыторыю, з агаломшана-тупаватых позіркаў вясковых мытнікаў Санька зразумеў: гэтым разам на яго жыццёвым шляху лёс паставіў бар'ер асаблівай моцы. Гэтыя сонныя мухі ў шэрым максімальна мыталі хіба што свінню, дый тую разабраную. І гэтым страшныя. Яны не зведалі асалоды валодання зялёнымі купюрамі і, значыць, у сваім ціхім сялянскім жыцці разлічвалі выключна на прасоўванне па службе.

Начальнік пункта-вагончыка выбег і схапіўся за галаву:

— Гэта што? Гэта ад-куль? Гэта д-для чаго?

Бедачына заікаўся.

«Калі пабачыць, што ўсярэдзіне, можа і анямець. Урэшце, гэта не так і кепска. Мы яго для пачатку дарагім вінцом адпоім, потым паперкі патрэбныя ў кішэньку засунем. Галоўнае, каб у цэнтр не кінуўся званіць — экспертаў па апаратуры выклікаць. Гэтыя вампіры да трусоў могуць распрануць, вокам не змігнуўшы, а то і скуру зняць не напружваючыся. Эх, куды мяне панесла. Так і сапраўды можна бяду наклікаць. Сабрацца! Забыўся, чым рызыкуеш? Забыўся, як сям'я пасля леташняга ўлёту на Брэсцкай мытні паўгода чорным хлебам ды капустай жывілася? Забыўся, што яшчэ і цяпер, калі бачыш тыя салатавыя качанчыкі, вантробы выварочвае? Ану нюхні чорнага корачка, можа, памяць і асвяжыш!»

Санька ўсхапіўся, быццам яму ў нос нашатыром пырснулі. Скочыў з кабіны і рушыў насустрач лёсу і начальніку Геранёнскага перахода.

І добра зрабіў: вада камень точыць, а вось пад ляжачы не цячэ.

## І вось ён вярнуўся

Бензін скончыўся ўначы, за хвіліну язды ад дому. Бензін не мог не скончыцца: лёс не хацеў адпускаць яго вось так проста, не выпрабаваўшы нарэшце і ў родным горадзе.

Разбуджаны таксіст за буксір заламаў гэтулькі, што калі б у чаўнака быў пісталет, ён адразу ж застрэліў бы хціўца. Але пісталета не было, і чаўнок, сціснуўшы зубы, згадзіўся. Гэта быў той выпадак, калі з першых крокаў (а масць у гэтую дарогу не пайшла адразу) ён здумаў прабівацца на гвалт. Як мага!

«Цікава,— пасміхнуўся вяла,— я ў мінусе ці хоць нешта на жыццё засталося? Зрэшты, цяпер такі час, што не выпасці з абоймы — ужо дасягненне».

Таксіст дацягнуў яго «васьмёрку» да пад'езда. Змеркаваўшы, што спрасонку заламаў суму, разоў у дзесяць большую за тарыф, моўчкі дапамог занесці тавар, асабістыя рэчы. Падзякаваў і знік.

Чаўнок перахрысціўся: здаецца, усё ціха, жонку не пабудзіў. Хай адпачывае — і так, гаротная, перанервавалася: шэсць сутак чакала. Стаў пад душ. Адкруціў гарачую ваду. Грэўся. Адчуў, што ад цяпла засынае. Выйшаў. Уздыхнуў. Нешта сэрца паколвае. Не ўпершыню... Прысеў. Так лепш. Паглядзеў у акно. Позірк слізгануў на сцяну, столь — чаўнок траціў прытомнасць...

Раніцай, калі жонка выклікала «хуткую», ён ужо не дыхаў.

«Што ж гэта робіцца, што ж?..» – стагнала яна, абдымаючы мужа, спрабуючы цяплом свайго цела вярнуць яго да жыцця. Але чаўнок не чуў.

Ён быў ужо там. Дакладней, тут. З намі.

У «ТУ-154», які разбіўся пяць гадоў таму. З усіх пасажыраў ён адзін тады выжыў.

І вось ён вярнуўся.

# КРЫМІНАЛЬНЫЯ АПАВЯДАННІ

## Прынцэса

Канец ліпеня выдаўся спякотны да знямогі. Сп'янелыя ад задухі людзі-цені блукалі па зямлі, як па дне акіяна.

Але Люся гэта не заўважала. Яна кружылася, як заведзеная лялька, і дарослым, што прыціхлі, разамлелі ад гарачыні за сталом у цэнтры саду, здавалася, гледзячы на яе, што яны бачаць старое паскоранае кіно. Толькі каляровае.

Люся спявала:

— Сонейка, сонейка, у мяне сёння дзень нараджэння! Павіншуй мяне, а я — цябе! Калі ласачка.

Па Люсінай спінцы скакалі дзве змейкі-коскі. Даставалі да пояса. Да яе прыгожага раменьчыка. Раменьчык з зіхоткай спражкаю быў аздобай сукенкі, падоранай мамкай і таткам на дзень нараджэння.

Ах, якая сукеначка!

Люся была шчаслівая, патанала ў шчасці, раставала ў ім. Люсі ж — толькі дванаццаць. У яе ўсё жыццё наперадзе! Усё!

За вялікім дубовым сталом разам з гасцямі знемагалі яе бацькі: чарнабровая, з пунсовымі шчокамі пяюха — калісьці салістка вядомага хору — мама і харашун-акардэаніст — выкладнік музыкі — тата. Усяго за сталом чалавек дзесяць. Радня.

Нібы ўлавіўшы ад дачкі зарад энергіі, Люсін тата ажыў, страпянуўся, выдыхнуў-скінуў з сябе млосныя абдымкі спёкі і сп'янеласці, зацягнуў моцным сакавітым басам:

— Ой, моро-оз, моро-оз, не моро-озь меня-а...

Люся любіла, калі тата спяваў. Яна любіла яго і баялася. Баялася: пасля хмельнага застолля тата сварыўся з мамай, біў яе.

Мама плакала і прасілася: «Не трэба, Валерык». А тата тузаў яе за валасы, крычаў: «Ты чаго на яго талопілася? Зараз ты ў мяне нагледзішся! — І круціў маме галаву.— Глядзі! Глядзі!»

Тата не мацюкаўся. Тата быў інтэлігент. Ён біў маму.

Яшчэ зусім нядаўна Люся была круглай выдатніцай. Але апошнім часам у яе надараліся і чацвёркі. Нярэдка яна прыходзіла ў клас змучанай пасля няспанай ночы і ўжо на трэцім уроку торкала носам у парту.

Настаўніца папікала: «І з гэтай дзяўчынкі я раіла браць прыклад?!» Трохі супакоіўшыся, цікавілася: «Што здарылася, даражэнькая?»

Люся маўчала. Ёй было сорамна за тату і шкада мамы. «Я больш не буду»,— апускала галаву.

Зноў пачулася музыка. Люся схамянулася.

— Ой, моро-оз, моро-оз, не моро-озь меня-а,— падымаўся з-за стала, расцягваючы акардэон, тата.— Не моро-озь меня-а, моего-о коня-а...

Люся паглядзела на неба, ціхенька папрасіла:

— Сонейка, сонейка, выканай, калі ласка, адно-адненькае маё жаданне.— І ўжо зусім шэптам дадала: — Каб татка ніколі не біў мамачку.

І зноў Люся закруцілася, забегала, заспявала. Спявала? Люся плакала, але гэтага ніхто не бачыў. Стаяла задушлівая спёка, а Люсі было халодна.

Горача Люсі было зімою, калі выбягала ў адной сукеначцы на вуліцу, клікала на падмогу суседзяў: татка зноў біў маму.

Так у Люсі мінулі тры бясконцыя, пакутліва доўгія гады.

Так мінула Люсіна дзяцінства.

Не было ў Люсі дзяцінства.

А ці ёсць без дзяцінства будучыня?

— Ой, моро-оз, моро-оз,— цягнуў пастаўленым басам тата, перабіраючы клавішы,— не моро-озь меня-а,— выцер рукавом пот з ілба.— Спякота.

«Холад, холад, холад,— бегала-саграваласся, супыняючы словамі дрыжыкі, Люся.— Сонейка, сонейка, памажы, калі ласка».

— Дачушка, бяжы да мяне! — раскінула рукі, гатовая злавіць Люсю, мама.

Мама прапала ў дзень апошняга Люсінага экзамену за восем класаў. Яе так і не знайшлі — напэўна, і не шукалі. Шмат іх, зніклых і прапаўшых,— усіх не перашукаеш.

А Люся скончыла восем з трыма чацвёркамі. Для яе гэта было зашмат. І яна адчула: да дзесятага ў выдатніцах не дацягне. Сталілася. І Люся кінулася ў тэхнікум — з апошніх сіл у апошні вагон. У найпрэстыжнейшы і цяжкадаступны. Вось так пастанавіла! Дваццаць пяць чалавек на месца, дваццаць пяць! Тое, што трэба! Будзь як будзе!

Усе дні да экзаменаў Люся праседзела перад мамінай фатаграфіяй: з упартасцю тапельца, які хапаецца за саломінку, паўтарала ўсё вывучанае ў школе.

А бацьку спаганяць злосць не было на кім, і ён запіў па-чорнаму. Кінуў работу. Суткамі без прадыху спяваў «мароза», успамінаў маму: «О-ох, навошта ж ты на-ас пакіну-л-ла-а?» Стагнаў, плакаў, апускаўся, паміраў.

А Люся не дарма ўпарта рыхтавалася — у тэхнікум паступіла. Здала ўсё на пяць! Насуперак лёсу!

Дырэктар, немаведама адкуль дазнаўшыся пра Люсіны нягоды, зрабіў для яе вынятак: дазволіў ёй, мінчанцы, пасяліцца ў інтэрнаце.

— Вось табе шанец. Бяры яго, трымай моцна-моцна,— пажадаў шчыра.— Лічы, што нарадзілася нанова!

Люся й сапраўды нарадзілася другім разам. У яе пачалося іншае жыццё. Непараўнанае.

Выдатніца, староста, камсорг. А ў выніку — сходы, вечарыны, кавээны, дыскатэкі, новыя знаёмыя, сяброўкі, паклоннікі. Жыццё! Шчаслівае, радаснае, светлае. Тое, пра якое яна і не марыла.

З гэтым сінявокім, у модных штанах клёш, з жоўта-чырвоным прымальнікам «Альпініст» пад пахай, усмешлівым маладым чалавекам Люся пазнаёмілася ў інтэрнаце. Ён зайшоў да маці-вахцёркі ўзяць ключы ад кватэры, а забраў ключы ад Люсінага сэрца. Звалі сінявокага загадкава — Мішка-Майкл.

«Што ж ён такое сказаў? Як так выйшла, што ў адно імгненне, адразу ж стаў блізкім, родным, дарагім, каханым? — успамінала пазней Люся.— А-а, во! Ён спытаў у маці: «А гэтая найхарашэйшая ў свеце прынцэса тут жыве?» Люся адразу ўспомніла сваю маму, яе словы: «Маленькая мая красунька! Ты станеш сапраўднай прынцэсай!» Ён так і сказаў: «прынцэса». Ён ведаў запаветнае слова.

Ах, як яны пасля смяяліся!

І якая Люсі (гэтак «па-французску», з націскам на апошні склад, Мішка-Майкл з першае сустрэчы стаў яе зваць) была шчаслівая! І як хутка пабег час! Як паляцеў ён, панёсся, памчаўся, пакаціўся!

Яны гаварылі пра Таркоўскага, слухалі Марка Болана па «Голасе Амерыкі», прарываліся на «Фантамаса» і «Чынгачгука» і, вядома ж, хадзілі ў такія модныя тады паходы. Лес, п'янкое паветра, возера, востраў, палатка, ноч, зоркі — яскравыя-яскравыя! — і яны ўдваіх. Мішка-Майкл абдымае яе і гаворыць, гаворыць. Ён кахае Люсі. Ён прагне быць з ёю. Заўжды! Вечна! Мішка-Майкл цалуе яе. Доўга-доўга не адпускае. Ох, Мішка, Мішка-Майкл...

Як хутка бег час! І як хутка большаў у Люсі жывот! Здрадліва хутка! З кожным днём! З кожнай гадзінай!

І змеркавала Люсі таксама хутка: нараджаць ёй няможна! Рана! Шаснаццаць!

Люсі не ведала, што другая яе спроба пачаць жыць па-новаму, па-чалавечаму, сарвалася, што дарога, якая абышла была бездань, стала віхляць, выгінацца, ператварацца ў круг, паварочвацца ў адваротны бок, назад.

Холад, холад, холад.

Зноў холад, як тады ў ліпеньскую спякоту.

Яна не памятала, як дабрыла да бальніцы.

Сярдзітыя цёткі ў белых халатах сварыліся на чым свет стаіць! Распытвалі, зневажалі, палохалі: «Глядзі, больш ніколі не народзіш! Хто зрабіў аборт у шаснаццаць, ужо не зацяжарвае!»

Як ёй было блага! Як нясцерпна балюча!

А добры, любы, родны Мішка-Майкл да яе так і не прыйшоў.

Мішка-Майкл, збіты да паўсмерці, ляжаў у падвале раённага аддзела міліцыі. Болю не адчуваў: быў без прытомнасці.

Дачушка вялікага начальніка да страты памяці кахала свайго аднакласніка — сінявокага стылягу, але, бачачы, што Мішка-Майкл, які і раней не надта адорваў яе ўвагай, усё больш аддаляецца, адыходзіць ад яе, у роспачы падала на яго заяву: згвалціў. І з Мішам «пагутарылі». Білі прафесійна, з паўзамі. Напачатку патлумачылі сітуацыю. Выбірай: вяселле ці турма? Адно з двух. Пакуль яшчэ не позна павярнуць назад, не ўсе масты спаленыя. Маўчыш? Глядзі, у

10. Зак. 413

турме гвалтаўнікам, ох! як цяжка, ох! як... І не кажы пасля, што не папярэджвалі.

Мішка-Майкл быў малады, верыў у ідэалы камунізму і ў няўхільнасць перамогі дабра над злом. Ён выбраў «цяжка» — турму.

Пасля знікнення Мішкі-Майкла і працяглага (садысты ў белых халатах даволі паздзекаваліся з малалеткі) знаходжання ў бальніцы — яшчэ адной школе жыцця — Люсі надламалася, здалася. Ёй усё стала абыякава: навука, сяброўкі, іх вясёлая група. Усё! Нават незвычайна спагадлівы дырэктар не змог вывесці яе са стрэсу. Люсі кінула тэхнікум, страціла апошні шанец, збілася з гасцінца на сцяжыну, зламала лёс, самую сябе.

Паўзабытае ўжо былое жыццё зноў забірала яе ў свае абдымкі.

— Дзе ты, любы? Дзе?!

Ён бы дапамог, засцярог, паклапаціўся пра яе. Ён бы... Ах, Мішка, Мішка-Майкл...

Мішка-Майкл загінуў на этапе, не даехаўшы да лагера і ўжо ані ў што не верачы. Ён страціў веру ў камунізм, але не ў чалавечую годнасць. За яе і пайшоў на смяротны бой.

«Чаго гэта шчанюк шаптаў: «Прынцэса!»? — думаў, выціраючы заточку, забойца.— Акалеў, а не даўся, сука».

Малараслага, крываногага, з дзікім позіркам цыганчука Люсі напаткала ля гастранома. Яна пераходзіла вуліцу і не заўважыла, што ступіла на дарогу, якая вяла ў бездань.

Спачатку ён яе не чапаў. Прыручаў. Наліўшы да краёў чарку, прапаноўваў: «Ды выпі, што ўжо там! За кампанію! Расслабся, весела будзе, бесклапотна! Ха-ха-ха! І ідзі да мяне. Ідзі. Што ўжо там... Ха-ха-ха!»

Але паступоваваўчынае нутро вылезла наверх. Паказала свой дзікі нораў. Дзень за днём ён катаваў яе, калечыў, мардаваў. І гвалціў, гвалціў, гвалціў. Раздзіраў на кавалкі. Цешыўся, уладарыў. А Люсі гінула. Люсі ператваралася ў Люську. Забітую, зацюканую, пакорлівую, укленчаную.

«Не бі!» — пачула яна сябе аднойчы і ўспомніла маму.

Кроў цыганская, кроў бунтарская.

— Задушу паскуду! — пырскаў слінаю, выплюхваючы ахрап'е мацюкоў. Ён не быў, як тата, інтэлігентам.

Гэта павінна было некалі здарыцца. Рана ці позна канчаецца цярпенне і ў Найвышняга. Падсумаваў ён усё зробленае цыганчуком і падумаў: час аддаць па заслугах. Хоць фінал атрымаўся, на першы погляд, нелагічны, дзіўны.

Яна ляжала ў паўзабыцці на бруднай падлозе, а ён гойсаў на ёй. Роў:

— Сёння, курва, я табе зяпу разарву!

Але зяпа разарвалася ў яго. Ён махнуў нажом перад сабою, паказваючы, як будзе рэзаць ёй горла, як будзе мачыць, забіваць сцерву, сучку праклятую. Але не разлічыў — п'яная рука сарвалася, і ён паласнуў па мордзе сябе. Губы распаўзліся да вушэй. Кроў лінулася фантанам. Бруднае цела асунулася на Люську і заціхла. Упершыню.

Яна доўга не магла ўцяміць, што адбылося.

Цыганчук нейкі час яшчэ мычэў, хрыпеў, і Люська хацела ўсцягнуць яго на ложак, можа, ўратаваць, але пачула мамін голас: «Не чапай!»

Мама і там памятала пра яе.

Люська падышла да магілкі з драўляным нефарбаваным крыжам. Апусцілася на калені. Яна сумавала па ім. Па сваім гвалтаўніку. Цяпер гвалціць яе не было каму. Дый каму патрэбна змардаваная, скалечаная, бяззубая жанчына, загнаная, запалоханая жывёліна — каму?

Сёння Люська прынесла яму кветкі. Два дні галадала, каб купіць гэты маленькі чырвоны букецік.

Яна схіліла галаву, паклала руку на грудок, заспявала-зашаптала:

— Ой, моро-оз, моро-оз...

І раптам успомніла:

— У мяне сёння дзень нараджэння.

І заплакала — пачула голас Мішкі-Майкла: «А гэтая найхарашэйшая ў свеце прынцэса тут жыве?»

## Жакей

Надвячоркам, перад тым як ісці на працу, Уладзімір клаўся на гадзінку-другую перадыхнуць. Ён вёў дыскатэку, якая доўжылася да глыбокай ночы, і ўвесь час недасыпаў. Дыскатэка была эксклюзіўная, дарагая, для багатых, але праграму рыхтаваў і вёў Уладзімір адзін. Дастойнага дублёра знайсці не маглі, і шэф часам непакоіўся, што будзе, калі вядоўца захварэе або з ім яшчэ нешта здарыцца. Але Уладзімір не хварэў, на працу выходзіў, і дыскатэка пад апладысменты сталых наведвальнікаў пачыналася заўсёды ў час.

Таго дня, пасля запісу са спадарожнікавай сістэмы зборкі апошніх шлягераў, стомленасць ад недасну ўзяла сваё. Ужо амаль машынальна ён аддаў суседу Лёву, які па завядзёнцы зайшоў якраз у гэты час перапісаць сабе падрыхтаваную для работы касету, і прылёг, не распранаючыся, на канапу.

Ён не ведаў, што скрайне ветлівы Лёва, адыходзячы, дзверы толькі прычыніў, і замок не замкнуўся. Жонка Наталля ўкладвала малога спаць і суседа не праводзіла.

Уладзімір знаходзіўся між сном і яваю, калі нешта вострае кальнула ў жывот. Гэта прымусіла расплюшчыць вочы, але сонная свядомасць яшчэ супраціўлялася. Усё ж боль перамог, і ён прачнуўся.

Спачатку Уладзіміру здавалася, што сон працягваецца. Нехта ў чорным, з нацягнутай на галаву панчохай, прыціскаў яму да жывата нож. Проста ў твар Уладзіміру ў такім самым маскарадзе дыхаў другі. У руцэ ў яго быў рэвальвер.

Уладзімір ніколі б не падумаў, што нацягнутыя на галаву калготкі могуць ператварыць чалавека ў нешта пачварнае, у монстра.

### I

— Заб'ю! — прахрыпеў той, што прыставіў нож.

Другі, з пушкай, дадаў:

— Ляжа-аць!

— Што за клаунада? — здзівіўся Уладзімір, падымаючыся, але ўдар рэвальверам па галаве зноў абрынуў яго на канапу.

Ён праваліўся ў цемру. Раптам — znічка! Загарэліся зоркі! Сышліся ў круг. Сталіся сонцам. Яно сляпіла. Закружылася галава. Ён паволі паплыў па коле. Не, не ён — плылі сцены, столь, падлога. Хуткасць кружэння павялічвалася. Цела налівалася свінцом, набрыньвала. Зараз яно выбухне...

Уладзімір ачуняў на падлозе.

Двое ў чорным не зніклі. Але з'явіўся трэці, гэткі ж блізнюк. Ён стаяў у праёме дзвярэй, метры за тры ад канапы, і адной рукою трымаў Наташу за валасы, а другой прыставіў да яе шыі нож. Кончык ляза пракалоў скуру, і з-пад яго сачылася кроў. Перапалоханыя жончыны вочы застылі.

— Заб'ю! — паўтарыў той, з нажом.

Другі, з рэвальверам, прашыпеў:

— Ляжы ціха, не торгайся, тады і дзеўку не зачэпім.

Уладзімір разумеў: цяпер галоўнае — выйграць час, не рухацца, але ўсё ж наважыўся — толькі вачыма — абгледзець пакой: колькі іх? Не паспеў і зусім трошкі, здавалася, непрыкметна павярнуцца, як атрымаў удар па разбітай, залітай крывёю галаве.

Уладзімір зноў праваліўся ў ноч. У цішыню. Ён стаіць. Адзін. Ногі тонуць у пяску. Пустыня. З'явілася Наташа. Заводзіць знаёмую песню:

— Навошта табе такая работа? Я ж казала, папярэджвала. Дабегаешся са сваімі касетамі і дыскамі. Давядуць цябе гэтыя Джагеры ды Глітары. Я адчувала... Цяпер усё...

Міраж знікае. Ён слепне. Раптам — святло! Яркае! Зноў сонца? Не, гэта кінаэкран. Пайшоў фільм. Чорна-белы. Зверху абрынаецца вадаспад. Кадр спыняецца, вадаспад завісае: нехта націснуў «паўзу». Імгненне — і карцінка распаўзлася. Экран страціў межы. Цяпер ён сам у ім, у кадры. Не, не ў кадры — у жыцці. Уладзіміру зноў захацелася разгледзецца, але ў свядомасці штосьці спрацавала, і ён не варухнуўся.

Адразу пачуў:

— Вырадак! Ты кончыш яго! Мабыць, ужо...

Уладзіміра выдалі павекі — здрыгануліся.

Бандыт заўважыў гэта, усміхнуўся:

— Жывы?! Малаток! — І ўжо спакайней: — Сапраўды, такую красуню нельга адну пакідаць, не-ельга. Добра? А-а? Добра-а... Цяпер — да нашых бараноў. Усім будзе кайф, калі скажаш, дзе бабкі. «Капуста» ў цябе ёсць, мы ведаем, так што, жакей, не марнуй часу...

Уладзімір глядзеў на расплывістую чорную галаву, якая гаварыла ўсё гэта праз панчоху. За час, пакуль тлумачылі сітуацыю, адчуў — ногі яму цяпер не памочнікі. «Як адняліся,— сцяў губы.— Та-ак, паловы цела ўжо няма. Шанцаў вырвацца ўсё менш».

— Уставай. Толькі ве-ельмі памалу,— загадала чорная галава.

Цела не слухалася. Памяць пра мінулы боль скавала яго. Бандыты, відаць, зразумелі тое і, узяўшы Уладзіміра пад рукі, пасадзілі. Руля рэвальвера перамясцілася ад галавы да шыі, нож — да рэбраў. Шанцаў вырвацца па-ранейшаму не было.

— Дык што з бабкамі?

Яго прыўзнялі, спрабавалі паставіць на ногі.

— Ара, гэтая сука не стаіць,— сказаў адзін з тых, што трымалі Уладзіміра.— Можа, вадой яго?

— Не трэба, пасадзіце, няхай перадыхне, падумае. Куды ён без ног?!

Уладзіміра апусцілі на канапу.

«Далі сесці. Добра. Гэта шанец»,— прамільгнула ў свядомасці. Разгледзеўся зноў толькі вачыма: «Іх трое. У пакоі двое і адзін на кухні, трымае Наташу... Падонак застаўся з жонкаю?» Ірвануўся, але нешта стрымала яго. Нож. Нож, што ўпіўся між рэбрамі.

«А гэты, з рэвальверам? Ён — злева. За ім — балкон. Адчынены. Шанец усё ж ёсць. Левага адшпурнуць паспею...»

Уладзімір сцяўся, гатовы скочыць, але прашыты неданосак — верхавод тройкі — па дрыжэнні нажа адчуў нешта нядобрае: лязо праткнула скуру і ўвайшло ў цела.

— Бачу, ты не зразумеў. Аус! — гукнуў і павярнуўся ў бок кухні.— З красуняй разабраўся? Добра! Цяпер вазьмі коўдру і накінь на мальца. Можа, тады да бацькі дойдзе...

«Божа, як мог забыць. Сынок! Наташка ўкладвала яго, калі засынаў. «Даганяй татку»,— шаптала малому ў вушка».

Цела Уладзіміра сцялася спружынаю, але ён адчуў, што і лязо ўвайшло глыбей. Болю не было, але вырвацца стала немажліва. Нож ці не на трэць быў у ім.

Пачуліся ўсхліпы, і Уладзімір убачыў: малюсенькія ножкі сына ўзняліся ўгору, засторгаліся.

«Годзе,— загадаў сабе.— Сынам рызыкаваць — не сабою».

— Грошы ў шафе. На верхняй паліцы.

Бандыт кінуў коўдру, падскочыў да шафы, выпатрашыў адну паліцу, пасля другую — грошай не было.

Нервовы, з рэвальверам, размахнуўся, і пасля новага ўдару залітае крывёй цела ўпала перад дзіцячым ложкам. Падаючы, Уладзімір пачуў: «Ёсць!» — і прыхапіў за сабою коўдру, што душыла сына.

Зноў ноч. Усё. Ён сваё адпрацаваў. Было шмат чаго. Можа, і насамрэч годзе? Бачыў гэтулькі, што досыць на два, на тры жыцці! Відаць, і сапраўды выбраў ліміт у Бога?

«Ці так гэта?» — адважыўся Уладзімір спытаць у Найвышняга.

І тут яго ахапіла гарачыня. Зноў закружылася галава.

«Дзе я? — спрабаваў спыніць кружэнне.— Чаму адзін? Дзе Наташа, сынок?»

— Божа, калі ты забраў самых блізкіх, забяры і мяне! — закрычаў у роспачы.

Ад крыку вярнулася свядомасць, мацней забілася сэрца, што пачало было спыняцца, пачасцілася дыханне.

Уладзімір расплюшчыў вочы. Навокал усё белае. «Дзе я?» Разгледзеўся. Кафля. Ён у ваннай. Не памёр. Толькі рукі... За рукі яго прывязалі да трубы, што ішла да мыцельніка. Звязаны і ногі. Вусны... Вуснаў не разняць. На іх — ліпкая стужка.

Прыслухаўся. Цішыня.

«Пакінулі жывым? — нібы ў тумане працягваў працаваць мозг.— Не забілі?»

Уладзімір напружыўся – і адразу азваўся боль, абрынуўся на яго, разрываючы цела. Ён зноў ледзь не страціў прытомнасці.

«Асцярожна,— сказаў сам сабе,— асцярожна».

«Думаць, думаць, не спаць»,— загадваў розум, калі першыя спробы выбрацца з пасткі не ўдаліся.

Труба. Труба ідзе да зліва. Зліў новы, пластмасавы, ён толькі памаляваны белай эмаллю разам з трубою. Трэба падцягнуць вяроўку да зліва і, упёршыся нагамі, ірвануць.

Паволі прыўзняўся на калені. Вяроўка нацягнулася. Нешта трымала яе. Канец? Не, не канец. Гэта апошняе мацаванне трубы, найслабейшае.

Уладзімір прыціснуўся спінаю да зліва. Уявіў, што разбягаецца, і — папёр. Ён разумеў, што можа ўдарыцца галавой аб падлогу, але гэта не палохала. Прачуванне свабоды ўзяло верх над свядомасцю, і спыніць яго было нельга.

Падаючы, Уладзімір паспеў павярнуць галаву і тым самым ураваў свой не вельмі моцны нос ад пераломy.

Адляцеў да дзвярэй. Не марудзіў. Націснуў на іх нагамі. Расчыніліся. Зноў прыслухаўся: па-ранейшаму ціха.

Рукі вяроўка рэзала цяпер не так моцна. Відаць, напружыўшыся, ён расцягнуў яе.

Спрабуючы паслабіць вузел, рэзка заторгаў рукамі. Яны памалу вызваляліся, але нямелі пальцы. Падванітоўвала. Час супраць яго. Ён пацягнуў больш моцную правую руку да сябе. Рука з болем пралезла праз путы і вырвалася на волю.

«Цяпер — ногі,— загадаў сабе Уладзімір, але ў галаве стаяў туман, і ён зразумеў: вызваліцца не паспее.— Трэба спяшацца».

І папоўз да кухні.

Жонку прывязалі да батарэі пад абедзенным столікам. Скручаная вяроўкамі, з заклееным ротам, яна глядзела на яго застылымі ад жаху вачыма. Пакуты і боль любага чалавека выклікалі ў ім лютасць, нянавісць, роспач: «Падонкі, сволачы, гады!» Падпоўз бліжэй. Асцярожна зняў з яе вуснаў скотч. Нічога не сказаў, забыўся, што ўмее гаварыць.

Сказала Наташа:

— О Госпадзе!

— Ціха, ціха,— супакойваў яе.— Не глядзі, не трэба,— шаптаў, не разумеючы, што Наталля не заплюшчыць вачэй, бачачы яго скрываўленую галаву, грудзі, усё цела.

— Ты не памрэш, ты ніколі не памрэш,— ажыла яна, адганяючы прэч думкі пра самае страшнае.

— Усё будзе добра,— ківаў Уладзімір, падтрымваючы жонку,— усё будзе добра.

Узяўся за стол, прыўзняўся. Прыборы ляжалі ў шуфлядцы. Выняў нож, апусціўся на калені. У галаву зноў нешта ўдарыла. Прытомнасць пакідала яго. Цьмяна разумеючы, што робіць, разразаў на жончыных руках вяроўкі. Неўзабаве абмяк і заціх.

«Халаднавата. Шэра-салатавыя сцены. Жалезная спінка ложка. Палата? Так... Я ў бальніцы...— зразумеў Уладзімір.— Жывы».

Пачуліся крокі. Праз імгненне адчыніліся дзверы. На парозе — двое. У форме.

— Ачунялі? — набліжаючыся, усміхнуўся адзін з іх.— Цудоўна. Не хвалюйцеся, вашы жонка з сынам у гэтай жа бальніцы. Даруйце, што турбуем, але — час, як кажуць, не чакае. Чым хутчэй вы адкажаце на нашы пытанні, тым болей застанецца шанцаў затрымаць бандытаў.

Чамусьці ўступаць у гутарку не хацелася, і Уладзімір заплюшчыў вочы.

— Ды што ж гэта такое? — убег, абурана размахваючы рукамі, дзяжурны доктар.— Сястра па лекі выйшла, а яны не забавіліся, пакой для допытаў у аддзяленні арганізавалі. Чалавека толькі-толькі з таго свету выцягнулі! Зараз жа пакіньце палату!

Уночы Уладзіміру не спалася. Нібыта адчуўшы гэта, нячутна зайшла медсястра. Убачыла, што Уладзімір ляжыць з расплюшчанымі вачыма, і амаль узрадавана сказала:

— Даруйце, што турбую. Я вас пазнала: вы дыск-жакей, ведзяце ночную дыскатэку ў кавярні, што непадалёк ад майго дома. Я некалькі разоў была там, і мне вельмі спадабалася. Працуеце шчыра, з душою. Музыка — толькі з кружэлак, відэа — кожны раз новае. І голас у вас аксамітавы, такі голас, які проста кліча, заражае энергіяй. Душа быццам у неба адлятае. Я была на іншых дыскатэках — зусім не тое. Яшчэ раз даруйце за турботы, але хацела, каб ведалі.

— Дзякуй вам, цяпер буду ведаць.

— Ой, ды што вы! Гэта вам дзякуй! І яшчэ пра адно хачу сказаць. Папярэдзіць. Старэйшы з тых, што ўварваліся днём у вашу палату, відаць, загадаў другому застацца дзяжурыць — цяпер ён спіць. Адыходзячы, старэйшы двойчы паўтарыў: «Галоўнае — даведайся, колькі грошай забралі. І яшчэ: паспрабуй выведаць, адкуль яны ў яго. Распытай, дзе, маўляў, узяў бабкі на фінскі скураны плашч, японскі тэлевізар з відэамагнітафонам».

«Ясна,— падумаў Уладзімір, калі сястра таксама нячутна зачыніла за сабою дзверы.— Іх хвалюе толькі тое, што грошы не яны забралі, а бандыты. А якая для мяне была б розніца? Нажом не рэзалі б? Рэвальверам бы не глушылі? Дык у іх іншыя цацкі для гэтых жа мэтаў ёсць».

Чамусьці больш за ўсё было шкада повара, які ў кавярню прыходзіў вечарам, адпрацаваўшы змену ў заводскай сталоўцы. Ён апошні, пяты, наважыўся аддаць сабраныя за год працы грошы на новае відэа- і аўдыёабсталяванне. Ён проста мроіў пра сваю піцэрыю.

І праз тры гады яна ў яго будзе.

Ужо бліжэй да заканчэння школы сыну Уладзіміра спадабалася гатаваць, і ён пайшоў да повара вучнем. Наташа не нарадуецца, калі яе «хлопчык пячэ для продкаў нешта смачненькае».

## II

— Заб'ю! — прахрыпеў той, што прыставіў нож.

Другі, з пушкай, дадаў:

— Ляжа-аць!

Уладзімір рэзка махнуў левай, адбіў руку з нажом і, развярнуўшыся, правай адкінуў бандыта з рэвальверам да балкона. Той галавой прабіў шкло дзвярэй, і адзін з празрыстых аскепкаў упіўся яму ў горла.

Рука з нажом на долю секунды затрымалася ў паветры, нібыта выбіраючы, куды ўдарыць. Гэтага Уладзіміру хапіла, каб заехаць бандыту ў жывот — нож выпаў і ўторкнуўся ў край канапы. Верхавод толькі паспеў прахрыпець: «Сюды-ы!» Удар у галаву аглушыў яго.

Трэці скочыў на жакея ззаду і — памыліўся. Кідкі цераз плячо Уладзімір рабіў лепш за ўсіх у секцыі. Наляцеўшы на тэлевізар, бандыт перавярнуў яго, ударыўся галавой аб сцяну і заціх.

«Цяпер — на кухню!» — пранеслася ў галаве.

Ён кінуўся да дзвярэй, але яшчэ жывы бандыт, які ўрос у балконныя дзверы, націснуў на курок. Першы стрэл прымусіў Уладзіміра спыніцца, другі — страціць раўнавагу, трэцяга ён ужо не пачуў. Аднак і таго, хто страляў, на большае не стала.

Верхавод апрытомнеў, разгледзеўся, узяў з падлогі рэвальвер, павярнуўся да тэлевізара і стрэліў у галаву распластанаму перад ім трэцяму. Вярнуўшыся на кухню, нагнуўся, схапіў за валасы жанчыну, што ляжала беспрытомная, прыўзняў, ткнуў ствол ёй у скронь і націснуў на курок.

У дзвярах азірнуўся:

— Наводчыку язык адрэжу.

Дзіця ў ложку не плакала, нібыта разумела, што наперадзе ў яго ўсё жыццё, змагацца за месца ў якім ён будзе адзін. І малы ашчаджаў сілы.

Праз чвэрць стагоддзя, калі ён стаў жакеем, у адным з элітных начных клубаў кожную раніцу гучала:

ПРАГРАМУ РЫХТАВАЎ І ВЁЎ УЛАДЗІМІР МАРАКОЎ.

## Апошні варыянт

— Тут не грэх выйсці перад сном прагуляцца,— прапанаваў сусед па купэ, паказваючы на адчыненыя ў тамбур дзверы.— Вугальку наша гаспадыня не шкадуе.

Цягнік спыніўся.

Нас было ў калідоры трое. У канцы яго яшчэ кешкалася правадніца. Ужо ступіўшы ў тамбур, яна зірнула на гадзіннік і захітала галавой: «Ай-я-яй! Ай-я-яй!» Мы адразу ж накіраваліся да яе: «Можа, што здарылася?» Але правадніца, нібыта не заўважаючы нас, павярнулася да выхаду, нечакана спрытна для сваёй вагі скочыла з прыступак і пабегла ў бок станцыі.

— Нічога не здарылася,— усміхнуўся мой спадарожнік, калі прайшоў у тамбур.— Відаць, падыхаць выскачыла. Слушна будзе і нам узяць з яе прыклад.

Мясцовы вакзальчык, хоць і нагадвае размаляваны дзятвою склад-свіранчык, усё ж не будка на паўстанку — стаянка тут пятнаццаць хвілін: буйная вайсковая частка непадалёку дыслакуецца. Праўда, вагон у нас апошні і да станцыі сотню метраў не даехалі, але гэта і лепш. Цягнікі рэдка парушаюць тутэйшы лясны неруш, і ваякі ад суму не прамінуць лішні раз дакументы праверыць, а то і чамаданы: як-ніяк памежная зона.

У мяне не было ахвоты скакаць у цемру і ветраную волкасць, нават захацелася вярнуцца ў цёплае ўтульнае купэ, але спадарожнік зноў загаварыў, і я застаўся там, дзе стаяў: ён жа да мяне звяртаўся.

— А назва ў станцыі,— спадарожнік кіўнуў кудысьці за акно,— запамінальная — Непылаева.— І дадаў: — Відаць, у той час, калі бальшавікі гэткім імем ахрысцілі яе, тутэйшыя лясы, як цяпер, з году ў год не гарэлі. Відовішча, скажу я вам...

Нечакана захацелася пабачыць «пыланне» лясоў, і я пагадзіўся:

— А мо й праўда варта разрухацца.

Сказаў няўпэўнена: усё яшчэ былі нейкія падсвядомыя сумненні. Але спадарожнік, відаць, не звярнуў на мой сумнеў аніякай увагі, бо адразу ж ступіў у тамбур, а адтуль, завісаючы на парэнчах, хуценька спусціўся ўніз. Мне нічога не заставалася, як услед за ім скочыць на мокры, чорны і тлусты ад масла і вугальнай смалы шчэбень.

— Можа, усё ж закурым? — страсянуў павесялелы сусед пачкам «Філіп-Морыса».— Суперлёгкія, амаль без нікаціну!

З раскрытай блакітна-белай скрыначкі роўна на трэць вытыркнуліся дзве цыгарэты.

«Спрытнасць рук і ніякага махлярства! — міжволі адзначыў я.— Фокуснік плюс весялун. Не сусед па купэ, а знаходка. Праўда, залішне прыставала. Казаў жа: тытунём не забаўляюся, дык не — закуры ды закуры. І з віном тая самая гісторыя: «Кроплю-другую, для настрою». Тлумачыў жа: спартовец, не п'ю. І лес, як бачу, звычайны, бадай, толькі пагрозліва густы і праз гэта выклікае трывогу».

Адказаў, ужо амаль злуючы:

— Не-не, дзякую! Мне абсалютна ўсё роўна якія: Морыс ці Дорыс, лёгкія або цяжкія, з нікацінам або без. Лепш раскажыце сакрэт: як у вас усё так спрытна выходзіць?

Да гэтага сусед паспеў адкрыць «вокам» бутэльку ліманаду і назваць карту, наўздагад выцягнутую мною з калоды.

Ён з ходу загаварыў са мною на ты, што мяне крыху абурыла. Я быў выхаваны зусім па-іншаму. Выходзячы з агульнапрынятых правілаў, трэба было б і мне тыкаць яму, тым больш што ён выглядаў старэйшым за мяне ўсяго гадоў на дзесяць, не больш. Але тыкаць я не важыўся. Чамусьці думалася, што гэты жартаўнік-усёвед — чалавек з іншага, незнаёмага і таму небяспечнага для мяне свету. Ягоная актыўнасць прыгнятала і насцярожвала, я не прымаў яе, адчуваў нязвыклай і чужою. Ён нібыта кіраваўся дэвізам: ні хвіліны спакою. Я ж аддаваў перавагу ўраўнаважанасці, нават паважнасці.

— Калі кожны будзе ведаць мае сакрэты, дык якія ж гэта сакрэты? — паляпаў спадарожнік мяне па плячы.— А чалавек, скажу табе, тым і цікавы, што ў яго не на віду. У цябе нябось таксама ёсць нешта такога кшталту?

— У мяне? — перапытаў я, паціскаючы са здзіўленнем плячамі.— Не ведаю. Здаецца, няма...

Ён усміхнуўся, але прамаўчаў, не стаў больш нічога выпытваць і ўдакладняць. А мне раптам зрабілася неяк няўтульна і трывожна. Я толькі цяпер адчуў, што халодны вецер пранізвае наскрозь, да касцей. І прапанаваў:

— Прабірае. Можа, вернемся?

Мы, выявілася, не стаялі на месцы, а адышлі да другога канца вагона — у самы хвост цягніка.

— Як скажаш. І праўда, не май на дварэ.— Ён таксама, як і я, толькі што сцепануўся.

Павярнулі назад. Непадалёку зноў засвяціліся агні станцыі.

Нечакана спадарожнік да болю сціснуў мне руку вышэй локця:

— Ціха, не варушыся! Глядзі! У акно, кажу, у акно глядзі! Пазнаеш? От жа дурніца. Адно слова — баба! Глуздоў малавата. Элементарнага не разумее: калі ў памяшканні гарыць святло, дык акно — як экран тэлевізара. Глядзі, глядзі, што вырабляе!

Я не меў змогі паварушыцца. «Кіно» паралізавала: наша суседка па купэ, студэнтка-першакурсніца, што ехала — як яна з гонарам прызналася — пасля паспяховай здачы сесіі дадому на вакацыі, зайшла ў прыбіральню. Зняла лёгкі пуловер, павесіла яго разам з ручніком і то праваю, то леваю рукою ўціскала рычажок-кранік, набірала ў далонькі вады і... апалосквала падпахі. («Афрыка», якую ўстроіла праваднiца, давалася ў знакі.) Раптам замерла, паглядзела ў люстэрка, у якім адбіваліся прыўзнятыя поўныя грудзі. Дакранулася пальчыкамі з нафарбаванымі пазногцікамі да вялікіх ружовых смочкаў — быццам пераконвалася ў іх пругкасці. Пад прасторным пуловерам яе грудзі зусім не абазначаліся, а тут... Тут усё выглядала інакш! Гэткім тэнісным мячыкам бюстгальтар не патрэбны. Прыцягвалі і ясныя, вабныя вочы, і пяшчотныя пульхныя вусны, і бездакорная кароткая стрыжка. Задурыў дык задурыў сусед мне галаву сваімі прыгаворкамі ды фокусамі. Такую красуню не заўважыў!

Урэшце спахапіўся: няможна ж так! Падглядваць — што можа быць горшае?!

Павярнуўся да суседа, хацелася сказаць яму «пару ласкавых», але ён не даў і рота раскрыць.

— Глядзі, глядзі! — падштурхнуў, падміргваючы.— Кіно толькі пачынаецца.

Я зноў машынальна падпарадкаваўся і павярнуўся да вагона. Студэнтка, нібы адчуўшы нашы позіркі, закрыла грудзі рукамі, углядзелася ў акно. Нічога ў ночнай цемры не ўбачыла і супакоілася, глянула некуды ўніз, грэбліва пахітала галавою. «Вядома, брудна! — міжволі пагадзіўся я.— На свеце няма нічога паскуднейшага за грамадскія савецкія туалеты». І раптам яна стала на унітаз, павярнулася да нас задам, задзерла кароткую спадніčку, спусціла калготы, за імі вузенькія белыя трусікі...

Аднекуль даляцела:

— ...адпраўляецца цягнік Ленінград — Мурманск...

Я апомніўся, крутнуў галавою. Было прыкра і сорамна. Як пасля гэтага вяртацца ў купэ, сустракацца з дзяўчынай вачыма?

А спадарожнік спакойна, нават дзелавіта сказаў:

— Пайшлі! Пара, брат, займаць месцы адпаведна купленым білетам.

Апанавала злосць: «Як ты можаш? Нізка ж, подла ўсё гэта! А з цябе — як з гусі вада. І я, выходзіць, заадно з табою».

— Супакойся! — на хаду чытаў фокуснік-тэлепат мае думкі.— Мы што, спецыяльна? Мы тут ні пры чым. Чысцюткая выпадковасць!

— Але ж маглі і не глядзець.

— Ды глупства ўсё гэта! Забыліся! — прапусціў мяне наперад, да прыступак.— Халаднавата? — паспачуваў падбеглай да вагона праваднíцы. Ён, здавалася, зусім забыўся пра ўсё, што адбылося хвіліну таму. Жалезны чалавек.

Я не адразу пайшоў у купэ, затрымаўся ў тамбуры, каля печы: ніяк не мог адысці ад убачанага. Хацелася скрозьдонна правaліцца. І студэнтка таксама добрая цаца. Няўжо не ведала, што карыстацца туалетам на прыпынках забаронена? І куды шторка з акна падзелася? Дый праваднíца безгаловая! Забылася «дабл» зачыніць, усё кінула і пабегла на станцыю. Успомнілася: «У яе там дружок у пагонах завёўся». Пікантную падрабязнасць паведаміў мне ўсё той жа ўсёвед-сусед: ён, ці бачыце, выпадкова пачуў яе гаворку з сяброўкай з суседняга вагона. Мільганула: «Выпадкова пачуў... Выпадкова ўбачыў... Выпадкова ўгадаў... Выпадкова пашанцавала... Перабор з выпадковасцямі».

Тым часам у тамбур паднялася задыханая праваднíца. Паспешліва апусціла рыфленую пліту над прыступкамі, зачыніла дзверы. Не паспеўшы аддыхацца, падала голас:

— Сядаем на свае месцы, таварышы, сядаем!

Я прайшоў да купэ, пастукаў. Навошта? Яна ж там не адна, ён таксама там. І ўсё ж, толькі дачакаўшыся дазволу: «Калі ласка, можна», адчыніў дзверы.

Першакурсніца слала пасцель і сустрэла мяне спінаю і... знаёмай спаднічкай. Узбіўшы падушку, прысела каля акна. Усміхнулася. У мяне адлягло ад сэрца: ні пра што не здагадваецца! Хацеў адказаць на ўсмешку ўсмешкай — не атрымалася. І на які дурнаваты камплімент не стала духу — язык нібы адзервянеў: усё яшчэ было сорамна!

Успомніў, што захапіў з сабою томік Роберта Шэклі. Улюбёны фантаст не раз дапамагаў знепрытомець-забыцца, прымушаючы

не толькі суперажываць яго героям, але і думкамі браць удзел у іх прыгодах. Паспрыяў мне Шэклі і цяпер.

Масавік-забаўнік бліжэй да ночы, відаць, знямогся, а можа, і вычарпаў сябе, бо неўзабаве прапанаваў:

— Што моладзь думае наконт адбою?

Моладзь думала станоўча.

На два ніжнія спальныя месцы нас было трое. Дама, зразумела, праходзіла па-за конкурсам, а вось мне і спадарожніку давялося цягнуць запалкі. Фокуснік, як заўсёды, перамог, і я палез на верхнюю паліцу.

Прахалода сыраватай падушкі — яшчэ адна заўсёдная асаблівасць савецкіх вагонаў — вывела мяне з затарможанага стану.

«Божа! Галава адсохла! Грошы! Я ж вязу грошы! Чужыя!»

У Ленінградзе добры цётчын знаёмы перадаў чатыры брыкеты з «дваццацьпяткамі» — дзесяць тысяч! — на шостую мадэль «Жыгулёў». Цётка пасля васьмі гадоў чакання ў чарзе талончык на машыну атрымала, а вось грошай так і не сабрала.

Прыўзняўся, пацягнуўся да курткі. Загавайла! У туалет ішоў — не забываўся на плечы накідваць, а тут на перон выскачыў без яе. От ёлупень!

Здымаючы куртку з кручка, чамусьці палічыў патрэбным патлумачыць суседу гэтую сваю турботу:

— Падушка пляскатая. Трэба пад галаву што падкласці.

— Ясная рэч,— усміхнуўся, але неяк халодна сусед.

Складваючы куртку ўдвая-ўтрая, неўпрыкмет прамацаў: брыкеты на месцы. І страховачныя шпількі на кішэнях — таксама. Фу-у... Дзякуй Богу! І зноў засаромеўся, але ўжо з іншай прычыны: як я мог пра нармальных людзей такое падумаць? Грошы ў каго хочаш адбяруць розум. Што праўда, то праўда.

Супакоіўшыся, заснуў імгненна. Снілася крамянае маладое цела суседкі, яе мяккі галасок: «Добрае кіно? А? Добрае? А за добрае трэба плаціць, малы, трэба плаціць...»

— Падымайся, хлопец, пад'язджаем! — Праваднiца торгала мяне за плячо.

Я зосну падскочыў, і мы ледзь не стукнуліся галовамі.

— От шустры! Адразу відаць, адпачыў чалавек! Не тое што ўчора — ледзь жывы па вагоне рухаўся,— засакатала яна.— Папраўдзе, і сама праспала. Дай Бог здароўя твайму суседу: пабудзіў,

як да «Паўднёвай» пад'язджалі. Яго там сваякі сустракалі. Ён і студэнтку з вашага купэ прыхапіў. Да іх і хлопчык — ён ехаў у суседнім вагоне — прычапіўся: «Падвязіце, дзядзечка, мне адсюль дадому бліжэй». З усяго цягніка толькі яны ўтраіх і сходзілі. Утраіх і паехалі. Вясёлы ў цябе быў сусед. Нават мне прыдумаў нейкага палюбоўніка. Гэта ў мяне, замужняй жанчыны?! От выдумляка! А ты паціхеньку злазь ды апранайся — пара.

— Дзякуй, што разбудзілі... кхэ... кхэ...— зламаўся чамусьці мой голас на хрыпенне.

— Пабегла падымаць астатніх! — Праваднiца паднялася з незасланай пасцелі студэнткі.— А ты ўсё ж паварушыся, займі чаргу ў мыцельнік. Як будзем пад'язджаць да Цэнтральнага, я ўжо не забудуся яго зачыніць.

Але да мыцельніка не дайшло. Нешта падштурхнула спраўдзіць пачкі пад шпількамі. Першы ж распячатаны брыкет рассыпаўся васьмушкамі роўна нарэзанай шчыльнай паперы — купюр па дваццаць пяць рублёў было ўсяго дзве: зверху і знізу. Лялька!

Наступную ўпакоўку раскрываць не стаў: усё было ясна, як божы дзень.

Успомніў, як даваў мне цётчын знаёмы грошы. Наказваў: «Глядзі, не лічы варон! Давяраю табе сабранае за многія гады працы на Поўначы. А там жыццё — не цукар». Успомніў, як увіваўся тады каля нас кірпаты хлопчык у шэранькім, да пятаў, паліто. Успомнілася і тое, што спярша, калі заносіў рэчы ў купэ, заспеў у ім парачку пенсіянераў, а вярнуўшыся пасля развітання з цётчыным сябрам, наткнуўся на веселуна са студэнткаю. Падумаў нават, што трапіў не ў сваё купэ.

Ясна! Хлопчык расказаў ім пра нашу з жыхаром Поўначы гаворку, і яны, высветліўшы, дзе я кінуў якар, паспяшаліся абмяняцца з пенсіянерамі месцамі. Хутчэй за ўсё сказалі, што сустрэлі земляка ці сваяка. Старыя, вядома, былі не супраць: трэба дык трэба.

Малы і падмяніў брыкеты, пакуль весялун з сяброўкай-«першакурсніцай» мяне, цяля, адрэпетаванай «клубнічкаю» забаўлялі. А перад гэтым, як цяпер разумею, маю пільнасць віном спрабавалі прытупіць. Можа, і цыгарэты прапаноўваліся не простыя, а з якой заразаю. У прынцыпе ўсё было разлічана слушна: хто адмовіцца ад капіталістычнага «Філіп-Морыса» і масандраўскага дэсертнага? А «кіно» — як апошні варыянт. Ён і спрацаваў. Пакуль глядзеў пастаноўку, хлопчык упакоўкі перакладваў.

Што ж, працмокаў — сам вінаваты. Сам і адказваць буду.

Накінуў куртку, якая падалася нязвыкла лёгкаю: грошы, можа, і не пахнуць, затое вагу маюць.

Спакойна падумаў пра самагубства: «А што? Расквітаюся з усімі адразу!»

Зноў успомніліся словы, прамоўленыя красуняю ў сне: «За добрае кіно трэба плаціць».

Заплачу!

Як нырнуў у прасвет між платформаю і лакаматывам — ён ужо набіраў ход — не помню.

Помню, што было потым... Калі ачуўся і ўбачыў трох сваіх старых сяброў.

Не толькі за добрае кіно трэба плаціць.

## Дарагое жыццё

Сястрычкі-блізняткі былі маладыя, як майская раніца, чароўныя, быццам казачныя феі, і дарагія, як Жыццё. Менавіта так. Бо «дорага бяз меры дорага,— нашэптвала прачуванне,— абыдзецца табе з Сашкам ночны шпацыр з феямі». Красуні пад раніцу шмыгнулі ў акно бацькоўскае хаты, а кавалераў, вядома, не запрасілі.

— Да суботы, салдацікі! Усё было так цудоўна!

Мясцовыя героі сустрэлі няпрошаных кавалераў маўклівым аглядам-канстатацыяй, але задоўжаную паўзу парушылі першыя.

— Любіш катацца? — падаў голас высачэзны, пад неба, у папугайнай кашулі, відаць, галоўны з іх, тыцкаючы ў мяне пальцам.— Любі і саначкі цягаць!

Сашка — малайчына, адразу змікіціў: большага па сіле праціўніка можна адужаць, толькі нечакана ўтрызаючыся яму ў горла. І першы кінуўся ў атаку. Рэмень вінтом верталёта засвістаў над яго пілоткаю і гэтым адразу адцягнуў на сябе траіх.

Двое астатніх, наўздзіў, не разгубіліся — рынулі да мяне.

— Н-а-а!

— Д-а-ай! — ашалела, разрываючы грудзі, маё сэрца.

Закружыўся млын з рук і ног.

Усе забыліся пра дарагое Жыццё. Зараз яно нічога не каштавала.

— Ку-ка-рэ-ку-у! — звонка і проста ў душу заверашчаў певень.

Нехта ў гэтую цёплую сонечную раніцу чуў яго апошні раз.

*

Сашка не быў цяжкавагавіком, і я лёгка ўзваліў сябра на плечы. Да часці напрасткі праз лес — з гадзіну хады, і з перадышкамі да пад'ёму паспею. Калі дадуць перадыхнуць. Чатырох мы палажылі, але той, пад неба, што разбіў Сашку галаву, пабег прывесці падмогу. Як прывядзе, дык аддыхацца не дадуць. Не дадуць.

Нічога, дачыкільгаем. І не з гэткага віхру выбіраліся. Ты, галоўнае, Алесік, трымайся! За мяне трымайся, не вешай галавы. Дыхай, як я дыхаю. Як паравоз, дыхай...

А цяпер — цішэй, дружа, цішэй. Прытрымай дух. Пашануй сілы, а заадно — і нашыя Жыцці. Няхай хлопцы бягуць сабе міма, няхай бягуць. Не вытрывае твая разбітая галава калоў, якімі месцюкі неўтаймоўныя на бягу размахваюць. Ну не стагні, Алесік, не стагні, дарагі. Бачыш, хлопчыкі спыніліся, прыслухоўваюцца? Ну не стагні, родны.

*

— Навошта валок? — азадачыў Сашка.— Без мяне не дагналі б, і жыў бы сабе, не тужыў. Можа, доўга-доўга жыў бы.

Сашкава магіла была побач з маёю, і я добра чуў сябра.

— Такія, як я, доўга не жывуць. Так што — усё нармальна, Алесік, усё слушна.

— Эх, братка! — уздыхнулі.

— Загадвай жаданне! — разышоўся Сашка.

— Да феяў! — бухнуў я.

— Толькі дачакаемся месяца! — падхапіў Сашка.

— Як жа без яго! — згадзіўся з сябрам.

Ён яшчэ доўга захлынаўся ад смеху:

— Ха-ха-ха, ха-ха-ха!

І не толькі ён.

**Гена**

Гену мне заўсёды было шкада. Хоць і самога лупцавалі не раз, але сябе так, як яго, не шкадаваў. Вялікі і прыгожы (чаго вартыя былі яго добрыя карыя вочы, пышная русая чупрына і гладкія

ружовыя, як у немаўляці, шчокі!), ён панічна ўсіх баяўся, дрыжэў пры кожнай пагрозе, ад каго б яна ні выходзіла, заціхаў, калі бачыў чыюсьці занесеную — а раптам ударыць? — руку. Не ведаю, хто і калі гэтак моцна яго напалохаў, але што нейкая сволач узяла на сябе такі грэх, сумневу не было. Я марыў знайсці гэтую сволач і адпомсціць за Гену. Жорстка адпомсціць! Адбіць падлюгу мазгі, як ён адбіў Гену!

Але мінулі гады. Забыўся Гена, аселі злосць, абурэнне, гнеў...

Учора я прахаджваўся каля сваёй школы. Дваццаць пяць гадоў таму, развітаўшыся з ёю, мы ўсю ноч шпацыравалі з аднакласнікамі па праспекце. Тая ноч сталася для мяне апошняй у родным горадзе. Назаўтра давялося з'ехаць, і болей я ў тутэйшых мясцінах не быў. Але жыццё — кругазварот, і рана ці позна мы вяртаемся да вытокаў.

Школа здавалася вымерлай, як, між іншым, і праспект. Вымерлая школа, вымерлы праспект, вымерлы горад. Такое вось атрымалася вяртанне.

Жывым быў... Гена, які паказаўся з-за рага. Ён амаль не змяніўся: такі ж вялікі, нават масіўны, і па-ранейшаму запалоханы, баязлівы да дрыжыкаў.

Гена ўбачыў мяне, замёр. Відаць, думаў: сігануць назад, за рог, ці ўсё ж ісці, як ішоў, далей? А можа, пашанцуе і не зачэпяць?

Я падняў рукі і склаў іх над галавою крыжам, даў зразумець — свой! Памятаеш наш знак?

Гена ўспомніў, ступіў наперад, пасміхнуўся.

Я быў здзіўлены: ён вельмі рэдка ўсміхаўся. І ніколі не плакаў. Дакладней, плакаў па-свойму. Пасля біцця і здзекаў дваровай шпаны ў яго пачыналі торгацца плечы, лыпаць доўгія дзявочыя вейкі, няспынна ліцца слёзы. Ні стогнаў, ні ўзрыгаў, ні просьбы аб літасці — толькі слёзы. Яны быццам вымывалі боль з цела і душы, вызвалялі Гену ад пакут.

Гена ўсміхаўся. Толькі цяпер я разгледзеў яго твар, і мяне быццам токам пранізала: ён быў ссечаны безліччу рубцоў-шнараў. Гэта ж колькі з яго, з гэтага твару, здзекаваліся, рэзалі яго!

Гена падышоў накульгваючы: відаць, дасталося не толькі твару.

— Прывітанне, дружа,— паспрабаваў я суцешыць яго, падбадзёрыць.— Ты ўсё такі ж — вялікі і дужы!

— Не, не, не! — задрыжаў-спалохаўся Гена.— Я не дужы, я не дужы, я не дужы! — Голас сарваўся на фальцэт.

— Добра, добра...— спахапіўся я.— Не пазнаеш, ці што?

Гена маўчаў, зіркаў-касавурыўся ў адзін бок, у другі, узважваючы, куды бегчы. «Што ж рабіць? — думаў я.— Вось дык сустрэча. Не, хлопцы! Сёння я так проста не здамся! Я павінен разарваць гэтае заганнае кола!»

— Генка! — успомніў, як называў яго ў дзяцінстве.— Генка, я — свой! Такі ж біты, як ты, адзін да аднаго. Няўжо забыў Саньку?

Дзявочыя вейкі перасталі торгацца, бровы выпрасталіся.

— Санё-ок! Ро-од-ны! — ажыў Генка і — заплакаў.

Плакаў ён вось так, наўзрыд,— пры мне ўпершыню. Плакаў, захлынаючыся слязьмі, усміхаўся:

— Санё-ок!

Я абняў сябра, злёгку паляпаў па плячы, падтрымаў — як у тую ноч, дваццаць пяць гадоў назад. Пастаялі. Пасля ўзяў яго за руку, і мы пайшлі.

— Санё-ок! — ніяк не мог супакоіцца Гена, ловячы дрыготкімі пальцамі мой локаць.— Ро-од-ны!

Мы ішлі, смяяліся, нечаму радаваліся. Як у тую выпускную ноч, калі нас забілі.

## Ціхая восень восемдзесят восьмага

Група завялася і была ў экстазе, выконваючы бітлоўскую «Come together. Right now». Нават сябра Чэмпіёна Андрэй, які сядзеў насупраць, паклаў відэлец, прыціх. Не вельмі даўно ён зазнаў — прытым, як выявілася, нізавошта — год катаванняў і голаду ва ўнутранай турме КДБ, празванай народам «амерыканкай». Андрэй глядзеў у адну кропку. Заглыбіўся ў простую, але рэзкую, што брала за душу з першых акордаў, бітлаўскую «together...». Здавалася, цалкам забыўся. Нешта ўспамінаў.

Моцнае ўзрушэнне адчуваў і Чэмпіён. Раскацістае «right now», здавалася, праточвалася ў душу і гучала ўсярэдзіне.

І таму не адразу, а толькі пасля паўтораных з націскам слоў «Добры вечар!» Чэмпіён спачатку ўбачыў, а пасля пачуў чалавека, што падышоў да іх. Сам сабе схарактарызаваў яго як караля мясцовых рэкеціраў. У народзе той і сапраўды лічыўся крымінальным аўтарытэтам і галоўным сярод бандытаў, што атабарыліся ў гэтай установе.

— У рэстаранчык да нас зазірнулі? У госці, як той казаў, на агоньчык? У госці — гэта добра. Трэба й развеяцца. А тое, што без падарункаў прыйшлі,— несалідна, некультурна, я нават сказаў бы — нахабна. Нахабнікаў жа трэба выхоўваць, вучыць дабру-розуму. Але вы не хвалюйцеся, мы людзі лагодныя, сардэчныя і наражвацца нікому не збіраемся. Дый грэх гэта — гасцей крыўдзіць. Але ж, скажам, узяць удзел у дабрачыннасці кожны, хто адпачывае ў рэстаране, думаю, абавязаны. Бачыце, там, у куточку, хлопцы сядзяць? Яны, між іншым, не проста так лынды б'юць, а вас ахоўваюць. Галодныя, адзначу. Удзячнасці ж — аніякай. А ці справядліва гэта, калі адны шыкуюць, а другія ад недаядання пухнуць? Ці добра? Па-боску? І апошняе задаю пытанне: ці маеце вы намер выправіць гэтую несправядлівасць?

Чэмпіён апрытомнеў і дапяў, чаго ад іх хоча змагар за праўду, ці, як кажуць пра такіх у пэўных колах, лідэр злачыннай групоўкі, а з выгляду — лох лохам: прыйшоў у рэстаран у азіяцкай піжаме. Яму, пэўна што, нехта ад злосці душэўнай падказаў, што гэткая апранаха — арыгінальны варыянт спартыўнага касцюма крутой, элітнай, малавядомай у Саюзе фірмы.

«Ванёк Ваньком, а гаворыць, як піша,— разважаў Чэмпіён.— Складна гэтак пра даўгі-абавязкі і галодных Паволжа расправіў».

Аднак наехаў на гасцей галоўны бандыт дарэмна. Пачуцця страху, уласцівага большасці нармальных людзей, у пераможцы добрага дзесятка міжнародных турніраў дзюдо і самба не было зусім. Да таго ж ён быў у піку формы, а значыць, на адкрытай, свабоднай пляцоўцы адзін мог змагацца з тузінам ахвотнікаў. Бандытаў жа было сямёра. Праўда, хлопцы нішто сабе, падцягнутыя, плячыстыя. Але гэтая акалічнасць Чэмпіёна не бянтэжыла. Вага для яго не мела асаблівага значэння.

І ён цярпліва растлумачыў «сіняму»:

— Ты, бос, не да тых хлопцаў падышоў. Публікі шмат, а выбар зрабіў не з лепшых. І калі, прыкладам, ты не ведаеш такога слоўца, як іпон[1], лепш перайдзі на другі бок дарогі і там займайся. Тут прыбіць могуць.

Дагаварыўшы, Чэмпіён на ўсялякі выпадак адсунуўся разам з крэслам ад стала (раптам бандыт занадта нервовым будзе і

[1] Чыстая перамога ў некаторых відах усходніх адзінаборстваў.

кулакамі пачне махаць), трошачкі адкінуў галаву назад і развёў рукамі: маўляў, выбачай.

Бандзюга, відаць, блізка з чэмпіёнамі не сутыкаўся (іх жа адзінкі, гэтых чэмпіёнаў, па белым свеце матляюцца, і яны, як правіла, недаступныя простаму народу, няхай нават і «сіняму»: калі не на зборах адседжваюцца, дык у спаборніцтвах бяруць удзел) і палез быў на ражон. Але нешта — відаць, ціхі голас і спакойны тон Чэмпіёна — насцярожыла «караля», ён засумняваўся ў сабе, надумаў перастрахавацца і махнуў астатнім:

— Гэй, братва! З намі пагаварыць хочуць. Ага, з усімі. Герой тут адзін знайшоўся. Проста прагне пазнаёміцца.

За раз падняліся шасцёра стрыжаных бясшыйных малойчыкаў і рушылі да гасцей.

Ішлі павольна.

Павольна Чэмпіён пачаў мяняцца. На твары ўзнікла ўсмешка. Ён учуў музыку. Сваю музыку. Музыку бою.

«Come together! — заражаючы энергіяй яго цела, прамільгнула ў свядомасці, і ён прыкінуў: — Шэсць. Шэсць плюс адзін — сем. Гэта блізка да мяжы. Усё! — загадаў сабе.— Нікога няма! Я адзін. Увага! Бой! Хаджыме![1]»

Ён пачуў «right now», ускочыў з-за свайго стала, перакуліў рукамі суседні і, вызваліўшы спераду ад сябе прастору, «хукам» у грудзі збіў першага з нападнікаў. Паспеў адчуць: такі ўдар нават для гэтага мацака — бальніца. Адскочыўшы ўбок, апынуўся ззаду ад самага дужага з бандытаў і рукамі з усіх сілаў штурхануў таго ў плечы. Дакладней, штурхаў не рукамі, а корпусам. Інакш бугай, які быў вышэйшы за Чэмпіёна на галаву, не праляцеў бы дзесятак метраў і не грымнуўся б усёю тушай на бетонную падлогу.

Астатнія чацвёра (галоўны застыў, як помнік) былі жвавейшымі. Бліжэйшы прыняў баявую стойку.

«Добра стаіць. Прыгожа. Па-баксёрску»,— падумаў Чэмпіён і, тупнуўшы нагой, на імгненне вымусіў баксёра апусціць вочы. Гэтага досыць было. Галавой ён баднуў бандыта пад рэбры, і той адляцеў ад яго, як пешы разявака ад капота машыны, што збіла небараку. «Слабаваты ў хлопца жывот, рыхлы,— зазначыў Чэмпіён, але адразу прыйшоў сумнеў: — Нешта лёгка хлопцы кладуцца»,— і

[1] «Сходзьцеся!» — каманда да пачатку бою ў некаторых відах усходніх адзінаборстваў.

на ўсякі выпадак аўтаматычна зрабіў крок управа — там было нібыта вальней.

У патрэбны час спахапіўся. Кулак яшчэ аднаго адважнага замест таго, каб патрапіць яму ў галаву, толькі шмаргануў па шчацэ. Але балюча шмаргануў. «Абпаліў, гад»,— мільганула ў Чэмпіёна, і ён зразумеў — гэта першы званок: ён прыпазняецца. Сабрацца! Прадыхацца! Удых-выдых! Наперад! І Чэмпіён ірвануў да галоўнага.

Той уцякаць не стаў. Што ні кажы, гаспадар і ўсё такое. Але і біцца «ў тэмпе» не ўмеў, таму абцас і раструшчыў яму пераноссе.

«Ты глядзі, заадно і з кальца вырваўся,— выдыхнуў Чэмпіён і разгледзеўся.— О-о, ну гэта нікуды не варта,— пракаментаваў сабе тактычныя захады бандытаў.— Трое, і з нажом яшчэ...»

Чэмпіён з дзяцінства баяўся нажоў. Такое ў яго было наканаванне. Яшчэ хлапчуком моцна парэзаўся, калі гуляў з падоранай паўночным сваяком фінкай. І ўсё ж, адолеўшы боязь, ён кінуўся на нож. Баяўся, але ведаў: таго, з нажом, атакаваць трэба першым.

Двое прапусцілі ўзброенага наперад. «Сур'ёзны, відаць, таварыш»,— зрабіў выснову Чэмпіён.

— Дай! — крыкнуў неспадзеўкі, паказваючы на нож, ад чаго бандыт на нейкі момант разгубіўся.

Скарыстаўшы затрымку, левай рукою ўхапіў яго за кісць, правай — за локаць і завучаным болевым рычагом прыгнуў да падлогі. «Не, гэтага шкадаваць нельга»,— пранеслася ў галаве, і ён шпурнуў бандыта на падлогу. Той торкнуўся ў плінтус галавой.

— Адпачні,— параіў Чэмпіён, пераводзячы дух.

Апошняя парачка не марудзячы кінулася да лесвіцы. Гэтак спрытна махнуць з другога паверха на першы Чэмпіён, напэўна, не змог бы і сам.

— Прыгожа,— пачуў і зразумеў: ён выходзіць з бою.

— У жыцці такога не бачыў. Як у амерыканскім кіно,— ажыў сябра Чэмпіёна Андрэй.— Та-ак... Не ведаў, з кім таварышую, не ведаў... Да цябе, выходзіць, без пушкі не падходзь.

— У-у-у...— загула, падтакваючы Андрэю, зала.

За бліжэйшымі столікамі запляскалі ў ладкі.

Чэмпіён падышоў да свайго. Апусціўся на крэсла. «Сем,— чамусьці зноў уварвалася ў ягоную свядомасць магічная лічба.— Нешта не так. Нешта не адпускае. Так-так, іх, безумоўна, больш. І хутка прыбудзе падмога! Бой не скончыўся! Увага!»

І тут яму апякло спіну. Цела зайшлося ад болю.

«Нож ці куля»,— падумаў. І памыліўся. Гэта апераза́ў яго дубінкай мясцовы мент, сяржант, дружбак сямёркі.

— Устаць! — раўнуў ён пастаўленым голасам.— Рукі!

Падскочыў другі мент. З кабурой на баку і наручнікамі на поясе.

— Ёсць пушка, не глядзі, не сумнявайся,— сказаў, перахапіўшы іранічны позірк Чэмпіёна.— Значыць, устаём, рукі падымаем. І ўсё робім вельмі павольна, ве-ельмі. Бачылі, які ты спрытны...

Прыціхлая зала зноў загула. Нехта крыкнуў:

— Чаго да чалавека прычапіліся? Лепш бы бандытаў лавілі! Не чапайце хлопца!

— Маўчаць! — раўнуў той, з наручнікамі.— А гэты хто? Такі ж бандыт! Рукі, я сказаў! — павярнуўся зноў да Чэмпіёна.

«Што рабіць? — узважваў Чэмпіён.— Паслухаць ці атакаваць? Можа, гэтага, з пушкай, падсячы, а другога — нагой з развароту? Не! — пастанавіў для сябе.— З мянтамі звязвацца — на сваю галаву праблемы шукаць. За мянтоў усякі суддзя папросту на «пяцёрку» раскашэліцца. Прыйдзецца здацца. Хоць і гэта рызыкоўна. Падмога, калі паспее раней, чым мяне павязуць, умомант змяце гэтых хамякоў... Але будзем спадзявацца на лепшае».

Мянту Чэмпіён сказаў:

— За ўдар па спіне адкажаш, а пакуль што адзнач і запомні: я не супраціўляюся. Аднак ведай: калі яшчэ раз махнеш палкай, гэта будзе апошні раз у тваім жыцці.

— Не палохай! Палоханыя. Не такіх крутых бачылі,— сказаў мент не надта пераканаўча.— Пайшлі...

«Шкада Андруся. Слова не вымавіў, а яго таксама забралі,— думаў Чэмпіён, спускаючыся па прыступках.— От жа не шанцуе хлопцу. Толькі што з КПЗ, і цяпер зноў...»

Андрэй жа думаў пра іншае: «Такія баі самі сабою не канчаюцца. Не да дабра ўсё гэта, не да дабра. Адчуваю, будзе працяг банкету...»

У фае з туалета, што быў насупраць гардэробнай, выйшаў мент-лейтэнант. Мянта гэтага Чэмпіён ведаў, але не пазнаў: у форме раней не бачыў. Кожны чацвер у іх клубе праводзіўся «дзень схватак», і лейтэнант не раз наведваўся да Чэмпіёна ва «Ураджай», бо ў «Дынама», дзе ён займаўся, вартых праціўнікаў у яго вазе было няшмат. Мент таксама хацеў стаць чэмпіёнам.

— Пятро,— не паводле статуту звярнуўся сяржант да лейтэнанта,— бандыта злавілі. Рэзкі, сука. Проста вундэркінд. Ты б пабачыў! Цэлы спектакль закаціў. Ну нічога, мы яго...

«Дык гэта ж Пётр! — прамільгнула ў Чэмпіёна: толькі цяпер ён пазнаў свайго спарынг-партнёра.— От змей! Сітуацыю ўсёк, а маўчыць. Здумаў памучыць, паздзекавацца,— разважыў, па-свойму ацаніўшы кароткі позірк таварыша.— Можа, і мае рацыю. Я ж яго на татамі не шкадаваў».

— Давайце, давайце, цягніце бандыта ў машыну. У аддзяленні разбяромся. Паглядзім, што за птушка,— загаварыў нарэшце лейтэнант.

«Падлюга!» — вылаяўся ў думках Чэмпіён, але апускацца да танных фраз кшталту: «Пятро, ты што, сваіх не пазнаеш?» — не стаў.

І тут заявіла пра сябе падмога.

Чэмпіён убачыў іх першы. Яны ламаліся ў дзверы. Нешта крычалі.

Загучала «Come together». Нагадала: «Небяспека!»

Уваходныя дзверы з тоўстага шкла былі зачыненыя, але дагодлівы швейцар паспяшаўся да іх.

— Стаяць! — загадаў яму Чэмпіён, рызыкуючы яшчэ раз атрымаць дубінкай. І, мабыць, атрымаў бы, калі б лейтэнант не зрэагаваў:

— Косця, правядзіце «вундэркінда» на другі паверх, прайдзіце праз бар у гасцініцу і выклічце машыну адтуль.

Сяржант не стаў абмяркоўваць загаду, штурхануў Чэмпіёна ў спіну:

— Пайшлі, круты. Сёння твой дзень. Халява табе так і прэ.

«Круты ды круты. І што ў яго за манера такая дэбільная: адно слова пяць разоў паўтараць»,— думаў Чэмпіён, падымаючыся па прыступках на другі паверх.

— Дваццаты, я восьмы,— пачуў Чэмпіён з рацыі, што раптам ажыла ў машыне.— Затрыманага дастаўце дадому. Ля аддзялення брыгада Крэндзеля дзяжурыць...

— Зноў табе шанцуе,— пракаментаваў сяржант паведамленне.— І адкуль такія ўдачлівыя бяруцца?

Сёння чацвер, дзень схватак. Ён праспаў і цяпер спяшаўся. Ляпнуў дзвярыма. Амаль уляцеў у адчынены ліфт. Не гледзячы,

11. Зак. 413

націснуў ніжнюю кнопку. На першым паверсе дзверы рассунуліся. Чэмпіён зрабіў крок, другі. Адчуў халадок. Небяспека! Справа?! Павярнуў галаву. Выкінуў, пераймаючы ўдар, руку. Позна!

Ён ведаў, што некалі спозніцца. У дзяцінстве бачыў сон. Бог, ці хто, глядзеў на яго, папярэдзіў: «Ты станеш лепшым, але ніколі не будзеш старым».

Удар быў з-за спіны збоку. Моцны, рэзкі, прафесійны. Чэмпіён скокнуў назад, але яго абхапілі двое. Умела абхапілі, як звязалі, не тузануцца.

— Герой,— сказаў бандыт, што ўдарыў яго,— зараз ты будзеш паміраць. Паміраць паволі і балюча. Ты падняў руку на Крэндзеля. Ведаеш, хто гэта? Ведаеш! — паласнуў бандыт яго па грудзях.— Не хвалюйся. Гэта не страшна,— адвёў руку з нажом зноў...

Уварвалося «Come together...». «Нажы — гэта не для мяне,— успомніў Чэмпіён.— З нажамі ў мяне праблема. Як жа атаку празяпіў?» Чэмпіён адчуў пах крыві. «Наперад! — загадаў сабе.— Бой! Хаджыме!»

Адштурхнуўшыся ад тых двух, што трымалі яго, нагамі ўдарыў трэцяга. Той адляцеў і выпусціў нож. «Без нажа працаваць можна,— мільганула ў Чэмпіёна думка. І, зноў адштурхнуўшыся, гэтым разам ад зямлі, кульнуўся цераз сябе, перакаціўся, згрупаваўся, устаў.— Цяпер паехалі»,— заклікаў сябе і... замоўк.

Перад ім стаялі двое: сяржант з напарнікам. У цывільным.

Сяржант дастаў пушку:

— Во гад! — не марудзячы націснуў на курок.

Куля трапіла Чэмпіёну ў плячо, прайшла навылёт, дзынкнула аб паштовую скрынку. Ён кінуўся на сяржанта, але той не адпускаў курка. Чатыры кулі ўвайшлі ў грудзі Чэмпіёна.

Чатыры разы апякло. Ён павольна апускаўся, непрытомеў, паміраў...

Калі тыя двое падышлі да Чэмпіёна, ён яшчэ чуў «Come together...» Сяржант прыставіў пісталет да ягонай галавы і стрэліў. Музыка абарвалася.

— Усё,— сказаў сяржант.— Адыходзім.

— Справы о'кей, кажаш? — спытаўся, трымаючы слухаўку, чалавек з заклееным дзвюма шырокімі стужкамі пластыра носам.— Гэта

добра, што о'кей. З мяне падаруначак. Зрэшты, з цябе, літэр[1], таксама належы...— не дагаварыў заклееныя і заціх. Убачыў.

Андрэй націснуў на курок. Пластыр, успораны чымсьці нявідным, адарваўся ад твару. Твару не было.

— Што здарылася? — чулася з павіслай на шнуры трубкі.— Што ў вас робіцца?

— Right now...— падняў трубку Андрэй.— My friend is waiting for you[2],— дапеў ён за Чэмпіёна.

Ён не ведаў, што сваім стрэлам паставіў у шэраг тых, хто там чакае помсты за сябе, і таго, у каго страляў.

**«Мальбара-Лайтс»**

Накінуў куртку, абмацаў кішэні: партманет на месцы. Вызірнуў у акно: шапік працуе. Спусціўся, «Мальбара-Лайтс» няма. Перайшоў на другі бок вуліцы, дзе бабулі ля кавярні, акупаванай італьяна-туркамі, прапаноўвалі цыгарэты з-пад крыса: ёсць «Мальбара», але без «Лайтса», а каханая ж заказала менавіта лёгкія. Прайшоўся да кавярні на рагу: ні таго, ні другога. Крамка на пачатку бакавой вулкі не свяцілася — зачынена.

Вярнуўся назад, у двор. Падышоў да машыны. Сеў, завёў. На колах – не на сваіх на дваіх: раз-два, і патрэбная рэч у кішэні.

На выездзе з двара прытармазіў. Месца на Нямізе небяспечнае: мост, за ім уздым і адразу стромы спуск. Двойчы азірнуўся: нікога — можна разварочвацца. Павярнуў руль улева, крануў машыну і... пачуў, адчуў нутром – аж дух заняло – віскат тармазоў, удар, скрыгатанне металу. Здавалася, на спіну звалілася рэйка. Тыцнуўся лбом у шкло. Адразу адкінула назад. Пацямнела ўваччу. Забыўся...

Пабудзіў голас-рык:

— Сляпы? Лупы забыў, га?

— Што такое? – ачуньваў.— У чым рэч?

— Не ўсёк! – па-ранейшаму наязджаў бас.— Ты, відаць, пацан, нюх страціў?

---

[1] Ад слова «лейтэнант» *(жарг.)*.

[2] Мой сябра цябе зачакаўся *(англ.)*.

«Раве, іграе на апярэджанне,— прабегла думка.— Цяпер несці адказнасць буду я, хоць праўда не на баку крыкуна. Я ведаю сваю вуліцу, тым болей гэтае месца побач з домам. Каб з яго не ўбачыць, што нехта едзе, трэба гнаць кіламетраў сто дваццаць, не меней. А пры ўездзе ж на вуліцу вісіць знак «сорак», з моста пачынаецца вуліца. Та-ак, вінаваты ён, а плаціць буду я».

— Ды нічога я не страціў,— пачаў досыць памяркоўна: для цывілізаванага чалавека незразумелыя сітуацыі лепш развязваць згодай.— Куды вы ляцелі? Знак жа вісіць! Тут школа непадалёк...

— Гэта хто ляцеў?! — Бас відавочна працаваў на публіку.— Ехаў сабе сорак, гора не ведаў. Што я, знакаў не бачу? Гэта табе засляпіла! Хочаш усё па-свойму перавярнуць?

«Ты якраз гэтага і хочаш! Перакінуць з хворай галавы на здаровую!» — падумаў сам сабе. Уголас прамовіў па-ранейшаму спакойна:

— Дарма горла дзярэш! Я не глухі. Ад'едзем да ўзбочыны. Тут толькі дадаць могуць.

— Эге, дык ты, бачу, хітрун. У лапці абуць захацеў? «Ад'едзем»! Эйш, прыдумаў.

«Тупы,— зразумеў я.— На тупых мне шанцуе штодня, як паводле раскладу».

— Нічога ніхто не прыдумляў,— паспрабаваў патлумачыць сітуацыю.— Тут чым даўжэй стаіш, тым болей шанцаў, што ў азадак заедуць. Што тут незразумелага?

І ў гэты момант узніклі яны. Ягоныя browsers? no — Ягоныя браткі. Як з неба зваліліся. У такіх па ўсім свеце ёсць браткі. Ім адзін аднаго шукаць не трэба. Ехалі міма і ўбачылі: «Ага, дык гэта ж свой з лохам сутыкнуўся. Можна пажывіцца»,— узрадаваліся браткі, прытармазілі. Іх было трое. Няспешна выйшлі з новай «BMW». Па-крутому не зачынілі дзверцаў. Рушылі да нас. Адзін вярцеў у руцэ ланцужок з кастэтам. Упалыя шчокі, шэры твар — копія зомбі. Другі — з прыжмурам, нібыта яму сонца вочы слепіць, відавочна зэкаўская звычка — ухмыляўся. Весяліўся. Трэці, стрыжаны пад нуль «качок», пэўна што, найздаравейшы і рэзкі, узначальваў шэсце.

Я разумеў, што бойка пры такім умеркаванні сілаў бесперспектыўная, і выйсце бачыў у адным: трэба яе ўнікнуць.

— Калі выходзіць строга з правілаў,— апярэдзіў «качка», не даў яму — а ён быў ужо раскрыў рот — паздароўкацца з босам,— дык

віна за мною. Але ў прынцыпе гэта не так. Знак «сорак» у пачатку вуліцы вісіць невыпадкова. Дарога крута бярэ ўгору, пасля рэзка падае, і машына, што йдзе паперадзе, знікае метраў праз сто. І ўбачыць яе, а тым больш зрэагаваць — нельга. Але зараз гэта, само сабою, няважна. Калі б ён,— паказаў рукою на «гоншчыка»,— не ляцеў больш за сто, дык я ўбачыў бы яго і дачакаўся, пакуль праедзе. А так выходзіць, што вінаваты я: разварочваўся не там, дзе належыць. Таму не супраць закрыць пытанне, а значыць, разлічыцца, аддаць належнае...

— Дый што тут разбірацца-свяціцца,— плюнуў на асфальт «качок».— Валім на базу... У сэнсе — у гараж,— паправіў сябе.— Гэта побач, у цэнтры. Там укалвае класны кузаўшчык. Лішняга не возьме. У яго ўсё па мізэры. Хлопец прыкіне, чым рамонт абернецца, ты разлічышся, і — разышліся, як у моры караблі.

«Побач, у цэнтры, класны кузаўшчык... Цывільная «сінеча» трапілася»,— здзівіўся я і, згаджаючыся, махнуў:

— У гараж дык у гараж. Толькі адганю машыну да ўзбочыны.

— Давай,— ухмыльнуўся той, што гуляў з кастэтам. «Ну й лох, цёпленькі спёкся»,— чыталася ў яго вачах.

«Паглядзім, хто яшчэ тут лох»,— падумаў я, сядаючы за руль. Уставіў ключ. Завялася старушэнцыя, не падвяла. Мільганула думка: «Можа, гонкі наладзіць?» Дакрануўся да педалі газу, машына рушыла. «Шых, шых, шых» — скроб кола пакарэжаны бампер. Зразумеў: з гонкамі глухі нумар. Затармазіў, выйшаў. Трымаўся натуральна. Сеў у «BMW».

— Пагналі.

Да гаража, дзе «ўкалвае класны кузаўшчык», дабіраліся чвэрць гадзіны. Усё было культурна і прыстойна (мне расказалі нават некалькі анекдотаў з турэмнага жыцця), але толькі да таго моманту, як заехалі на лодачную станцыю. Яна станавіла сабою абгароджаную дзялянку зямлі памерам з палову футбольнага поля, на якім стаялі два будаўнічыя вагончыкі, даволі вялікая драўляная халабуда накшталт стадолы і амаль ля берага, на фоне шэрагу перакуленых лодак,— альтанка. Злева і крыху далей стаяла прыбіральня і бочка з пагрозлівым чэрапам і надпісам: «Не курыць!» У ёй, напэўна, трымалі паліва для матораў. Гаражоў не відаць было. Усё слушна. Так мне і трэба.

— А дзе ж наш майстра-слесар? — падняў я бровы, удаючы дурня.

— Не спяшайся,— выйшаў з машыны «качок».— Будзе табе майстра, і не адзін. І не толькі слесар.

— А чаго адразу на ты? — прапусціў я сказанае міма вушэй.— Здаецца, авечак разам не пасвілі,— але не дагаварыў, азірнуўся на гул за спінаю.

Да станцыі пад'ехалі яшчэ дзве «бээмвухі». Чалавек сем саколікаў рэкецірскага бізнесу ўсміхаліся, віталі сваіх.

«Зручная прылада — мабільны тэлефон,— падумаў я.— І паўгадзіны не мінула, а хлопцы ўсё ведаюць, у курсе падзей».

— Як будзем разбірацца? — спытаў нязголены мужычок гадоў сарака пяці — пяцідзесяці з сінімі ад наколак рукамі. Адвесіў блазенскі паклон, нібы запрашаючы зайсці ў вагончык.— Па-людску ці па-іншаму?

Я зразумеў, што зараз будзе вызначацца цана рамонту плюс маральна-матэрыяльныя выдаткі (як яны кажуць — няўстойка), якія, паводле чутак, у такіх хлопцаў разоў у пяць перавышаюць рэальную суму.

Давялося далей клеіць дурня:

— Што тут разбірацца? Закрываць трэба тэму. Няма ніякіх праблем. Вінаваты дык вінаваты. За ўсё трэба плаціць. Я не супраць. Але тут, як бачу, ніякага кузаўшчыка няма. Прапаную пад'ехаць да майго аднакласніка. Аднаўленнем машын ён заняўся яшчэ ў час першых кааператываў. Досвед — аграмадны. Лепш за яго ніхто такую работу не зробіць. Адказваю!

— От з гэтым спяшацца не трэба. Вельмі сур'ёзнае гэтае слова — «адказваю»,— абарваў мяне ўладальнік сініх рук.— Разбяромся на месцы. Навошта без патрэбы катацца, кагосьці там шукаць? Тут бабкі падаб'ём.

«Чаго ж там, на месцы аварыі, не падбілі?» — слушна падумаў я. Але, каб не пагаршаць сітуацыю, давялося пагадзіцца:

— Тут дык тут.

— Цяпер паглядзі на машыну,— павысіў голас «сіні».— Бакавіна счасана, пярэдняя стойка паехала. Машыне — кранты. Аніводзін доктар яе не вылечыць. Так што пра рамонт забудзь. Тачку трэба вярнуць новую, такую, як была.

— Якая ж яна новая?! — не стрываў я.— Гэтай мадэлі гадоў дзесяць, не менш.

— Пры чым тут гады? — Рэакцыя была імгненнай.— Машына не ездзіла. Прайшла нейкіх пару тысяч. На спідометр зірні!

«Па перамотцы спідометраў вы спецыялісты»,— падумаў я, ужо ледзь валодаючы сабой.

— Не хачу нічога чуць пра новую машыну. Назавіце суму, якую я павінен за рамонт. Калі яна боская, разлічуся — і ўсё на гэтым. А калі...

Ад удару ў спіну я пахіснуўся, але на нагах утрымаўся. Зрэагаваў, адскочыў назад, прыняў стойку. Вось чаго не варта было рабіць! Гэтага чакалі. Нешта цяжкое, як сцяна, абрынулася на плечы і адкінула мяне назад, на бандытаў. Падкасіліся ногі. Асунуўся. Шанцу ўваліць ляжачаму браткі не ўпусцілі. Першыя ўдары адчуваў, пасля некуды праваліўся...

Ачуўся ў вагончыку. Паглядзеў на аконца: шарэла. Відаць, адпачываў доўга.

Сінія рукі торкнулі пад нос смярдзючую прабензіненую анучу.

— Ты, гэта, дарма хлопцаў раззлаваў,— разабраў я малюнак змяі на ягонай руцэ.— Ледзь адбіў цябе ў мальцоў. А магло па-іншаму павярнуцца. Дарма не захацеў па нулях усё раскінуць, дарма. Але цяпер, калі хлопцы з'ехалі, можаш не баяцца. Напішы колькі слоў, якія я прадыктую, і...

— Пад дыктоўку не пішу!

— Зноў за сваё? — Скамечыла рука маю кашулю.— Рызыкуеш, хлопец, ой, рызыкуеш.

«Рызыкую? — паўтарыў сам сабе.— Можа, «сіні» і мае рацыю. Зацыкліўся, рызыкую і магу дарызыкавацца. Трэба змяніць тактыку. Што ён сказаў? Мы адны? Ужо лягчэй...» Уголас згадзіўся:

— Добра, дыктуй...

— Вось бачыш, можаш і па-іншаму, культурна гутарыць. Правільна змеркаваў,— усміхнуўся «сіні»,— усім жыць хочацца. Цяпер — па справе. Чырканеш «пісямко» жонцы. Так, маўляў, і так, вінен аднаму чалавеку, а доўг — гэта святое... Ясна тлумачу?

— Ды ўжо ж, ясней не трэба. А чым пісаць? Зубамі?

— Зноў грубіяніш. Глядзі, дагаворышся. Руку я табе вызвалю. Адну. Для пісаніны досыць.— Ён нагнуўся і развязаў вузлы на запясцях.— Падыміся, левую зноў да пояса прыхвачу.

Я адчуў: вось ён — шанец вырвацца. Паволі прыўзняўся, адвёў назад галаву, заціснуў у зубах боль ад падвярэджанай шыі і рэзка, з усіх сіл, джвагнуў «сінюку» лбом між вачэй. Нос бандыта расплыўся, вочы сышліся да пераносся — пацэліў трапна. Без жалю штурхануў яго ў грудзі. Мужычок раструшчыў часопісны столік у

цэнтры вагончыка, адляцеў у кут, грымнуўся аб лодачны матор, які вельмі дарэчы апынуўся там, раскінуў рукі і заціх.

«От і адпачні,— уздыхнуў я і адразу ж выдыхнуў.— Уцякаць! Аднаму шайку не адолець... Не, уцякаць нельга! Стаяць! Думаць! Бандыт, памятаю, запаліў газавую пліту, хацеў пастрашыць агнём. Ён яе так і не патушыў, адна канфорка гарыць. Добра, хай».

Я падкінуў на пліту «дроўцаў» — стос газет, што зляцелі з разламанага століка. Шуганула адразу. «Падсохла паперка,— палягчэла на душы.— Пара ўцякаць! Тут хутка смажаным запахне...»

Выскачыў з вагончыка. Падбег да бочкі з палівам. Кульнулася лёгка: напалову пустая. Пакаціў да стадолы. За пару метраў ад яе штурхнуў бочку апошні раз. Выбег за плот, азірнуўся.

Дашчаная будыніна ўспыхнула, як высушаная салома. Гэта вам не жартачкі — бочка з бензінам.

Хоць адбегчыся ўдалося досыць далёка, я разумеў — так проста не ўцячы. Я спаліў логавішча, але не яго насельнікаў, і ўсё яшчэ наперадзе. От і «бээмвухі» пад'ехалі. Зноў азірнуўся: шукаюць. Угледзелі. Кінуліся наўздагон. Нешта крычаць. А-а, зразумела, што яны могуць крычаць. Імчаць хутка, няйначай былыя спартоўцы. І гэта небяспечна! Бегчы! Не спыняцца!

Успомніў і скалануўся: такое ў маім жыцці ўжо было. Логавішча, «бээмвухі», вагончыкі, сінія рукі, уцёкі — усё было ў сне, вельмі даўно. Акурат гэтак я і бег. Доўга, да знямогі, пакуль не акружылі. Што тады зрабіў не так? Чаму дагналі? Я стаміўся, спыніўся, схаваўся і... здаўся! Значыць, галоўнае — не спыняцца, змяніць варыянт, паспрабаваць іншы.

Гэтым разам — не як у сне — не затаіўся. Ведаў, што будзе, калі дам сабе палёгку. І я бег. Задыхаўся і бег. Падаў, уставаў і бег. Бег, бег, бег, уцякаў ад смерці. І, здаецца, яна асталася...

Убачыўшы свой дом, узрадаваўся, але па інерцыі ўсё яшчэ ляцеў. Страх ураганам штурхаў у спіну. Не, стоп! Стаяць! Крамка! Свеціцца? Гэтым разам — так! Працуе! Можа, і «Мальбара-Лайтс» з'явіліся?

Калі падляцеў да крамкі і ўбачыў пачак з запаветнай назваю, сілы гаварыць не было. Як глуханямы, пастукаў па шкле вітрыны, паказаў, што хачу купіць. Прадаўніцу, відаць, не збянтэжыла мая немата, і яна прасунула ў аконца жаданы залацісты пачачак:

— Гэтыя?

Я па-ранейшаму моўчкі паклаў перад ёю шэра-салатавыя паперкі. Забіраючы пачак, пачуў:

— Божа!

Я зразумеў яе. Не кожны дзень кліенты з разбітым да крыві тварам трапляюцца.

— Дзякуй,— выціснуў з сябе, завярнуў за рог і пабрыў да роднай параненай птушачкі. Пабітая, яна глядзела на мяне, жалілася абедзвюма вялікімі вачыма-фарамі.

«Прабач, дарагая, усё будзе добра,— супакоіў.— Паехалі, зменім дыслакацыю. Тут робіцца небяспечна».

Паціхеньку, з шых-шыханнем, заехаў у двор, за гаражы. Выйшаў, пагладзіў любку, паабяцаў: «Я ўсё выпраўлю. Заўтра ж! Патрывай».

На лесвічнай пляцоўцы зноў укралі лямпачку, і маладая красуня не разгледзела ў вочка скрываўленага твару пасланага ёю па цыгарэты мужа. Пазнала па голасе. Але голас ёй падаўся дзіўным, вінаватым, ці што. І яна падумала: напэўна, «Мальбара-Лайтс» не было і ён зноў купіў якое паскудства.

## Першага верасня

Я сустрэў Андрэя на Цэнтральным рынку. Ішло да закрыцця, народу амаль не было, і хоць мы не бачыліся добры дзесятак гадоў, пазналі адзін аднаго адразу — Андрэя, як і даўней, вылучала белая, пышная, пад ранняга Рода Сцюарда, чупрына. Ён купляў сваім блізняткам персікі. Расказаў, што дачушкі перайшлі ў чацвёрты клас, выдатніцы. Не пагадзіўся з маім банальным: «Хутка растуць чужыя дзеці». Пахваліўся, што, нягледзячы на цяжкі час — пра што сведчыла хоць і акуратна, але цыраваная яго куртка,— яму пакуль што ўдаецца кожны вечар прыносіць малым нешта з садавіны: іх хударлявыя фігуркі («Нічога не зробіш,— развёў Андрэй рукамі,— мае дакладныя копіі») як не ўголас патрабавалі вітамінаў. Перажываў, што надыходзіць новы навучальны год, а толкам не падрыхтаваўся да яго: не купіў дзяўчаткам школьнай і спартыўнай формы, чаравікаў, красовак, ранцаў, цёплых рэчаў на восень. Андрэй думаў набыць усё адным махам і не тут, а ў Польшчы: там, маўляў, танней і лепшай якасці. І грошай назбіраў дзеля такога

выпадку. Выехаць збіраўся ў бліжэйшую пятніцу, каб вярнуцца ў нядзелю: панядзелак — першага верасня.

На тым і разышліся.

Некалі мы разам вучыліся ў аспірантуры. На пачатку перабудовы я не вытрываў жыцця на няшчасныя сто дваццаць «рэ» і падаўся ў аўтаномнае плаванне. Андрэй быў цярплівейшым. Абараніўся, выкладаў. Вельмі любіў сваю работу. Лекцыі яго нагадвалі перадачу «Што? Дзе? Калі?». Аўдыторыі не змяшчалі ўсіх ахвотных паслухаць — рэдкая не толькі для таго часу з'ява. Малады, прыгожы, перспектыўны, студэнткі бегалі за ім цугам, а ён... ён па-ранейшаму жыў у двухпакаёвай хрушчоўцы з мамаю і дзвюма сваімі малымі красунямі: жонка пайшла шукаць больш сытага існавання.

Нейкі час Андрэй яшчэ трымаўся за інстытут, але ўрэшце закрылі і яго. З таго часу я Андрэя не бачыў.

І вось — другая запар сустрэча. Хоць не ведаю, ці можна гэта назваць сустрэчаю. На маіх вачах два здаравілы ў камуфляжы з блішчастымі ад тлушчу мордамі падкраліся да яго ззаду. Андрэй паглядзеў на мяне, пазнаў, але прывітацца не паспеў. Адзін з мянтоў схапіў яго за валасы, другі пачаў выкручваць руку. Андрэй не вылучаўся сілаю ці ростам і, калі б яны сказалі яму проста: «Пройдзем»,— не падумаў бы супраціўляцца. Мянты ж, відаць, наважыліся зрабіць навучальна-паказальны захоп валютніка. Яны гнулі Андрэя да зямлі, але, на іх здзіўленне, ён упёрся: не хацеў пэцкаць аб брудны асфальт нядаўна абноўленай курткі. Не жадаў, каб дочкі, яго светлыя галоўкі, спалохана запыталі: «Тата, гэта бандыты на цябе напалі?» Як бы ён растлумачыў ім, што ўсё якраз наадварот? Схапілі яго мянты з падказкі бандытаў: не плаціць, маўляў, ясак. Ён бы заплаціў, але дужа хацелася апрануць дзяўчынак. Думаў — абыдзецца.

Не абышлося.

Мянты зламалі яго супраціў, павалілі ў гразь. Андрэй выпусціў пакет, з якога выпалі і пакаціліся два вялікія апельсіны. Мент, што выкручваў Андрэю руку, адфутболіў апельсіны з-пад ног, і разам з напарнікам яны пацягнулі Андрэя да «ўазіка» — той акурат пад'ехаў.

— Узялі, нарэшце, суку,— пракаментаваў мент у цывільным, выходзячы ім насустрач з машыны.— У-у, халяўнік! Сёння цябе навучаць разлічвацца. Растлумачаць, хто ў хаце гаспадар.

Андрэя паставілі на ногі. Мент у цывільным зайшоў яму за спіну і нечакана падскочыў. Ад удару нагой у паясніцу Андрэй уваліўся ва «ўазік». Палезлі ў машыну і мянты. Дзверцы зачыніліся, і банда паехала. Агаломшаны, не маючы сіл зварухнуцца, я глядзеў услед шэрай машыне. «Чаму яна не чорная? — знячэўку прыйшла думка. Яна павінна быць чорнай, як тыя «варанкі» з вылюдкамі ў трыццатыя гады».

У школу першага верасня дзяўчынкі не пайшлі. Перад гэтым, у пятніцу, Андрэй зранку папярэдзіў маці і дачок, што, магчыма, з базару дадому заязджаць не будзе — адразу махне ў Варшаву. Аўтобус адыходзіць каля семнаццаці, і няма сэнсу швэндацца туды-сюды. Яшчэ сказаў маці, што бярэ з сабою ўсе сабраныя за лета грошы: яды ў хаце было на тыдзень, так што да яго прыезду яны ім не спатрэбяцца, а там усякая лішняя капейка будзе дарэчы. Маці ўпрасіла ўзяць і яе «энзэ»: пяць долараў, якія летась падарыла ў дзень нараджэння сяброўка — суседка-пенсіянерка. Але Андрэй усё ж змеркаваў заскочыць на хвілінку дадому: не мог паехаць, не развітаўшыся з дочкамі. Выбраў для іх два вялікія апельсіны — большыя заўсёды саладзейшыя.

І ў суботу, і ў нядзелю да глыбокай ночы блізняткі чакалі тату. Ім не цярпелася ўбачыць новую школьную форму, і ранцы, і новыя чаравічкі — старыя зусім знасіліся. Татка абяцаў, што купіць сваім выдатніцам найлепшыя.

Бабуля ў ноч на нядзелю спаць не клалася. На досвітку дастала выцвілыя ад частага мыцця сукеначкі дзяўчынак. «На ўсялякі выпадак трэба папрасаваць,— падумала. Спахапілася: — На які такі ўсялякі?» Прасуючы, адхіляла ўбок галаву: не хацела, каб на сукенкі капнула сляза. Сэрца неспакойна білася, кружылася галава — пэўна што, падняўся ціск: раніца, а сына няма. Не важылася будзіць унучак: позна заснулі, а сёння ўсяго толькі лінейка, бацька ж прыедзе — і малыя пойдуць у школу ў новенькім. «Усё будзе добра, сынок»,— паўтарала адно і тое ж, водзячы прасам.

Развіднела, надышло першага верасня.

У лясным масіве каля чыгуначнай станцыі на ўскраіне сталіцы сонны опер апісваў труп, на які раніцай натрапіў мясцовы жыхар, што выгульваў сабаку:

— Мужчына... Век трыццаць пяць — сорак... Валасы пышныя, сівыя... Куртка заліта крывёю... Грошай і дакументаў не выяўлена...

«Рабуюць народ,— думаў аператыўнік.— А тых, хто супраціўляецца, забіваюць». І не здагадваўся, як меў рацыю.

Аднекуль даплыў школьны званок. Опер успомніў, што для ягонага сына гэты званок — першы. «А хлопцы з рынку не падвялі,— усміхнуўся задаволена.— Арганізавалі мальцу да школы новы гарнітурчык. Фірмовы, не тое што наша барахло...»

## Настаўнік фізікі

Два бамжы счапіліся насмерць, люта мясілі адзін аднаго. Пераможца (ці той, хто застанецца жывы) рабіўся адзінаўладным гаспадаром смеццевага бака на тэрыторыі дарагой аўтастаянкі ў цэнтры горада.

Санька ведаў абодвух.

Высакаваты, у шэрым, досыць паношаным касцюме, у светлай, некалі белай кашулі, пры гальштуку няпэўнага колеру,— былы настаўнік фізікі, удавец, пенсіянер. На пенсію яго выпхнулі. Новая дырэктарка, прысланая з гарана для ўмацавання кадраў, змеркавала, што стары занадта мяккацелы для сучаснай школы. За апошнія гады настаўнік, і праўда, не паставіў ніводнай двойкі. Лічыў: хто хоча ведаць фізіку, той і пасля тройкі задумаецца. Каму ж фізіка да лямпачкі, таго і адзінкаю не напалохаеш. Не выратавала настаўніка нават тое, што для многіх пакаленняў вучняў ён быў прыкладам сумленнасці і прыстойнасці.

Пазбыты ўлюбёнай работы, якой прысвяціў усё жыццё, ён першым часам не выходзіў з дому. «Як глядзець дзецям у вочы? — задаваў сабе ўсё тое самае пытанне.— Выхоўваў, казаў: трэба імкнуцца жыць па-ленінску, вучыцца і яшчэ раз вучыцца, думаць пра заўтрашні дзень — і дагаварыўся: выгналі, як сабаку, забралі гэтае заўтра». Паціху настаўнік прызвычаіўся тапіць тугу і перажыванні ў горкай. Уперад піў пакрысе, але з кожным днём арганізм патрабаваў спіртнога ўсё болей, што і давяло былога куміра дзяцей да жабрацтва. А пасля ён страціў і дах над галавою: падчарка не захацела жыць з «дармаедам» і даслоўна выштурхнула яго за дзверы. Судзіцца? Не ўжо, выбачайце,— пайшоў бамжаваць.

Другі прэтэндэнт на права калупацца ў «прэстыжным» сметніку заявіўся сюды быццам з супрацiўнага лагера. Усё жыццё (з невялікімі і рэдкімі перапынкамі) ён праседзеў у турмах, «косячы», як сам хваліўся, пад дурня (можа, таму і выжыў). І хоць быў зэкам са стажам (АНР, як ні кажы,— асабліва небяспечны рэцыдывіст) і пакінуў след амаль на ўсіх зонах былога Саюза, на ролю рэкеціра, бандыта, верхавода злачыннай групоўкі не цягнуў — аслабеў целам і розумам. Не навучаны працаваць, жабраваў.

Цяпер ён біўся за тое, каб не бадзяцца па горадзе ў шуканні ежы, не красці з чужых памыйніц (што заўсёды небяспечна), а мець сваю, да таго ж сытную і недалёка ад склепа, у якім начаваў.

Зэку ўдалося падгрэбці працiўніка пад сябе і схапіць за горла. Але забіваць ён не збіраўся: усё ж бамжаваць — не парыцца на зоне. Трушчыў у пальцах кадык настаўніка і хрыпеў: «Зыдзі, падла, гэта маё, зыдзі».

Той маўчаў. Толькі вочы гарэлі, крычалі, як у яго баліць душа.

Санька не вытрымаў, падбег, адапхнуў крымінальніка:

— Пайшоў вон, падонак!

Зэк кінуў на яго з-пад ілба злы позірк, але біцца не палез, адступіў, павярнуўся да настаўніка:

— Нічога, інтэлігент, нічога. Не кожны дзень за цябе заступацца будуць. Неяк аднаго падпільную! Гарнітурчык і фэйс так адпрасую...

Ён прабубнеў нешта яшчэ і знік.

Да болю ў сэрцы Санька шкадаваў настаўніка, але, успомніўшы, як не любіў той спачування, зрабіў выгляд, быццам не пазнаў яго:

— Пацярпіце крыху, збегаю выклічу «хуткую».

— Не варта турбавацца, малады чалавек, усё нармальна,— перапыніў настаўнік, выціраючы насоўкаю кроў з твару.— «Хуткая дапамога», пасля міліцыя... Не хачу звязвацца з гэтай публікай. Ідзіце, прашу вас, калі ласка, а то, чаго добрага, і вас заадно...

Яго «калі ласка» нагадала выпускны экзамен. Тады настаўнік убачыў, што Санька запнуўся, гатовы паплысці, і супакоіў: «Не хвалюйся, збярыся, калі ласка, з думкамі, вазьмі сябе ў рукі. Ты ж ведаеш закон Шарля Кулона, сто разоў выводзіў». І Санька ўспомніў, дакладней, сфармуляваў той закон адразу, у памяці.

Санька не стаў пярэчыць настаўніку, упрошваць прыняць дапамогу. Пагляд настаўніка прымусіў яго апусціць вочы. «Мы ва ўсім вінаватыя, мы! — дакараў Санька сябе.— Заслужаны настаўнік —

бомж, і ўсе маўчаць! Мая хата з краю. Нешта трэба мяняць, развязваць гэты гордзіеў вузел».

— Ідзіце, ідзіце, не хвалюйцеся,— быццам прачытаўшы Санькавы думкі, падштурхнуў яго настаўнік.

Санька адышоў, але ў машыну сядаць не спяшаўся. Стаяў, чакаў: раптам вернецца зэк. Але той не паявіўся...

Калі позна ўвечары пакідаў машыну на стаянцы, ні настаўніка, ні зэка паблізу не было.

Раніцай патэлефанаваў галоўны рэдактар і нагадаў: «Рукапіс трэба здаць максімум праз два тыдні, інакш — вылеціце з плана».

Выйсця не было, і Санька ўзяў адпачынак: трэба нарэшце дапісаць пачатую некалі аповесць, што завяршала кнігу.

Праз два тыдні рукапіс быў гатовы. Можна везці. Дый машына зачакалася на стаянцы.

— Нешта даўно вас не відаць было,— сустрэў Саньку вартаўнік.— Усё пішаце, як той казаў, ствараеце? А ў нас тут іншыя справы ствараюцца. Мянты другі тыдзень шастаюць, спакою не даюць. Бамжа нашага помніце? Таго дзівака, што ў касцюме і пры гальштуку хадзіў, быццам прафесар? Ведалі яго? Дык вось, забілі старога! І ўяўляеце хто? Следчы казаў, што нават ён быў уражаны: праламаў бамжу галаву былы аднакласнік. Не дацягнуўшы да восьмага, ён кінуў навуку, пасля ўсё жыццё правёў у турмах і лагерах. І вось сустрэча аднакласнікаў праз пяцьдзесят гадоў. Такая вось сустрэча... А што гэта вы так пабялелі? Бамжа ж забілі, не каго там...

## Маленькая гісторыя

Машына з чырвонай паласою на баку паўзла паволі, нібыта ўсляпую. Малады чалавек, які сядзеў побач з кіроўцам, нервова круціў галавою, шукаў: «Куды ж яна падзелася, куды?» І собіла яму прызначыць сустрэчу менавіта там, дзе спыняцца забаронена! Дамовіліся: толькі на імгненне прытармозяць, забяруць яе і паедуць далей. Але — спазніліся. Амаль на дваццаць хвілін. Спазніліся не па сваёй віне.

Яна лічыла так: інтэлігентны чалавек, сама сабою, мусіць пачакаць, але не болей як чвэрць гадзіны, і пакрыўдзілася: «Не з'явіўся!

Усё ў яго не як у людзей. І ў такі дзень не змог без сюрпрызаў! Няўдача!» Завяла сябе, разнервавалася, падбегла да краю вуліцы, падняла руку.

Прыгожыя жанчыны прываро́жваюць. Два шыкоўныя джыпы, ледзь не счапіўшыся, нібыта бычкі-трацячкі, рагамі-абярэгамі рэзка затармазілі. Пашанцавала ўладальніку «Ленд Крузера» — ён першым адчыніў дзверцы:

— Прашу! — эфектна кінуў замест звычайнага «Куды?».

Каця зірнула на ўсмешлівага маладога чалавека, хацела звыкла — у ёй яшчэ не астыла злосць — паслаць як мага далей задаволенага жыццём лавеласа, але, успомніўшы, як абышоўся з ёю Сяргей (сёння яны планавалі падаць у загс заяву), моўчкі села ў машыну.

«Ленд Крузер» амаль імгненна ўліўся ў агульную плынь транспарту.

Маладзён з пахам «Кельвіна Кляйна» не лез з роспытамі. Убачыўшы, што незнаёмка нечым узрушана, паспрабаваў яе супакоіць:

— Тут паблізу кветкавы магазін. Прапаную зазірнуць. Такая шыкоўная дзяўчына не павінна заставацца без ружаў ні хвіліны! Думаю, акурат чырвоныя пасавацімуць да вашай дзівоснай сукенкі.

— Дзякуй вам, вядома, за клопат і ўвагу, але я спяшаюся дадому,— устаяла супраць першых кампліментаў Каця. Аднак у яе тоне не было катэгарычнасці. Ружы дарылі ёй толькі раз — летась, на выпускным. Сусед па парце адважыўся. Дык то ж — аднакласнік, свой...— Дамовіліся аб сустрэчы, і мяне чакаюць,— спрабавала ўпэўніць яна незнаёмага і самую сябе,— і хацелася б...

— Ага-ага,— мякка спыніў яе красун, бачачы, што дзяўчына кажа неяк няўпэўнена.— І мне хацелася б... зрабіць вам прыемнае!

«Можа, ва ўсім гэтым і няма нічога страшнага ці кепскага, чалавек жа быццам культурны»,— здавалася, слушна зметкавала Каця, але ўголас па-ранейшаму адмовілася:

— Я праўда не магу...

— Не дык не,— нязмушана пагадзіўся гаспадар джыпа.— Прынята. Але мы ўжо на месцы. Хвілінку, я мігам.

Толькі цяпер, калі малады чалавек выйшаў і накіраваўся да магазіна, Каця ўбачыла, які ён станісты, падцягнуты, энергічны.

«Нават вельмі энергічны,— без аніякай іроніі падтрымаў нутраны голас,— ве-ельмі».— «Ну і што?» — спрабавала яна запярэчыць.

Але голас настойваў: «Забудзься на свайго няўдачніка, што заўсёды спазняецца, паглядзі, які прынц вока на цябе паклаў, не пазбывай сябе прыемнасці, адзін раз жывём».

З букетам пунсовых ружаў красун выплыў з магазіна. Каця адчула, як бярэ яе ў палон белазубая ўсмешка, як уеліся ў яе светлашэрыя вочы, як затрапяталася, закалацілася яе сэрцайка.

«Няхай будзе што будзе,— прашаптала, уздыхнуўшы.— І праўда, нармальны, здаецца, хлопец».

Ён сапраўды быў нармальным хлопцам, але не проста хлопцам, а сынком «новага рускага» (яна ад пачатку так падумала – і не памылілася). У свае маладыя гады паспеў не толькі зведаць слодыч усёдазволенага жыцця, але і аб'есціся ім. Надакучылі яму і даўганогія жрыцы кахання. І хвалявалі, вабілі хіба што такія вось «зялёныя» і неспрактыкаваныя, даверліва-чыстыя і, вядома ж, прыгожанькія маладыя дурніцы, якім вельмі лёгка закружыць галаву, абязволіць бязмернай галантнасцю і шчодрасцю, а пасля завалодаць і нацешыцца. І не проста нацешыцца, а па-крутому, з жорсткасцю, здзекуючыся з малалеткі, робячы ёй балюча (па-іншаму ён ужо й не ўзбуджаўся). І разам лічыў, што робіць дзяўчыне ласку, адорвае шчасцем: маўляў, калі б не ён, дурніца ніколі б і не даведалася, што ёсць зусім іншае, чым яе звычайнае і шэрае,— багатае, захапляльнае, асаблівае жыццё. Жыццё без мер і межаў...

Вось для такіх маленькіх ён і ўмеў паказаць сябе нармальным, нават больш чым нармальным хлопцам.

Сеў у машыну і пяшчотна, з прыдыханнем пражурчэў:

— Гэта для самай вабнай і чароўнай, для... Магу я даведацца, як зваць прыгажуню?

— Каця... Кацярына,— спахапілася, асуджаючы сябе: «Хутка ж у мяне да знаёмства дайшло».

— Ал-лік,— шчоўкнуў языком элегантны ўладальнік джыпа.— Для вас Алік, а для ўсіх іншых – Аляксандр,— адчаканіў апошнія тры літары і перайшоў на іншы тон: – Цяпер – расслабляемся, выдаю серыю апошніх анекдотаў...

Серыя аказалася ўдалай, добра падабранай, і гэта Кацю канчаткова супакоіла.

Спыніліся каля новага цаглянага дома з агароджаю, якая ад вуліцы праставала ў лясок і хавалася ў ім. Алік набраў уваходны

код. Пачулі: «Open the door»[1] — і рушылі да яйкападобнага, з белага металу ліфта. Той падышоў без выкліку — «атрымаў каманду» ад уваходных дзвярэй. Прамуркаў: «Назавіце код, калі ласка». Улавіўшы патрэбны набор лічбаў, рушыў угору. Не паспела Каця агледзець сябе ў люстраных дзвярах, як тыя адчыніліся: прыехалі.

«Дзівосы,— уздыхнула з палёгкай.— Адно слова — фірма».

— Заходзьце, лэдзі, у мой сціплы прытулак,— падаў ёй Алік дыстанцыйны пульт.— Націсніце, калі ласка, на зялёную кнопачку.

«Нішто сабе — сціплы! — заўважыла сама сабе Каця.— Ліфты на дзвюх мовах размаўляюць, дзверы скураю абабітыя і з пульта адчыняюцца, кнопка званка пазалочаная. Наколькі ж шыкоўна такая кватэра павінна быць абстаўлена ўсярэдзіне?»

Усярэдзіне да названых аксесуараў дадаліся цёплая, яўна з падагрэвам, падлога, якая да таго яшчэ й свяцілася, фактурныя сцены з тоўстага, колеру морскай хвалі шкла, стыльная, ажно б'е па вачах, аранжава-лімонная сталоўка, змеяватыя храмаваныя люстры-падсветкі. Такога супердызайну Каця не бачыла і ў галівудскіх кінафільмах.

Алік запрасіў госцю прысесці, але апамятацца не даў:

— Каву, гарбату, джус? Раю орандж — апельсінавы. Гатую сам. Спецыяльнай машынкай выціскаю. А можа, ну іх, гэтыя сокі, асвяжымся халодненькім, з лёду, шампанскім? Ёсць «брут».

«Глядзі ты, усё ў яго ёсць. Шчаслівы, не тое што некаторыя»,— зрабіла Каця выснову. Адважылася, выдала па-англійску:

— Please, orange with ice[2].

Нечаканая паўза Кацю збянтэжыла, і яна перайшла на родную мову:

— Калі можна, вядома...

— Не можна, а трэба,— падтрымаў гаспадар. І прапанаваў: — Паглядзіце пакуль гэтыя прыгожыя часопісы, я хутка...

Каця не прагартала да канца першы ж «Плейбой», што трапіўся пад руку, як вярнуўся Алік з падносам. Да джусу ён прынёс танюткія сандвічы з сырам, фаршыраваныя нечым чырвоным — пэўна што, морквою — аліўкі і мяккае персікавае марозіва.

[1] Дзверы адчынены *(англ.)*.

[2] Калі ласка, апельсінавы <сок> з ільдом *(англ.)*.

Ад такога сервісу насцярожанасць і недавер, якія яшчэ таіліся недзе на дне душы, канчаткова зніклі, настрой узняўся. «Ва ўсім вышэйшы клас!» — з захапленнем падумала Каця.

Алік пазіраў на яе пераможцам, усміхаўся. Першая дзея прайшла — лепей не трэба: дзяўчына завялася і, значыць, усё рухаецца згодна з планам...

Каця ўзяла высокі бакал з утопленай у залатой вадкасці пластыкавай саломінкай, пацягнула-пакаштавала — казка! Захапіўшыся, не заўважыла, як асушыла палову бакала. Па целе пракацілася хваля прыемнай цеплыні. Каці зрабілася хораша і супакойна. Яна засынала...

Праз гадзіну яе разбудзіў пранізлівы холад.

— Ачомалася? — пачула знаёмы голас.

Расплюшчыла вочы.

— Дзе я?

— Можа, у гасцях, а можа, і дома — у залежнасці ад паводзінаў.

Каця ўбачыла перад сабою вузкія шчыліны светла-шэрых вачэй. Цяпер яны не свяціліся дабрынёю, як раней, а запытальна ўзіраліся. Пераканаўшыся, што Каця апрытомнела, ён не стаў нічога тлумачыць, пайшоў да выхаду. Каля дзвярэй на хвіліну затрымаўся:

— Сама разумееш, даводзіцца перастрахоўвацца. Хоць, можа, ты і не брыкалася б, але рызыкаваць — сабе на шкоду.

Калі дзверы зачыніліся, Каця прыўзнялася, разгледзелася. Пусты пакой. Яна — на падлозе, у куце, прыкаваная наручнікамі да батарэі. Успомніла і жахнулася: «А мама ж усе вушы пратрубіла: не загаворвай на вуліцы з незнаёмымі, не загаворвай...»

«Ратавацца! — усё больш уключалася свядомасць.— Пакуль не забілі, не знявечылі. Не спі, вазьмі сябе ў рукі, не надта шмат аранжавай атруты глынула. Зрэшты, у яго, відаць, тут усё на наркотыках настоена. Запаслівы. І глядзі ты, сволач, у якой кватэры жыве! У фільмах маньякі па сутарэннях шастаюць, а гэты... Уліпла, дурніца! Што ж рабіць, як вырвацца? Спакойна, здаецца, ён ідзе...»

— Галубка, што ў нас з настроем? Як будзеш сябе паводзіць: слухацца ці капрызіць, дадатковыя праблемы ствараць?

— Капрызіць не буду, я ж не вораг свайму здароўю,— намагалася Каця быць спакойнай.— Толькі не магу я рабіць гэта без настрою і не прывёўшы сябе ў парадак. Пастаў павольную музыку і дазволь прыняць душ.

— Санітарыя і гігіена? Добра, задаволім запаветнае жаданне. У крэдыт, зразумела.— Гаспадар расшчапіў кайданкі, дапамог устаць.

Ванны пакой быў пусты — ні паліцаў, ні люстэрка, ні іншых звычных рэчаў: зубной пасты, шчотак, пральных парашкоў, нажніцаў. «Нажніцы часам спрацоўваюць пры абароне не горш за нож, а парашок — не горш за мянтоўскую «чаромху»,— успомніла Каця вядомы дэтэктыўны серыял.— Але тут... Ванна, бідэ — і ўсё. Відаць, яшчэ не абставілі як след... Аднак жа павінна быць выйсце, павінна! Можа, узяць і заехаць яму з усяе сілы нагою ў пахвіну, а потым учапіцца ў гада пазногцямі, зубамі, ірваць, крычаць, кусацца? Чытала, для такіх гэта найпершыя лекі... Не, сілаю яго не возьмеш, дубіна пад два метры, адным ударам заб'е. Стоп! Што ж гэта я?! А акно?»

— Можа, выйдзеш? — папрасіла Каця жаласна.— Саромеюся...

— Люблю, калі мяне саромеюцца. І яшчэ больш люблю памагаць распранацца.

— Паможаш, якія пытанні. Толькі цяпер дай мне, калі ласка, пабыць адной, настроіцца. Так будзе лепей.

— Добра, схаджу прынясу ручнік,— адпусціў яе запясце.— Але не ўздумай жартаваць, усякія падкопы строіць, не раю...

«Ды плявала я на твае парады, маньяк чортаў,— асмялела Каця, калі дзверы зачыніліся. Успомніла: — Акно! У ім паратунак».

Паспрабавала адчыніць раму, але з жахам усвядоміла: «Не дам рады! Зняты ручкі. Разбіць? Няма чым. А голымі рукамі такое шкло не возьмеш. Можа, як у дзяцінстве, калі з моста давала нырца ў ваду — рыбкаю? На якім я паверсе? Не павінна быць занадта высока. Падымаліся на ліфце нядоўга, пэўна што, не вышэй за трэці. І як на бяду — ніводнага ліхтара на двары: хоць вока выкалі».

Імгненні адляталі, Каця не важылася скочыць, а ён мог зайсці ў кожную хвіліну.

Зноў успомніла маму, яе заўсёднае: «Кацечка, ні з кім і нікуды, ты ж дзяўчынка, пакрыўдзіць могуць».

«Наперад!» — скамандаваў — зноў ажыў! — нутраны голас. Адышоўшыся для разгону да сцяны, яна кінулася ў акно...

Лопнула-стрэліла шкло — ці яе галава? — Каця ўжо зразумець не паспела.

Нягледзячы на аддаленасць ад цэнтра, «хуткая» прыехала да месца трагедыі толькі на некалькі хвілін пазней за міліцыю. З машыны з маркотным тварам-маскаю вылез лекар-практыкант і

пацікавіўся ў эксперта з дзяжурнай опергрупы, што здарылася. Той кіўнуў: няўжо не бачыш?

Падышоўшы да распластанага на бетоннай падмостцы цела, лекар нечакана замёр, потым замітусіўся, замахаў, як сляпы, рукамі, залепятаў:

— Божа мой, чаму, за што?!

Калі б Каця была жывая, яна б адказала Сяргею.

## Дабрадушны

Вясна пабудзіла ў пяць. Жарсць разрывала цела, але жонка яшчэ з вечара — як заўсёды, каб не забываў! — папярэдзіла: «Раніцай не грымець! Хадзіць на пальчыках! Не дай Бог прачнуся раней за дванаццаць — мала не падасца».

Як у тым анекдоце:

— Хочаце выпіць?

— А няўжо ж не?

— Ну, не дык не!

Апошнюю фразу паўтарыў уголас. Усё ж улюбёная прымаўка адной крывабокай сцервы, што ледзь не загнала мяне ў магілу — падставіла пад бандыцкія нажы — на золаку юнацтва.

Снедаў адзін. Нудота. Перакурыў. Жарсць не аціхла, але дзверы ў спальню па-ранейшаму былі замкнёныя.

Што рабіць?

Вызірнуў у акно. Па двары праходжвалася суседка: вывела свайго ўлюбёнца — шэрага, амаль што няўгледнага на фоне асфальту пудзеля Бубліка, вялікага ахвотніка да мясцовых дам-с. Так, здаецца, невідзімкай да іх і падкрадваўся. Шустры кавалер.

Пастанавіў не аставацца. Апрануўся, спусціўся: калі што — а што? — хадзіў па пошту, асвяжаўся-прачынаўся, дыхаў паветрам! Прайшоўся ўздоўж сцяны. Ля апошняга, вуглавога, пад'езда стаіўся: чакаў, пакуль суседка зойдзе за дом і яе не відаць будзе з вокнаў маёй кватэры.

З'явілася.

Усміхнуўся, згуляў на апярэджанне, павітаўся першы:

— Добрай раніцы, шаноўненькія! (Не забыўся і на ўлюбёнца.)

Падумаў: «У яе, пэўна што, усё наадварот: муж — сава». Пачуў:

— Ты глядзі, Бублік, не толькі нам у выходны не спіцца. Цікава...

Пасля «цікава» агульная мова, паразуменне і прыемныя абоім тэмы знайшліся адразу. Дамовіліся: працягнем гутарку пазней.

Вярнуўся ў неасцярожна бадзёрым настроі (расслабіўся), чым моцна раззлаваў Яе Вялікасць, якая зрабіла ласку прачнуцца.

— А што гэта ў цябе вочы блішчаць? — замест «Добрага ранку, любы!» падазрона прыжмурылася яна.

— Па табе засумаваў, вось і блішчаць. Прагнуць...— адказаў як мага лагодней, даваў шанец, не чужая ж.

Не скарыстала (усё ж чужая!):

— Глядзі ў мяне! — пагразіла пальцам з пазногцем, большым, чым сам палец, і знікла ў ваннай. Ужо з-за дзвярэй пачуў: — Не ўздумай у цукарніцы чайную лыжку пакінуць. I хлеб не рэж, як інвалід бязрукі. Крошак на ўвесь стол. Ты ведаеш, я нервовая, за сябе не адказваю. (Так-так, пайшла абуджацца-разыходзіцца, лепш бы далей спала-харашэла.) I наагул, браў бы прыклад з майго брата. Чалавек хоць і маладзейшы за цябе на дзесяць гадоў, і інстытутаў не канчаў, а які разумнік, які ў яго парадак у хаце. Схадзіў бы на экскурсію. I працуе не абы-дзе, а ў багатай фірме. Грошай — во! — не раўня табе, галадранцу! А што ты? Задарма студэнтам мазгі з ранку да вечара сушыш-палошчаш! («А ты не сушыш, ты на іх капаеш»,— падумаў, ды сказаць не адважыўся. Звычка...) I гэта ўсё, на што здатны? — ніяк не магла ўгамавацца жонка.— Недарэмна брат не толькі бачыць, але й чуць пра цябе не хоча. Так і не пажадаў знаёміцца-радніцца.

Адкруціла ваду. Бубніць працягвала, але зараз яе слухалі толькі краны. Давай, давай, дзяры горла, разрухвай звязкі.

Тым часам падзеі набіралі абароты. Да прызначанай сустрэчы заставалася менш за гадзіну, а я не толькі пра кветкі не парупіўся, але і прычыны для знікнення не прыдумаў. Выратавала «Вялікасць» — свой чалавек у чужой камандзе.

— З'ездзіў бы на рынак,— паказалася яна з ваннай з белым, як смерць, ад крэму тварам.— У халадзільніку хоць запалі, няўжо аслеп?

«Ды, здаецца, не аслеп,— падумаў. Успомніў: — Каўбаса двух гатункаў сохне, сыр, масла, малако, яблыкі, рыба, ліманад, пірозівы... Што яшчэ? А-а, учора чорная ікра скончылася. Вядома, акрамя гэткага вытанчанага далікатэсу для яе ўсякая іншая ежа — атрута».

Рынак дык рынак. Бачыць Бог, сама напрасілася. Калі б ведзьма ведала, што сёння да рынку прыкладаецца, наўрад ці праявіла б ініцыятыву — раўнівая і хцівая ў дадатак: ні сабе, ні людзям.

Многія мужы і жонкі думаюць, што рана ці позна адкрыюць для сябе (абавязкова!) гэтую страшэнную таямніцу — здраджвала ім другая палова хоць раз у жыцці ці не. Але жыццё мінае, а яны так і застаюцца ў няведанні, хоць пра абоіх усё вядома і яго сябрам, і яе сяброўкам.

Зноў адхіляюся ад курсу. Хутка зберціся і — у дарогу. Адна нага тут, другая — там.

Апрануўся. Цяпер — з не вельмі задаволеным выглядам — паведаміць: «Я пайшоў!» Вытрываць яе: «Ох, і трапіўся ж мне мумуччына!» (але-але, з падвоенымі «му» і «ч») — і ў бой! Для некаторых і гэткі прыдасца.

Суседка чакала, як і дамовіліся, ля ўвахода ў кінатэатр «Мір». На пытанне-ўсмешку наконт планаў запэўніў:

— Планаў няма, але могуць быць экспромты. Можа, Раўбічы: кажуць, сауна там прыстойная.

— Сто гадоў не была ў такіх установах,— адразу згадзілася яна, але слова «сауна» далікатна ўнікла.

«Во што значыць чалавек, які думае, дакладней, усё разумее! — ацаніў суседку па заслугах.— Для яе час — грошы. І слоў падазроных на вецер не кідае. З такой не прападзеш, не ўхраснеш у гісторыю, не загрыміш пад фанфары»,— зрабіў выснову на карысць больш блізкага знаёмства з суседкай.

— Тады — у дарогу! — кінуў кліч ёй і сабе, спыняючы таксі, якое, нібы на заказ, выплыла з-за рога.

Сядаючы, на ўсякі выпадак азірнуўся: нікога, чыста. Ну й добранька.

— У Раўбічы!

— Усёк! — кіўнуў таксіст у люстэрка задняга віду.— За асобную плату магу пасля і пачакаць.

— А чаго нас чакаць? — адрэагаваў, ускідваючы бровы.— Мы ж не на пікнік зберліся. На работу едзем, познімся ўжо.

— Вядома,— падкалупна ўсміхнуўся кіроўца.— Добрая работа. Свежае паветра і ўсё такое...

Я не стаў высвятляць наконт шматзначнага «і ўсё такое». Сабакі гаўкаюць, а караван ідзе. Гэтак моўчкі і дабраліся.

Ля ўвахода ў ціхі двухпавярховы будынак не было прыпаркавана ніводнай машыны. «Прыехалі,— уздыхнуў,— выходны». Не разгубіўся (а ёсць іншыя прапановы?), падышоў да дзвярэй, пастукаў.

— Хто галоўны? — спытаў у хлопца ў трыко, які ўзнік на парозе.

— У выходныя — я за яго. Але сёння сауна не робіць. Не пашанцава-ала вам,— высокім сапрана выдаў ён нечакана. (Блакітны, ці што? І дзе гэта я чуў такі высокачастотны галасок?) — От калі наконт масажу,— заўважыў ён баксікі ў маіх руках (заначку ад Яе Вялікасці), рэзка крутнуў галавой — прачнуўся,— дык гэта мы можам. У мяне вышэйшая катэгорыя. Я не які там самавук цёмны.

«Кемлівы хлопчык,— заўважыў.— Гадоў трыста таму добрым бы халопам быў». І з нядбалай усмешкай багатага бізнесоўчыка прамовіў:

— Прагнем усяго і па поўнай праграме, акрамя масажу — тут мы і самі як-кольвек разбяромся. Урубай катлы, не траць часу. З аплатай змяркуемся. І не турбуйся, наўрад ці сёння твае босы аб'явяцца. Наперадзе жаночы дзень. Думаю, у іх праблем і без цябе стае.

Хлопец, здаецца, палымяна любіў шамаценне заморскіх купюраў, бо, адчуўшы іх у потнай далоньцы, спрачацца не стаў, а запрасіў прысесці:

— Арганізуем усё ўмомант!

Не марудзячы, выйшаў.

Суседка павяла вачыма сюды-туды:

— Неспакойна тут неяк. Здаецца, у такіх месцах асабліва цікаўныя не палянуюцца тэлекамеры ўмантаваць.

Я паблажліва ўсміхнуўся:

— Гэта ты лішку дала, мы ж не першыя асобы краіны. Не з тандэма «аператар-гэбіст і пракурор-красунчык».

Сам сабе зацеміў: «Малайцом, хвалюецца, кантралюе сітуацыю, не спіць, як мая, дзень і ноч. З такой і праўда не прападзеш. Флірт фліртам, а рэнаме вышэй за ўсё».

Дзяжурны, выявілася, зусім не дурань, і катлы бурлілі задоўга да нашага прыезду: да прыёму гасцей хлопец быў, як у дзяцінстве вучылі,— заўсёды гатовы.

З разуменнем і ледзь прыкметнай ухмылкай дыпламаваны масажыст правёў нас да запаветных дзвярэй, апынуўшыся за якімі, разумееш, што пакуль ты за імі, ты — у пастцы і, значыць, заўсёды

ёсць шанец, што яны могуць зачыніцца (калі вас, вядома, высачылі). Аднак жа не ныем — не каркаем, спадзяёмся на лепшае. У дадатак — акрыяў я духам, гледзячы на фізіяномію масажыста, якая аж свяцілася (думаецца, у прачуванні лёгкіх грошай),— наўрад ці мікрасхемкі ў камеры або мікрафоны парыльню вытрымаюць. А якраз там многія і любяць косці старыя разварушыць, адпачыць-пазабаўляцца. Калі і стварылі такі цуд, дык, відаць так, дух-жар не толькі вочы, але і аб'ектывы слязіцца-пацець вымусіць. Не надта верыцца, каб цікаўныя хлопцы разабраліся ў такім тумане, хто з кім і чым займаецца. А інакш — які сэнс?

Суседка (цяпер ужо і сяброўка) распранулася з ледзяным — дзівосная жанчына! — спакоем. Адно слова — красуня! Грудзі з другога памеру, як выдавалі пад вопраткай, перайшлі ў трэці. Смочкі ружовыя, як шчокі немаўляці. Сцёгны — пышныя, рэзка пераходзяць у шыкоўную дупку-мяч. Шанцуе ж некаторым! Штодня з такім мячом гуляюць.

Цела-наркотык прытуманіла свядомасць. Ачуняў, уваходзячы ў салодкае запаветнае месцейка. Яна войкала, абдымала, быццам баялася страціць. І я зноўку забыўся.

Час ляцеў.

Няўмольна раставалі чыесьці апошнія імгненні.

Не вельмі дурны, а лепш — зусім не дурны шантажыст, выбачайце, масажыст, ці, калі ўжо да канца быць дакладным, масавік-забаўнік прыставіў да другога боку сцяны, якая падзяляла раздзявалку «люкс-нумара» і склад бялізны, паўтараметровыя алюмініевыя драбіны. Пасмейваючыся, ён пацёр спрактыкаванымі пальчыкамі-жэўжыкамі вядомую штуку між ног і паглядзеў, ці загарэўся чырвоны светладыёд, які сведчыць, што тэлекамера робіць.

Гарыць! Робіць, родненькі! І яшчэ як! «Вока» аб'ектыва спецзмесівам памазаў — цяпер не запацее!

Няспешна (абазнаны быў, а няўжо ж — неяк раз замітусіўся і загрымеў) самавук-«рэжысёр» злез з прыступак, падхапіў пад паху алюмініевую сяброўку-памочніцу і падаўся ў «студыю», што раней была пакойчыкам для гразевітамінных ваннаў.

— Прыз — у студыі! — сказаў, пераймаючы аднаго вусатага тэлехлапчыну і аблізваючыся ў чаканні.— Ці пакажуць госці сёння што-кольвек вартае? — нецярпліва разарваў поліэтыленавую ўпакоўку відэакасеты. Уставіў скрыначку ў аконца відэамагнітафона,

што стаяў справа ад манітора на насценнай паліцы над ваннай. Націснуў кнопку «запіс», пасля яе – «паўза». Але апошнюю адразу ж адпусціў.– Глядзі, не распрануўшыся пачалі. Каб раней часу не спякліся. Бос за такое кіно ні капейкі не заплаціць. Але не, мужычок – нішто сабе, сапе, стараецца. І дзе гэта я бачыў яго? Ці – чуў? О, глядзі ты, і ў мяне пайшло ўгору. Давай, давай, падымайся, слухайся татачкі.

Калі двое на маніторы плюхнуліся ў басейн і прадоўжылі свой інтымны занятак там, «рэжысёр» не вытрываў: «Ваду! Трэба наліць ваду, як у іх!»

Адкруціў кран. Лёг.

Ванна напаўнялася з хуткасцю святла.

– Ух,– стагнаў «рэжысёр»,ператварыўшыся ў акцёра.– А-а-а.

Падаўжальнік сеткавага сілкавання, да якога была далучаная апаратура, гайдаючыся, нібы ванька-ўстанька, на краі паліцы, доўга думаў, зваліцца яму ці не зваліцца. Быццам нешта намеркаваўшы за самога Госпада, ён асмеліўся і скокнуў. Ух ты!

Акцёру-рэжысёру падалося, што гэтак ён яшчэ ніколі не канчаў.

– О-о-о-о!!!

Жалезнымі абцугамі нехта ўхапіў яго за сэрца і рваў з грудзей: «Р-раз! А ну яшчэ! Р-р-раз! Р-р-р-раз! Табе кажу – ад-да-ай!!!»

«Сцэнна-рый няпр-равільны! – скеміў праз імгненне кінааматар, якога забівала токам.– З вадд-ой – перабор! Прр-агнуў поўнай імітац-цыі».

«І-і-і – бах!!!» – выбухнула свядомасць.

Усё. Фініш. Канец. Смерць.

Ванна, цела, вада, на яе паверхні – згусткі белай непразрыстай субстанцыі, і згаслы манітор.

– Цік-а, цік-а, цік-а,– забіраў насценны гадзіннік час у тых, што парыліся ў сауне.

Мінула гадзіна.

«Рэжысёр» пруцянеў.

Двое з мокрымі галовамі выйшлі ў фае.

– А дзе ж тут валасы сушаць? – пацікавілася яна, але, убачыўшы патрэбны агрэгат імпартнай вытворчасці, усміхнулася: – Добрая сауна, усё паводле вышэйшага класа.

– Выдатная! – пагадзіўся ён.– Супер!

Выходзілі задаволеныя і шчаслівыя.

— А масажыст,— павярнулася жанчына да свайго кавалера,— нармальны хлопец, дарма ты пра яго нешта бурчэў. Я, дарэчы, яшчэ як заходзілі, падумала: «Сімпатычны малады чалавек, прычасаны, акуратны, такі не падвядзе». Малайчына, га? Дацяміў: у далікатных выпадках лепш не праводзіць, даць гасцям зысці па-ангельску, не бянтэжыць іх.

— Але, такіх цяпер рэдка напаткаеш,— пагадзіўся ён.— Дабрадушны хлопец.

Праз дзень я нёс труну з «дабрадушным» — маладзейшым за мяне на дзесяць гадоў жончыным братам.

# АПАВЯДАННІ ПРА КАХАННЕ

## У месяцовым святле

У няпоўныя пятнаццаць трапіў я на турбазу «Юнацтва», пабудаваную яшчэ на схіле сталага сацыялізму недалёка ад знакамітай пескаватай сугі на возеры Нарач. Там і закахаўся ў найхарашэйшую ў лагеры дзяўчынку з дзівосным імем Наташа. Закахаўся не падзіцячаму, а па-сапраўднаму! І галоўнае, яна адказала ўзаемнасцю.

Мы былі на сёмым небе ад шчасця, баяліся разлучыцца нават на хвіліну. Варта было апынуцца сам-друг у зацішку, як страчвалі галовы: ліплі адно да аднаго, абдымаліся, цалаваліся! Бегалі на спатканні ўначы, хоць і ведалі, чым гэта магло скончыцца. Але дзіва! Мы праяўлялі незвычайныя цвярозасць і асцярожнасць, ахоўваючы свае сустрэчы ад пільнага вока дзяжурных выхавальнікаў. Упярод нават суседзі з палатаў не ведалі, што апоўначы мы блукаем уздоўж берага, плаваем, пракладваем курс ад каўша Вялікай Мядзведзіцы да Палярнай зоркі і — летуценім, летуценім, летуценім. Божа, пра што мы толькі не марылі! А найперш — каб хутчэй скончыць школу, стаць дарослымі, самастойнымі, згуляць вяселле і нарадзіць шматшмат дзяцей! Чым болей — тым лепей! Весялей! Хіба ж няпраўда?

Здаецца, я і сёння помню, адчуваю, як нясцерпна было чакаць, пакуль усе ў дамку паснуць. Роўнае ціхае дыханне суседзяў было сігналам да падымання. Наташыны сяброўкі — дзяўчынкі ёсць дзяўчынкі! — засыналі хутка і дружна, і да намоўленага месца — старога паўразбуранага пірса ля сугі — Наташа заўсёды прыходзіла раней за мяне.

Помню першую начную сустрэчу там, ля пірса. Наташа нечакана скінула з сябе ўсё, нават купальнік, нейкі час глядзела праз

мяне, быццам не заўважаючы, што я тут, а тады з разгону кінулася ў ваду! Самы час было аслупянець. Урэшце, я таксама, наўрад ці што разумеючы, пазбыўся майкі, плавак – і да яе.

З таго часу мы толькі так і рабілі: скідалі адзенне і ў скрозьдонную начную прахалоду Нарачы. Якая цудоўная была Наташа ў месяцовым святле! Кроплі зіхацелі срэбрам на яе бронзавай ад загару, невыказна пяшчотнай і цёплай скуры, але скочвацца не спяшаліся...

Мы плавалі, давалі нырца, ганяліся адно за адным, абдымаліся і ішлі на дно, разнімалі абдымкі і ўсплывалі.

Выходзілі з вады таксама паводле нашай, першай, завядзёнкі: Наташа крыху адставала, абхапляла мяне ззаду за плечы і так, паравозікам, паволі, нага за нагу, мы брылі да берага. Выйшаўшы, валіліся на халодную ад расы траву. Наташа гарнулася да мяне, грэла, нібыта дзіця, сваім целам, шаптала: «Мой мілы хлопчык!» Салодка туманілася свядомасць ад гэтых п'янкіх слоў.

Рынуўшыся ў адзін з такіх тумаяноў, мы і адважыліся на самае-самае. Упершыню...

Я і цяпер не надта разумею, як і чаму тое адбылося. Я быццам аддаваўся ў жаданы палон нейчае волі. У нашым дзівосным спектаклі рэжысёрам, безумоўна, была Наташа, а я – самаахвярным і палкім акторам. Яна падказвала, вучыла і ставіла перада мною заданні і звышзаданні, а я, скароны ўладай яе чараў, самазабыўна лунаў у невядомых дасюль вышынях, уздымаючыся і падаючы да смяротна-салодкага замірання сэрца.

Але гэта я цяпер так разважаю, а тады...

Мы былі проста шчаслівыя! Нас было ў лагеры толькі двое. Для нас не існавала нікога і нічога. І мы забыліся, ды і наўрад ці ведалі, што там, дзе двое, заўсёды ёсць трэці – лёс.

Аднойчы, зайшоўшы далей, чым звычайна, мы выпадкова трапілі ў пастку, якая была расстаўлена зусім не для нас: рыбнагляд з міліцыяй наладзілі аблаву на браканьераў. З імі быў і ўчастковы. Ён праявіў уладу – затрымаў «піянераў»: займаліся, маўляў, не тым, чым дазволена. Мы былі раздушаныя яго грубасцю і пошлымі разважаннямі пра раннія палавыя кантакты. Урэшце мы апынуліся ў аддзяленні міліцыі, дзе і мусілі чакаць раніцы. Але ў Наташы між бруднай бетоннай камеры з жалезнымі кратамі дзвярэй сталася істэрыка, і ад «недалетак» надумалі пазбыцца. Праз гадзіну нас даставілі да вагончыка начальніка лагера. Той, паміргаўшы соннымі вачыма, адклаў разбор да раніцы і адправіў начных гуляк спаць.

Праўда, перастрахаваўся: загадаў выставіць варту з важатых каля нашых дамкоў.

Прысуд прачыталі на ранішняй лінейцы:

— За парушэнне рэжыму — знаходжанне па-за тэрыторыяй у ночны час — адлічыць Наталлю К. з лагера і адправіць дадому найбліжэйшым аўтобусам.

«Адну?! — здзівіўся я.— А мяне? Мы ж былі разам! Я ж — мужчына! Гэта мяне перш-наперш павінны пакараць!»

Ірвануўся са строю:

— Таварыш начальнік лагера! Дазвольце...

— Паслухай, Рамэо,— з нечаканай сілаю тузанула мяне за руку старшая піянерважатая.— У цябе сумленне ёсць? Забыўся, што твая маці прапанаваная на ордэн? Хочаш зняславіць перадавіка вытворчасці?

Нясклавіць маму я не хацеў.

— Станавіся ў строй! — загадала злосна.— Пытанне вычарпана.— І дадала з'едліва: — От герой знайшоўся!

Наташу адправілі ў той самы дзень перад ціхай гадзінай пад пільным наглядам фізрука-культурыста. Яна сядзела ў кабіне старой палутаркі і ціха плакала. На гэтай ламачыне, як называў яе кухар, у лагер прывозілі прадукты. Я глядзеў праз мутнае шкло на Наташу і ледзь стрымваўся, каб самому не расплакацца. Горкі камяк падкаціў да горла, калі машына рушыла з месца. «Усё,— падумаў, глытаючы ўзняты ёю пыл.— Жыццю майму — канец».

Да сканчэння змены заставалася амаль два тыдні. Яны мне падаліся годам. У апошнія дні, як абуралася старшая піянерважатая, я зусім адбіўся ад рук: знарок хадзіў за тэрыторыю лагера, заплываў за буйкі, не спаў у ціхую гадзіну. Начамі, схаваўшы пад падушку чорна-серабрысты «ВЭФ», слухаў па радыё Бі-Бі-Сі Севу Наўгародцава. Карацей, нарываўся на скандал. Але мяне быццам не заўважалі. Відаць, дзеля мамы.

У дзень ад'езду я першы ўварваўся ў адзін з аўтобусаў, што прыехалі па нас.

— Ранавата месца запэўніваеш! — падняў на мяне вочы пажылы кіроўца.— Выезд па абедзе. Ваш начальнік абяцаў нас юшкаю накарміць.

«Якая там юшка! — не знаходзіў я месца ад абурэння.— Няўжо не бачыце, што не магу я больш трываць?! Наташа, мілая мая

дзяўчынка, як ты там? Я так даўно не бачыў цябе! О, як я хачу цябе абняць!»

Здавалася, прайшла вечнасць, перш чым аўтобусы нарэшце рушылі.

Усе тры гадзіны дарогі я бачыў за акном Наташу: валасы, якія даставалі амаль да таліі, пяшчотныя падушачкі шчок, вялікія, заўсёды здзіўленыя блакітныя вочы, мяккія, падатлівыя вусны.

«Наташа!» — клічу я.

Не чуе! Усміхаецца, бяжыць да вады. Нешта кажа, паказвае, тлумачыць.

Рэхам далятае нейчы смех. Чый?

Хлопцы і дзяўчаты раскатурхалі: прачніся, соня, прыехалі!

Высадзілі нас там, адкуль забіралі,— каля заводскага Дома культуры. Хоць прыбылі раней, не ў адпаведнасці з графікам — кіроўцы неяк заўсёды выгадаюць час! — сустракала аўтобусы процьма людзей. Шум, смех, радасная гамана: малайчына, паправіўся, загарэў, падрос!

Мама не прыйшла. Яна загадзя паведаміла пра тое ў лісце: «У мяне ўвесь тыдзень — другая змена. Сам разумееш: лета, шмат хто ў адпачынку, замяніць няма каму. Кладу ў канверт талончык на транспарт і рубель на вінаград. Ключы — у цёткі Евы». Гаворка ішла пра суседку.

Іншым разам нястача мамы засмуціла б мяне: мы жылі душа ў душу, не мелі адно ад аднаго сакрэтаў і амаль што не разлучаліся. Але цяпер я быў нават рады, што яе няма. Гэта мне якраз дарэчы: адразу ж, не марнуючы часу, паеду да Наташы. Дзякуй Богу, адрас яе раздабыў. Не ведаю чаму, з якіх такіх памкненняў, але старшая піянерважатая злітавалася і перапісала з атраднага журнала Наташыны арыенціры ў нашым і на той час ужо велізарным горадзе: «Вуліца Сонечная, дом 12, кватэра 7».

Зазірнуўшы яшчэ раз у пакамечаны лісток, хоць і ведаў адрас на памяць, я выскачыў з аўтобуса. Важкі чамаданчык (мама, збіраючы мяне ў лагер, уціснула ў яго амаль што ўвесь мой гардэроб) балюча біў па калене, але гэта нават падганяла — наперад, хутчэй!

Вось і Сонечная! Нумар дванаццаты на тым баку! Ёсць! Пад'езд, вядома, першы. Пераскокваў цераз тры прыступкі. Другі паверх. Кватэра сем! Прыехалі.

Светла-карычневая абіўка дзвярэй была падзелена залатымі плешкамі цвічкоў на роўныя ромбы. Прыгожа! Прыгожа і дорага.

Гэта крыху астудзіла мяне, прымусіла адвесці руку ад кнопкі званка. У тыя гады мала хто дазваляў сабе такую раскошу — абіваць дзверы. «А Наташка, відаць, з багатай сям'і! Хто бацькі? Не казала чамусьці. Можа, не варта турбаваць? Хто я такі, калі падумаць?»

Сумеўся, падняўся на паўпаверха. Прысеў на батарэю пад лесвічным акном. «Раптам яе мама адчыніць? Спытае, што мне трэба?» Ага, не падумаў пра гэта. А такое ж можа быць, што адчыніць маці. Ці бацька...

Але не сядзелася. «Ну і што, ну і няхай адчыніць мама. Чаго баяцца? Я ж не злодзей. Спытаюць, дык і адкажу: разам з вашай Наташай быў у лагеры, яна забылася хусцінку, а я прывёз, вось, калі ласка... Дый не такія ўжо, відаць, яе бацькі вялікія начальнікі, калі дачку з лагера выкінулі».

Пераканаў сябе. Спусціўся, пазваніў. За дзвярыма пачуліся крокі. Не вытрываў, крыху адступіў, напяўся...

Пстрыкнуў замок. Дзверы адчыніліся.

Наташа! І яшчэ харашэйшая як была! У доўгім яркім халаце — проста ўсходняя князёўна!

— Ты? Адкуль? — ступіла да мяне. Пра нешта хацела спытаць яшчэ, але, нібыта апамятаўшыся, паспешліва прычыніла за сабою дзверы. Нарэшце пацікавілася: — Збег з лагера?

Хацелася пахваліцца: так, маўляў, збег, каб цябе хутчэй пабачыць! Але хлусіць не ўмеў. Сказаў як было:

— Збегчы не пасмеў: мог бы нашкодзіць маме. Проста змена скончылася. Я адразу з аўтобуса, во — з чамаданам, нават дадому не заходзіў. Вельмі сумаваў па табе. Думаў, памру,— не стрымаўся, ступіў да яе, замёр, чамусьці не адважваючыся абняць. Засаромеўся нечага?

— Усё з вамі ясненька,— злёгку адхілілася Наташа.— Мама для цябе заўсёды была самая-самая...

Унізе ў пад'езд нехта ўвайшоў. Дыхнула свежым паветрам. Скразняк расхінуў няшчыльна прычыненыя дзверы з выбітай жоўтымі цвічкамі лічбай 7.

— Кроха, што так доўга? Бяжы хутчэй да татачкі! Ён цябе яшчэ чаму навучыць...— У праёме паказаўся высокі станісты хлопец у будатрадаўскай форме.

Не адразу дайшло, хто гэта і які такі татачка. Стаяў, глядзеў і, відаць, па-дурному лыпаў вачыма.

«Не сумавала...— адчуў, як пахаладзела ўсярэдзіне.— Здрадзіла...»

Хлопец убачыў мяне. Хмыкнуў. Перавёў запытальны позірк на Наташу:

— Што гэта за дзіцячы садок?

— Эдзік,— тонкія Наташыны бровы незадаволена ўзляцелі ўгору,— не трэба! Гэта Валік. Мы з ім у адным лагеры адпачывалі...

— Ды ўжо ж бачу, што не ў рэстаране. Пэўна ж, у нармальныя месцы хлопца яшчэ не пускаюць?

— Эдзік, ну годзе табе! Валік хоць і невысокага росту, але вельмі добры і сумленны хлопчык.

«Хлопчык! — адбілася рэхам у галаве.— Добры і сумленны хлопчык!»

— А ты — несумленная!

Адразу я кінуў ёй у твар гэтыя словы ці крыху счакаўшы? Не помню. Відаць, адразу, з ходу сарваліся. На той момант гэта былі самыя крыўдныя і самыя гнеўныя словы, якія маглі прыйсці мне ў галаву.

Выпаліў я іх, павярнуўся і на злом галавы кінуўся ўніз. Целам расчыніў цяжкія дзверы пад'езда. Выкуліўся з ненавіснага дома нумар 12 па вуліцы Сонечнай. Імчаўся, не азіраючыся, не звяртаючы ўвагі, што чамадан моцна б'е па калене. Нічога не бачыў — бег, бег, бег. Уцякаў ад яе і ад усяго. Ад першага пацалунка, ад першых няспаных начэй, ад першых пакутаў сэрца.

Тады я не ведаў, што ад першага кахання нікому і ніколі не ўцячы!

## Пах «Envol»[1]

### I

Надвор'е, як для пачатку кастрычніка, стаяла проста цудоўнае. Цёпла — каля дваццаці, сонечна. Ісці ў вагон не хацелася. Для супрацоўнікаў інстытута турпадарожжа выходнага дня было задарма. Зрэшты, гэта мала турбавала Уладзіміра. Калегі і каляжанкі мо і спакусіліся дармовасцю, а ён? Ліха яго ведае... Але ж падахвоціўся праехацца. І цяпер, перад самай адправай, завагаўся, у нейкай ня-

[1] «Энволь» (узлёт, лунанне). Вельмі папулярны ў СССР у 1980-я гг. дэзадарант французскай фірмы Lancome. Выпрабляўся з 1950-х да другой паловы 1990-х гг. філіялам кампаніі ў Марока.

пэўнасці марудзіў на пероне, узважваў: а ці ёсць сэнс раз'язджаць? Чаго ён не бачыў у той глухмені — Чарнаўцах? Ці будзе там цёпла, каб, скажам, пакупацца? Мо плюнуць на дурноту, пакуль не позна? У гэтым сваім одуме ўжо быў завінуўся ісці дадому, як раптам нехта паклаў яму на плячо руку:

— Паехалі, не пашкадуеш! Я — экскурсавод. Зваць Аляксандрам. Для сваіх — Алекс. Кожныя выходныя важу ў Чарнаўцы вашага брата. Павер, яшчэ ніхто не шкадаваў, што пабываў у тых казачных мясцінах. Будзем жыць у гатэлі ля самага пода скалы. А паветра якое ў гарах! Пі — не нап'ешся! Мазгі ўдвая хутчэй круцяцца! Карацей, не хвалюйся, усё будзе як мага лепш, супер, абяцаю.

«Абяцанкі — цацанкі, а дурню радасць»,— пасміхнуўся сам сабе Уладзімір, але пытанне, ехаць ці не ехаць, для яго было развязана. Супраць чыстага горнага паветра не ставала аргументаў.

Неўпрыкмет яны падышлі да сярэдзіны цягніка, падняліся ў вагон. Экскурсавод звыкла, як да сябе ў кватэру, завярнуў у першае ж купэ.

— Ты прысядзь перад дарогай,— паляпаў Уладзіміра па плячы,— а я прайдуся, пагляджу, што за кантынгент назбіраўся. Кадры, як казаў суровы дзядзечка Джо, вызначаюць усё.

«Добры экскурсавод — вясёлы, свойскі,— падумаў Уладзімір.— Яшчэ не паехалі, а ўжо, лічы што, пашанцавала».

Неўзабаве цягнік зрушыўся. Аляксандр вяртацца не спяшаўся, і Уладзімір зноў схамянуўся: «Усё-ткі паехаў. І як прабавіць трое сутак у глухмені? Піць днямі й начамі? Не лепшы варыянт. А які лепшы? Усё ж дарма паддаўся на ўгаворы. Колькі ўсяго можна было б зрабіць за выходныя! Сітуацыя ў краіне рэвалюцыйная. Перабудова! Хто крэдыты мільённыя вырывае, хто тонамі цукар з рэгіёна ў рэгіён з вар'яцкай дэльтай пераганяе. Некаторыя, нават з табліцай множання не вельмі знаёмыя, да камп'ютэраў сталі неабыякавыя. А ты? Толькі справы ў дыск-кавярні ўгору пайшлі, толькі яна набыла сякую-такую папулярнасць, і на табе — у глухмень. Малайчына! Нічога лепшага не прыдумаў. Няўжо халяўка спакусіла? Даўнавата за прафсаюзныя грошы не ездзіў? З паршывай авечкі хоць поўсці клок?»

Горка-іранічная ўсмешка скрывіла ягоныя вусны. Так, цяпер ён можа і паздзекавацца з сябе: зрабіўся багаценькім. Значыць, з ранейшага і пакпіць не грэх. А калі сур'ёзна, папраўдзе? Дык нешта-такі спакусіла? Прачуванне, быццам у гэтым падарожжы нешта адбудзецца? Нешта здарыцца такое, што пераверне ўсё

13. Зак. 413

ягонае жыццё? Пахітаў скрушна галавою, бы дзівячыся з таго, што ён, напавер, яшчэ зялёны юнак, раз гэтак наіўна верыць ці, прынамсі, спадзяецца на нейкі цуд.

— Зноў захандрыў? — з'явіўся нарэшце Аляксандр-Алекс.— Не пакінуць і на хвіліну! Годзе ўдаваць з сябе пакутніка! Слухай навіны. Зараз павесялееш. Я абышоў вагон, памеркаваў, што да чаго. Нашага з табой брата — ну, ты мяне разумееш — налічыў акурат з дзесятак. Дык пяць на пяць. Аптымальнае, адзначу, умеркаванне. Сабе пару, здаецца, падабраў. Чарга за табой. Параіў бы атакаваць суседку маёй па купэ, але баюся, што яна птушка няўлоўная. Рукі ў золаце, на вушах — брыльянты, адзетая — быццам у Галівуд на ўданне Оскараў зберлася. Дый сама — краля атамная. А пах які ў яе купэ! Нібыта ў парыжскі парфумны магазін трапіў. Галава кругам! Такіх мадам-с у нашых вандроўках не сустракаў. Яна з іншай оперы. Выпадковая, залётная пташачка. Выдае, што збегла ад мужа-мільянера на пару дзянькоў — развеяцца. У народ падацца. Можа, за ёю і пагоня ляціць? Самы, што ні кажы, дэтэктыў на тваіх вачах раскручваецца, а ты — сумуеш. Урэшце, глядзі сам. Бачу, таксама не прасцячок. Джынсы «Levis» — фірма без пытанняў. Красоўкі з трыма палоскамі, як у зборнай Саюза. Адным словам, думай, а я пайшоў збіраць статутны капітал. Трэба ж вас неяк аб'яднаць, згуртаваць, стварыць калектыў аднадумцаў у расслабленні і вясёлым ладзе жыцця. Інакш усю дарогу праседзіце, зашыўшыся ў нумарах. Знаная рэч, праходзілі. Знаёміцца трэба яшчэ ў цягніку, бо маліну могуць перахапіць мясцовыя джыгіты. Усе яны пры грашах. А бабкі каму хоця галаву закружаць. Допінг, які спрыяе збліжэнню ў палявых умовах, сам разумееш, адзіны — віно. І чым больш яго, тым хутчэй збліжэнне. Спраўджана ўжо...

Аляксандр, ён жа Алекс, ён жа Сашка, дастаў са свайго дыпламата пацёртую беспамеравую палатняную сумку і выйшаў.

«Добры экскурсавод,— зноў пахваліў Уладзімір хлопца,— учынны. Іншы на ягоным месцы пачаў бы нешта гамазіць: сёння адпачываем, усе пытанні па прыездзе. А гэты — з ходу ў бой! Малайчына, не лайдачыць. Пашанцавала, што ні кажы».

«Пашанцавала». Слова гэтае чамусьці асела ў галаве і нечым трывожыла. Кажуць, калі пашанцавала спачатку, дык будзе шанцаваць і далей. У чым? У каханні? Як у той славутай песеньцы савецкага баевічка пра белае сонца пустэльні? Дык там жа пашанцавала, здаецца, у смерці, а не ў каханні! Ці наадварот?

Добра было б, каб пашанцавала якраз у каханні, бо апошняе чамусьці абмінала яго. Пэўна што, сам вінны. Занадта высокімі меркамі мераў. Занадта ідэальныя ідэалы вымалёўваў і вышукваў. Вось жа, каб, як у салодкі вір, і на ўсё жыццё! Каб аж дух займала, разрывалася-растаплялася сэрца!

І вусны ў каторы раз зноў перасмыкнуліся — зараз нават з нейкай з'едлівасцю: які ж ён дурань! У трохдзённай пустапарожняй п'янай (вядома ж, не без гэтага!) прагулянцы марыць спаткаць вялікае і светлае каханне! Ах-ах! Святая прастата! Наіўнасць, кажуць, як і дабрыня, аздабляе і нават ці не ратуе свет, аднак часцей за ўсё падводзіць асобнага чалавека.

Алекс не затрымаўся. За ім у дзвярах паказаліся афіцыянт (выдавала адзенне) і двое кавалераў. Уладзімір здагадаўся: з іхнае, мужчынскае, пяцёркі, пра якую казаў яго аднакупэйнік і новаспечаны прыяцель. Пад чулым кіраўніцтвам экскурсавода яны недзе ўжо крыху «прынялі» і цяпер расслабіліся, усміхаліся. Адзін, жвавейшы, з ходу адрэкамендаваўся: «Віктар!» — і прыстукнуў абцасамі, як унтэр-афіцэр у бальшавіцкіх кінастужках. Сыпаў жартамі, іскрыўся весялосцю. Ужо праз хвілінку даверліва казаў Уладзіміру:

— Алекс кажа, ты на мільянерку вока паклаў. Што ж, пану, як кажуць, лепш відаць. Мы сціплейшыя, на каралеў не заглядваемся.

— Не мялі, Віцька, лішняга,— перапыніў жартаўніка Алекс.— Збегай лепш па цыгарэты. Пра курыва зусім забыліся.

— Арганізуем,— памяркоўна адказаў Віцька і знік.

Алекс пазнаёміў Уладзіміра з другім з іхнае пяцёркі:

— Гэта Сяргей.

— Валодзя,— паціснуў ён руку высокаму, русяваму, з дабрадушным тварам хлопцу.— Ну вы, чэрці, і набралі! — ацаніў колькасць выкладзеных на лаўку закусі і напояў.— Імяніны ў каго ці Дзень настаўніка ўздумалі адзначыць?

— У мяне народзіны,— засаромеўся Сяргей.— І зарплату ўчора атрымаў. Так што... Дарэчы, мая мама і праўда настаўніца.

— Не бянтэжся, Сяргейка, тут усе свае,— падбадзёрыў яго Алекс.— А дзе ж наш пяты? — успомніў пра «пяць на пяць».— Голіцца? Бач ты, які ў Віцькі сусед абачлівы. Між іншым, твой канкурэнт, Валодзя. У яго таксама разлік на мільянерку.

— Канчайце, без мяне мяне ажанілі,— незласліва абурыўся Уладзімір.— Чым слухаць вашу балбатню, наведаю лепш тамбур, асвяжуся на халадку.

Выйшаў у тамбур і сутыкнуўся з свежанапарфумленым «пятым» — як ён адразу здагадаўся. «Нішто сабе хлопчык, акуратненькі,— парахаваў.— Бадай што, і занадта. Сапраўды канкурэнт! І, мабыць, небяспечны. Як у яго наконт шэрага рэчыва, інтэлекту, значыць? Трэба паглядзець».

— Добры дзень,— павітаўся Уладзімір.— Думаю, вы з нашых, чарнавіцкіх?

— Але, ваша праўда. Экскурсавод, Аляксандр, здаецца, казаў, што збор у ягоным купэ хвілін праз пятнаццаць. Вас, пэўна што, паслалі мяне з курылкі выкурыць? — скаламбурыў «пяты».

«Не ставала, каб мяне нехта некуды пасылаў». Уладзімір адчуў ці не падкат злосці і адказаў у такім самым лёгка-іранічным тоне:

— Ай-я! Прасілі знайсці каго на падмогу дзяўчатам — стол сервіраваць.

— Што ж, можна і памагчы.— «Пяты» патушыў цыгарэту і прайшоў у вагон.

«Не такі ўжо і змей, дарма злаваўся. І наагул, мужчынская палова, здаецца, на вышыні. А ў дадатак — ніводнага знаёмага»,— ужо зусім супакоена падумаў Уладзімір, зацягваючыся ментолавым «ВОК».

Цыгарэты напярэдадні купіў, без практыкі, як мага даражэйшыя, нават не ведаючы, што за яны, бо курэннем пачаў бавіцца нядаўна, як грошы завяліся. Думаў, даражэйшыя — лепшыя. А тыя, як выявілася, жаночыя, амаль што безнікацінавыя, накурыцца імі нельга. Дык патушыўшы трэцюю, кінуў пачак у тамбурную сметніцу. «Трэба пашкадаваць лёгкія, пакуль не прысмактаўся»,— падумаў сам сабе і вярнуўся ў вагон.

У іхным купэ чуўся гучны смех, раз-пораз яго перапыняў спрактыкаваны барытон гаспадара.

Калі Уладзімір адсунуў дзверы, у формуле «пяць на пяць» заставалася адзіная вакансія.

— Прывітанне!

— Дабрыдзень! — пачуліся галасы.

Адказаў з усмешкай:

— Добры дзень і вам, людзі добрыя! — З паклонам, не надта модна, але элегантна назваў сябе: — Уладзімір.

Абвёў вачыма павесялелую ад першай чаркі кампанію. Пагляд прыліп да дзяўчыны, якая сядзела пры акне. «Тая самая, недасяжная»,— здагадаўся. З ходу адзначыў: «На выгляд гадоў

дваццаць: век — дзяўчыны-жанчыны. Вочы вялікія, сінявата-чорныя, валасы — пышныя, кучаравыя, як у мулаткі, скура — белая, чыстая, вусны, шчокі, нос — усё прыгожае, амаль што ідэальнае. І туман ад Францыі. Хмельны туман. Туман, які паглынае, гіпнатызуе, паралізуе. Няйначай хвалёны "Энволь"».

Яна адчула Уладзіміраў пагляд, злавіла яго, захапіла, спапяліла, скамечыла, стрэліла сваім, упілася, выціснула, як лімон, адпусціла, усміхнулася. «Та-ак,— пагадзіўся Уладзімір з бывалым Алексам,— няўлоўная і небяспечная. Ведзьма. Гэтакіх спальвалі на плошчах. А я заўжды шкадаваў спаленых ведзьмаў. Можа, і дарма...»

Алекс быў шчырым прафесіяналам у сваёй справе, і ноч праляцела — як імгненне. Апамяталіся пад раніцу. Прытарможаныя стомай, заціхлі. Пакрысе распаўзаліся па сваіх купэ. Знаёмства адбылося, хоць пакуль што — агульнае. Пары не сфармаваліся, але пэўнае збліжэнне намеркавалася.

— Для пачатку — няблага,— пазяхаючы, падсумоўваў Алекс, калі яны засталіся ў купэ адны.— Цяпер да вечара — ціхая гадзіна, а там — зноў у бой. Спакой нам толькі сніцца. Сэ ля ві.

Уладзімір на Алексавы высновы і надумы рэагаваў досыць абыякава. Нічога новага пад гэтым белым месяцам. Усё, як і трэба было чакаць, як вядзецца ў дарожных, на скорую руку, застоллях. Хіба толькі адзін вынятак — Марына. Божае стварэнне — пекнаты неймавернай! Сапраўды ідэальнага характва! Якраз такую прагнуў сустрэць, хоць, пэўна ж, і не спадзяваўся, што яны ёсць, існуюць у рэальнасці. Незямное — нябеснае харастово! І сама ці не лепш за іншых разумее: не проста жанчына — багіня! І неначэпна, ледзь улоўна, падкрэслівае гэта, падтрымвае над адмыслова-бездакорнай галавою німб сваёй адметнасці. Нібы кажа: «Глядзіце, цешцеся, аднак жа... Не спадзявайцеся! Не разлічвайце! Не лезьце з прызнаннямі!» Алексава банальнае «сэ ля ві» тут нічога не вытлумачвае: апроч Марыны, ніякага іншага «ля ві» там не было.

Думка абарвалася нечаканым, нават раптоўным Алексавым пахропваннем. Уладзімір схамянуўся, пазайздросціў: «Умеюць жа людзі вось так, легчы і адразу забыцца, заснуць. Шчаслівы чалавек. Нервы — жалезныя».

Але неўзабаве здаўся і сам. Нервы нервамі, а арганізм сваё ўзяў.

Разбудзіла іх правадніца:

— Падымайцеся, хлопцы, а то і памыцца не паспееце. Скора Чарнаўцы.

— Нішто сабе — прылеглі...— цяжка прачынаўся Алекс.— Далі маху! Ды не бяды, на месцы наможам. І ты глядзі, ніхто не разбудзіў. Усё ж ціхая група назбіралася, інтэлігентная. Тэрмінова трэба нешта рабіць. Гэтыя сціпленькія ўвесь адпачынак могуць сапсаваць.

На вакзале Алекса сустракаў ягоны калега і, як відаць, даўны прыяцель з пралетарскім імем Арцём, ці — Малдаван, як ахрысціў яго Уладзімір за чорную чупрыну і вясёлы нораў. Ён і запрасіў іх «крышку праехацца».

— Сядайце, не бянтэжцеся,— адразу ўзяў стырно ў свае рукі.— Шчыра запрашаю ва ўкраінскую Швейцарыю!

Ехалі нядоўга, але і за гэты час шустры ды вясёлы Малдаван паспеў шмат чаго расказаць з гісторыі Чарнаўцоў. Гаварыў і пра свайго славутага земляка. Праўда, Уладзімір, заглядзеўшыся на хараство тутэйшых мясцін і, думаючы нешта сваё, недачуў.

Рассяліў Арцём мінчукоў у двухмесных нумарах. Уладзіміра Алекс, вядома, узяў да сябе. Ён запрыкмеціў яго і прасякнуўся сімпатыяй яшчэ на вакзале ў Мінску, а найболей — у цягніку, калі на пытанне, адкуль бяруць грошы на такі, як у яго, «прыкід», Уладзімір адказаў, што начамі вядзе эксклюзіўную дыскатэку, на якой асноўны кантынгент — прадстаўнікі новага капіталістычнага класа. Тады Алекс рэзюмаваў: «Зразумела, няма пытанняў».

Калі зайшлі ў нумар, камісар Малдаван — спякота, а ён у скуранцы,—звяртаючыся да Алекса, сказаў:

— Добра не помню, але, здаецца, у гэтым нумары ты яшчэ не жыў?

— Твая праўда. І чаму ты спытаўся, здагадваюся. Сёе-тое чуў пра вашага славутага кампазітара.

— Так, Саша. Ён правёў тут апошнія дні. Гуляў безаглядна. Згодна з сваім талентам. Грошай пакінуў! Гэтулькі, пэўна што, не прайшло праз тутэйшую бухгалтэрыю за ўсе гады савецкай улады.

— Вы гэта пра якога-такога земляка-мільянера ўспомнілі? — пацікавіўся Уладзімір.— Раскажыце недасведчанаму, зрабіце ласку.

— Тут, Валодзя, ніякіх сакрэтаў няма. Гэтага чалавека ты ведаеш,— адказаў за Арцёма Алекс.— Помніш, песня некалі была: «Чырвону руту не шукай вечорамі...»

— Дзіва што! Яе ўвесь Саюз некалькі гадоў запар напяваў.

— Дык гэта ён напісаў. І «Водограй» — ягоная рэч, і іншыя.

— Во пра каго гаворыцца! — здзівіўся Уладзімір.— Сумна. Не люблю, калі добрыя людзі раней часу адыходзяць. А што з ім здарылася?

— Загінуў, забілі. У лесе знайшлі. Некалькі дзён праляжаў.

— Якраз такіх і забіваюць! — цяпер ужо гнеўна працягваў Уладзімір.— Шэрасць не зачэпяць. Тыя па сто гадоў няшчасную зямлю топчуць. А як талент, дык давай, рэж яго, заганяй у магілу!

— Супакойцеся, хлопцы. Не трэба пра благое,— паспрабаваў Арцём змяніць тэму.— Вы ж адпачываць прыехалі. Так што — размяшчайцеся. А я зноў на вакзал. Наплыў у гэтую восень як ніколі. Саша ведае, дзе мяне знайсці, калі спатрэблюся. Усё, пабег. Бывайце!

Пазбірацца задумалі ў іхным нумары, найбольшым. Сходзіліся, як даўныя знаёмцы: усмешкі, жарты, узаемныя кампліменты. Напояў розных набралі — хацелася пакаштаваць усяго. І неўзабаве віно мясцовае, а найперш крымскае, зрабіла сваю справу. Добрае віно, як і харошая жанчына, падымае настрой.

Дзесятка падабралася вясёлая, і рогат-смех стаяў нястрыманы. Дзяжурная паверха прыбегла была паабурацца, але, выслухаўшы галантныя Алексавы прабачэнні, а пад тое — ёй нешта перайшло ад яго ў рукі, велічна адплыла на свой пост.

Вядома, кожны расказаў сваю гісторыю, як ён да гэткага жыцця дакаціўся. На падпітку з языкоў злятала такое, што ў іншых варунках не сказалася б і пад прымусам, і спакваля гасцінічны нумар рабіўся для ўсіх родным, агульным домам.

Марыніна гісторыя, сцісла, была такая. Працуе ў інстытуце, які год таму і скончыла. Замужам нядаўна, некалькі месяцаў. Жыве на Бранявым. («Але-але, у тым самым цэкоўскім доме»,— без манернасці адказала на нейчае пытанне.) Свёкар — міністр, муж — начальнік аднаго з аддзелаў Саўміна. Жывуць з яго бацькамі на адной пляцоўцы. У падарожжа выбралася, можна сказаць, выпадкова. Мужава аднакласніца Ларыса паклапацілася, угаварыла яго: адпусці жонку праветрыцца. Засумуе — мацней кахаць будзе. Муж адказаў, што жывуць яны не за царом Гарохам і, вядома, хай галубка палётае крыху ў гарах Карпацкіх. Так Марына апынулася ў Чарнаўцах. «І нікольки не шкадую. Прырода тут чароўная! А дыхаецца! — бліснулі яе вочы.— Быццам нанава нарадзілася. Дзякуй Ларысе. А перад ад'ездам, дурніца, хвалявалася, усю ноч не спала».

— Гэта ты дарэмна,— падняў Алекс чарку.

Калі ён, як кажуць, быў пры абавязку, для яго не існавала аўтарытэтаў.

— Перад такой дарогай трэба адпачываць. І не адну ноч, а ўсе тры. Тры спаныя ночы супраць трох няспаных! Жартую,— удакладніў, злавіўшы запытальны Марынін пагляд.— Адным словам, праехалі. Бачу, ува ўсіх наліта. Малайчына, Сяргей, адразу відаць — імяніннік. Так, за Сяргея пілі. Давядзецца свежы тост адкаркаваць. Слухаем-запамінаем. У аднаго няшчаснага жонка была красуня — вачэй не адвесці, але зусім не ўмела гатаваць, і хлапчына ўвесь час галадаў. У другога небаракі суджанка нарадзілася цудоўнай кулінаркай-кухаркай, але была такая страшненькая, што спаць з ёю трэба было напругі і высілкаў волі, дзеля чаго муж і рабіўся патроху абыякавым, прытым не толькі да яе. Дык вып'ем жа за тое, каб кожны з нас быў негалодным і неабыякавым!

— Лепш за цудоўных дам! Дзеля іх можна і пагаладаць! — падняў келіх Уладзімір.

Здавалася, гулянка ў нумары задоўжыцца да ранку і скончыцца бог ведае чым, але культмасавік Алекс спахапіўся ў час:

— Як вы сабе думаеце, панове, ці не настаў час далучыцца да тутэйшых рэстаранных актывістаў? На свет паглядзець ды сябе паказаць? Я добра мыслю?

— Добра! — выдыхнула кампанія хорам.

— Тады — наперад!

У рэстаране ўсё ўжо было гатова. Напэўна, парупіўся Арцём: ссунуты тры столікі, застаўлены-засервізаваны адмыслова, нават вазы з кветкамі ўзвышаліся. Дагодлівы метрдатэль з усмешкаю да вушэй сустракаў «амаль землякоў» на парозе:

— Сюды, калі ласка, браткі-беларусы, сюды, калі ласка!

Алекс і тут быў на вышыні. Дзяўчат рассадзіў акурат супраць вызначаных кавалераў: даў змогу перад апошнім танцавальным прымеркаваннем глянуць адно аднаму ў вочы. А галоўнае, гэта было ўзважванне перад ураганным надыходам ночы.

Уладзімір, само сабою, апынуўся насупраць Марыны. Так і мусіла быць. Наконт падзелу, акурат такога, згоды дасягнулі даўно. І ўсё ж ён узрадаваўся. Ведаў дакладна: калі ягонае сэрца збіваецца з рытму і няроўна дыхаюць лёгкія — гэта добры знак.

Разагравала, дадавала імпэту не толькі віно, але і музыка. Аркестр раз-пораз падымаў кампанію з-за сталоў. Выдатнымі танцорамі паказалі сябе ўсе мінчукі.

Уладзімір і любіў і ўмеў танцаваць, а таму быў усцешаны спрытам і нястомнасцю землякоў. «Добрую кампанію згуртаваў Алекс»,— зноў, каторы ўжо раз, пахваліў яго.

Мінчукі віхурыліся ды кружыліся ў карусені так, што і не разабраць было, хто з кім танцуе. І Уладзімір падумаў: час выдаць усё, на што здатны, і тым самым канчаткова сцвердзіць сваё права выбару. Скочыўшы ў цэнтр, ён ваўчком закружыўся па паркеце. Быў тады такі модны танец: то на спіне круціцца, перакідваючы тудысюды ногі, то на жываце — досыць складанае практыкаванне.

Усе абступілі яго, заўзята пляскалі ў ладкі, прытанцоўвалі, смяяліся. Усміхнулася і Марына. «Нарэшце! — заўважыў гэта і паддаў сабе пары Уладзімір.— Усяго адна ўсмешка, а пінжака на мне ўжо няма,— раптам падумаў.— Як бы капцы не прыйшлі пінжачку французскаму. І хто каго, скажыце, пачаў першым распранаць?»

Падумаў так Уладзімір і сумеўся. Марына, вядома, паланіла і не адпускала. Але ж і не выказвала згоды. Адзінае, чаго пакуль дамогся,— скупой усмешкі. І ўсё ж вяртаўся за стол з надзеяй. Прылізаны «пяты» пасля ягонага «ваўчка» здаўся і перакінуўся на паўнаватую Святлану, выпускніцу наргаса.

Прызначаны Алексам адказным за «налівай» Віктар выконваў свае абавязкі старанна. А піўся натурпрадукт лёгка, як салодкая вадзічка, і неўзабаве ўсе відочна ап'янелі. Асабліва сам падчашы: ён рупліва спрабаваў напаіць сваю суседку — рыжанькую Наташу, а выйшла — наадварот. Цямілі кепска, але танцавалі — шалёна. Уладзіміраў «ваўчок» завёў нават сціплага імянінніка Сяргея, і той урэшце адважыўся абняць даўганогую Тамару, якая, на яго здзіўленне, толькі гэтага і чакала.

Нечакана музыка абарвалася, і занадта шустры на свае гады саксафаніст, просячы цішыні і ўвагі, пастукаў па мікрафоне і абвясціў:

— Дарагія сябры і госці нашага горада! Канцэртная праграма падышла да свайго фінішу. Мы былі рады граць для вас, але, самы разумееце, час позны, пара расставацца. Дзякуем вам за ўвагу і...

— Ніякіх «і»! — першы зрэагаваў Уладзімір.— Ад імя гасцей горада, гэта значыць ад нашага імя, выказваю вам удзячнасць за

14. Зак. 413

зведаную намі асалоду. Вялікі дзякуй! І, калі можна, адно пытанне: ці магу я пагаварыць з лідэрам групы?

— Чаму не?! — бадзёра адказаў саксафаніст, задаволены тым, што яго назвалі лідэрам групы, а не нейкім там кіраўніком ВІА. Спусціўся, усміхаючыся, са сцэны, падышоў да століка.

— Дружа,— пачаў Уладзімір,— граем — пакуль сядзім, а плацім — з улікам начнага каэфіцыента.

— Сотка! — назваў музыкант максімальную цану і не стрымаўся, дадаў: — Нічога не магу зрабіць: хлопцы стаміліся, на меншае не пагодзяцца.

Ён хацеў яшчэ нешта сказаць, але Уладзімір перапыніў:

— Атрымайце! — і запхнуў пяць дваццацьпятак у верхнюю кішэньку «лідэравага» пінжака.— Для пачатку, здаецца, досыць. Пачынайце з «Червоной руты».— І, павярнуўшыся да кампаніі, спытаў: — Я тую, што трэба, рэч заказваю?

— Само сабою,— ачуўся Алекс, які на імгненне дазволіў сабе асалавець.— Даеш працяг банкету!

— Ага, і што да банкету,— спахапіўся Уладзімір.— Дзе наш слаўны метрдатэль? А-а, вы тут?! Добра... Тады, калі ласка,— стол! Новы! З нуля! Усё меню! Паехалі?

— Паехалі дык паехалі! — хуценька адрэагаваў вымуштраваны метрдатэль.

Два разы ў Чарнаўцах нікому нічога паўтараць і тлумачыць не трэба, і неўзабаве абрус-самабор ажыў, заварушыўся, задыміў гарачым, запах салатамі, засвяціўся садавіной, прыгожымі бутэлькамі і шмат чым яшчэ.

Змена духу адразу дала плён і дапамагла ўсім разбіцца на пары. Засталіся толькі двое беспрытульных: Марына і Уладзімір. Ён разумеў, што гэта той выпадак, калі ахвяра мацнейшая за ката, і перад апошнім раундам трэба прыдумаць нейкі асабліва эфектны манеўр. Які? Ударыць па банку! Пан або прапаў! Спаліць усе масты да адступлення! Штурхнуўшы Алекса, Уладзімір шапянуў яму некалькі слоў, і той, згодна кіўнуўшы галавой, вышмыгнуў за дзверы. Уладзімір сцяўся, чакаючы.

І вось ён настаў, задуманы, вызначальны момант. Да стала манументальна падплыў метрдатэль.

— Нумар люкс для вас падрыхтаваны,— праспяваў і на далоні падаў Уладзіміру вялікую бірульку з маленькім, як ад валізы, ключыкам.

Уладзімір браў ключ, а сам краем вока сачыў за Марынай. «Як яна зрэагуе? Ці не спытае: «Для каго — для вас?» Ці не ўстане, каб з высока ўзнятай галавой пайсці з залы? Узялася за келіх? Не пачула ці робіць выгляд, што яе гэта не датычыць? Маўчыць? — Сэрца ягонае ледзь не вырвалася з грудзей.— Перамога!»

— Дзякую,— выдыхнуў Уладзімір, кладучы бірульку з ключом у кішэнь. Цішэй дадаў: — Ваш даўжнік да канца жыцця!

Але апошнія словы пачулі, і гэта чамусьці стала сігналам да разыходжання. Першы знік з Ларысаю Алекс. За імі неўпрыкмет пайшлі жартаўнік Віктар з Наташаю. Урэшце, падняўся імянiннік Сяргей — з гонарам, нібыта чынячы геройства, павёў з сабою высокую, да пары яму, Тамару. Прылізаны «пяты» паглядзеў на Марыну, уздыхнуў, але знайшоў у сабе сілы ўсміхнуцца, узяць пад ручку пульхненькую рагатушку Свету, кінуць двайм, што не спяшаліся ўставаць: «Удачы!» — і адысці.

Уладзімір і Марына, толькі калі засталіся адны, падняліся.

У супернумар ішлі моўчкі і няспешна, нібыта, не змаўляючыся, ашчаджалі сілы. От і заказаны люкс. Зайшлі. Уладзімір замкнуў дзверы і паклаў ключык у сакрэтную кішэньку пакутнага пінжака — перастрахоўваўся. «А раптам не дагаджу ці яшчэ што не спадабаецца».

Марына паводзіла сябе так, быццам была адна. Ні слова не кажучы, падалася ў лазенку і бясконца доўга мокла пад душам. Вымучыла Уладзіміра дарэшты. Калі выйшла, ён быў такі зараджаны, што не ўсё цяміў. Адважыўся. Абняў яе, падхапіў на рукі, панёс да ложка. Асцярожна паклаў. Лёг побач. Не мог стрымаць дрыжыкаў: вельмі ж прыгожая была Марына, не верылася.

Яна ляжала з заплюшчанымі вачыма, пра нешта думала. «Пэўна што, не пра мяне»,— змеркаваў Уладзімір.

Знячэўку павярнулася на бок, як бы дэманструючы сябе, і спытала:

— Ты з такой, як я, спаў?

— Не,— адказаў шчыра Уладзімір.— Гэткіх вышыняў браць не даводзілася.— А нутраны голас дакінуў: «Можа, таму і жывы?»

Зноў — цішыня. Ён успомніў амаль што дзіцячае: маўчанне — знак згоды. Асмялеў, перасіліў сябе, спытаўся:

— А ты?

— Я, апрача мужа, ні з кім не была.— Марына паглядзела яму ў вочы.— Кажуць, што ён харашун, якіх мала. Не ведаю. Ведаю

галоўнае: не любіць ён мяне. Часам здаецца, што прычына ў арыентацыі...

«Неяк надта ж цвяроза разважае,— захваляваўся Уладзімір.— Так можна і перагарэць. Пара атакаваць».

Атакаваць не давялося. Павярнуўшыся да Марыны, убачыў: яна — палала. Ярчэй за яго. Шмат ярчэй!

І тады ён выбухнуў. Доўгія хвіліны чакання, пакуль Марына была ў лазенцы, страх, што ўсе намаганні застануцца марнымі, плюс аграмадны «завод» ад яе непраўдападобнага хараства зліліся ў адно, увайшлі ў рэзананс, і... Уладзімір панёсся, памчаў, паляцеў — забыўся на ўсё на свеце.

Гэта было нешта на мяжы чалавечых сілаў. Здавалася, ажылі два вулканы, і лава аднаго намагалася паглынуць лаву другога.

Зацішак, што надышоў разам з світанкам, здзівіў. «І як выжыў, вытрываў, змог?! — не верыў Уладзімір.— Сёмае неба! Цяпер я ведаю, што такое ўзысці на сёмае неба! Гэта калі бярэш планку, у жыцці для цябе немажлівую, недасяжную...»

Разбудзіў стук у дзверы. Уладзімір расплюшчыў вочы. Разгледзеўся. Марыны побач не было. Дзе яна? Пайшла?! Не! У лазенцы святло.

Ахінуўшыся прасцінаю, падышоў да дзвярэй:

— Алекс, гэта ты спаць не даеш? Мы ж не ў цягніку, свой прыпынак не праедзем,— абурыўся, адчыняючы дзверы.

— Салют, салют!

— Добрага ранку!

— Затаіліся, суб'екцікі?! — уварвалася за Алексам уся вясёлая кампанія.

— Сюрпрыз маладажонам! — выступіў наперад Віктар.— Рада брыгады пастанавіла: сёння ж гуляем вяселле!

— Што вы, хлопцы? Цішэй! Марына пачуе, дык дасць вам вяселле, а заадно і на арэхі.

— Ты чаго гэта? — выйшла з ваннага пакоя Марына.— Пазабаўляўся з дзяўчынай, а цяпер адмаўляешся ад яе?!

— Не адмаўляюся! — з радасцю, зусім па-хлапечаму адгукнуўся Уладзімір.— Хіба ад багінь адмаўляюцца? І марыць пра такое не мог.

— А я марыла,— зусім сур'ёзна перабіла яго Марына.— Пра такога, як ты! Прыгожага, дужага, добрага!

— Во так, Валодзька, трапіў ты ў нерат,— узрадаваўся чамусьці Віктар.— Здавайся, калі прайграў, будзь рыцарам.

Пра рыцараў была першая кніга, прачытаная Уладзімірам гадоў у шэсць. Ён заўсёды быў за рыцараў. Гуляць дык гуляць! Тым больш на ўласным вяселлі!

— Здаюся, што з вамі паробіш! — усміхнуўся Уладзімір.

— Тады за мной! — імгненна зрэагаваў спрактыкаваны Алекс.

Не бавячы больш часу, кампанія выправілася ў рэстаран. Уладзіміру зноў давялося раскашэльвацца. Другая гульба ў рэстаране нагадвала першую, з выняткам таго, што танцы былі не калектыўныя, а парныя. Да ўсіх прыйшла нязвычная, проста безаглядная раскаванасць — ніхто нікога не саромеўся. Праўда, чамусьці цалаваліся і абдымаліся ўсе, апрача маладых. Новым сябрам удалося падняць іх на «горка» толькі раз. Пацалунак атрымаўся такі задоўжаны, што паўтарыць яго маладая не адважылася.

Разбегліся недзе апоўначы. Гуляць пазней сілаў не было. Што ні кажы, а надходзілі трэція няспаныя суткі.

Рэшту тае ночы Уладзімір правёў... у раі. Так-так! У раі яе цела — пяшчотна-цнатлівага, даверліва-смелага, полымна-спапяляльнага. Яно атуманьвала «Энволем», адбірала розум.

Ранак выдаўся хмурны і тужлівы. Пэўна што, дзеля салідарнасці з сябрамі, засмучанымі блізкім расстаннем.

У аўтобусе гамоны спакваля перайшлі ў шэпты, а на момант сядання ў цягнік і зусім скончыліся. Нават няўрымслівы Алекс прыціх.

Уладзімір сядзеў насупраць Марыны і не зводзіў з яе вачэй. Ён захлынаўся ад кахання, жадання, шчасця і не зусім разумеў, дзе знаходзіцца, што вакол адбываецца. Адчуваў толькі яе пагляд. Быў яго нявольнікам. Належаў яму. Ён пакахаў Марыну, пакахаў больш за жыццё...

Мінск сустрэў іх страшэннай залевай. Уладзімір не заўважаў яе. Глядзеў, як аддаляецца таксі, у якое села Марына.

«Усё,— уздыхнуў,— казка скончылася. Яна нават не азірнулася».

## II

Першыя дні ён чакаў званка, але потым успомніў, што ў спеху забыўся даць нумар тэлефона Марыне. Зрэшты, не забыўся. Ён проста разгубіўся пры развітанні. А цяпер кусаў сябе за локці.

Штоночы Марына снілася, стаяла перад вачыма, але... Надходзіла раніца, пачынаўся новы дзень, неадкладная работа — і ў інстытуце, і ў дыскатэцы,— адсоўвала ночныя мроі на другі план, засланяла іх, прытупляла. Паступова жыццё ўвайшло ў сваю звычную каляіну, стала, як і раней, ціхім, аднастайным. Але нешта ў душы не давала спакою. Яна нібыта працівілася шэрай будзённасці. Жыло ў ёй нейкае прачуванне, ці што?

Казка, пережытая ім у Чарнаўцах, не забывалася. Аднак жа ўсё часцей з нейкай тужлівай наканаванасцю думаў пра тое, што гэта была сапраўды ўсяго толькі казка, якая наўрад ці паўторыцца. Нікому, нават найбольшаму шанцуну не суджана такое шчасце. Адсюль і прысуд: не спадзявайся і не чакай! Скажы дзякуй і за тое, што было,— не кожнаму і яно выпадае. Усе мы занадта грэшныя, каб назаўсёды трапіць у рай. Суцешся тым, што зведаў яго.

Прыходзілі і думкі іншага складу-ладу. Маўляў, чаго ты нудзішся, быццам страціў ні больш ні менш як самога сябе? А чаму не дапусціць, што гэта была прыемная, памятная, нават незабыўная, але ўсяго толькі дарожная прыгода? У дарозе чалавек разняволь-ваецца, вызваляецца ад усялякіх путаў збрыдлага жыцця і лёгка спакушаецца ўсякай магчымасцю адхлання, стоць галавой кідаецца ў прымроены вір пачуццяў ды ўчынкаў, зусім недапушчальных, неверагодных у жыцці, што засталося недзе там, ззаду, за плячыма, на другім канцы чыгуначнай калейкі ці стужкі шашы. Вось гэтак і ты: выпадкова, знячэўку трапіў у прыгожую дарожную казку. Але ж дарога скончылася, а дакладней, вярнулася да свайго пачатку. І ўсе, хто быў у дарозе, таксама вярнуліся да самых сябе. І яна вярнулася да таго, ад чаго збегла на некалькі дзён развеяцца. Урэшце, вярнулася да мужа, якога, магло здарыцца і такое, пачала кахаць па-сапраўднаму — моцна і верна. А на цябе, выпадковага ўдзельніка іскрыста-вясёлай, разбязуранай дарожнай інтэрмедыі, даўно забылася.

Уладзімір такія думкі гнаў прэч. Не пагаджаўся. Бо інакш чаму неспакойна ў яго на душы, чаму як быццам жыве ў ёй прачуванне чагосьці? Як і тады, перад ад'ездам з Мінска, калі вагаўся, ехаць ці не ехаць у тыя загадкавыя хіба сваёй назвай Чарнаўцы.

І аднойчы — званок празвінеў. У кожнага ў жыцці калі-нікалі звініць такі званок.

— Зусім забыўся на Алекса! А ён усё памятае. І чыйсьці дзень нараджэння памятае. І абяцанне запрасіць на яго ў госці! Алекс

усё памятае, не раўнуючы як некаторыя. І калі гара не ідзе да Магамета...

— Што за наезды? — улучыўся ў гульню Уладзімір.— Кінуў мяне на волю лёсу — і бочкі коціш?! Якім, дарэчы, ветрам у сталіцы? Праездам з Парыжа, у сэнсе, з Чарнаўцоў?

— Давай жартуй, небарака,— працягваў атаку Алекс.— Спі, спі! Так усё жыццё і праспіш! А тым часам некаторыя патрабуюць працягу банкету. І сёння гэтыя некаторыя надумалі яго наладзіць! Карацей, чакаем а сёмай у «Камянях». Чысці пёркі! Не так шмат часу засталося. І ні пра што не пытайся. Усё роўна нічога не скажу. Салют! Канец сувязі!

— От змей! — абурыўся Уладзімір.— Разбудзіў, заінтрыгаваў, завёў і павесіў трубку. Малайчына! У сваім амплуа.

У рэстаран Уладзімір думаў зайсці ціхама. Цікава ўсё ж было даведацца, хто гэтыя «некаторыя». Але хітрун Алекс пераняў яго яшчэ пры ўваходзе. З падазронай ветлівасцю дапамог здаць у гардэроб куртку, узяў за руку, папрасіў перад уваходам у залу заплюшчыць вочы.

— Ну вы і даяце! — не стрымаўся Уладзімір, калі ўбачыў за сталом усю цёплую кампанію.— От сюрпрызёры! Так і разрыў сэрца можна атрымаць! — пачаў і знямеў: за сталом сядзела Марына.

«Божа! Гэта і праўда яна! Душа — не памылялася. Не было гэтых тыдняў і месяцаў ростані. Я толькі ўчора сказаў ёй: да сустрэчы, любая! У Чарнаўцах была не казка. У Чарнаўцах я пакахаў! Упершыню! Моцна! Назаўсёды! Марына — мой лёс, мая радасць, маё шчасце!»

Яна была фантастычна прыгожая! Яўна надумала перасягнуць сябе тую, чарнавіцкую. Багіня! Уладзімір зразумеў, што не можа жыць без яе. Ды ён без яе і не жыў. Чакаў. Увесь гэты час чакаў! І дачакаўся! Ён — кахае! Свет перавярнуўся, перакуліўся, пакаціўся. Уладзімір адчуваў, што лунае над прорваю разам з ёй, баючыся яе і згараючы ад кахання. Што ж, хай згарыць, няхай зваліцца ў бездань — ён усё роўна будзе ўдзячны лёсу.

І каханне іх павяло.

Яны пайшлі з рэстарана раней за ўсіх. Не вытрывалі, збеглі!

Таксіст ленавата патлумачыў, што па адзінаццаці менш чым за два лічыльнікі з месца не скранецца.

— Тры! — засмяяўся Уладзімір.— І едзьма за горад. Будзем шукаць гасцініцу, дзе прымаюць мінчукоў.

— Завязу хоць за блізкі свет,— выскачыў таксіст з машыны, каб адчыніць Марыне дзверцы.

І Уладзімір заплаціў тры лічыльнікі. Заплаціў дзяжурнай у міжнародным цэнтры адпачынку «Юнацтва», заплаціў раніцай у рэстаране за «вечаровы» стол.

Пасля сняданка Марына дадому не паехала, засталася з ім. І Уладзімір не задаваў пытанняў — прыняў яе волю як належнае. Іншага не ўяўляў. Не прыходзіла да галавы.

Ён вярнуўся ў казку. Ужо амаль не спадзеючыся на тое. Ды падкочваў пад сэрца ледзь улоўны трывожны халадок. Ад усведамлення, што кожная казка мае не толькі пачатак, але і канец, няхай сабе, часцей за ўсё, і шчаслівы. А ён не хоча, каб казка канчалася. Ён зробіць усё, каб іхная з Марынай казка доўжылася без канца. Толькі наўрад ці ўсведамляў, што абраны ім шлях — не самы пэўны. Хутчэй наадварот — найзгубнейшы, нават трагічны.

Уладзімір самахоць — шчасце сляпое! — здумаў доўжыць тую самую, чарнавіцкую, ува ўсіх яе адметнасцях і нюансах, казку. Скласці, прыдумаць новую — паленаваўся, а хутчэй за ўсё — не задумаўся пра яе патрэбнасць. І каханне іх, на жаль, не павяло — панесла.

Рэстараны змяняліся рэстаранамі, сталы прагіналіся ад заказанага: «Усё меню!»,— ансамблі мяняліся, як пальчаткі, таксісты расказвалі легенды.

Ён плаціў, плаціў і плаціў. Плаціў швейцарам і афіцыянтам, фарцоўнікам і метрдатэлям. Спускаў усё заробленае ў кавярні, хоць і зарабляў нямала. Установа была найвышэйшага класа. З дапамогаю найлепшай у горадзе спадарожнікавай сістэмы Уладзімір «даставаў» амаль недасягальны амерыканскі сатэліт, з якога высысаў апошнія навіны музыкі і кіно. Кухара адшукалі сярод старых, саўмінаўскіх, ці не з першай саюзнай дзесяткі. Дызайн залы і бездакорнае абслугоўванне маладых афіцыянтак, надзейная ахова — усё вышэйшага рангу. Адным словам, ад кліентаў адбою не было. Грошы плылі, можа, і не ракою, але ручаінай досыць бойкай. Плылі — і сплывалі.

Карацей, жыццё не кацілася, а мчала. Усё было прыгожа, весела, шыкоўна. Шчаслівы, Уладзімір лунаў на сёмым небе і не думаў прызямляцца. Настрой — цудоўны, дух — баявы, сілаў — процьма. Ён — у раі. Ёсць Марына — яго мара, яго найцудоўнейшы сон, яго фантазія, каханне, надзея.

Так праміну́ў год. Год любові і лёту. Год, які зблытаў у адно дні і ночы. Год-імгненне.

Уладзімір збольшага помніў, як пачынаўся іх апошні дзень. Так, так! Пасля таго дня жыццё скончылася, зноў вярнулася існаванне. Шэрае, ціхае, збрыдлае.

Дзень той быў асаблівы — 8 Сакавіка.

Як заўсёды, ён патэлефанаваў у рэстаран, даў ведамасць, што прыедзе. Нешта заказваць патрэбы не было: там усё ведалі і памяталі. Сустрэцца дамовіліся ў дзевяць. У жаночы дзень у зале пераважалі жанчыны, і гэта дадавала мужчынскай палове пэўнасці сваіх сілаў. Няспешная хада. Усмешлівыя твары. Бадзёрыя галасы.

Найбольш вылучаўся малады лупаты азербайджанец у чорным скураным пінжаку і аранжавай байцы. На яго азіраліся амаль што ўсе вінавайцы свята, а ён не зводзіў вачэй з адной, з Марыны. Ён таксама хацеў узяць сваю планку.

Марына не магла не заўважыць гэтага.

Нічога не заўважаў толькі Уладзімір. Каханне, якое завалодала ім яшчэ з апошняга прыстанку аўтара «Червоной руты», кружыла галаву, рабіла жыццё сапраўды казкай.

Уладзімір не разумеў, што з ім. Недзе пад дванаццаць гадзін адчуў неймаверную стому — быццам усе ранейшыя няспаныя ночы акурат сёння каменем наваліліся на яго. Гэтак, пэўна што, і было.

— Марына, можа, паедзем дадому? Нешта я не ў форме. Вочы зліпаюцца.

— Валодзечка, вазьмі машыну і едзь. Не паспееш нагрэць пасцель, як і я прылячу. Зараз пачнецца апошні танец «З адным крылом». Я вельмі люблю гэтую рэч!

— Добра.

Адказаў няйначай машынальна, не ўсведамляючы, чаму так зрабіў. Толькі пасля, праз колькі гадзін, зразумеў: ягонае папушчэнне — не што іншае, як насланнё, амана. Ён жа цудоўна ведаў: такой дзяўчыне, як Марына, наўрад ці дадуць проста паслухаць музыку.

А Марына? Яна, вядома ж, заўважыла харашуна-азербайджанца. Ну й што? Ёй было смешна: ну-ну, паглядзі, паторгайся. Спакуслівая Маша, ды не ваша!

Але здарылася інакш. Вірлавокі красунчык гіпнатычным паглядам дамогся яе згоды на танец, закружыў і...

«Без меня тебе, любимый мой, лететь с одним крылом...»

Чым больш Марына кружылася ў танцы, тым больш у яе кружылася галава і туманілася думка. Віно, потым каньяк шматкроць узмацнілі гэтую аману, і Марына няўхільна і спакваля адыходзіла ў свет казачных ілюзій і чароўнага падману. Яна кружылася, кружылася-п'янела яе галава і, сп'янелая,— усё больш штурхала яе ў вір танца. Вось ужо сціхла мелодыя, пайшлі адпачываць музыкі, а Марына ўсё ляцела і ляцела, ахутваючы ўсіх і ўсё чароўным водарам «Энволю». Яе вялізныя вочы гарэлі шчасцем, вусны нешта ціха і нястрымна шапталі. Зала нібы зачараваная глядзела на адзінокую пару, якая танцавала ў цішы.

Уладзімір спаў як забіты і званка ў дзверы не пачуў. Разбудзіў тэлефон, што ляжаў побач.

— Алё,— адказаў спрасонку. Пачуў кароткія гудкі і кінуў трубку.— Каб на вас трасца, жартаўнікі пустагаловыя!

Але гэта былі не жартаўнікі. Гэта быў не жарт. Побач не было Марыны! Нешта здарылася? Што?

Зноў званок. Гэтым разам званілі ў дзверы. Уладзімір зірнуў у вочка: Марына. Усміхаецца. Адчыніў. Марына кінулася да яго, абняла, пацалавала. Доўга не давала ўздыхнуць. Нечакана заплакала.

— Я так знудзілася за гэтую ноч! Думала, да раніцы не дажыву.

— А што здарылася? — пачаў прачынацца Уладзімір.— Чаму пасля рэстарана не прыехала?

— Падумала пераначаваць у мамы, яна ж за два крокі ад «Камянёў» жыве. Не хацела цябе непакоіць. Ты быў такі стомлены, і я падумала: не паеду, хай адаспіцца.

— Непакоіць? Мяне? Але ж ты ведаеш, што я заўсёды рады цябе бачыць! Я кахаю цябе! Не магу без цябе! Люблю, калі мяне непакоіш! З табою я заўсёды...

— Валодзечка, не будзем пра гэта. Пойдзем у ванну. Зараз жа! Я хачу ў ванну. Я хачу цябе!

Уладзімір не пазнаваў Марыны. Яна, зазвычай стрыманая напачатку, кінулася да яго, як сабачанё:

— Мой! Нікому не аддам! Кахаю, кахаю, кахаю! Толькі цябе!

Уладзіміру гэта падалося дзіўным. «Чаму «толькі цябе»? А што, ёсць яшчэ хто?» — мільганула трывожная думка.

У мала непрытомным стане яны вылезлі з ванны, дапаўзлі да пасцелі і адразу забыліся.

«Зноў гэты пракляты званок? — адкрыў вочы Уладзімір.— Нехта нахабна выпрабоўвае маё цярпенне».

— Алё! — закрычаў у трубку.— Калі ты, дурань, не перастанеш...

Голас з трубкі перабіў:

— Валодзя, супакойся, гэта я, Лёва, сусед. Чаго разышоўся? Дзеля цябе ж званю, а ты крычыш. Спусціся, пагаманіць трэба. Сур'ёзна!

Уладзіміру не хацелася ўставаць, але ён перасіліў сябе і падняўся. «І што яму трэба?» — гадаў, ідучы да суседавых дзвярэй.

Дзверы расчыніліся, як толькі ён да іх падышоў.

— Заходзь, дружа, заходзь. Зараз пабачыш, што сапраўдныя сябры і ў бядзе застаюцца сябрамі.

— Гэта ў якой яшчэ бядзе? — здзівіўся Уладзімір.— Ты пра што?

— Гора ў цябе, Валодзя, вялікае гора! Марына, каханне тваё мілоснае, здрадзіла табе.

— Ты разумееш, што вярзеш?! — ускіпеў Уладзімір.

— Паслухай спачатку. Тады будзеш шумець.— Лёва самахоць адступіў назад.— Ты ж ведаеш, я сава і кладуся не раней як у тры ночы. Дык вось, столькі і было, калі пачуўся званок. Гляджу ў вочка — Марына. Думаю, можа, яе хто пакрыўдзіў ці з табою што здарылася, можа, дапамога патрэбная... Адчыніў. Гляджу, а яна не адна. З цыганом ці з грузінам — я ў іх не разбіраюся. Усміхаецца. От табе, думаю, і сюрпрыз. А яна ўзяла таго грузіна за руку, упілася ў мяне вачышчамі і кажа: «Лёва, як бы табе растлумачыць? Карацей, ёсць прапанова. Мы ў цябе пабудзем гадзінку-другую, а ты атрымаеш за гэта сто — сто, Лёва! — рублёў. Ты не хвалюйся, гэта Валодзеў кампаньён». Як я мог не пагадзіцца? Я за месяц маю дзевяноста, а тут за пару гадзін сто! Ты павінен мяне зразумець! Ты не можаш крыўдаваць. Яна ж сказала, што грузін — твой добры знаёмы і яны толькі пачакаюць цябе. Я ж не ведаў, што будзе далей... Не глядзі на мяне так. Што цяпер паробіш? Гэта ўсё Марына твая! Ты даруй мне, Валодзя, даруй! Купілі яны мяне з вантробамі. Сто рублёў...

Сэнс суседавых слоў Уладзімір спачатку не зразумеў, падумаў, што ўсё тое ашуканства. Але, убачыўшы вырачаныя вочы, плямы поту на лысым чэрапе, зразумеў: яго знайшла, падпільнавала, напаткала бяда. Абрынулася, задушыла, загубіла. Марына больш не ягоная. Марына — здрадзіла. Марына — прадала. Але ж Марына кахала?! Таму і наладзіла ў ваннай сеанс на мяжы выжывання. Толькі цяпер да яго дайшло.

Уладзімір не падзякаваў суседу за падказку. Чорную паслугу той зрабіў. Здаў Марыну, іхнае каханне, жыццё, усё. Не было слоў. Знямелы, вяртаўся да сябе.

Марына сядзела на ложку. Убачыла і адразу скеміла: ён ведае. Значыць, усё гіне, усё ляціць у апраметную. Прачытала гэта ў ягоных вачах. Але не кінулася ў роспач. Пастанавіла змагацца, утрымаць Уладзіміра. Зараз ці ніколі. Упала на калені.

— Валодзя, што мне рабіць? Што мне зрабіць, каб ты дараваў? Валодзечка, ён мне нечага падсыпаў! Я нічога не разумела. Усё было як у сне. Ачулася, толькі калі... Я адразу яго адштурхнула. Спытай у гэтай свалаты, суседа свайго. Навошта ён нас пусціў? Ён жа твой сябра! Валодзечка, я нічога не разумела! Валодзечка!

— Марына, не трэба! Гэта — канец! Я не ўяўляю, як буду жыць далей, я ж кахаю цябе. Але адно ведаю дакладна: дараваць — не змагу! Я хацеў бы, вельмі хацеў, але... Гледзячы на цябе, я заўсёды буду думаць і ўяўляць, як ён, чужы, абдымае цябе, цалуе, спаталяе з табою сваю жарсць. А ты — гэта я. Значыць, ён трахнуў мяне? Ён адтрахаў мяне, Марына! А ты... Ты разбіла нашы жыцці. Ты разбіла нашы лёсы! Ты разбіла наша каханне! Усё, досыць! Дай мне пабыць аднаму, дай мне спакойна...

— Валодзечка,— рыдала Марына,— што мне зрабіць, каб ты дараваў? Хочаш, я...

— Калі ласка, напрамілы Бог, не прыніжайся.

— Валодзечка, ты не хвалюйся, ты толькі не хвалюйся. Я пайду, я зраблю ўсё, што ты захочаш. Я буду чакаць цябе ў... пад'ездзе. Колькі трэба, столькі і буду чакаць. Але я не магу пайсці назаўсёды! Я не магу.

Мінулі два дні. Уладзімір не выходзіў з кватэры, не адказваў на званкі тэлефона і на званкі ў дзверы. Гэтым разам у дзверы пастукалі.

— Валодзя, гэта я, суседка, баба Лена. Адчыні, калі ласка.

Ён неахвотна павярнуў ручку замка.

За спінай бабы Лены рыдала Марына.

— Валодзя, ты ж добры чалавек, пашкадаваў бы дзяўчыну,— узяла суседка яго за руку.— Павер мне, старой: людзям трэба дараваць. Нельга затойваць злосць. Марына не спецыяльна гэта зрабіла. Так выйшла. Яна цябе кахае. Любіць больш за жыццё! Вось што

галоўнае! Марына мне ўсё расказала. Яе нечым апаілі. Яна не можа без цябе. Бог гаворыць...

— Баба Лена,— перапыніў Уладзімір суседку,— Бог тут не паможа. І адвакат не паможа. Ніхто не паможа. Я не магу прымусіць сябе. Я спрабаваў — не магу!

Марына начавала і днявала ў пад'ездзе яшчэ двое сутак. Суседкі паілі яе гарбатай, супакойвалі, званілі да Уладзіміра на кватэру. Ён не адказваў.

Раніцай на пятыя суткі Марына падышла да ягоных дзвярэй:

— Даруй, Валодзя. Я зразумела, як табе балюча. Зразумела па сабе. Я пайду. Буду чакаць твайго званка. Прашу, пазвані, дай мне апошні шанец. Не адбірай надзеі. Я ведаю, што ты чуеш, адчуваю гэта, адчуваю цябе, кахаю. Пазвані!

Але Уладзімір не пазваніў.

Ён не даў ёй шанцу, як не даў шанцу і сабе. Ён не мог даць таго, чаго ў яго не было. Ён не хацеў усё жыццё глядзець на Марыну, а бачыць красунчыка ў чорным скураным пінжаку і аранжавай байцы.

Ішлі дні. Марына не званіла і не прыходзіла. Ад Алекса Уладзімір даведаўся, што дзень і ноч яна чакала ад яго званка і, не дачакаўшыся, кінулася з роспачы ў гульбу па рэстаранах, дзе яны некалі былі разам. І рэстараннае жыццё засмактала неўпрыкмет Марыну. Яна любіла танцаваць. І яе запрашалі. А калі кружылася ў абдымках чарговага кавалера, бачыла ў ім Уладзіміра. Бачыла яго і пазней, калі спакуснік абдымаў яе, вёз дадому, забаўляўся з ёю. Але рэстараннае жыццё ёсць рэстараннае — п'янае. І паступова Марына кацілася ў бездань.

Уладзімір папрасіў зважыць кілаграм вінаграду і міжволі паглядзеў на суседнюю прадаўніцу: чым гандлюе тая? Пабачыўшы яе профіль, адразу адвярнуўся. Хуценька ўзяў пакунак з вінаградам і, забыўшыся на рэшту, адышоўся ўбок. Стаў за вусатым апельсіннікам, зноў паглядзеў.

Яна!

Яна паклала на вагу абрыкосы. Азірнулася, адказала на нейкае пытанне азіята, што сядзеў у яе за спінаю. Той зноў нешта спытаўся. Яна зноў павярнулася. Гэтым Уладзімір скарыстаўся і памяняў пазіцыю — схаваўся за стэндам прадаўца відэакасет. Глядзеў. Няўжо яна?!

Яна!

Бедная! Адчула пах «Энволю». Заціхла, выпусціла з рук цыгарэту. Паглядзела налева, направа. Удыхнула, пацягнула носам паветра: так, «Энволь»! Той, не мужчынскі і не жаночы, асаблівы. Яна помніла гэты пах: неадменны, салодкі, пякучы, вабны. Пах удачы, прыгожага жыцця, моцнага маладога цела, зіхатлівых вачэй, асалоды. Іх пах!

О цудоўны, дзіўны, чароўны «Энволь»! Колькіх ты абудзіў, адрадзіў, узвысіў, ашчаслівіў! Колькіх уратаваў у хвіліны роспачы, колькіх узнёс да нябёсаў!

О прокляты, ненавісны, бязлітасны «Энволь»! Колькі жыццяў ты скамечыў, скруціў, знявечыў! Колькі загубіў надзей! Колькіх загнаў у магілу!

«Гэта Валодзя! — бліснула ў яе свядомасці.— Ён тут. Валодзя! О Божа! Уратуй! Даруй і ўратуй! Я паміраю. Я без цябе паміраю! Як мне кепска без цябе! Валодзя, гэта твой пах, я ведаю, твой! Дзе ты?»

— Ты чё, заснула? — прыкрыкнуў на яе чорна-шэры нятолены азіят.— Чэлавек трэты раз «сколькі за абрыкос» спрашываэт, а красавіца аглохла! Прасныс, дура, работат нада!

Марына прывыкла да ягоных зняваг і не зважала на іх. Дома яе чакала дачка. Яе радасць і ўцеха — кволая Волечка. Яна часта хварэла. Дактары казалі: вітаміны, вітаміны, вітаміны. Шмат вітамінаў. А яны каштавалі грошай. У інстытуце на вітаміны не заробіш. І Марына пайшла на службу да гэтых. Яна цярпела іх, смярдзючых, хцівых, злых: дэньгі, дэньгі, дэньгі. Цярпела здзекі, цярпела іншае. Галоўнае — дачушка. Яна прыйдзе дадому, памые садавіну, дасць малой і будзе глядзець, як тая «за кампанію» ўгаворвае падаравнага бабуляй катка:

— Калі не будзеш есці, не вырасцеш такі вялікі, як я.

Потым прыйдзе ноч — яе збаўленне, слёзы, адчай, успаміны. Прыйдзе пах «Энволю».

Дзеля дачкі Марына жыла, цярпела, пакутавала, нікога, апрача яе, не заўважала.

— Аглохла, а?

Яна ачулася ад воклічу гаспадара.

— Заткніся, гніда! — кінула.

Азіят разявіў рот. Ён не чакаў такога і, агаломшаны, прыціх.

«Дзе ж Валодзя? — шукалі яе вочы.— Пах жа... Мне не здалося. Ягоны пах. Дзе ж ён? Дзе маё каханне, дзе? Я вымалю дараванне! Не адпушчу сваё шчасце. Учаплюся ў яго. Намёртва ўчаплюся! Назаўсёды! Каб жа знаць, што без цябе мне не жыць! Я не змагла выпрасіць у цябе даравання! Стаяла на каленях, каялася. Цяпер я ведаю — гэтага мала. Ты шмат даваў, але і патрабаваў нямала. Не, не так. Ты аддаваў сябе і патрабаваў наўзамен мяне — усю, дарэшты. Цяпер я зразумела: здрада сплачваецца жыццём. Я дакажу, што гатова на смерць! Ты паверыш, што я ніколі не зірну на іншага, што ў свеце для мяне заўсёды, вечна будзе толькі адзін мужчына — ты! Інакш хай Бог выпаліць мае вочы! Ты даруеш! Злітуешся і даруеш! Ты не зможаш не дараваць, калі ўбачыш, як я кахаю цябе, як не магу без цябе, як пакутую, гіну, як засмоктвае мяне балота, бруд. Ты паверыш, што я больш ніколі не спатыкнуся. Тады проста быў зрыў, выпадковасць. Я расслабілася, забылася ўсяго на імгненне, і яно сталася канавым. Цяпер я ведаю, што страціла. Я дорага заплаціла за здраду. Дванаццаць гадоў адна. І згодна заплаціць жыццём, толькі дазволь быць побач з табою і памерці ў цябе на руках. Дзе ж ты, дзе?»

Марына круціла галавою, вейкі дрыжэлі, шчокі палалі. Гаспадар глядзеў на яе і маўчаў. Дагэтуль ён не бачыў гэтую ціхую, пакорлівую жанчыну такой адважнай і прыгожай. «Як я рызыкаваў, павышаючы на яе голас,— пабялеў чорна-шэры.— Алах! Яна магла забіць!»

Марына выскачыла з-за прылаўка, удыхнула паветра, так, гэта Валодзя! Але дзе ён? Куды мог пайсці? Да выхаду? Туды!

«Бягу па следзе, як сабака,— думала Марына.— Так мне і трэба. Сама вінаватая. Трэба было не адступацца, вымольваць дараванне. А цяпер — як сабака! Як пабітая, выкінутая з двара сучка! Як тады, пасля той ночы. Але няхай, як сабака! Галоўнае — дагнаць, адшукаць! А потым — упрасіць, пераканаць! Памерці, але пераканаць! Я не хачу быць адна. Я не хачу змагацца з жыццём сама-адна!

Дзе ж ты? Дзе?

О Божа, аддай мне каханага, дазволь упасці перад ім на калені. Я ўчаплюся ў яго і ніколі не адпушчу. Ніколі! Гэтым разам я не здамся, дакажу!»

Уладзімір стаяў за вітрынай — мазаікай з відэакасет — і глядзеў, як Марына бегла да выхаду з рынку. Ён зразумеў — яна шукае яго. І ўнутрана скалануўся, нечакана зразумеўшы і сябе: ён яе, прадажніцу,

кахае! Усё яшчэ кахае. Гады, што прабеглі з той пары, не сцерлі, не выпалілі гэтага пачуцця з ягонай душы і сэрца.

І ён не вытрываў, ірвануўся наўздагон. Ён павінен даць ёй шанец!

Падбег да дзвярэй, адчыніў, убачыў яе са спіны і... замёр: ногі адзервянелі, голас перасеў — прапаў.

«А жонка, дзеці, дванаццаць гадоў жыцця, дом, наш агульны дом?»

Рука, што трымала дзверы, апусцілася, і яны паволі, з рыпам зачыняліся. Зачынялася і ягоная душа. Зноў, як і тады, памірала. Паміраў іх шанец. Паміралі ён, яна, каханне.

Нібы адчуўшы за спінаю знаёмы ўздых, яна азірнулася. Але дзверы паспелі зачыніцца, і Марына яго не ўбачыла.

«Дзе ён? Дзе? — пыталася ў самой сябе.— Галоўнае — знайсці яго. А ўсё астатняе — за мной. Я не тая, што была тады. Ён паверыць мне. Паверыць і даруе».

— Валодзя! — крычала.— Валодзечка-а!

«Мяркуй,— думаў ён.— Дзеці і жонка ці гэтая... некалі фантастычна прыгожая дзяўчына, шчыра казачная красуня, а зараз — вартая жалю, бязлітасна пацёртая жыццём жанчына, але па-ранейшаму каханая і дарагая?»

Так! Ён заўсёды, усе гэтыя гады кахаў яе. Здрада і час толькі ўзмацнілі пачуццё.

«Каханне ці сям'я — мяркуй!» — зноў сказаў сабе Уладзімір.

І ён змеркаваў.

## Хлопчыкі

Маладая мама, гадоў дваццаці пяці — не больш, вабненькая бландзінка з вясёлымі ямачкамі на пунсовых шчоках і зманліва нафарбаванымі вуснамі, чакала з мужам і сынам чаргі да адваката.

Я стаяў за імі.

Муж, відавочна, быў з пароды тых, каго ў народзе называюць цямця-лямця: тупавата-вінаваты твар, прыадкрыты і, быццам ад ікаўкі, дрыготкі рот, неспакойны, жаласлівы, разлічаны на спагаду і падтрыманне пагляд. Бесперапыннае пацепванне плячамі і няўцямнае мармытанне наводзілі на думку, што школьны курс навукі ён, само сабою, адолеў, але вось для чаго — наўрад ці помніць.

— Зноў заснуў? — торкнула яго пад бок жонка.— От памылка прыроды. Так бы стаяў і спаў дні навылёт! У іншых мужыкі як мужыкі, а ў мяне... Схадзі ў краму, хоць нейкі толк з цябе будзе.

Яна, відавочна, верхаводзіла ў сям'і, але не з розуму ці разважлівасці, а з прычыны сваіх валявых, байцоўскіх якасцяў.

Тройчы напаказ, пад носам у яго, пералічыла грошы і сто разоў паўтарыла: «Глядзі ў мяне!» Ён нешта прамармытаў і, з палёгкаю, пакіраваў у бліжэйшы, адразу за рогам дома, прадуктовы.

Хлопчыку было гадоў шэсць. Ён сядзеў на адзіным у холе крэсле і, утаропіўшыся ў падлогу, думаючы нешта сваё, ледзь прыкметна соўгаў нагамі — ехаў на веласіпедзе.

Ягоная мама па адходзе цямці-лямці некалькі разоў абгледзела мяне ацэнлівым позіркам. Пэўна што, я зацікавіў — моднай катонавай курткаю ці проста як сусед па чарзе. Выдавала, што агляд яе задаволіў — цікаўнасць змянілася адкрытым абяцаннем-выклікам: маўляў, жанчына я, нягледзячы ні на што, незалежная, без комплексаў, а мужа, самі бачылі, як бы і няма. За гэтым, відаць, была надзея, што я кінуся да яе знаёміцца, запісваць тэлефон, каб без лішняй бавы запрасіць у рэстаран, у казіно, а то і ў якую модную сауну,— урэшце, колькі таго жыцця! Я мякка ўнікаў яе напору, але яна нібыта не заўважала гэтага, аднак калі ў чарговы раз адвёў вочы ўбок, нечакана павярнулася да сына з крыкам:

— Даняў! Устань і падыдзі да мяне! Да мяне, я сказала! Двойчы паўтараць не буду! Зараз жа!

Малы не падняўся — ножкі не даставалі да падлогі,— а скочыў з крэсла. Быў, пэўна што, добра вымуштраваны. Памалу падышоў да мамы, заміргаў вочкамі. Рукі, як у малітве, склаў на грудзях. Мама замахнулася, маючы намер уляпіць яму поўху. Але, як падалося, мой міжвольны ўздых, а не прамяўканае малым «Ой!» у апошні момант запыніў яе.

— Глядзі ў мяне! — Схапіла сына за карак, прыгразіўшы той фразай, што і бацьку: — Даскачашся!

— Не бі! Калі ласка...

— Ідзі! — адпусціла яна сынаў каўнерык.— Яшчэ раз пабачу, што боўтаеш нагамі,— крыўдуй на сябе! Я не жартую, і ты гэта ведаеш!

Мне стала тужліва. Ну, круціцца хлапчанё на крэсле, дык жа сумна яму. І я знябыўся, стоячы тут. Дык што — біць за гэта? Вось так і мужа свайго давяла да раслліннага стану.

А мадам, і вухам не павёўшы, яшчэ раз паспрабавала заарканіць мяне позіркам. Не дамогшыся, як і перад гэтым, жаданай узаемнасці, сцяміла нарэшце, што атака захліпнулася. Не помнячы сябе ад злосці, зноў накінулася на сына:

— Перастань матляць нагамі! — завішчэла, да непазнавальнасці скрывіўшы свой вабны твар. Падбегла да малога, размахнулася...

Той, чакаючы ўдару, засланіў галаву рукамі:

— Мамка, не бі!

Дзе там! Яна ўдарыла яго тройчы. Хацела дадаць яшчэ, але я не стрываў:

— Паслухайце! Няможна ж так!

Бландзінка абгледзела мяне пагардлівым позіркам: «Недарэка!» — але не мовіла ні слова і, адпусціўшы малога, вярнулася на сваё месца — на пляцок ля ўвахода ў кабінет адваката. У гэты самы момант дзверы адчыніліся і на парозе ўзнікла акуратна адзетая бабуля:

— Выбачайце, што забавілася.

— Вы б яшчэ да другога прышэсця сядзелі,— буркнула бландзінка і, выявіўшы зайздросны спрыт, шмыгнула за дзверы. Пакінула хлапчанё, быццам забылася на яго.

І бацька як пайшоў у краму, так і прапаў. А можа, вярнуўся ды стаіць дзе за рогам, хаваецца — не хоча, каб ім прылюдна папіхалі.

Я скарыстаў момант і падышоў да хлопчыка.

— А ты малайцом! — усміхнуўся яму.— Сцярпеў, не заплакаў.

Мне хацелася пагладзіць малога, пашкадаваць, ды не адважыўся: чаго добрага, спалохаецца, убачыўшы, што падымаю руку.

Раптам успомнілася: у кішэні ляжыць гадзіннік, набыты Зміцерку да дня нараджэння. Падумаў: яшчэ амаль тыдзень, паспею сыну купіць іншы.

— Трымай! — дастаў жоўценькі, ужо з раменьчыкам гадзіннік.— Давай, брат, памагу зашпіліць.

— Не-не! — спалохана адхіснуўся хлопчык.

— Чаму?! — Я быў знячэўлены.— Паглядзі, які прыгожы!

— Адзін дзядзя ўжо даў быў мне тамагочы. Я пасля два дні ў куце стаяў. Мамка сказала: калі яшчэ раз у незнаёмага вазьму што, яна мяне з дому выганіць,— захныкаў малы.— Не трэба!

— Добра, добра,— паспрабаваў я супакоіць хлопчыка.— Не трэба дык не трэба. Толькі не плач. Ты ўсё роўна малайчына.

Сам сабе падумаў: мусіць, я не першы, хто адбівае атакі гэтай бландзінкі.

Мне нічога не заставалася як пайсці. Плюнуў на чаргу, чакаць не стаў — выйшаў на двор. Глынуў свежага студзеньскага паветра. Угледзеў на другім баку вуліцы цямцю-лямцю — той і сапраўды вызіраў з-за афішнай тумбы.

«Не, Зміцерку я ёй не аддам! — пакляўся сам сабе.— Яшчэ падчэпіць гэткага ж цюхцяя — дзе ты іх, вартых, набярэшся? — і пачне здзекавацца з сына, спаганяць на ім сваю злосць на няўдалы лёс ды на тату-свалату, што зламаў ёй жыццё».

Махнуў таксісту, які пралятаў міма. Учэпістым спрактыкаваным вокам той згледзеў мяне, прытармазіў.

— Дзіцячы садок чатырыста чатыры,— адольваючы нервовую задышку, вымавіў я.— Ведаеш дзе? Тады пагналі. Цісні на педаль.

— Націснем, не турбуйцеся,— спакойна адказаў кіроўца. Паглядзеў на мяне, паківаў галавой: — Я разумею...

Я не ведаў, што ён разумее ці мае на ўвазе, але, пачуўшы, што таксіст таксама спяшаецца ў дзіцячы садок, падумаў: «Што нам рабіць з усімі гэтымі ўзгадаванымі сацыялізмам маткамі — сучкамі, ваўчыцамі, гібрыдамі гада і распусніцы?»

Мы не ведалі, што рабіць. Мы проста мчалі па нашых хлопчыкаў. Ён — пасля таго як падвёз чарговую кліентку з сынам, я — пасля няўдалай спробы параіцца з адвакатам.

## Сюжэт

Сеў за камп’ютэр. Наважыўся паэксперыментаваць — напісаць апавяданне, не маючы пэўнай задумы, напрацовак, сюжэта — нічога з таго, што ёсць у пісьменніка, калі ён бярэцца за пяро. Хоць мець сюжэт, відаць, не так ужо і важна. Дапусцім, апавяданне акурат і будзе пра тое, як прыдумаць сюжэт. Успомнім бяспройгрышныя тэмы: каханне, здрада, нянавісць, смерць. Не густа. І галоўнае — усё ўжо было. Пра ўсё пісана-перапісана, усё заезджана да нудоты. І таму... Ой, што там, за акном, бліснула? Знічка? Ды якая яркая! Пашэнціла дык пашэнціла. Не трачу дарма часу, загадваю жаданне: дай мне, Божа, вузлавое слова, слова-спружыну, слова-матор. Я хачу, каб... каб... Стоп! Ёсць! Завёўся!

Матацыкл завёўся.

Малодшы брат паглядзеў на старэйшага:

— Ты абяцаў — сёння ўжо абавязкова павозіш.

— Сядай, назола, усё роўна не адчэпішся. Але каб пасля не крыўдаваў. І бацьку не ўздумай скардзіцца. Сам напрасіўся. Лаві шлем. Зашпіліў? Яшчэ раз пытаюся: не перадумаў? Упэўнены? Тады сядай!

Павесялелы малодшы гэпнуўся на заднюю сядуху, радасна адрапартаваў:

— Гатовы!

— Узорны піянер! Цяпер хапайся за мяне і трымайся мацней,— загадаў старэйшы.

Газануў некалькі разоў, як бы правяраючы «машыну», нарэшце адпусціў счапленне, і браты літаральна паляцелі з месца.

Малодшы брат ніколі б не паверыў, што мчаць на матацыкле будзе так страшна. З першых жа метраў яму перацяло дыханне, здавалася, вось-вось ён зляціць з сядла і разаб'ецца. Насмерць, ушчэнт. Толькі што, у момант абгону, ледзь не зачапілі грузавік. На павароце нага чырканула па асфальце. «Хутчэй бы ўсё скончылася,— думаў ён, дранцвеючы ад страху.— За кіламетр буду матацыклы абыходзіць. О Госпадзе...»

Пашанцавала, Бог злітаваўся.

Званок.

Зняў трубку:

— Слухаю.

— Вы яшчэ дома,. Сяргей Канстанцінавіч? — пазнаў механічны голас сакратаркі.— А пара б ужо выехаць: у шаснаццаць нуль-нуль пачынаем. Як — што? Забыліся? У Рыгора Сцяпанавіча дзень нараджэння! Вы мяне добра чуеце?

— Чую, чую... Дзякуй, што нагадалі.— Хуценька паклаў трубку, пакуль гэтая сарока не затлуміла галаву дарэшты.— Так, на чым жа спыніўся? «На бліжэйшым павароце нага чырканула па асфальце. «Хутчэй бы ўсё скончылася,— думаў, дранцвеючы ад страху.— За кіламетр буду абходзіць матацыклы. О Госпадзе...» Пашанцавала, Бог злітаваўся».

Не, Бог тут ні да чога. Усё выракуе ўдача. Разгледзім той самы выпадак з матацыклам. Удача прыходзіць да канкрэтнай асобы. Гэта значыць, спачатку трэба нарадзіцца чалавекам, а не сланом,

скажам. Бо сланы не ездзяць на матацыклах. Гэта і ёсць першая ўдача. Тады — дажыць да таго веку, калі зможаш трымаць руль. Другая ўдача! Далей...

Далей пажадана не траціць часу на пустое мудрагельства і падумаць, што падаць паважанаму шэфу і мужу маёй каханкі, Рыгору Сцяпанавічу. Можа, рогі? Не смешна. Ён гумар не ацэніць і зробіць з іх вяшак, на якi ў бліжэйшыя восенныя месяцы раз у тыдзень я буду вешаць сваю куртку. І штораз перад тым, як пацешыцца з ягонаю красуняй, прыйдзецца дакараць сябе ў думках, які я подлы і нягодны: спакушаю шэфаву жонку без аніякага сораму. Зрэшты, годзе займацца самавыхаваннем — збіўся з сюжэта. Што там з хлопцамі? Яшчэ ездзяцца? Пара тармазіць.

— Усё, спектакль скончаны,— заявіў старэйшы брат.— Паркуемся.

«Здаецца, жывы,— абмацаў сябе малодшы.— Во праехаўся. На ўсё жыццё запомню!»

— Ну што, набраўся страху? — злез з матацыкла старэйшы.

— Дзе-е там,— малодшы стараўся гаварыць спакойна,— усё нармальна. Амаль што як на веласіпедзе, толькі з гары.

— На веласіпедзе, кажаш? — засумняваўся старэйшы.— А самому за руль не хочацца? Я пакажу, што трэба рабіць.

— Праўда? — не паверыў малодшы. І ўчапіўся за здагадку: «Напэўна, самому кіраваць матацыклам не так страшна, як вісець ззаду?»

— Сядай на маё месца,— пачаў старэйшы першую навуку.— Бліжэй да руля. Па-блатному будзеш ездзіць, як навучышся. Цяпер пакруці ручку газу, адчуй яе. Націсні на тармазы, прывыкай да педаляў...

Нешта я заваладзіўся з хлопцамі. Пара бегчы на босавы імяніны.

У кватэру на трэцім паверсе аднаго з найпрэстыжнейшых дамоў горада ўляцеў з робленаю, да вушэй, усмешкаю. Віншаванне загадзя амаль слова ў слова спісаў — прыдумваць не было калі — з адное паштоўкі, прысланай мне летась:

— Дарагі (памяняў імя і імя па бацьку) Рыгор Сцяпанавіч! Ад усяго сэрца («Так,— прызнаўся сабе,— сэрца якраз жа ў мяне і няма»)... віншую вас з юбілеем. У гэты радасны для вас і, безумоўна ж, усіх нас (ой, ці для ўсіх?) дзень хацелася б зычыць вам

вялікіх поспехаў у працы, моцнага здароўя (пры гэтым стандартным зычэнні ў мяне чамусьці пачаў заплятацца язык) і доўгіх гадоў жыцця! — Адразу спытаў сябе: «З такой жонкаю?» І сам сабе зазначыў: «Крый Божа, тым болей з такою жонкаю!» Сабе ж дадаў: «З гэткай ненажэрнай красуняй год за тры трэба лічыць. Так што наўрад ці...»

Перакульваючы ў рот чарку, зноў успомніў пра матацыклістаў.

— Цяпер адзін зможаш праехацца? — глянуў старэйшы брат на малодшага пасля таго, як тры гадзіны запар бавіў яго на пустцы непадалёк ад дома.

— Пытаешся! — усклікнуў малодшы.— Сам жа бачыш, я ўжо о-го-го як кірую!

— Думаеш? — недаверліва пахітаў галавою старэйшы.— Што ж, паглядзім. Пакуль што — толькі да нашага дома і назад. Зразумеў?

— Зразумеў. Рукі, праўда, крыху дрыжаць, пэўна што, з непрывычкі. Можа, кругоў пяць яшчэ зраблю тут, а пасля рызыкну і па вуліцы?

— Добра, займайся. Галоўнае — адпрацуй да аўтаматызму перамыканне хуткасцей. Руль трымай моцна, не торгайся. І ў павароты старайся плаўней уваходзіць...

Пакуль малодшы брат даводзіў да бляску тэхніку кіравання, тосты на чэсць Рыгора Сцяпанавіча пайшлі па другім крузе. Да майго чарговага выступу было далёка, і я спусціўся, здавалася, незаўважна, у двор — падыхаць свежым паветрам. Амаль што адразу ж выбегла і яна.

— Не глядзі на мяне так,— кінула, ледзь не крычучы.— Я ўсё прагадала. Сказала Грышу: пакуль, маўляў, дойдзе да гарачага, хачу спакойна пакурыць. А на лоджыі поўна гасцей...

— А я пра што...

Далей я не стаў выпрабоўваць лёс і моўчкі пачаў рухацца назад. Яна ценем кінулася за мною.

У пад'ездзе схапіла мяне за плечы, прыхінула да сцяны.

— Абдымі,— прашаптала, заплюшчваючы вочы.— Я хачу цябе.

«Вар'ятка! Убачаць жа! Далібог, убачаць! — пранеслася ў галаве.— Няўжо не разумее? У нас жа сем'і, дзеці. Пазабаўляліся, пацешыліся і — годзе».

— Ціха, супакойся,— узяў яе за рукі.— Дачакайся панядзелка. Я ў абед вырвуся. Абяцаю.

— Ніякіх панядзелкаў. Ніякіх абяцанняў. Хачу цябе зараз, кожны дзень, заўсёды, усё жыццё!

«Сапраўды з глузду з'ехала,— занерваваўся я.— Што рабіць? Як супакоіць вар'ятку?»

— Абяцаю,— прыціснуў да сябе.— У панядзелак прыеду, сядзем, усё абдумаем і...

— Ніякіх «і»! Я не веру! Я не дачакаюся! — перабіла.— Я больш не магу чакаць!

Не стрываў:

— Усё! Годзе! Пусці! — лёгенька адштурхнуў яе і ступіў да выхаду. Адтуль — на вуліцу. На другім баку — стаянка таксі. Машыны ёсць! Яшчэ пару метраў — і я вольны. Яна вернецца да гасцей, жыццё пойдзе сваёй чарадою, і вечар скончыцца без скандалу.

Яна, імгненна ўсвядоміўшы, што засталася адна, ірванулася ўслед.

— Спыніце яго! — закрычала.

І гэтае «спыніце!» апаліла мне плечы. «Уцякаць! Куды? Ці мага?» Спачатку захапіўся, пасля заблытаўся, цяпер вось магу дабегацца. От табе і сюжэт. А як там, дарэчы, мае хлопцы?

— Значыць, дамовіліся,— нагадаў старэйшы брат малодшаму,— толькі туды і назад. Калі будзеш праязджаць паўз наш дом, на вокны не глядзі — чаго добрага, у слуп урэжашся.

Малодшы сядзеў за рулём, падгазоўваў і старэйшага не слухаў. Ён паверыў у свае сілы і думаў толькі пра адно: хутчэй у бой. Паказаць старэйшаму, што можа не проста праехацца, прапаўзці чарапахай. Не! Ён праляціць эфектна, як сапраўдны матацыкліст.

І малодшы газануў і сарваўся з месца. Пад'язджаючы да свайго дома, яшчэ здалёк выгледзеў знаёмыя вокны. «Вунь нашы,— усміхнуўся.— Можа, там і мама стаіць? Махну рукою: салют, мама! От здзівіцца!»

Але мама не здзівілася: у яе былі іншыя клопаты. Яна выбегла на вуліцу, павяла вачыма: «Дзе ён? У таксі сядае!» Ірванулася да перахода.

Матацыкліст, што нёсся на жоўтае вока святлафора, нават не паспрабаваў аб'ехаць яе або прытармазіць. Загледзеўся на вокны.

Удар! Яго выкінула з сядла. Праляцеўшы з дзесятак метраў, пакаціўся па зямлі.

Хлопцу пашанцавала: упаў на зялёную палосу, што падзяляе вулічны рух. Жанчыну ж матацыкл кінуў на слуп святлафора. Выцяўшыся аб яго галавой, яна страціла прытомнасць.

Малодшы толькі абадраў аб зямлю твар ды парваў адзенне. Цьмяна ўсведамляючы, што некага збіў, падняўся і слепа пасунуўся да няшчаснага перахода. Ля святлафорнага слупа скалануўся: на асфальце ніцма ляжала жанчына. Яе галава падцякала крывёю.

Я апынуўся ў таксі за лічаныя імгненні да гэтых падзей, нічога пра іх не ведаў і вечаровому званку не здзівіўся. Аднак тэлефанавала не яна. Яна ўжо болей ніколі не патэлефануе. І мне, думаецца, нават да галавы не прыйдзе эксперыментаваць з прыдумваннем апавяданняў. Варта толькі скласці сюжэт, як д'ябал увасабляе яго ў жыццё.

## Трое

Я стаю над прадоннем. Яшчэ крок — і вяртанне ў раўнавагу, у норму, у жыццё стане немажлівым. І тады я зыду ў нікуды. Стану нікім. Памру. Знікну. Мяне не будзе. Будзе яна. Самы блізкі мне чалавек.

Let it be![1]

Яна вельмі прыгожая, незвычайна прыгожая. Да асляплення, да памутнення розуму, да страты прытомнасці. Яна — мая каханая. Мая жонка. Маё першае і адзінае каханне. Мая надзея. Мой апошні прыстанак. Мой анёл. Лёс.

Так! Лёс! Трагедыя! Бездань! Смерць!

Сёння яна адышла. Я разумею, яна стамілася. Увесь час удвайгу. Увесь час разам: я і яна. Хто хочаш стоміцца.

Але чаму я не стаміўся? Чаму так сумую па ёй? Бо кахаю? Не ведаю. Проста хачу, каб яна была побач.

Але яна — адышла. Можа, так ёй будзе лепей? Галоўнае, каб каханай было лепей. Але ж ёсць яшчэ я, той, хто кахае яе. Адданы

[1] Хай будзе так! *(англ.)*

ёй. Чаму яна не падумала пра мяне? Яна ж ведае, што я не магу без яе, не магу!

Яна ведае...

Горка і балюча.

Сказала — выскачу на хвілінку, а мінула ўжо чатыры гадзіны. Калі б каханая папярэдзіла, што мяне чакае ростань даўжынёю ў вечнасць, я быў бы хоць як падрыхтаваны. Паспрабаваў бы яе запыніць. Утрымаць. Я прасіў бы, маліў, угаворваў, пераконваў. У мяне быў бы шанец...

Але яна сказала — на хвілінку.

І, як на тое, я не паехаў на работу, застаўся дома. Бы знарок. Цяпер я ведаю: каханая гаварыла адно, а думала другое.

Гэта — бездань!

Пачатая другая пляшка гарэлкі. Але гэта слабы лек ад рэўнасці. Рэўнасць лёгка ператварае гарэлку ў ваду. І я раблюся безабаронным. Мяне агарняе роспач, жаданне смерці. Я ўва ўладзе Яе Вялікасці Рэўнасці. І няма мне ратунку! Няма!

Чатыры гадзіны без каханай! Як гэта пакутліва доўга, вечна, назаўжды. Я зламаўся. Згарэў. Спаралізаваны. Хворы. Небяспечны. Гатовы на ўсё!

Гэта — бездань!

І ўсё ж я веру: каханая прыйдзе! Я ёй патрэбны. На ўсякі выпадак (раптам што здарыцца?), але — патрэбны. Абавязкова патрэбны. Інакш — нельга! Інакш...

Яна прыйшла. Тлумачыць: забавілася ў сяброўкі (дапамагала па гаспадарцы маме; забягала ў офіс да свайго дзядзькі і трапіла на гадавіну фірмы; прахаджвалася па парку — развітвалася з восенню). Яна гаворыць бесперастанку. Гаворыць так, нібы адказвае на пытанні. Навошта? Я ж іх не задаваў. Можа, пытанні задалі мае вочы? Ці яе сэрца адчула мае пакуты?

Не ведаю...

Я сказаў, што званіў сяброўцы (заязджаў да мамы; дзядзька ўчора з'ехаў за мяжу; а пасля гадзіннай прабежкі па парку ледзь адмыў ад гразі падораныя ёю чаравікі). Спакойна сказаў. Дальбог — спакойна.

Але каханай здалося, што я дапытваю яе, павышаю голас, здзекуюся, не веру ніводнаму яе слову. І яна загарэлася:

— Я проста шпацыравала па вуліцы, хадзіла па крамах. Зайшла ў кавярню выпіць кавы. Ну і што? Я не рабыня, я вольны чалавек!

15. Зак. 413

Ці ты думаеш інакш? Можа, мне і дыхаць нельга без твайго дазволу?! Ты — варвар! Ты...

Я зразумеў. Я ўсё зразумеў. Усё! Дзе яна была. З кім дыхала. Да каго дакраналася. Хто варвар. Не проста зразумеў — убачыў, як чужы абдымае каханую.

Захліснуў боль. Боль да непрытомнасці, да роспачы, да слепаты.

І тады я ступіў да сваёй бездані. У кожнага яна свая. Цяпер я гэта ведаю...

Бездань.

Я — перад ёю. Толькі Богу вядома, што будзе далей.

Рэўнасць мацнейшая за розум, але не мацнейшая за Бога. У Ім — збавенне.

Ён стаяў на краі даху дваццаціпавярховага дома.

Унізе — асфальт. Чысты. Ні кусціка, ні дрэўца. Шанцаў выжыць — нуль. Гэта найгалоўнейшае — не выжыць! Свет для яго не існаваў. Свет перакуліўся. Знік. І ён таксама знікне.

Гэта — бездань!

Ён глядзеў на неба, потым апусціў галаву, зірнуў долу, спалохаўся, але роспач мацнейшая за страх, і ён ступіў.

Падаў уніз галавою. Так трэба. Ён пачуў сваё «А-а-а!!!» і зразумеў: рэўнасць, што распірала яго, раптам счахла, адступіла. І бліснула святло. Захацелася жыць. Ухапіцца за жыццё. Спыніць смяротны лёт. Убачыць неба.

Ён паспеў перавярнуцца і ўпаў на ногі. Але...

Хрыбетнік хруснуў, успароў скуру, вылез вонкі.

Ён не разбіў галавы і яшчэ нейкі час дыхаў.

Бог пачуў ягоную просьбу. Вызваліў ад задухі рэўнасці. Цяпер ён вольны і шчаслівы.

Let it be!

А пачыналася ўсё незвычайна, таямніча, казачна. Пачыналася з кахання. Шчасце не мела межаў. Дні ляцелі, як імгненні, і ён баяўся, што ўсё гэта не больш чым салодкі чароўны сон. І ўсё сапраўды сталася сном. Каханне было адно на дваіх — ягонае каханне. Без узаемнасці. Каханне і рэўнасць. І нянавісць. Яе нянавісць...

— Так, гэта мой муж,— спакойна пацвердзіла каханая ў моргу і, не чытаючы, падпісала патрэбныя паперы.

Спакойнай яна падалася і следчаму-практыканту. А насамрэч усё ў ёй бушавала і кіпела. Яна знемагала ад жадання хутчэй убачыць свайго неўтаймоўнага, неймаверна дужага Звера. Толькі ён, катуючы, даводзіў яе да шаленства. Толькі з ім яна патанала ў аргазме, памірала ад шчасця, згарала ў полымі. Ён быў яе гаспадаром, паганятым. Лупцаваў яе, біў, кусаў, ірваў на часткі, шкуматаў. Ён быў яе катам і збаўцам...

Яна шалела ад агіды і болю, рабілася жывёлінай, поўзала перад ім на каленях, лізала яго гарачае цела. Забывалася, траціла свядомасць і зноў западала ў экстаз. Вар'яцела і заходзілася ад адчування ягонае сілы.

Яна не ведала, што гэтай ночы яе Звер выракуе: настаў час. Час выпусціць дух з гэтага ненасытнага стварэння, што рве на сабе валасы і крычыць такое ненавіснае яму: «Яшчэ-э!»

І ён усміхаўся. Усміхаўся яго амаль бязгубы твар, жмурыліся неспакойныя бегатлівыя вочкі. Ён не бачыў, які жахлівы ў гэты момант. Якая ён пачвара. Не бачыла гэтага і яна. Для яе Звер быў найхарашэйшы. Ён — яе кат і збаўца.

І Звер усміхаўся. Ён зрабіў гэта. Вылечыў пяць. Вылечыць і яе. Круг замкнецца. Шэсць хворых, шэсць лялек, якія любілі такое ненавіснае для яго «Яшчэ-э!». Ён выканае ўмову. Ён стане антыхрыстам. Скора. Цяпер ужо скора ён будзе сярод сваіх. І Звер усміхаўся.

Яна не ведала, што, аддаляючыся ад морга, няўхільна набліжаецца да яго. Не, да мяне! Да нас! І яна кінулася бегчы.

Хутчэй! Звер чакае яе!

І яна пабегла па простачцы, якая была кругам.

Яна не ведала, што рэшту ночы правядзе побач са мною.

Яна не ведала.

Let it be!

— Прыгожая пара,— усміхнуўся паталагаанатам, уваходзячы скальпелем у маё цела.

Анатамаваць каханую яму не было патрэбы.

## Беверлі-хілз

— Я ведаў, што ты маеш шанец пераадолець бар'ер, прарвацца да нас. Такія, як ты, пазначаныя ад самага зачацця, але толькі адзін з мільёна ўсведамляе наша існаванне за факт, жыве і памірае разам з намі. А калі шчыра — не памірае ніколі. За год дамагчыся таго, на што іншым трэба дваццаць! Значыць, ты народжаны для сапраўднага жыцця, для сапраўднай гульні, бітвы, трагедыі. І ўсё гэта будзе табе дадзена. Але для пачатку, каб зрушыць сітуацыю, укладзем дамову. Угода табе падасца дзіўнай, падазронай, нават вар'яцкай, ды без яе не абысціся — яна заглыбіць цябе ў наша, сапраўднае, жыццё. Бачу, задумаўся. Ёсць пытанні? Задавай, толькі расслабся, не напружвайся.

— А чаго напружвацца?! Усё ясна як белы дзень. Я пісаў апавяданне і на пэўным этапе ўвайшоў у яго. Ступіў за мяжу паміж рэальнасцю і фантазіяй. З'ехаў з глузду. Звар'яцеў. Хоць разважаю, здаецца, лагічна правільна, разумна. Ці не? Хіба можа быць такое, каб нехта пратачыўся ў сваё апавяданне, зліўся з яго персанажамі? Адказваю: можа, калі гэта — сон. Значыць, я сплю. Няма пытанняў. Аднак холад чамусьці працінае...

— Холад — гэта нічога, лепш як спёка, асабліва агністая. Але тэму такую развіваць не хацелася б... А ты малайчына! Дрыжыш, а прымусіў-такі сябе і змагаешся, разважаеш, робіш высновы. Сапраўдны прафесіянал, логік. Усё слушна. Я задаволены. Ты адзін з абраных, адзін з найлепшых і невыпадкова тут апынуўся. А цяпер слухай і запамінай. Не глядзі на мяне і не спрабуй гадаць: што будзе далей, навошта ты тут, дзеля якой мэты? Скажу, усё скажу. Але не адразу. Не так гэта проста. Толькі не хвалюйся, супакойся. Вы кажаце — і тут я цалкам згодны — не такі страшны чорт, як яго малююць. Карацей, забіваць цябе ніхто не збіраецца. Нашая мэта якраз адваротная — падоўжыць тваё новае — нашае — жыццё. («Нашае? — тарганулася думка ў пісьменніка.— Не разумею».) Алеале, падоўжыць, нават калі ты будзеш супраціўляцца, чаго нельга адкінуць. Чаму? Пасля даведаешся. Паўтараю — не ўсё адразу. З ходу і ў нас не вельмі выходзіць. Такім парадкам, угода. Першая і апошняя. Ты гаворыш, чаго хочаш, а я выконваю твае жаданні. Але калі ты ўжо здагадаўся, хто перад табою, дык, мусіць, разумееш, што мы задарма не працуем. Плату, пэўную частку твайго цела — ціха-ціха, не спяшайся адмаўляцца, потым усё зразумееш! — я пры-

значу сам, выходзячы з маштабнасці тваіх просьбаў. Цела таго, хто прарваўся да нас, каштуе дорага, таму не трэба залішняй сціпласці. Калі ласка, кажы...

— Я сказаў бы, што не маю ніякіх жаданняў, абы не бачыць таго, хто іх накідвае і сам жа выконвае,— гэта значыць цябе. Зараз галоўнае прачнуцца і...

— Зайздросная логіка! — перапыніў д'ябал пісьменніка.— Аднак памылковая. Гэта не сон. Ты сапраўды бачыш перад сабою антыбога. І табе лепш не траціць марна сілы, не ўпарціцца, а чаго-колечы пажадаць. Урэшце, каб вырвацца адсюль, гэтага абавязкова трэба пажадаць, і вельмі моцна. Вельмі! Чуеш? Паўтараю: загадваеш жаданне — і атрымваеш шанец. Як бачыш, мы прайшліся па крузе. Табе тое трэба? Ты ж ніколі марна час не траціў. Не трać і цяпер! Даходліва тлумачу?

— Куды ўжо даходлівей,— уздыхнуў пісьменнік.

Хваляванне яму замінала дайсці да рады. «Даскакаўся! Дапісаўся! Дапяў да праўды! Да самага яе дна, да адваротнага боку. Я — на другім баку. У іншым вымярэнні. Трэба нешта рабіць, неяк выбірацца. Не апускаць рук, трымаць вуха востра, думаць». Уголас прадоўжыў:

— Усё зразумела, і з цікавасці — што будзе далей? — адкажу: я хачу быць багатым, такім багатым, каб купіць таго, хто ўзяўся б забіць цябе. Калі такога на ўсім свеце не знойдзецца, дык купіць цябе самога.

— Багатым — гэта добра. Але мой забойца яшчэ не нарадзіўся: я ведаў бы — думаю, разумееш — пра яго існаванне. І купіць мяне цяжка, хутчэй за ўсё — нельга. Але багацце павялічвае твой шанец перамагчы ў гульні. Такім парадкам, просьба пачутая і прынятая: багацце. Цяпер — канкрэтна. Пачнём з лота нумар адзін. Дзе будзем жыць? Віла? Замак? Што-колечы сціплейшае?

— Замак?! Крый Божа! Годзе з мяне адной здані! Няхай будзе віла.

— Дзе?

— Беверлі-хілз, калі на тое пайшло. Чуў, там весела.

— Так і карціць сёе-тое сказаць пра твой выбар, асабліва наконт «весела», але прамаўчу. Віла ў Беверлі-хілз — лічы, дамовіліся. На чым будзем ездзіць?

— Гуляць дык гуляць! «Ролс-Ройс» ці «Бентлі». Але не супраць пакарыстацца і чым-кольвек са спартыўных жарэбчыкаў: «Ламбарджыні» альбо «Ферары».

— Прыстойныя «кары». Арганізуем. А як наконт яхты?

— Цалкам за. Мара маленства.

— Збудзецца мара. Рахунак у банку?

— Невычарпальны.

— Выпішам. Адзін такім багаццем будзеш цешыцца?

— З сям'ёю.

— Дакладней.

— Ну, як належыць: жонка, дачка, сын.

— Узорны татка! Чаго яшчэ пажадаеш, святы чалавек?

— Сам ведаеш, што да гэтага прыкладаецца: элегантны гардэроб, каштоўнасці...

— Няма праблем. З бразготкамі бавы не будзе. Спадзяюся, гэта ўсё? Добра. Цяпер пагаворым пра разлік. Плата прымаецца толькі адна — рука!

— Якая рука?

— Не якая, а чыя. Твая, чыя ж яшчэ! За сваю працу я хачу атрымаць тваю руку. Правую. Па-мойму, гэта справядліва.

— Руку? Правую? Ці не зашмат хочаш?

— А ты? Беверлі-хілз, віла, яхта, «Ламбарджыні»...

— Добра,— махнуў правай рукою пісьменнік, быццам загадзя развітваючыся з ёю.— Чорт з табою!

— А ты жартаўнік,— усміхнуўся задаволены д'ябал.— «Чорт з табою!» У нашым выпадку гучыць нават пікантна.

— Ведаю,— прыжмурыў вочы пісьменнік.— Але давай так: спачатку выконваеш жаданне, а пасля...

— А ты засцярожлівы,— пахітаў галавою д'ябал.— Я па драбязе не падманваю. Ты мяне крыўдзіш. Расчароўваеш. Слабы ты, аднак, чалавеча... Добра, закругляемся. Гэта ўсё?

— Усё, усё, каб цябе! Каб ты палаў зыркім полымем!

— Во гэта па-нашаму! — пацёр рукі д'ябал.— Зазлаваў! Завёўся. Ваяка! Будзе з цябе карысць. Малайчына. Наастачу хачу спытаць: ты ведаеш, што ў свеце наймагутнейшае? Няпростае пытанне? Адразу не можаш адказаць? Падумай, напружся! Усё адно нічога не прыходзіць да галавы? Дык знай — задарма, заўваж, даю інфармацыю: наймагутнейшы — час. Аднак жа гульня і яго перамагае. Гульня — гэта жыццё, дакладней, тое, адкуль, з чаго яно бярэ пачатак. Некалі ты гэта зразумееш. А цяпер парадую цябе маім пажаданнем: да няхуткай сустрэчы! Бывай!

— Падлюга! Каб ты...

— Ты камплiментамi не надта раскiдайся, дый накрычацца яшчэ паспееш. Ашчаджай сiлы,— сказаў д'ябал, абдаў пiсьменнiка пахам серы i знiк.

Беверлi-хiлз — гара. Вечар. Лёгкi брыз лена пагладжвае акiян.

«Бадай што, мая яхта найхарашэйшая,— салодка ўсмiхнуўся пiсьменнiк, трымаючы руку над вачыма, як брыль ад сонца.— Славутая Беверлi-хiлз! Найбагацейшая ў свеце. Не падвялi i суседзi. Джэк Нiкалсан, Марлон Брандо — зорная кампанiя! Вясёлыя, непрадказальныя, загадкавыя. Нядаўна па-суседску ў непераможную «Аль-Катрас» зазiрнуў. Для нас, пэўна што, мясцiнка. Аль Капонэ зноў жа... Трэба ўспамянуць бедачыну. Жартую — не мая тэма. Я больш — што да фiласофii. Таямнiцы таго жыцця спасцiгаю. Адчуваю, скора дафiласофуюся».

— Дарагая, ты часам не ведаеш, якой-такой дзiўнай стравою твой тоўсты кiтаец частаваць нас увечары будзе? — павярнуў пiсьменнiк галаву да жонкi — яна якраз выходзiла з басейна.

— Ну, пачынаецца! — адказала слоўкам з таго, даўнейшага, жыцця.

«Любая сэрцу фраза,— зноў усмiхнуўся пiсьменнiк.— Добрая. Знаёмая. Родная».

— Можаш дарма не напружвацца: мы зробiм усё, каб ты не адгадаў. Сюрпрыз! — засмяялася жонка, махнула рукою, апырскала, пяшчотна паглядзела — кахала.

«Весела,— зазначыў пiсьменнiк.— Асаблiва мне. Уначы прылятала першая ластаўка. Я ляжаў з жонкаю, досыць нацешыўшыся яе — маiм! — малочным целам, гладзiў падатлiвае плячо, быў шчаслiвы, спачываў. Яна папрасiла:

— Мiлы, палашчы мне яшчэ грудзi, калi ласка.

Але-але, акурат гэтак i сказала!

Я зацiх, жахнуўся: грудзi ўздрыгвалi, сойчыкi набрузлi, варушылiся. Мая рука па-ранейшаму гладзiла жончына плячо. Аднекуль з сярэдзiны iшоў голас: "Што ж ты думаў? Ведай, браток: калi адсякаюць руку, на яе месцы заўсёды вырастае другая, новая, чужая, невiдомая — мая. А грудзi ў тваёй жонкi як мае быць! Даўно гэтакiх пругкiх не гладзiў. Нават завёўся па старой памяцi. Малайчына, цудоўны выбар"».

— Мiлы, сёння мы з кiтайцам гатуем табе нешта адмысловае,— перапынiла голас каханая.— За такую ноч грэх не аддзячыць. Так

ты мяне ніколі не лашчыў! Я ўзлятала і лунала, падала ў бездань і зноў вярталася ў нябёсы! І так бясконца, бясконца, вечна... Як я ўдзячная табе, любы! Як кахаю цябе! Якая шчаслівая! Дурніца! Уяўляеш, хачу зноў нарадзіць табе малое.

«Смяецца,— жахнуўся пісьменнік.— «Я шчаслівая... Хачу зноў... Хачу нарадзіць...» Ад каго? Ад д'ябла?! Ад сатаны?! Жах! Рука не мая! Дзіця — не маё. Можа, і я — не я? Не! Лухта! Часовае вар'яцтва! Вынік скоку з гразі ў князі! Прыехалі!.. Стой! Не ныць! Не паддавацца! Працаваць! — загадаў сабе.— Пісаць і пісаць, аддаваць даўгі. З кашмарамі пасля разбяруся. У «Нью-Йоркер» абяцаў даслаць апавяданне сёння ўвечары. Запэўніў, што абавязкова атрымаюць. Працаваць і яшчэ раз працаваць! Не кіснуць! Не расслабляцца! Выканаць абяцанне!»

Пісьменнік сеў за камп'ютэр, пачаў дыктаваць. Разумнай машыне рука не патрэбная. Машына паслухмяна выводзіла на дысплеі надыктаваны тэкст. Гаварылася-пісалася лёгка, натхнёна, хутка. «Эфект перамены месца? — спытаў сам сябе.— Можа быць. Хоць у гэтым плюс».

Праз шэсць гадзін, пасля трох шліфовак-рэдагаванняў, пісьменнік націснуў клавішу друку. З прынтэра папаўзла папера з тэкстам. Прачытаў, каб праверыць, ці не падманным было адчуванне ўдачы. «Нармальна,— заспакоіў сябе.— Выйшла».

Не марудзіў: час, нервы разбэрсаныя ўшчэнт, трэба паспець. Паслаў праз электронную пошту. Курыў, адганяючы дымам благія думкі, чакаў: абяцалі адказаць адразу. Праз дваццаць дзве хвіліны камп'ютэр даў знак: пошта, прыміце паведамленне.

Прыняў.

«Шаноўны пане... Вы, пэўна што, памыліліся і даслалі не сваё апавяданне. Прыйшла нейкая графаманская лухта. Рука, без аніякіх сумненняў, не Ваша. Раім выклікаць спецыяліста наладжвання камп'ютэраў. Чакаем Вашых апавяданняў. Можа, ёсць працяг цыкла, які Вы друкавалі ў Германіі? З павагаю — рэдактар аддзела...»

«Што ж я такое паслаў? — Пісьменнік скіраваў курсор на скрынку перадачы паведамленняў. Памылкі не было — файл той. Адкрыў, прачытаў першыя радкі.— Лухта! Суцэльная лухта! Нешта з галавою? Перагрэўся? Пэўна што. Спякота неймаверная».

Адшмаргнуў шторы, перамкнуў кандыцыянер на hi cool. Націснуў кнопку лямпы, што асвятляе клавіятуру. Угледзеўся ў чорна-сіні

фон манітора. У думках разбегся, рыхтуючыся скочыць. Скочыў. Прадыктаваў першыя радкі. І далей, далей. Пайшло. Захапіла. Па другім крузе. Зноў хутка, лёгка. Хваляваўся, але спыніцца не мог. Паплыў. Адчуваў сябе ў роднай стыхіі.

Зайшла жонка:

— Мілы, ты хутка? Я ўся знемаглася. Чакаю не дачакаюся паўтору ўчарашняй казачнай ночы. Ты быў у ёй галоўны чараўнік.

«Зноў смяецца,— паглядзеў на жонку пісьменнік.— Шчаслівая. «Галоўны чараўнік!» Галоўны цяпер — не я!» — абурыўся, але жонцы адказаў мякка:

— Харошая мая, зараз дапішу і прыйду. Крыху засталося. Добра?

— Чакаю, чакаю, чакаю! Абяцай: калі раптам засну, дык абавязкова разбудзіш. Але пастараюся дачакацца. Кожная ноч з табою цяпер — як...

Жонка пайшла, і пісьменнік не пачуў яе апошніх слоў.

«Дзякуй Богу, час яшчэ ёсць,— выдыхнуў.— У «Йоркеры» будуць чакаць да поўначы. Пісаць! Тэрмінова! Не падвесці! Другі раз не пацвердзіць клас — самазабойства! Другі раз — не выпадковасць».

І пісьменнік зноў нагаворваў, жэстыкуляваў, шаптаў. Працавалася, як і раней, падазрона лёгка.

— І чорт з ім! — мацюкнуўся.— Ух ты, каго ўспомніў! — Спахмурнеў: — Ай-я, не, гэта быў сон. Вядома ж, сон! Дом на Беверліхілз пасля трох гадоў паспяховай работы ў Еўропе я купіў сам. Гэта што — таксама сон?

Пісаць! Пісаць! Не адхіляцца!

Неўзабаве прадыктаваў фінальныя радкі. Канцоўка спадабалася: арыгінальная, нечаканая. «Нармальна,— сказаў сабе, як заўсёды.— Паглядзім, што адкажуць гэтым разам, паглядзім».

Адказ прыйшоў праз пяць хвілін:

«Шаноўны пане... Нам усё ж здаецца, што раніцай Вам трэба выклікаць спецыяліста па камп'ютэрах. Зноў прыйшло нейкае глупства. Мяркуйце самі: ці ж магла Ваша рука напісаць такі банальны фінал? «І ў абдымках яны заснулі назаўсёды». Ваша рука напісала б нешта на галаву вышэйшае за гэтую бязглуздзіцу. Успомнім, прыкладам, фінал з «Траіх»: адразу ж пасля агляду самазабойства мужа жонка бяжыць на сустрэчу да каханка. Разумее, што ён хворы на галаву, вар'ят, нават горш — садыст, звер, але не можа стрымаць сваю жарсць».

«Яна не ведала, што, аддаляючыся ад морга, няўхільна набліжаецца да яго. Не, да мяне! Да нас! І яна кінулася бегчы.

Хутчэй! Звер чакае яе!

І яна пабегла па простачцы, якая была кругам.

Яна не ведала, што рэшту ночы правядзе побач са мною.

Яна не ведала.

Let it be!

— Прыгожая пара,— усміхнуўся патолагаанатам, уваходзячы скальпелем у маё цела.

Анатамаваць каханую яму не было патрэбы».

Во гэта — Вы! Тут усё напісана Вашай рукою! Чыста. Дынамічна. Экспрэсіўна. Двайны, нават трайны сэнс, і нічога лішняга. Ваша рука. Ваша...

Яшчэ раз раім звярнуцца ў бліжэйшую фірму па рамонце камп'ютэраў. З пашанаю — рэдактар аддзела...»

— Сапраўды перагрэўся,— паклаў руку на лоб пісьменнік.— Годзе! На сёння ўсё. Спаць! Адпачываць. Раніцаю пабачым, што да чаго. Свежая галава — палова поспеху.

Ён прайшоў у спальню. Жонка, бессаромна голая, ляжала пад кандыцыянерам. «Дзіўна,— сцепануў плячыма.— Заўсёды баялася холаду, не выносіла тэмпературы ніжэй за трыццаць і ніколі не раскрывалася. А тут ляжыць сабе ў патоцы халоднага паветра і ўсміхаецца». Па жончыных грудзях беглі-перакочваліся хвалістыя дрыжыкі. Пісьменнік заціх. Цела прыўзнялося, выгнулася, затрымцела, зноў апусцілася на пасцель. Жонка прашаптала:

— Яшчэ! Але, але, так! О-о, як мне хораша!

«Перапрацаваўся! — уздыхнуў пісьменнік.— Два апавяданні за дзень! Сапраўды можна звар'яцець! Спаць! Зараз жа! Інакш — дурдом, міраж, блюзнерства! Пачуецца ж такое».

Лёг побач з жонкаю. Асцярожна паклаў руку на яе грудзі. З-пад далоні выслізнула нешта валасатае, потнае, гідкае.

— Уцякаю, уцякаю! — дыхнуў на пісьменніка жахам знаёмы голас, падмацаваны пахам серы.— Ты гаспадар, ты! Не хвалюйся. Грунт я падрыхтаваў. Магу, калі хочаш, і далей за цябе папрацаваць. Толькі скажы...

— Галюцынацыі... Усё! Я паралізаваны, дабіты,— прашаптаў пісьменнік і забыўся.

— Мой муж — найлепшы ў свеце! — разбудзіў яго жончын пацалунак.— Ноччу ты так салодка ўвайшоў у мяне, што здавалася, сэрца разарвецца ад шчасця. Ты волат! Супер! Як я кахаю цябе! Да няпамяці кахаю...

«Чуеш, што гаворыць? «Да няпамяці»! Калі ў цябе такое было?! А мяне праганяў!» — ажылі ў пісьменнікавай галаве шматкі фраз.

Ён выплываў са сну з выразным усведамленнем, што наперадзе яго чакае шмат цікавага. «Вінчэстэр недарма купіў»,— падумалася ў адказ на сваё ж пытанне пра тое, што будзе рабіць далей.

— Так! Змагацца, не апускаць рук! — загадаў сабе.— Біцца да канца.

Зачыніўся ў кабінеце. Пасля хвіліннай паўзы патэлефанаваў адвакату:

— Дружа, не дзеля службы, кінь усе справы і знайдзі сур'ёзную фірму пратэзавання. Ніяк не прывыкну жыць без рукі. Хоць дзеравяку якую прычапіць. Не, дзеравяку, вядома, не трэба. Даведайся, што ў гэтай галіне ёсць найлепшае, і паведамі. Тэлефануй. Чакаю.

Чакаць давялося вечнасць — трыццаць неймаверна доўгіх хвілін.

Званок.

Адвакат гаварыў, як у гарачцы:

— Не ведаю, можа, дарэмна мітусіўся. У найлепшага і цана адпаведная. Два мільёны каштуе апошняе дасягненне канструктарска-камп'ютэрнай думкі.

— Пляваць на грошы! — перабіў яго пісьменнік.— Сёння ж аплаці!

— Гэта можаце зрабіць толькі Вы асабіста. Згодна з дамоваю, каб зняць такую суму, патрэбен Ваш подпіс.

«Малайчына д'ябал: тры — нуль! — паклаў трубку пісьменнік.— Спрытна гуляеш! У адны вароты. Добра, дастаў! Што ж, пагуляю і я! Толькі — як цябе знайсці, каб ударыць у адказ? Дзе шукаць? Думай, думай! — заклікала свядомасць.— Ратуй сваё становішча, сям'ю, жыццё!

Галоўнае — пераадолець бар'ер. Прарыў мажлівы толькі праз апавяданне. Але... такія апавяданні, відаць, пішуцца адно праваю рукою, якой няма. Інакш не выходзіць. Дзе ж узяць руку? Замкнёнае кола. Няма выйсця! Тупік! Фініш! Канец! Прыплылі!

Стой! Заткніся! Салапяка! Слабак! Выйсце ёсць заўсёды!

Думай, думай, думай...

Ціха!

Ёсць! Вядома ж, ёсць!

Ёсць адно апавяданне. Невядомае. Пра жонку. Яна прасіла яго не публікаваць. Занадта інтымнае. Так яно і засталося ненадрукаваным. Як я забыўся! Зараз жа начытаю камп'ютэру. Можа, пойдзе».

Пісьменнік прабег вачыма апошнія радкі. Узмакрэлы, паглядзеў на кандыцыянер: робіць. Пачуў знаёмы голас:

— Махлярства, мой дружа! Пайшоў на падман? Навучыўся чыніць у абход?! Давай, камбінатар, што ў цябе там?

— Прапанова. Свежая. Я хачу ўвесці новыя, больш жорсткія і цікавыя, правілы гульні.

— Больш цікавыя, кажаш? Давай, прыдумляй, спрабуй падмануць бацьку. Хоць, як мне падавалася, нам і так з табою сумаваць не даводзіцца. Пра вінчэстэр, скажам, успомніў. Гэта ты дарма. Не той метад.

— Разумею, згодзен, але я пра іншае. Унясём дадатковыя ўмовы. Ты шмат мне даў. А цяпер, наадварот,— адбяры што.

— Што, прыкладам? І навошта? Які ў гэтым сэнс? Нешта не падабаецца мне тваё хітраванства...

— Мне таксама далёка не ўсё падабаецца. Зрабі так, каб у мяне не стала найраднейшых людзей — бацькоў!

— І што потым?

— Потым — новая гульня.

«Згаджайся, згаджайся! — заклінаў пісьменнік д'ябла.— Не будзе бацькоў — не будзе мяне, і, такім парадкам, скончацца ўсе гэтыя жахлівыя кашмары».

— Дык тут і думаць няма чаго,— адказаў д'ябал, павесялеўшы,— згодны. Гэтай прапановы я чакаў дужа доўга. Можна сказаць — усё антыжыццё!

«Ён чакаў, каб мяне не стала? — збянтэжыўся пісьменнік.— Нешта тут не так. Ды чорт з ім! Галоўнае — вырвацца!»

«Не, чорт — з табою! — ухмыльнуўся д'ябал.— Усё тут акурат так. А што да таго, каб вырвацца, дык — пра гэта ўсе мараць».

Ён быў у экстазе, у стане трызнення. Ён спаў сам з сабою. На ім ляжаў ён — д'ябал.

— А-а-х,— стагнаў у аргазме. Адчуў, што апрытомеў, і з прыдыханнем прашаптаў: — Я ж табе казаў: добрая ўгода, выгадная. Няма продкаў — няма цябе! Хітра прыдумаў. Але так не бывае. Лёсам

табе наканавана быць у адным біяполі з жонкаю. Раз яе няма — ты стаў ёю. Ты — у ёй. Гэта твой лёс! Затое я цяпер — ты! Прыемныя навіны, праўда? Я — ты. Твая жонка на Беверлі-хілз з табою-мною-д'яблам! Не плач! Добрыя навіны, добрыя. Ты ведаеш, а некалі ж гэтак і было! Я толькі вярнуўся ў сваё цела. Вось так! Дзякую. Шчыра! Very well! Каб ты ведаў, як мне надакучыла бадзяцца па Беверлі-хілз!

## Гэта не балюча

### I

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ: «Ты — нябожчык!» Як бы вы самы ўспрынялі такі вырак: «Малады чалавек, галубочку, хацеў бы папярэдзіць: жыць вам засталося не больш як год! Не больш! І не глядзіце на мяне як на вар'ята, і не спрабуйце раскрыць рот і пра нешта спытаць. Я не ведаю, колькі дакладна часу адвёў вам Найвышні — хвіліну, гадзіну, дзень ці месяц, але пэўна што — не болей як год!»

Навошта, адкуль нарадзілася, узнікла, усялілася ў мяне здольнасць прачуваць смерць? Не сваю — чужую. Як вызначаю, што менавіта гэты няшчасны альбо няшчасная — з тых, каму засталося жыць меней за год? Не ведаю.

Іду па шырокай шматлюднай вуліцы і здзіўляюся: асуджаных не так ужо й мала! Яны быццам апякаюцца аб мой позірк, кідаюцца ад мяне, паскараюць крок, калі не бягуць. Але куды б яны ні кіраваліся, куды б ні ішлі, ні беглі, мне вядомы іх фінал, дакладней — блізкая яго няўхільнасць.

Чым тыя, каму засталося жыць меней за год, розняцца ад іншых? Як распазнаю іх? Хто надзяліў мяне гэтым жудасным самазабойчым дарам? Хто?

### II

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ. Загаварыў ён. Амаль закрычаў. Нечакана, з налёту. Агідна. Так, мабыць, рыпелі веснічкі ў юдавым доме. Разам з голасам з рота вырваўся смурод мярцвячыны.

— А, новенькі, цёпленькі! Яшчэ неадукаваны? Захапляешся вялікім, невядома кім табе дадзеным усёмагутным дарам? Давай, давай, чмурэй, цешся! Першыя дні ўсе на сёмым небе лётаюць. Язык, пэўна што, свярбіць? Так і хочацца пахваліцца, ударыць у званы? Адгадаў? Прызнавайся, не маўчы. Хвалюешся? Не бойся. І не спадзявайся што змяніць. Усё згодна з планам. Увесь свет згодна з планам. Здзіўлены? А гэта праўда, павер. Выпадковасцей не бывае. Ведай, пад канец падарожжа і ты будзеш кідацца ад навікоў. Меней за год засталося не нейкім там нешчаслiўцам. Акурат нам — мне і табе. Гэта значыць, ты — наш, той, хто ўвайшоў у круг, пераступіў мяжу, трапіў на адваротны бок. Таму ты і ёсць пасвячоны. І не толькі ты! Усе, каму засталося меней за год, ведаюць праўду пра сябе. Ведаюць, але маўчаць. І рота ніколі не разявяць. Пад страшнымі катаваннямі не прызнаюцца. Дзеля сваіх блізкіх і дзеля самых сябе. Ёсць закон, правіла, прынцып: балбатун памірае да часу, раней прызначанага часу. Памірае ў пакутах, у полымі, у пекле. А хто хоча трапіць у пекла? Ты?

Згадка пра пекла прымусіла мяне здрыгануцца ад жахлівай фантастычнай здагадкі: я пазнаю тых, каму засталося жыць меней за год, бо стаў для іх сваім. Я свой, такі самы, як яны, ужо калею, амаль што нябожчык. І ніхто з іх не кажа пра гэта, не крычыць. Не хочуць, баяцца адысці раней. Тым болей — у пекла. Але гэта яны не хочуць — нармальныя, звычайныя, якіх бальшыня. Мне ж карта ў жыцці іншая выпала.

— Я! А хіба ты — не хочаш?! — адказаў пытаннем на пытанне. Ён знямеў ад такога нахабства. Яшчэ ў маленстве я засвоіў: нечаканасць — галоўнае, з чаго складаецца перамога.— Хіба не прагнеш помсты? Не імкнешся да справядлівасці? Не? Хочаш спакойна дажываць — і ўсё? Навошта? Не ведаеш? А я ведаю! Ёсць мэта! Найвышэйшая! Галоўная! Самая першая! Аснова, падмурак, сэнс жыцця...

— Жыцця? — ачуўся крыкун.— Ну не! З жыццём у цябе зараз пачнуцца праблемы! Не будзе ў цябе ніякага жыцця!

Ён пайшоў на мяне. Чамусьці я гэтага чакаў.

## III

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ. Але мог дзеяць. І першы схапіў яго за горла. Што будзе, калі ён памрэ раней часу і не праз свой доўгі язык, а ад маёй рукі? Я заб'ю злога вестуна і закрычу, выкрыю сябе: «Людзі, мне засталося жыць меней як год! Таму прызнаюся: яшчэ за год да смерці асуджаныя знаюць усё, але маўчаць!» Пасля такога самавыкрыцця, думаю, пекла мне забяспечана. А гэта — галоўнае, тое, да чаго я імкнуся: трапіць да юдаў, у апраметную. Знайсці там забойцу бацькі! Вось мэта майго жыцця! Кроў — за кроў, смерць — за смерць! Але смерць за смерць не выходзіць. Я спазніўся. Цягнік пяцідзесятых пайшоў. Застаецца кроў — за кроў, кара — за кару, пакуты — за пакуты.

Пальцы сціснулі кволае горла. Яму, відаць, і праўда заставалася не шмат часу. Ён быў вышэйшы за мяне, з выгляду дужэйшы, але дарма спрабаваў адарваць ад сябе мае рукі — нумар з абаронаю не прайшоў. Пазногці ўсё глыбей упіваліся ў ягоную шыю. Правы ўказальны намацаў кадык, падчапіў яго, націснуў — і вочы высокага палезлі з вачніц. Жоўтыя, з зялёным ваніты змяёй выслізнулі з яго рота. Я адпусціў кадык, і крыкун абвяў.

Цяпер мара збудзецца. Я — забойца ды яшчэ і выдаў сябе. Усё зроблена з запасам. Мушу трапіць туды, куды імкнуўся. Заслужыў, дамогся, маю права. Ды што там права — я абавязаны сустрэцца з забойцам бацькі. Дзякуй табе, крыкун, дзякуй!

## IV

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ. Нешта ляцела, вішчэла, набліжалася да мяне. Смерць? Зноў? Адскочыў, прыпаў да зямлі, заціх. Тое вісклівае «нешта» не папала, але паспела зрэагаваць, згрупавацца, перакаціцца, устаць. Загарлала, залямантавала. Яшчэ адзін крыкун?

— Свалата! Цяпер табе засталося меней за гадзіну. Ты пазбыў мяне асалоды назіраць, сачыць за табою. Не хацелася забіваць цябе адразу. Думаў, пагуляем, пабегаем, падужаемся. Але ты не пакінуў мне выбару. Ведаеш, хто ты? Нябожчык? Не! Ты — мой духоўны двайнік. Я той, каму засталося меней як месяц. Ты прыйшоў змяніць мяне. Але, выбачай, гэтае права трэба заваяваць. Калі

я заб'ю цябе, дык зноў стану тым, каму меней за год. Бачыш, я не хачу з наскоку. Няхай усё выракуе сумленны паядынак. Такі закон. Уставай, кожная хвіліна дарагая. Цябе павінен пакараць я, а не Найвышні. Мне трэба паспець да ягонага прыходу.

«Паядынак дык паядынак! — думаў я.— Гэтага за горла не схопіш — галава адразу пераходзіць у плечы, валасы густыя, доўгія». Я схапіў яго за валасы. Пяцярнёю. Тузануў уніз. «Ну, гад!» — заехаў нагою яму ў жывот.

Ён ірвануўся, вызваліўся, адскочыў, завішчэў:

— Паскуда! Я прыкончу цябе! Ты будзеш трэці. І тады я вярнуся на той бок.

— Не вернешся! — Я кінуўся ўсім целам яму пад ногі.

Інерцыя, памножаная на лютасць, памагла зваліць долуаграмадную тушу. Дабраўся да горла. Душыў. Галоўнае душыць! Гэта ў мяне добра выходзіць. Пальцы сціснуліся. Цяпер разумею, чаму так цяжка адарваць бульдога ад шыі ахвяры.

## V

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ. Я ўвайшоў у ноч, у холад, у нікуды, у пекла. Я знарок апынуўся тут першым. Супраць правілаў. Супраць усіх. Я адзін. Мяне не павінна быць. Я — выпадковасць, якой не бывае.

Вочы звыкліся з цемраю і ўлавілі ўдалечыні мігатлівы агоньчык. Здаецца, цяпельца гарэла там сінім полымем. Хацелася падысці, але нешта падказвала: не спяшайся, засвяціцца заўсёды паспееш. Галоўнае — знайсці забойцу, учыніць яму допыт. Марудна, спакваля пілаваць-ірваць ірада на часткі. Катаваць, катаваць, катаваць! Кожны падлюга павінен ведаць: за свае паскудныя справы адкажа. Рана ці позна адчуе, як варыцца ў катле. Рана ці позна па ягоным горле пальецца растоплены метал. Рана ці позна з яго здзяруць скуру, вырвуць ягоны адростак. Ад такіх не павінна заставацца нашчадкаў. Такіх трэба вынішчаць пад корань. Дзеля гэтага я зышоў у пекла. Пара пачынаць селекцыю. Пара.

І рушыў на сіні агоньчык.

## VI

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ. Чацвёртыя суткі, брудны і потны, я поўзаў па камянях. Агоньчык то набліжаўся, то аддаляўся. Нейкім цудам я дапяў да яго — падмануўшы, зайшоўшы з тылу. Сіняе святло струменіла з пячоры. Я ступіў туды. Так, іх катавалі ў аграмадных пячорах-норах. Яны паразвучваліся гаварыць. Мыкалі, плакалі, malілі, душыліся сваёю крывёю і... не паміралі.

Мне пашчасціла застацца незаўважаным, хоць было імгненне, калі ледзь не выдаў сябе. Убачыў бацькавага забойцу. Ён ляжаў, распяты на каменным доле. Я ведаў, што так кладуць надта старанных, выслужлівых катаў. У роце юды тырчэла лейка. Выканаўца нёс коўш з растопленай смалою. Коўш разбураў мае планы. Я хацеў, каб падлюга загаварыў перад знікненнем. Як перашкодзіць выканаўцу? І з чаго гэта ён спыніўся, прыслухоўваецца? Няўжо ўчуў мяне? Ціха! Ляжаць, не варушыцца, зліцца з зямлёю, з пячораю, з пеклам. Выканаўца азіраўся. Накіроўваецца да мяне? Не, павярнуў да выхаду. Смала ў ягоным каўшы астыла, ці што?

Час ішоў. Імгненні адлічвала сэрца. Выканаўца не вяртаўся. Можа, узяў разрыўку? Я асмялеў, падняўся, зняў з пояса біклажку з вадкасцю. Гэта была няпростая вадкасць. Ад яе малекулы распадаюцца на атамы. Яна ператварае жывое ў хімію, у перыядычную табліцу, у нішто.

Пякельнай вадкасці не пашкадаваў. Выліў на ногі. Не спяшаўся. Ён, як і ўсе, толькі мыкаў і з мальбою лупіў на мяне вочы. Ён прайшоў усе кругі пекла і ўжо нічому не здзіўляўся. Хацеў знікнуць, растаць, позіркам маліў пра гэта. І я дапамог яму. Дапамог бацькаваму забойцу. Нашы жаданні дзіўным парадкам супалі. Такое бывае. У пекле.

— Раскажы, як катаваў бацьку,— падступіўся да мэты свайго візіту.— Што шэпчаш? Не катаваў? Дык гэта ён на сваю ахвоту падпісаў відавочную хлусню на сябе? Не? Білі? Ужо «мы»? Яшчэ нехта, не ты адзін? Збіццё да смерці — гэта, па-твойму, не катаванне?

Я даў сабе волю — стаў асыпаць юду праклёнамі. Апамятаўся, калі той пачаў раставаць. Рассыпаліся ступакі, калені, жывот, грудзі. Апошняй рассыпалася галава.

Гэтага моманту я чакаў. Гэта быў галоўны момант. Яго нельга было праваронiць. Ад цела юды адлучалася душа. Яна паляцела б шукаць сабе новы прытулак. Такога я не мог дапусціць.

Душа ўсплыла і збіралася ўнікнуць. Я не спазніўся, падпаліў гадзючае воблака — шпурнуў у яго гаручае палена. Воблака пыхнула і, перш чым знікнуць, абпаліла мяне. Гэта было апошняе паскудства, якое ўчыніў забойца.

## VII

Я НЕ МОГ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЧАГО АБО СКАЗАЦЬ. Я ўзляцеў, праваліўся, зноў узнік, прачнуўся — спаў. Расплюшчыў вочы. Дома. Чаму? Як вярнуўся? Што зрабіў апошняе? Спаліў гада? Гэта быў сон? Не ведаю. Што было яшчэ? Два забойствы? Ірад быў трэці? Я забіў трох і вярнуўся на гэты бок? Пераступіў мяжу? Шкада! Але сон гэта ці не сон?

— О, мы зрабілі ласку прачнуцца,— зазірнула ў спальню каханая. Падышла, выцерла мой змакрэлы твар. Пасміхнулася: — Харошы ты мой! — Памацала, ці не развязаліся за ноч вяроўкі. Не развязаліся, да крыві ўпіліся ў мае запясці.

— Праклінаю цябе!

Каханая прашаптала:

— Ты, мой дарагі,— трэці. Мы абое робім добрую справу. Ты адпомсціў за бацьку, я — адпомшчу за дзеда!

Нож увайшоў мне проста ў сэрца. Зусім не балюча, калі ў вас разрываецца сэрца. Цяпер я гэта ведаю...

## Вяртанне

Яна зайшла ў ягоны пакой. Тут ён працаваў. Удзень і ўночы ледзь чутна гудзеў камп'ютэр, нястомна пастуквала клавіятура. Ён працаваў да знямогі. Спяшаўся дагнаць час, лёс, жыццё. Тут нараджаліся ягоныя героі. Адкрытыя, смелыя, гордыя, нязломныя. Не здаваўся і ён. Змагаўся, пакуль не загінуў.

Ён загінуў, але засталіся героі ягоных апавяданняў. Цяпер яны жывуць за яго. Памагаюць трымацца ёй. «Ты не адышоў, ты побач.

Ты, я і твае героі. Мы разам»,— як замову, шэпча яна, калі сядае перад камп'ютэрам.

Сёння яна зноў зайшла ў ягоны пакой. Як заўсёды, дзень праляцеў неўпрыкмет. Цямнела.

— Вось і пабачыліся,— уздыхнула, прачытаўшы фінал ягонага апошняга апавядання. Навяла курсор на кнопку завяршэння работы.

Слёзы каціліся па твары.

— Памажы! — сарвалася на крык.— Памажы паяднацца з табою. Заўтра пабачаць свет твае апавяданні. Іхныя героі пойдуць у людзі. Я зрабіла ўсё, што магла. Цяпер вольная! Я прыйду да цябе. Толькі памажы.

Гарбаты карлік з яйкаватай галавою, зраслымі бровамі і маленькімі, нібы дзіцячымі, пальчыкамі набраў на клавіятуры:

«Тата Д'ябал! На месца прыбыў, але трапіў у пастку. Героі апавяданняў заблакавалі пакой пісьменніка. Прапануюць абмен: маё жыццё на жыццё аўтара. Не ведаю, што рабіць. Чакаю дапамогі. Прашу адказаць як мага хутчэй.

Ваш Звыродны».

Д'ябал аказаўся адразу:

«Падвёў ты мяне, сынок, падвёў. Хоць што тут паробіш: маладосць, неспрактыкаванасць. Зразумелая сітуацыя. Давядзецца напружыцца, трэба ж неяк выцягнуць цябе з людскога балота. Цяпер — аб справе. Скажы блакіратарам праўду: аўтара вярнуць нельга. Яны — ажылі, значыць, іхны стваральнік ужо ў гісторыі. Няхай зробяць сваё — заб'юць цябе. А я буду чакаць твайго вяртання. Не хвалюйся — гэта не апошняя спроба».

Так і здарылася. Адзін з герояў уварваўся ў пісьменнікаў пакой і выкінуў вырадка праз акно. Той не разбіўся, а, нібы свярдзёлак, увайшоў у зямлю.

Барацьба пачалася спачатку. Першая спроба сталася для ўсіх няўдалай.

Яна зноў у ягоным пакоі. Гэтым разам камп'ютэр завёўся і загрузіўся сам.

— Што рабіць? — глядзела, як ажывае дысплей.— З вырадкам нічога не выйшла, але, можа, ёсць іншыя варыянты? Памажы, зусім

знебылася без цябе. Героі адзін за адным ідуць у жыццё, і скора я застануся адна.

— Не хвалюйся! — адказаў дысплей.— Усё ідзе згодна з планам. Адзін з герояў ужо не наш, але гэта толькі дапаможа.

— Я веру табе. Спадзяюся, усё будзе, як ты задумаў,— з палёгкай выдыхнула яна.

— Я таксама,— засвяцілася на дысплеі, і праз секунду манітор згас.

Далейшыя падзеі не забавіліся.

«Малайчына д'ябал, добра прыдумаў,— усміхнуўся, гледзячы на пісьменніцкую ўдаву, вырадак. Ён толькі-толькі з'явіўся і адразу ж адчуў яе пяшчотны радасны пагляд.— Варта прыняць аблічча аднаго з герояў — і зусім іншы вынік. Татка разумны».

Вынік і праўда быў іншы, але не той, пра які карлік думаў.

Ператвараючы свайго вырадка ў героя, д'ябал не ўлічыў, што за зменаю абалонкі мяняецца і нутро. Нутро ж яе стварае. Карлік рассыціўся ў героі. Здзейсніўся пісьменнікаў план. Герой быў часткаю яго самога, першаю прыступкаю праточвання, пачаткам вяртання.

— Ты ўжо тут? — спыталася яна, не верачы сваім вачам.

— Добрага дня, дарагая! — ажыў пісьменнік.— Ну і як табе спадабалася наша апошняе апавяданне?

## ЗАПІСЫ

*Абразкі*

### Мера кахання

Каханне не бывае трошкі ці занадта шмат. Альбо ты — палаеш, нервуешся, радуешся, пакутуеш, летуценіш, узлятаеш на неба і падаеш у бездань. Альбо вакол цябе ўсё — шэрае, чужое, мёртвае.

Каханне не бывае трошкі ці занадта шмат...

### Садок

Мы былі суседзямі. Яна — мілая, прыгожая, добрая. І я — шляхетны яе кавалер. Часам па-суседску яна запрашала мяне ў госці ў свой ложак. Мы церліся насамі, дыхалі адно ў аднаго — і былі шчаслівыя.

Больш за ўсё мы баяліся вечара. Увечары нас разлучалі. Яе забіралі ў пяць, і я яшчэ цэлую гадзіну плакаў за альтанкаю ў пясочніцы, пакуль не забіралі і мяне.

А наперадзе было ўсё жыццё. У кожнага — сваё.

Я не памятаю яе вачэй, твару, усмешкі.

О, як я сумую па ёй!

### Яны не ведалі

Ён глядзеў, глядзеў і не вытрымаў — торкнуўся ёй пад спадніцу, абняў ногі. «Цвёрдыя, як дрэвы»,— прыцціх.

Надзіва, яна не закрычала, не адскочыла. Злавіла сябе на тым, што хацела гэтага, думала — ашалела. Заціхла, уздыхнула, прыціснула яго да сябе:

— Так добра?

— Ага,— вымавіў ён ледзь чутна.— Вельмі.

— Кахаеш мяне?

— Больш за ўсіх на свеце! Не праганяй!

— Не буду.

Ён прыціснуўся да яе ног-дрэў яшчэ мацней. Яна праз спадніцу гладзіла яго па галаве.

Яны не ведалі, што ніколі ў жыцці не зазнаюць большай, чым у гэтыя хвіліны, асалоды.

## Мяжа мажлівасцей

Мяжы сваіх мажлівасцей не ведае ніхто.

Канчаюцца трэція суткі за рулём. Адолена чацвёртая тысяча кіламетраў. Без адпачынку. Запраўка — ноччу ў дальнабойцаў: паўсюль — шакалы.

Ён змагаўся. Доўга. Але стаміўся, здаўся, і сон, здавалася, ужо забраў яго ў свой ілюзорны свет. Апошнім напружаннем волі ён прымусіў сябе азірнуцца, і — о, цуд! Бясконцую стомленасць, жаданне заснуць, забыцца — як рукою зняло: на заднім сядзенні ўсміхаліся бялявыя хлопчык і дзяўчынка, і ён ажыў. Зноў, у соты раз.

Няма мяжы!

Мяжы сваіх мажлівасцей не ведае ніхто!

## Не прасачыліся

Яны стаялі на мосце, узіраючыся ў прадонную цемру Свіслачы. Ведалі: там смерць. На душы было спакойна: нягледзячы ні на што, яны застануцца разам. Утраіх: ён, яна і дзіця, што зараджалася ў ёй. Гэта было адзінае выйсце, адзіная для іх мажлівасць не разлучацца. Ёй загадалі рыхтавацца да ачышчэння — так яны гэта называлі, а на яго завялі справу аб спакушэнні непаўналетняй. Яе бацька, генерал-чэкіст, пакляўся: «Ніколі ў мой род не прасочацца жабракі-паэты».

Не прасачыліся.

Двое — не, трое! — скочылі з моста, абдымаючы цяжкія камяні.

Не дачакацца чэкісту працягу роду.

## Адно цэлае

Ён не стрымаўся, выцяў яе: здрадзіла, прамяняла, усё жыццё пусціла пад адхон.

Яна адчула палёгку: ён не адышоў адразу, не кінуў, хоча яе пакараць, заглушыць свой боль яе болем. Што ж, няхай будзе так. Галоўнае, каб ён застаўся з ёю, застаўся побач. Яна болей не насмеліцца. Ніколі! Барані Божа! Яна толькі паспрабавала, не са злосці, з цікаўнасці. І дарма! Апяклася. Але яна вытрывае, адолее хоць якія выпрабаванні, каб застацца з ім.

Яны ж — адно цэлае.

Ён думаў: пакрыўдзіў, не стрымаўся. Так, не стрымаўся, не змог, здаўся, зламаўся. Напляваў на пражытыя гады. А цяпер што? Дзе выйсце? Ці можна выправіць сітуацыю, вярнуць каханую?

Стой! Не ныць! Шукай выйсця! Выйсце ёсць заўсёды! Ён павінен вярнуцца на кругі свае. Даравацъ, забыць фатальную выпадковасць, выразаць з памяці дакучлівы нарыў. Супакоіць сябе і яе. Застацца з ёю.

Яны ж — адно цэлае.

## Ігар Елянёў: Рэквіем

Ёлкі-палкі, Ёлкін-Палкін... Тваё прозвішча было Елянёў, Ігар Елянёў, але я перайменаваў цябе ў Ёлкіна-Палкіна. Атрымалася весялей і, як ні круці,— усё ў яблычак: «Ах, змей, Ёлкін-Палкін!», «А ты жартаўнік, Ёлкін-Палкін!», «Кажаш, па конях, Ёлкін-Палкін?!», «Ух і рызыкант ты, Ёлкін-Палкін!». І то абавязкова з клічнікам і толькі на біс! Ты заўсёды ўсё рабіў на біс! Спяваў, граў, кахаў...

Ты знаўся з найлепшымі жанчынамі, не адну цнотку ўвёў у свет салодкага юру. Ростам крыху вышэй за сярэдні, падцягнуты, з прыгожым, быццам вытачаным, тварам, у якім адгадваўся далёкі намёк на азіяцкае, дакладней, японскае паходжанне.

Ты пачынаў, калі яшчэ біліся на танцпляцоўках,— у сярэдзіне сямідзесятых. Граў у ВІА, шалёна лупіў па бубнах і спяваў з абавязковым «іхнім» пранонсам фогертаўскае «Хэй, ту найт!»...

Дзяўчаткі дрыжэлі, вар'яцелі, а ты, адыграўшы хіт Абадзінскага «После буквы эл...», які завяршаў праграму, кідаў:

— Едзьма ўсе, якія праблемы!

У цябе ніколі не было праблем. Ратавалі дарагія рэчы, якія ты насіў з выкшталцонай абыякавасцю. На іміджы не эканоміў, хоць у той час у нас ніхто як след не ведаў гэтага слова. За «стол» у рэстаране мог разлічыцца французскім пінжаком з «тоўстага» велюру, таксісту не пашкадаваць «лакостаўскай» кашулі, дзяўчыне падарыць ноч неабсяжнага, на мяжы выжывання, кахання, ноч, якую яна не забудзе ніколі!

Ніколі!

Так!

Паміраў ты адзін. Раніцай адчуў Яе набліжэнне. Успрыняў як належнае. Ведаў, здагадваўся — адвесці ці хоць замарудзіць Яе прыход можа толькі спакой. Прылёг, ашчаджаў сілы. Але не ляжалася. Ты ўстаў, па-дзіцячаму наіўна пастанавіўшы, што яшчэ не позна, што можна выратавацца, трэба толькі выпіць болей малака, вельмі многа, ачысціць арганізм ад алкагольнай заразы. Але арганізм сказаў — не! Арганізм закрычаў — не! Арганізм помсціў, забіваў, смяяўся. Цябе ванітавала, ванітавала, ванітавала. І ты здаўся, зноў лёг...

Напярэдадні сябры зноў напаілі цябе да непрытомнасці. Ужо дзесяць гадоў яны вось гэтак прыходзілі табе на падмогу, давалі мажлівасць забыцца, а ты разлічваўся з імі, выклікаючы гурму дзяўчат — былых сваіх паклонніц. Яны, праўда, даўно ўжо не дзяўчаты, а замужнія жанчыны, многія ўжо мамы, але сум па каханні, пражытым на золку жыцця, прымушаў іх страчваць розум і мчаць на твой покліч. Яны прыбягалі, не зважаючы ні на якія перашкоды і не задумваючыся ні пра што, забываючыся на мужоў, дзяцей...

Ты памёр у трыццаць восем. Не, не памёр — загінуў, загнаў сябе. Усё жыццё ты сябе гнаў: наперад, наперад, наперад! І мы неслі труну з тваім целам пад гіпнатычнае: наперад, наперад, наперад...

Сёння гадавіна тваёй смерці. І сёння памерла тваё першае і найадданейшае каханне, папраўдзе, забіла сябе — засілілася. Вы рассталіся, калі ты быў юны і нястомны, а яна вярталася ад цябе дамоў прытанцоўваючы, і рабача́й, што мокрым красавіцкім ранкам спяшаўся на завод, шчыкаў сябе: ці не сплю?

Сябар Ёлкін-Палкін, ты спазнаў найлепшых жанчын, але ёсць кола, ёсць ты і яна, тваё першае каханне. І цяпер вы будзеце разам, назаўжды. Кола замкнулася. Няхай зямля вам будзе пухам...

## Ёсць – не будзе

Яе не было, няма і не будзе. Той, найхарашэйшай, жаданай, каханай, дарагой, адзінай, самай блізкай, роднай для мяне жанчыны,— цябе. Ты не знікнеш, бо не з'явішся, не адгукнешся, не скажаш, што ты ёсць. Але ты – ёсць, бо я помню пра цябе, ведаю, мару, кахаю, абагаўляю, спадзяюся, жыву табой. Ты ёсць у думках, у мроях, у жаданнях, у імкненні знайсці цябе.

І пакуль ты ёсць – цябе не будзе.

## Праменьчык

Вось ён, праменьчык святла, надзеі!

Во, во, во!

Зні-ік...

Прачнуўся. Разбудзіў пракляты будзільнік. Устаў з левай нагі. Жах! Паплавок у бачку не тоне. Адарваўся. Смурод.

Зноў скончылася зубная паста, кава, гарбата – усё. Апрача яе.

Яна лямантуе, сварыцца, спапяляе вачыма, курыць, праклінае, плача, спіць з іншымі.

Узяла нож. Спрабавала забіць.

Збег.

На працу: болей няма куды.

Вахцёрка прачнулася, крычыць:

– У сем гадзін падняў! Не спіцца ўсякім паўдуркам! Зранку спакою няма! Ключы? Не дам! Абыдзешся, на, з'еш! Праца з васьмі. Чаго вочы вылупіў?!

Вылупіў. Глядзеў. Зразумеў.

Копія яе. Сука. Такое ж стварэнне. Такая самая яна-яно.

Збег. Зноў. Звычка.

Парк. Лаўка. Сеў. Круціў галавою, глытаў кісларод, супакойваўся. Убачыў. Ідзе. Знаёмая? Не!

Жонка!

Спынілася. З сабачкам, усмешкаю, увагаю.

Пра нешта спытала. (Які голас!) Мяне? Дзіўна...

– Вы? Вы помніце? Паездка ў Маскву! «Эс-вэ-купэ», раніца, зубная паста, кава, гарбата – усё.

17. Зак. 413

А-а!
Так, так, так. Напружваўся, успамінаў, хацеў.
Хацеў у казку. У жыццё... У тое: «Вы помніце?..»

Восць ён, праменьчык святла, надзеі!
Во, во, во!
Зні-ік...

**Арол ці рэшка?**

Як і навошта ў Бога так выходзіць, што адна хлусіць, не вылазіць з бруду — і вясёлая, а другая сумленная, чыстая — і заўсёды сумная, заплаканая? Што за дзіўнае размеркаванне? Я ненавіджу такую несправядлівасць! А можа, гэта лёс: арол ці рэшка? Але тады — пры чым тут Бог?

**Ён думае**

Ён думае, што ён ідыёт, бо яна думае, што ён ідыёт.
Ён — ідыёт!
Ён думае, што вінавата яна, яна — што ён. Ніхто ні ў чым не вінаваты. Проста ёсць такі панятак — псіхалагічная несумяшчальнасць.

Ён думае, што яна падгульвае, яна — што ён. У фінале: нервы, скандалы, бойкі...
Лепш бы яны падгульвалі ды ні пра што не думалі.

Ён думае, што дзяцей у сям'і мусіць быць трое (Бог любіць тройцу), яна — што досыць дваіх (гэтая лічба і ў школе была з ёю неразлучная). Так і жывуць. Зрэшты, жыве — яна. Ён — думае.

**Замена**

Памяняў адну саракагадовую на дзвюх па дваццаць.
Быў задаволены, шчаслівы, радаваўся, піў асалоду, лунаў у нябёсах, жыў!
Сканаў!

## Блізняты

Муж і каханак былі братамі-блізнятамі, але зразумелі гэта за нейкую хвілю да таго, як забілі адзін аднаго.

Новы партнёр удавы, калі чуў слова «блізняты», сутаргава сплёўваў і хрысціўся. Але знайшоўся брат і на яго — брат удавы. Ён не стаў чакаць, пакуль нажытае бацькам дастанецца новаму лавеласу.

На пахаванні забітага брат не суцяшаў сястры, не ліў слёз спачування: ён ляжаў побач, у такой самай труне.

«Не ведаю,— казала яна следчаму,— навошта ім спатрэбілася знішчаць адзін аднаго?»

## Палата № 8, або Праз 110 гадоў

Сцены тут выпацканыя брудна-блакітнай фарбай, столь пакрытая сажай, як у курнай хаце... Вокны з сярэдзіны знявечаныя жалезнымі кратамі. Падлога шэрая і шурпатая. Смярдзіць тухлай капустай, кнотавым чадам, блашчыцамі і аміякам. І гэты смурод у першую хвіліну робіць на вас такое ўражанне, як быццам вы заходзіце ў звярынец...

А. Чэхаў. «Палата № 6», 1892 г.

Ёсць на адной з ускраін горада М., як кажуць, чорт ведае дзе, збудаваная яшчэ ў часы сталага сацыялізму клінічная бальніца, а ў яе рэанімацыйным аддзяленні — палата № 8.

Што за палата? І чым ужо так адметная?

Пытанні — натуральныя, ды адказы на іх няпростыя.

Вось выпілі вы, скажам, з радасці, што жыццё да лепшага павярнула: зарплату, хоць мізэрную, і з боем, але вам аддалі. Выпілі, ну і, вядома ж, пацягнула вас на развагі пра існаванне сваё ўбогае, пра жыццё-быццё, якое на цвярозую галаву і жыццём не назавеш. «А калі яшчэ па кроплі?» — падумалі. Дзе кропля, там і дзве! А як жа інакш пасля змены-прыпаркі ды з гэткімі маленькімі грошыкамі ў кішэні расслабіцца-забыцца? Не на Канарскія ж выспы — мяккакліматычныя, суцэльна вечназялёныя — ляцець на праграванне костачак за пару дзесяткаў адзінак, для вас зусім не ўмоўных, а з боем, як ужо адзначалася, выбітых. Ды з імі з бліжэйшага рэстаранчыка пасля сціплага абеду-палудня жывым не выпусцяць!

Дзеля таго і пастаўлены дужыя хлопцы з тонкімі матылькамі на тоўстых шыях!

Значыць, выпілі і дабавілі. А дабаўка, нават наймізэрнейшая, як вядома, не ідзе на карысць арганізму, вітамінамі не распешчанаму. Зрэшты, распешчанаму — таксама не ідзе.

У выніку целам вы крыху аслабелі. Не трымаеце, скажам так, раўнавагі. І гэтая акалічнасць плюс кружэнне галавы вазьмі і кінь вас у абдымкі зямелькі родненькай. Пакаціліся вы снежным кулём з стромае горкі. Коціцеся, і раптам — бах! — дубок першага паваеннага саджэння пяшчотна вас цалуе.

— Го-па-а! Го-па-а! Амер-рыка — Еўроп-па-а!

Прыляцелі-прыехалі.

І стан вашага арганізма няўхільна завяршае пераход у стадыю, якую з'едліва называюць станам паміж небам і зямлёй. Што ж далей? А далей — вядомы ланцужок: выпадковы і неабыякавы (калі пашанцуе) мінак — цяжкія (і вашыя) енкі — спалоханыя крыкі-ляманты (мінака) — беганіна (яго ж) у шуканні тэлефона — бясконцае чаканне (ужо супольнае) — «хуткая дапамога» (нарэшце-такі!) — прыёмны (нібыта) пакой — аналіз (вядома) крыві — выяўленне (на жаль!) алкаголю.

І вось ён — прысуд.

— У палату № 8! — гідліва адрасоўвае вас выпадковы касталом у тутэйшы чысцец.— Га, га, га! Пт-фу! — пралятае плявень за сантыметр ад вашага правага вуха.

— Пайшоў! — штурхае целавозку яго памочнік, мазасанітар з недапраўленай воўчай зяпай.

І вы зноў едзеце — ужо на целавозцы — даўжэзнымі чорнымі калідорамі.

— У-ух! Кхы-кхы! — каркае крывой сківіцай, нагою кіруючы целавозкай, санітар.

— Давай, давай! — падбадзёрвае яго касталом.

Першае з вашых адчуванняў яшчэ ў калідоры паблізу палаты: агідны, да млоснасці, да кружэння галавы, смурод. Грымучая сумесь трупных гніенняў, моташнага смуроду фекаліяў, ванітаў і прыкрага паху сумесі зліплых крыві і «зялёнкі».

Праўда, вы ўжо зноў непрытомны і смурод вам — па чарапку. Што ж, хоць тут пашанцавала. Але на большае губу не раскочвайце — гэта, пэўна што, будзе адзінае, дзе ўдача, хоць і часова, на вашым баку.

Ваша палата затаілася на першым паверсе, але няма ніякага сумневу, што знаходзіцеся вы ў нейкім сутарэнні. Аб гэтым сведчаць хваравіта-цьмянае, нязменнае, удзень і ўночы святло; аблезлыя, чвэрць веку немаляваныя сцены; ірваныя кавалкі лінолеуму на падлозе, якія чапляюцца за ногі; плесня з рэшткамі вапнавага беліва на столі; абы-як памазаныя бура-шэрай фарбай вокны з іржавымі, крыва зваранымі жалезнымі прутамі; абгрызеныя — пацукамі, ці што? — дзверы.

Усё гэта вы ўсвядоміце і ўбачыце, калі, дасць Бог, ачомаецеся і разгледзіцеся. Разгледзіцеся і са спазненнем, горкім шкадаваннем зразумееце, якім шчаслівым жыццём да гэтага жахлівага моманту-выпадку жылі. Не было ў вашым атачэнні такіх харашунчыкаў, як гэты, прывязаны за рукі і за ногі, распрануты нагола пацыент злева, што тузаецца ў белай гарачцы; альбо з трубкамі ў разадраным роце «таварыш» справа, каторы захлынаецца крывёй і слінай. А ўжо пра стварэнне, якое безупынку паўтарае пяшчотную рыфмачку: «Я...ць тваю маць, я...ць тваю маць...» — размешчанае проста ля вашых ног, нешта чырванаскурае, кшталту мутанта — мешаніна малпы з сабакам, і казаць не даводзіцца.

Ёсць сярод гэтай гоп-кампаніі і паненкі. Адна харашуха, так-так, тая, у супраціўным куце, па-цыганску, амаль элегантна, трасе важкімі грудзьмі, а заадно вымольвае з заплюшчанымі вачыма ў столі цыгарэту: «Дай закурыць, ну дай закурыць, а я адпрацую, ох, як адпрацую, шкадаваць не бу-удзеш-ш». І язычок яе, як у галоднага ваўчаняці, бегае туды-сюды, туды-сюды... Адмысловая і суседка харашухі, высахлая ўшчэнт старая з шалёнымі вачыма і з закручанай бінтамі ў дзесяць столак галавой. Нейкія нелюдзі так папрактыкавалі аб яе ногі, што не памагаюць і столкі: сочыцца несупынна кроўка і праз бінты.

І ўсе трызняць, трызняць, трызняць. Усе дзевяць, дакладней, восем, апрача кактэйльніка — «таварыша з трубкамі», пацыентаў палаты № 8.

— Высако сяджу, даляко гляджу...

— Увязу цябе я ў тундру, увязу цябе-е адну-у...

— А мы яго па ша-апцы! А мы яго па ша-апцы!

— На табе, сука! На! Атрымай!

— Раўня-йсь, смір-рна! Ша-агам-м арш!

— Мгнавення раздаюць каму — пазор, каму — бясслаў-е, а каму — бясчэсце-е...

— Ж-ж-ы-ы-ы... Ж-ж-ы-ы-ы... Мы едзем, едзем, едзем...

— Оп-гоп, што ты, што ты, расчыняйце вароты!

Пра якія такія вароты гаворка ідзе?

І вось у гэтай вясёлай блюзнерскай кампаніі вас і знойдзе мясцовы эскулап — сама стрыманасць. Акіне гідліва вокам — здалёку, ад увахода, бліжэй — ні-ні! — фэ-э, якое паскудства! — палату-камеру і запіша навіка ў адкіды грамадства:

— Ну і бамжатнік! Бр-р!

А тое, што вы сумленны працаўнік, дваццаць гадоў сацыялізм на адным энтузіязме будавалі і пятнаццаць — капіталізм за сасіску ў дзень аднаўлялі,— гэта ў разлік не ідзе. Гэта ўжо вы самыя вінаваты, што некалі шарыкі ў забітай ура-лозунгамі галаве баяліся варушыць, а цяпер у пэўным стане ў бальніцу лучылі.

Больш за стагоддзе мінула, а пакінуты Богам воз — краіна-палата № 6, прабачце, № 8 — і сёння там.

...Старэнькая «хуткая» ў выглядзе дабітай дваццацьчацвёркі 1983-га, андропаўскага, года выпуску з віскатам, скрыгатам і выццём, выпусціўшы з заіржавелага нутра чарговую порцыю кurodыму, жвава хіснулася на два левыя колы, быццам на дыбкі, і завярнула да шлагбаума, што перагароджваў уезд у двор дзевятай гарадской клінічнай бальніцы. Амаль не зніжаючы хуткасці і не выключаючы сірэны, машына праскочыла пад шлагбаумам, які толькі што пачаў падымацца, і цудам яго не зачапіла. Яшчэ праз імгненне, заскавытаўшы тармазамі, застыгла каля збітых прыступак прыёмнага пакоя.

Чарговы кліент палаты № 8 — прыбыў!

— Рады вас бачыць! — скрывіў вусны ў амаль што сяброўскай усмешцы мясцовы эскулап — сама стрыманасць, але я яго не чуў.

## Класны хлопец

Ён згроб абедзвюма рукамі яе мясістую, укаранаваную сойчыкам-жолудам цыцку і — паплыў. Гарачыня чужога цела паглынула яго. Вяршыня асалоды! Харошая нейкім даўнейшым хараством, недасягальная, быццам з карціны Рубенса, яна, калі засталіся адны, неадступна гледзячы яму ў вочы (але, але, акурат праз іх, праз вочы, яна пратачылася і авалодала яго свядомасцю),

са спакоем ангельскай каралевы, падкрэсліваючы кожнае слова, спыталася:

«Раздзьмі цяпельца, застымулюй дзяўчыну. Не ведаеш як? Не ўмееш? А я навучу. Глядзі, усё вельмі проста. Трэба ўзяцца вось тут. Але не цісні, як танк, на грудзі. Яны нікуды не ўцякуць...»

Здзіўлены, дарагі мой чытач? А што ж ты думаў? Як яшчэ прымусіць такога гультая чытаць і адукоўвацца?! Проста са скуры даводзіцца вылузвацца, каб абібока на старонкі завалачы... Ах, табе і гэтага замала? Во ты які маньячок, выяўляецца! Што ж, хочаш нечага яшчэ баявейшага? З крывёю? Няма праблем! Развернемся на сто восемдзесят градусаў. Але пачатак — пакінем. Бачу, табе ён лёг на душу...

Ён згроб абедзвюма рукамі яе мясістую (та, та, та — прапусціў!) цыцку і зразумеў, чаго хацеў, пра што марыў, мроіў, якімі пакутнымі пакутамі пакутаваў. Усё жыццё! Ад нараджэння! З матчынага ўлоння! З генаў таго, хто яго зачаў. Ён і зараз смагне, памірае ад жадання, ад жарсці, аддаў бы ўсё — і як будзе, так будзе! Начхаць! Так, ён хоча аднаго — адкусіць яе сойчык. Вырваць з цела гэты гарачы, набрынялы, гладкі, амаль што без зморшчынак лялечны чубок чырвонай шапачкі! І яшчэ! Адкусіўшы, ён смачна яго выплюне: «Тфу!» — разатрэ нагамі, закрычыць, загалёкае, заглушыць яе стогны і ўвап'ецца зубамі ў другі сойчык: «Раз!» І з'есць. З чамканнем, давячыся. Кайф! Другі трэба абавязкова з'есці, праглынуць, увабраць у сябе! Ух! Ён не любіў паўтарацца...

Потым размяжджэрыць ёй галаву (каб замоўкла), і лепш аб сцяну (глухі, нягучны ўдар), і дабрацца да... Зрэшты — не! Спачатку — твар, вусны! Але, але — вусны! Пульхныя, жывыя, маладыя, вільготныя. Яны бязгучныя, амаль што нерухлівыя, але яшчэ дыхаюць, дыхаюць! О-о!

Вусны змахну нажом (не паўтарацца!). Навошта? А навошта забіваюць? Не ведаеце? Здагадваецеся? Думаеце — хворы? Глупства! Я — Маньяк! Так, так! З вялікай літары Маньяк! Звер! Забойца! Пачвара! Злы геній! Не шэрасць, як вы! Не шэрасць!

Ну што? Цяпер праняло? Не? Во даеш! Ты жалезабетонны, ці што? А можа, на скуралупні ў дзяцінстве ашываўся? Як жа цябе прымусіць чытаць, ёлкі-палкі? Слухай! А можа, ты з гэтых

разумнікаў, як іх... інтэлігентаў? Што ж ты раней не казаў? Нічога, і для цябе знойдзецца слоўка. Мяркую, вось гэта цябе разварушыць. Слухай. Бог любіць тройцу.

Ён згроб абедзвюма рукамі яе мясістую... Стоп, стоп, стоп. Ты ж у нас асаблівы! Цябе па-іншаму трэба ўлагоджваць. Ласкава. Мякка. Пяшчотна. Здаём назад...

Любая мая, цудоўная! Жыць не магу без цябе! Ты найхарашэйшая ў свеце! Шкада, што не для мяне!

Шкада...

Што? Навошта ж перапыняць? Занадта проста? Дзіцячы садок? Зноў міма? Зноў не туды паехалі? Добра! Давёў! Атрымай! Сам напрасіўся! Цяпер — не крыўдуй!

«Перавярнуць усё жыццё, зламаць, скрышыць усякія перашкоды, адолець нягоды, няўдачы, удары лёсу дзеля цябе — адзінай, жаданай, каханай! Ты — мая чараўніца! З табою спазнаў я рай! Рай — калі ты са мной! Рай — калі я з табой!..» — гэта я ўжо пяю. Бачыш, да чаго давёў? — нават голас прарэзаўся!

Чаму цішыня, я пытаюся? Дзе апладысменты? Дзе ўдзячнасць чулага, спагадлівага чытача? Ці зноўку не дагадзіў вашаму адмысловаму густу? А можа, вы аматар рэбусаў, загадак, дэтэктыўных забаў? Здагадаўся? Усё так? Нарэшце! Што ж ты, нягоднік, адразу не прызнаўся? Добра, разбяромся. Загадкі, загадкі, загадкі, тайна злачынства... Так, так, так... Ёсць! Казачка! Вясёленькая!

Жылі, не тужылі двое: ён і яна. Пабраліся даўно, гадоў пятнаццаць назад, але дзяцей — пра якіх марылі і снілі! — так і не займелі. Не лёс! Зрэшты, жылі дружна. Добраараблялі, хадзілі ў госці, тэатры, рэстараны. У водпуск ездзілі ў краіны далёкія і цёплыя. Так год за годам, прыступачку за прыступачкай і адольвалі ў гэтым свеце, нікому не замінаючы.

Але неяк раз, калі жонка вярнулася з работы (як заўсёды, раней за мужа) і зайшла ў хату, ёй адразу нешта падалося дзіўным.

Запала сэрца: «У яго ж быў пісталет!» Як ашалелая, кінулася на кухню. Нешта падказала: калі гэта здарылася, дык акурат там.

Муж ляжаў з прастрэленай галавой, але яшчэ дыхаў, глядзеў на яе. Хацеў нешта сказаць, хутчэй — пра нешта спытаць.

І яна зразумела, пра што, і адказала. Расшпіліла пінжачок, прыспусціла спаднічку, павярнулася да яго бокам:

— Так відаць?

І ён пабачыў. За імгненне да смерці пераканаўся: цяжарная! І нават паспеў узрадавацца (ён быў добры — як і яна, між іншым), прашаптаў:

— Даруй, я зламаўся, я хацеў...— не дагаварыў.

Ён памёр.

Каханая закрыла яму вочы. Прысела, абняла.

— Я ведаю, чаго ты хацеў, любы,— ледзь чутна варухнуліся вусны.— Ты марыў, каб я нарадзіла, але не жадаў змірыцца з думкаю, што зачаць я магу толькі ад другога. Замкнёны круг атрымаўся: я здрадзіла дзеля цябе, зрабіла тое, каб збылася твая мара і ты меў малога; ты памёр праз мяне: ведаў, што ніколі не зможаш дараваць здрады, і не хацеў абрыдзець мне сваёй рэўнасцю ды пакутамі...

Пачуўся званок.

«Малайчына, татачка,— падумала яна. І ўсміхнулася: — Толькі ж пунктуальны ты на сваю галаву».

Цяпер галоўнае — пазбыцца ад нялюбага. Любага ўжо няма...

А татачка ўляцеў радасны, усміхаўся. Дарэмна: татачкам ён так і не стаў...

Як табе гэткі сюжэцік? Што, зноў прэтэнзіі? Не зразумеў? Як жа цяжка табе дагадзіць! То — дзіцячы садок, то — недацяміў. Чытач называецца, інтэлігентны чалавек! А можа, ты хочаш цішыні, цяпла, мора, адзіноты і лёгкіх бесклапотных прыгод? Так бы і сказаў! Хоць гэта ўсё роўна не да мяне. Гэта — да Даніэля Дэфо. Тут ён быў першы (з сучасных, як той казаў). Ім і застаўся. Так што прабач: надзеі не спраўдзіў. Але будзь спагадлівы: я ж стараўся як мог. Вельмі стараўся...

Вось гэтак заўсёды: захочаш скокнуць вышэй галавы, падняцца на прыступку, а ў выніку прыходзіш да класікі. Да Даніэля Дэфо. Усё ж класны быў хлопец!

## Партрэт

Вось вы – мастак, малады, таленавіты, смелы, дзёрзкі. Гэтаксама смела і дзёрзка вы забілі сваю багатую, у гадах, што вечна вас павучала, жонку. А перад тым, заўважым, паспелі намаляваць яе амалоджаны партрэт-камплімент (адзін з першых падарункаў – а як жа інакш да старой мымры падлабуніцца?). Ён і цяпер вісіць у спальні. Цудоўна прамаляваны, ваш гонар, адна з першых удач. І здымаць яго вам зусім не хочацца. Дый дзірку ў сцяне потым заштукоўваць.

І вось вы вольны шляхціц, забяспечаны, у росквіце сілаў – самы раз, каб пажыць дзеля ўласнае асалоды.

І вы запрасілі яе – маладую, прыгожую, амаль, як і вы, пачаткоўку. І яна здзейсніла любоўны цуд, і вы – ля яе ног. І ўсё як найлепш: воля, каханне, шчасце. І яна – такая спакусніца-чараўніца.

Але гэта для вас усё як найлепш. Для яе ж усё выглядае іначай: ёсць грошы, але як бы не зусім яе, ёсць віла, але як бы зусім не яе. Ні тое, ні гэтае. Лозунг жа красуняў: усё альбо нічога!

І яна ідзе на ўсё.

І ўжо ваш аўтапартрэт ёй не хочацца здымаць са сцяны.

## Хлопцы ўжо, відаць, зачакаліся?

Прахапіўся ў пяць. Толькі-толькі днела. Разбудзіў ён. Утаропіўся ў мяне вачыма, высмоктваў апошнія сокі. Я ўпершыню злавіў яго за працай. Зразумеў, чаму пасля смерці яе мужа кожную раніцу пачуваюся блага, а яна баіцца тут начаваць.

Шпурнуў будзільнік. Жалезная скрыначка не даляцела да яго некалькі дзюймаў, адскочыла, упала на падлогу, пакацілася: дзінь, дзінь.

«Ён у ахоўным полі,– сцяміў я.– З ходу – не ўзяць. Думай, Федзя, думай».

Ёсць ідэя: сернікі! Полымя праглыне і поле! Падпаліць крывасмока!

Устаю, усміхаюся (як бы кажу: ну годзе на сёння, даражэнькі, ну годзе), іду нібыта мыцца. Запальваю пліту, нібыта згатаваць кавы, але прыкурваю ад канфоркі газету. Адразу, пакуль «сябра» не датумкаў, што да чаго,– выплюхваю ў вочы-свярдзёлкі – толькі

не абмыхнуцца! — падрыхтаваную на ўсякі выпадак (як супала!) шклянку спірту і пасылаю наўслед агністыя «апошнія навіны». І — салют: яго партрэта больш няма!

А сам кіруюся дахаты. Не чакаю, пакуль тыя, што нічога не бачаць, мяне туды ў ненавіснай з дзяцінства кашулі да пят завязуць. Дый халасцяцкае, у родных сценах, жыццё будзе спакайнейшым. І хлопцы зноў жа, пакуль я сватаўся-жаніўся, пэўна што, па сябруку засумавалі...

## Як яны ўсміхаліся адно аднаму!

Яна: «Піць пачне з сямі-васьмі. Да адзінаццаці будзе «гатовы». У дванаццаць адыдзе, захрапе, і вось тады...»

Ён: «Ляжа, як усе, хто шануе здароўе, у дзевяць-дзесяць. Да адзінаццаці пагартае якую лухту, кшталту «Веданне свайго гараскопа — зарука даўгалецця». Пад дванаццаць гарматай не разбудзіш. І вось тады...»

Яны сядзелі за невялікім столікам у «МакДональдсе». Прыгожыя, элегантна адзетыя, шчаслівыя. Быў выходны дзень. Сонечна. Радасна. Яму зайздросціў увесь мужчынскі род, ёй — увесь жаночы.

«Вось тады,— скончыла яна,— і заб'ю яго...»

«Яе»,— паправіў ён.

Як яны ўсміхаліся адно аднаму!

## Апошняе слова

Ён заехаў ёй поўху: яна, не папярэдзіўшы, адлучылася на некалькі гадзін і, як ён лічыў — здрадзіла. Але яна не здраджвала. Прынамсі, гэтым разам яна сапраўды была ў маці. Апошнім часам тая дрэнна пачувалася і папрасіла яе: «Хачу цябе ўбачыць, нешта сказаць. Баюся, што гэта будзе апошняе маё слова». На пратэсты дачкі дадала, што жартуе, але паўтарыла настойліва: «Прыйдзі, дачушка!»

«Мама казала праўду,— думала яна,— быццам у ваду глядзела: муж цябе ўдарыць, як толькі зойдзеш, а пасля папросіць прабачэння, збегае па кветкі, цукеркі, шампанскае...»

Так усё і адбылося. Але пад канец вячэры. Пасля яе слоў: «Вось гэта мужчына! Такі, мабыць, не стоміцца да ранку!» — ён ускіпеў

рэўнасцю да тэлевізійнага героя і зноў замахнуўся. Але ўдарыць не паспеў – вастрыё нажніцаў для стрыжэння рыбы ўвайшло яму пад рэбры.

Ён доўга не паміраў, а яна істэрычна смяялася.

Раптам супакоілася.

– Ледзь не забылася,– выцерла слёзы.– Як адыходзіла ад мамы, яна і сказала: «І апошняе табе маё слова, дачушка: перад тым як сесці вячэраць, пакладзі каля сябе што вострае і доўгае...»

## Прызнанне

З нейкага часу яму пачало здавацца, што муж, які надта ж хваліць сваю жонку прылюдна (скажам, за бяседным сталом), робіць гэта не проста так, не з прычыны палкага кахання і пяшчоты да яе. Чамусьці думалася, што такі чалавек у нечым вінаваты перад сваёю палавінай, тоіць нейкі страшэнны грэх і цяпер каецца, спрабуе загладзіць віну, адкупіцца. І толькі зараз, за святочным сталом, да яго дайшло, што тут да чаго,– яны, гэтыя людзі, проста не спяць з жонкамі...

– Тата, твая чарга маму віншаваць! – прахапіўся ён ад голасу старэйшага сына.

– Але-але, мы чакаем, Алег Васілевіч,– падтрымалі госці.– Ваш тост.

Ён паволі падняўся з крэсла, нібы ажываючы, вяртаючыся ў святочную атмасферу, з якой, задумаўшыся, выпаў на колькі хвілін, ледзь чутна праверыў голас: «гм-гм», канчаткова ачуўся і – яго панесла:

– Скажу вам, сябры, шчыра: без маёй дарагой, ненагляднай, мудрай, каханай жонкі я ў гэтым жыцці анічога б не дамогся. Толькі дзякуючы ёй...

– Вось гэта я разумею – каханне! – перапыніла яго жончына сяброўка.– Вось гэта прызнанне.

«Але, прызнанне,– мільганула ў ягонай галаве,– сапраўды, прызнанне...»

## Несправядлівасць

Яна ведала, што свет несправядлівы, але каб да такой ступені! І каб несправядлівасць закранула акурат яе, усё жыццё гатовую сустрэць хоць якія нягоды?

Не, свет не толькі несправядлівы — свет нелагічны, непаслядоўны, бязглузды.

Яна пільнавалася рэжыму, жыла згодна з распарадкам: басейн, сон, масаж, прырода. Не працавала, неператамлялася, не нараджала, шанавала сябе: да сарака — ніводнай зморшчынкі. Любіла сябе. Вельмі любіла.

І яна, што ашчаджала сваё здароўе, як зрэнку вока, што здзьмухвала з сябе пылінкі, цяпер памірала, а ля ложка стаяў яе муж. Сівы, аблыселы. Які ніколі не асцерагаўся, недасыпаў. Усё жыццё працаваў як вол і таму быў вечна змучаны і ў пяцьдзесят — стары. Стары і стомлены.

І, стомлены, ён падаваў ёй есці, прыўзнімаў на падушках галаву, даглядаў яе, супакойваў, здабываў па аптэках лекі, працаваў уночы, каб аддзячыць дактарам і не прыйсці да яе ў палату з пустымі рукамі. Шмат працаваў. Цягнуў і цягнуў ярэмца.

Ён кахаў яе.

Яна памерла, але так і не зразумела, што свет не проста несправядлівы — ён суцэльна несправядлівы. Несправядлівы і да несправядлівасці, і да кахання.

## Як у Бога за пазухай

Шэсцьдзесят гадоў разам. Шэсцьдзесят гадоў жыцця як у Бога за пазухай. Ён быў інтэндант, генерал. Заўсёды заняты, заклапочаны, нават па выхадзе ў адстаўку: «Не хачу, каб ты хоць калі зведала нястачу». А яна — пры ім: жонка, каханка, кухарка, прыслуга, сяброўка — усё разам.

Жыццё прамчала, як імгненне. Жыццё прамільгнула...

Яна выцяла яго. Моцна, наводліў. Пасля яшчэ і яшчэ. Па галаве. Біла і галасіла. У яго пайшла кроў. З рассечанай губы, з носа. А ён толькі бездапаможна ўсміхаўся. Паказаў вачыма на сервант. Там, у верхняй шуфлядцы, ляжаў дамскі, інкруставаны слановай косцю пісталет. Падказка? Ён кіўнуў: давай!

Яна не вінаватая. Яна — здалася, зламалася, сарвалася: ён зноў вырваў шланг, праз які апаражняўся. Пад раніцу заснуў, павярнуўся на бок і — шланг зляцеў. Ці ж першыня! Божа, зноў гэты смурод. Ён працінае, выварочвае, душыць...

Ён не варушыўся, астываў, а яна ўсё перакладвала пісталет з рукі ў руку, не магла прыйсці да памяці. Нарэшце ачомалася, села ўзгалавашча на крэсла. Апошнія некалькі месяцаў амаль не ўставала з яго: чакала, спадзеючыся на цуд. Цяпер — усё. Уздыхнула: «Дзякуй Богу, канец. Даруй, любы. Даруй і павер: цярпела, але — не вытрывала. Гэта, выходзіць, мне не да падняцця. Але ты не хвалюйся, я скора».

Прайшла на кухню, узяла падрыхтаваную загадзя капсулку, паклала ў рот. Наліла ў шклянку вады. Запіла. Вярнулася ў спальню. Легла побач з ім. Была шчаслівая: зноў разам.

Ціха заснула.

## Я люблю любіць

Каханне!

Каханне — гэта найвышэйшы, дадзены нам Богам духоўны і душэўны дар. Найлепшае з набытага чалавекам на зямлі. Повязь развіцця і эвалюцыі.

Яно ап'яняе, змушае траціць галаву — і ўзносіць да нябёсаў. Робіць свет прыгожым. Рухае яго наперад. Скіроўвае ў будучыню.

Каханне — гэта надзея, мара і мроя, покліч продкаў, прага дасканаласці. Усведамленне сэнсу жыцця. Найвышэйшае шчасце. Асалода. Найсвятлейшае жаданне. Удача. Перамога. Удзячнасць. Слёзы і смех. Слёзы радасці. І ад душы смех.

Каханне — гэта Дабро.

Гэта — Рай.

Але ёсць пачуццё, мацнейшае за каханне, наймацнейшае ў свеце пачуццё.

Рэўнасць!

Рэўнасць — гэта кара нябесная, найбольшае зло.

Рэўнасць, як і інтуіцыя, вышэй за розум. Але інтуіцыя дапамагае розуму, рэўнасць жа вядзе да страты яго.

Рэўнасць — гэта сатана з апраметнай, д'ябал, што пракраўся ў душу, завалодаў сэрцам, свядомасцю, целам.

Рэўнасць спусташае духоўна, адбірае сілы, нявечыць жыццё, лёс. У рэўнасці няма логікі. Яна адвеку алагічная: кахаеш чалавека і — лічыш яго здраднікам.

Рэўнасць — гэта атрута, змешаная з крывёю, ракавая пухліна, што спавіла і спаралізавала цела, змусіла яго гнісці. Жах памутнелага розуму, самакатаванне да няпамяці.

Рэўнасць — гэта перамога рэфлексаў над інстынктамі. Але не ў саюзе з эвалюцыяй, а насуперак ёй.

Рэўнасць — гэта рэгрэс, дарога, якая вядзе ў нікуды.

Рэўнасць — гэта Пекла.

Гэта — нянавісць! Татальная нянавісць — нянавісць да блізкіх.

Я ненавіджу ненавідзець!

Я люблю любіць!

## БОНУС

*(З чорнага сшытка)*

### Чужаземец

Вязень ведаў, што не вытрымае катаванняў, але ведаў і іншае: у яго ёсць шанец — хворае сэрца. Яно не стрывае, здасца, згарыць, перастане біцца раней, чым развяжацца язык.

Яго білі прафесійна і доўга. Мінула вечнасць, перш чым з палёгкаю ўсвядоміў: udaраў не ўспрымае і ў прасторы не арыентуецца. Практыкавалася — вось-вось узляціць: адбітае нутро страціла повязь з целам, і яно здавалася бязважкім. Зачапілілася надзея: «Дасць Бог, так і памру, не раскрыўшы рота».

Два мокрыя ад поту малойчыкі адвалаклі вязня ў кут камеры.

Адзін плюхнуў на акрываўленую галаву вадой з вядра, прабасіў:

— Так і будзеш у маўчанку гуляць?

— Нічога,— пасля невялікай паўзы адказаў за вязня другі.— У Доктара спяваць пачне. У яго і не такія салаўямі заліваліся. Пайшлі, мы сваё зрабілі...— Але нечакана павярнуўся і выцяў ляжачага нагой.— От, сука!

Вязень маўчаў.

На змену малойцам з'явіўся белы карлік. Зрэшты, не карлік — тыя складзены больш-менш прапарцыянальна,— а гэты да смешнага каратканогі і таму нехлямяжы чалавечак у белым, да пятаў, халаце. Праўда, тым, хто ведаў карантыша Доктара, ніколі, гледзячы на яго, не прыйшло б і да галавы засмяяцца: звычайна, у час стыканняў з кліентамі, ён весяліўся і хахміў. На шырокім Доктаравым твары нішто, калі браць упаасобку, здаецца, не адштурхоўвала: выразныя карыя вочы, просты, амаль што ідэальны нос, строгі квадратны падбародак, ярка-ружовыя, як у дзіцяці, рухавыя вусны. Але ўсё гэта было неяк зрушана, перамешчана, і з гэтае прычыны твар быў як зберты і склееexcl з разнародных фрагментаў. Такая вось адмысловая пачварнасць.

За пачвараю ўвайшоў здаравіла ў шырокім трыко і з голым торсам — з той самай каманды разагравальнікаў. Сёння яму выпала працаваць на пару з Доктарам.

«А карантыш — баязлівец! — пасміхнуўся ў душы вязень.— Самадзін нават з паўмёртвым баіцца застацца. Відаць, былі прэцэдэнты».

Здаравяк абарваў яго одум. Хапіў за лахманы, што засталіся ад адзення, падцягнуў да ўмураванага ў сцяну металічнага крэсла. Пасадзіў і прыціснуў рукамі-гірамі да спіны. Хехекнуў:

— Чаму такі мокры? Ванну прыняў? — Не чакаючы адказу, пахваліў: — А трымаешся малайцом, скора ачуняў, вынослівы. Цяпер расслабся пакуль што, адпачывай, набірайся сілаў. Яны табе зараз спатрэбяцца...

Вязень спадзяваўся, што сэрца не дацягне да таго моманту, калі ён апынецца на спецкрэсле — так назваў яго, убачыўшы ўпершыню. Прыслухаўся да сябе. Не, сэрца схавалася, затаілася — ашчаджала сябе. Сэрца хацела жыць.

Здаравяк прышпіліў вязня да крэсла. Рамяні ўпіліся ў цела, сціснулі, спаралізавалі. Гэта паўплывала: сэрца спалохалася, сарвалася, затрапяталася.

«Малайчына! — пахваліў яго вязень.— От і пасобіш мне. Можа, да самага страшнага і не дойдзе...» І заціх, убачыўшы столік са слясарна-медычным інструментарыем, які падкочваў да яго карантыш.

Доктар узяў храмаваныя абцугі, якія паблісквалі пад моцнай вузкаскіраванай лямпаю, і некалькі разоў развёў і звёў іх — разрухваў пальцы. Абцугі ціха парыпвалі — скрэблі па мазгах.

— Думаў, кусаюцца толькі шалёныя сабакі? Дзе там,— наблізіўся да яго вясёлы чалавечак.

Паказаў зубы, выбеленыя да бляску. Угледзеў: вязень сцяўся. Пасміхнуўшыся, задоўжыў паўзу: наталяўся асалодаю.

— Значыць, так. Электроніка цябе не бярэ: ты яе, не датыкаючыся, вымыкаеш. Хімія, пігулкі, уколы табе таксама да лямпачкі — не прымае іх твой хітры арганізм. І хлопцы мае дарма двое сутак стараліся, спадзеючыся, што ў цябе сумленне абудзіцца. Застаецца адно — успомніць святую інквізіцыю. Яна заўсёды свайго дамагалася. А ўжо якія кліенты ў яе былі! Цярплівыя, скажу табе, кліенты, цярплівыя... А геніі якія... Адзін Джардана Бруна чаго варты... От бачыш, і па гісторыі прайшліся... Цяпер і па табе пройдземся... Ды не дрыжы, не торгайся! Балюча — толькі першы раз, пасля прывыкаеш. Я ж прывык...

«Ты не прывык, ты гэткім нарадзіўся. Сабака, нелюдзь, жывёліна! — Вязень глядзеў карантышу ў вочы.— Калі здамся, здраджу, збаюся — стану такой самай жывёлінай».

Доктар прыціснуў да сцягна вязня пякуча-халодную галоўку абцугоў.

— Ну што, будзем языком варушыць ці і далей нямка з сябе ўдаваць? — Яшчэ счакаў: падкідваў апошні шанец.— Пакуль што цябе прамацвалі з сярэдзіны. Цяпер праверым звонку...

Сэрца ў вязня зноў ажыло, закалацілася, пайшло збівацца з рытму, захлынацца. Ён падахвоціў яго, шапянуў у думках: «Давай, давай...»

І тут пачвара пстрыкнуў абцугамі — вырваў са сцягна латку скуры з ружовымі нітачкамі мяса.

Маланка болю праццяла галаву вязня, але сэрца, ліха на яго, не разарвалася. Наадварот: зноў прыціхла, сціснулася, запаволіла бег. Разрывалася галава. Стала млосна.

«Інсульт! — мільганула ў згасальнай свядомасці.— Божа, забяры мяне, забяры!»

— Не, даражэнькі...— На кіў карантыша лінуў з вядра здаравяк.— Без споведзі ад нас яшчэ ніхто не адыходзіў.

Ледзяная вада астудзіла галаву, і вязень роспачна і ясна ўразумеў: такога разрывання цела па кавалачках яму доўга не вытрываць, ён здасца, раскажа ўсё — чаго ад яго патрабуюць і чаго не патрабуюць. Ягоны мозг не выбухнуў, не заліўся крывёю ад першага разу. З часам, казаў Доктар, прывыкаеш? Не, ён не такі моцны

і хутчэй зломіцца, чым прывыкне. «Госпадзе, дай мне памерці да таго, як...»

Надзея заставалася па-ранейшаму адна — сэрца!

Але сэрца дарэшты зацiхла, легла на дно.

Доктар апусціў абцугі ў высокую шклянку. Кроў павольна змешвалася з празрыстай вадкасцю, афарбоўвала яе ў колер маладога чырвонага віна. Патануў-знік у ёй і шматок скуры.

Карантыш вышчарыўся:

— Значыць, абцужкоў таксама не баішся? Смелы, аднак! А як наконт пазуркоў? Спадабалася нямка ўдаваць? Нічога, рана ці позна галасок у цябе прарэжацца.

Ён змяніў інструмент. Злавіўшы маленькай цёплай рукою вязнеў мезенец, адціснуў мякаць, старанна абцяў пазногаць пласкагубцамі, тузануў і залямантаваў, быццам той пазногаць вырывалі ў яго:

— А-а!

Гэта быў крык захаплення.

Маланка зноў ударыла вязню ў галаву. Але пранізала не па гарызанталі, з вуха ў вуха, як мінулым разам, а пеканула зверху. Упілася ў цемя і рассекла галаву напалам. Вязень не закрычаў: спаралізавала мышцы твару. З горла пайшла кроў. «У-у...» — загудзеў розум, зрываючыся ў бездань, але — утрымаўся на беражку.

— Моцны арэшак,— расплыўся ў усмешцы карантыш.— Давядзецца сяброўкай вернай пакарыстацца.— Ён узяў са століка пілку-лобзік даўжынёю з дзве пядзі.— Гэтая харашуха да чаго хочаш дапілуе,— узрадаваў.— Во, глядзі, рука твая ля запясця прывязана, а мы яе зараз вызвалім. Праўда, не ўсю — сам разумееш, свабода вымагае ахвяр.

Доктар прыклаў пілку да рукі крыху ніжэй раменьчыка-жгута, зрабіў першую насечку. Скура распаўзлася, разаслала крывавую дарожку.

— Паехалі! — разануў ужо з націскам.— Туды-сюды, туды-сюды! — з асалодаю вадзіў пілой і вішчэў.— Глядзі, які я работнічак! Глядзі...

Калі пад пілою зашалясцела косць, вязень паплыў — каляровы малюнак перад вачыма ператварыўся ў чорна-белы, чорна-белы — у непраглядную ноч.

Здаравяк сваю службу ведаў, момант адчуў дакладна — зноў абліў вязня вадою:

— Не, герой, нумар з паскораным пахаваннем не пройдзе!

Холад вярнуў вязня да памяці. Ён зноў бачыў. Бачыў у колеры. Кроў — чырвоная. Буйвал-здаравіла — у сінім трыко і з рыжай валасатай грудзінай. «Не паміраю,— намагаліся і не маглі шапнуць засмяглыя губы.— Дай цябе немач!»

Раптам за спінаю карантыша нешта грымнула, задрыжэлі дзверы камеры.

Гру-ух-х! — разам з завесамі і прыліплай да замка-завалы тынкоўкаю ад сцяны аддзяліліся цяжкія акаваныя дзверы, рухнулі на здаравяка і ўціснулі яго ў падлогу. Канец адагнутай жалезнай шыны ўспароў яму бок.

У праёме паказаліся двое ўзброеных. Адзін, не бавячыся, гваздануў пачвару прыкладам аўтамата па галаве. Праломленая галава засмяялася.

Пасля другога ўдару ўхмылка з ружовых вуснаў зляцела, маленькія ножкі падагнуліся і карантыш моўчкі паваліўся. Ён ляжаў у вязня ля ног, закаціўшы вочы. Быццам сабака, якога аддзячыў-пагладзіў за верную службу гаспадар. Сабакам ён і быў. Шалёным сабакам...

«Учэпісты, яшчэ крыху — і дамогся б свайго!» — глядзеў на замерлага ката вязень.

І раптам злавіў сябе на думцы: «А мае збаўцы, хто яны? Што зробяць, калі падзялюся з імі вядомай мне інфармацыяй? Скарыстаюць яе дзеля дабра ці зла?»

— Не хвалюйцеся,— быццам пачулі ягоныя нявыказаныя сумневы тыя двое.— Мы адразу раскрыем карты: нам вядома, хто вы і адкуль. Ведаем мы і тое, што праз лучнасць са сваім светам вы здольныя варажыць будучыню — акрамя сваёй — на бліжэйшыя дваццаць чатыры гадзіны. Зараз развяжам путы, і вы пачуеце пра нашы планы...

Вязень траціў прытомнасць. Ён яшчэ не паспеў усвядоміць, што вызвалены, быў ва ўладзе нясцерпнага болю, але недзе ў глыбіні душы ўжо нарадзілася, расло гэтае ганарлівае пачуццё: ён выжыў, вытрываў, застаўся чалавекам!

Цяпер ён не жадаў смерці — хацеў жыць! Чаго б гэта ні каштавала — жыць! Насуперак усім вылюдкам і пачварам — жыць! Жыццё — цудоўнае!

Радасць і шчасце перапоўнілі яго, падхапілі, панеслі. І сэрца, якое выцерпела нечалавечыя пакуты, не скарылася, калі скараліся

розум і цела, раптам не вытрывала абрынутае патокі свабоды — захлынулася...

Збаўцаў насцярожыла, што галава чужаземца раптам упала на грудзі. Адзін з іх узяў яго за руку: пульсу не было.

— Вады! Хутчэй! — закрычаў, спрабуючы зрабіць хоць што.

Усё было дарэмна.

Збаўцы так і не даведаліся, што адбудзецца заўтра — 11 верасня 2001 года.

А Душа чужаземца ляцела да неба.

Неўзабаве закружылася ўслед за Зямлёю. Кружылася і чакала.

Чакаў свайго часу і я.

І час надышоў. Я вырваўся на волю, і Душа ўвайшла ў мяне, ускалыхнула сэрца — адарыла жыццём.

Так я нарадзіўся. Папраўдзе — ажыў ён, чужаземец.

# ЗМЕСТ

СШЫТАК ЗАБІТАГА КАНТРАБАНДЫСТА
*Апавяданне*

Ваяры невідочнага фронту ..... 5
Усход — штука тонкая ..... 35
Першы клас ..... 58
Трэцяе купэ ..... 73
Самы Ніжні Тагіл ..... 78
Касіў Ясь ..... 101
Інтуіцыя ..... 110
Фарц ..... 117
**Бонус**
А далей — дробязі... ..... 123
Дзевяць сутак і дзевяць гадоў ..... 125
Уладзівасток — Найдалёкшы Усход, або Другая спроба ..... 126
Мост ..... 128
Аблава ..... 131
І вось ён вярнуўся ..... 132

КРЫМІНАЛЬНЫЯ АПАВЯДАННІ

Прынцэса ..... 134
Жакей ..... 140
Апошні варыянт ..... 147
Дарагое жыццё ..... 153
Гена ..... 154
Ціхая восень восемдзесят восьмага ..... 156
«Мальбара-Лайтс» ..... 163
Першага верасня ..... 169
Настаўнік фізікі ..... 172
Маленькая гісторыя ..... 174
Дабрадушны ..... 180

АПАВЯДАННІ ПРА КАХАННЕ

У месяцовым святле ... 187
Пах «Envol» ... 192
Хлопчыкі ... 216
Сюжэт ... 219
Трое ... 224
Беверлі-хілз ... 228
Гэта не балюча ... 237
Вяртанне ... 242

ЗАПІСЫ
*Абразкі*

Мера кахання ... 245
Садок ... 245
Яны не ведалі ... 245
Мяжа мажлівасцей ... 246
Не прасачыліся ... 246
Адно цэлае ... 247
Ігар Елянёў: Рэквіем ... 247
Ёсць — не будзе ... 249
Праменьчык ... 249
Арол ці рэшка? ... 250
Ён думае ... 250
Замена ... 250
Блізняты ... 251
Палата № 8, або Праз 110 гадоў ... 251
Класны хлопец ... 254
Партрэт ... 258
Хлопцы ўжо, відаць, зачакаліся? ... 258
Як яны ўсміхаліся адно аднаму! ... 259
Апошняе слова ... 259
Прызнанне ... 260
Несправядлівасць ... 261
Як у Бога за пазухай ... 261
Я люблю любіць ... 262
**Бонус**
*(З чорнага сшытка)*
Чужаземец ... 263

**Маракоў, Л. У.**

М25 Запісы забітага кантрабандыста : апавяданні, абразкі / Леанід Маракоў. — Мінск : Маст. літ., 2008. — 270 с.— (Сучасны беларускі дэтэктыў).

ISBN 978-985-02-0990-0.

Герой апавяданняў Леаніда Маракова — цэльны і лёгка пазнавальны. Гэта наш сучаснік, за плячыма ў якога багаты жыццёвы досвед,— рыцар небяспечнага чаўночнага бізнесу, джэнтльмен удачы, у якім арганічна ўжываюцца і летуценны рамантык і жорсткі прагматык. Адзінае, чаго ён не ўмее,— гэта сядзець склаўшы рукі. Ён сам стварае для сябе экстрэмальныя ўмовы, а тады — перамагае, гіне і зноў уваскрасае. Нават каханне ў прозе Маракова — гэта заўжды экстрым і рызыкоўная гульня.

Постмадэрнісцкае апавяданне-загадка, крымінальны аповед, вострасюжэтная любоўная навела, невялікі абразок і проста занатоўка нечаканай думкі — жанры, у якіх працуе пісьменнік.

**УДК 821.161.3-3**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

Сучасны беларускі дэтэктыў

**МАРАКОЎ Леанід Уладзіміравіч**

**ЗАПІСЫ ЗАБІТАГА КАНТРАБАНДЫСТА**

*Апавяданні, абразкі*

Рэдактар *Ю. В. Пацюпа*
Мастак *Н. У. Кузьмянкова*
Мастацкі рэдактар *Л. М. Рудакоўская*
Тэхнічны рэдактар *В. І. Барута*
Стылістычныя рэдактары *А. М. Анцытовіч, М. А. Паддубская, Л. Г. Ганчарэнка, Я. А. Бебель*

Падпісана да друку 10.03.08. Фармат 84×108 1/32. Папера афсетная № 1.
Гарнітура Гарамон. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 14,28. Улік.-выд. арк. 15,71.
Тыраж 1500 экз. Заказ 413.

Выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0056778 ад 17.02.2004.
220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.
www.mastlit.by: e-mail: mail@mastlit.by

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Типография "Победа"».
222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11.

ISBN 978-985-02-0990-0
9 789850 209900





Леанід Маракоў

# Запісы забітага кантрабандыста